Божае збаўленне набывае форму рукі, працягнутай беднаму, якая прапануе гасціннасць, бароніць і дазваляе адчуваць сяброўства, якое яму патрэбна. З гэтай канкрэтнай і датыкальнай блізкасці пачынаецца сапраўдны шлях вызвалення. «Кожны хрысціянін і кожная супольнасць пакліканы быць Божымі прыладамі вызвалення і падтрымкі бедных дзеля поўнай сацыяльнай інтэграцыі; а значыць быць уважлівымі да крыку беднага і гатовымі яго падтрымаць» (Evangelii gaudium, 187).

*Папа Францішак*
*(з Паслання на Сусветны дзень бедных,*
*13 чэрвеня 2018 г.)*

ISBN 978-985-7074-94-5

ЛЮБІ СВАЙГО БЛІЖНЯГА




# ЛЮБІ СВАЙГО БЛІЖНЯГА

Дапаможнік па развіцці парафіяльных структураў дабрачыннага таварыства «Карытас»

CARITAS



# ЛЮБІ СВАЙГО БЛІЖНЯГА

Дапаможнік па развіцці
парафіяльных структураў
дабрачыннага таварыства «Карытас»

Мінск
«ПРО ХРЫСТО»
2018

УДК 272
ББК 86.375
Л93

Пераклад з англійскай *Юліі Шэдзько*

Пераклад зроблены паводле інтэрнэт-версі кнігі
Manual For Parish Caritas Development
LOVE YOUR NEIGHBOUR
*Regional PSM Project*
*Caritas Albania, Caritas Bosnia and Herzegovina, Caritas Bulgaria,*
*Caritas Croatia, Caritas Kosovo, Caritas Macedonia, Caritas Montenegro,*
*Caritas Serbia and Caritas Slovenia*

NIHIL OBSTAT
Цэнзар кс. кан. д-р Ян Крэміс
Мінск, 7 чэрвеня 2018 г.

IMPRIMATUR
Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі
Старшыня Канферэнцыі Біскупаў
Мінск, № 160/к/18 ад 7 чэрвеня 2018 г.

ISBN 978-985-7074-94-5

© РМ «Дабрачынная каталіцкае
таварыства Карытас» ККББ, 2018
© УП «Выдавецтва „ПРО ХРЫСТО“», 2018




# На служэнні людзям

Глыбокапаважаныя супрацоўнікі дабрачынных арганізацый «Карытас»!

Вы трымаеце ў сваіх руках унікальны дапаможнік па развіцці парафіяльных структураў дабрачыннага каталіцкага таварыства «Карытас».

З першых дзён рэлігійнага адраджэння ў нашай краіне, распачатага ў 90-я гады мінулага стагоддзя пасля трох пакаленняў ганенняў, вялікая ўвага ў Каталіцкім Касцёле звяртаецца на праблему сацыяльнага служэння на нацыянальным, дыяцэзіяльным і парафіяльным узроўнях. Сучасны стан гэтага служэння патрабуе большых намаганняў для арганізацыі дабрачыннай працы ў парафіях, бо менавіта ў іх Касцёл непасрэдна сутыкаецца з людзьмі, якія знаходзяцца ў цяжкім становішчы.

Паколькі задачаю сацыяльнага служэння з'яўляецца дапамога ў вырашэнні праблемаў грамадства з мэтаю забеспячэння сацыяльнай справядлівасці, яго можна лічыць часткаю патройнай місіі Касцёла: абвяшчаць Божае слова, асвячаць людзей і служыць ім. Нельга зразумець Касцёла без дыяканіі. Езус прайшоў праз жыццё, чынячы людзям дабро (пар. Ян 10, 32). Гэтаксама павінен рабіць і Касцёл на ўсіх узроўнях сваёй місіі, у тым ліку і ў парафіяльным служэнні.

Хрыстус сказаў: «Што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі» (Мц 25, 40), а св. апостал Якуб сцвярджаў, што «вера без учынкаў мёртвая» (Як 2, 17). Усё гэта азначае, што дабрачынная дзейнасць з'яўляецца знакам нашай хрысціянскай самасвядомасці і прысутнасці Бога сярод людзей.

Гэты метадычны дапаможнік прызначаны перш за ўсё для людзей, адказных за дабрачыннасць на дыяцэзіяльным узроўні, для святароў, якія служаць у парафіях, і для супрацоўнікаў парафіяльных аддзяленняў «Карытас». Ён з'яўляецца вынікам сумеснай працы розных таварыстваў «Карытас» Паўднёвай Еўропы.

Вельмі важна тое, што ў гэтай кнізе, угрунтаванай на Святым Пісанні і сацыяльным вучэнні Касцёла, падаюцца тэалагічныя асновы дабрачыннасці. Яны дапамагаюць нам зразумець праўду пра тое, што дабрачыннасць — не проста філантропія, а служэнне людзям, якія знаходзяцца ў патрэбе, і вынікае яно з Божага наказу любіць бліжняга як самога сябе (пар. Мц 22, 39).

Асаблівая ўвага ў дапаможніку звяртаецца на праблему сацыяльнага служэння ў парафіях і патрэбу развіцця валанцёрства з мэтаю больш эфектыўнай дапамогі тым, хто чакае яе ад нас. Адметнасцю дапаможніка з'яўляецца таксама яго практычны аспект: у ім выкарыстоўваецца метад трэнінгу, які скіраваны на заснаванне і развіццё парафіяльных таварыстваў «Карытас».

Выказваю ўдзячнасць усім, хто спрычыніўся да выхаду ў свет гэтай вельмі важнай і патрэбнай кнігі, — Каталіцкай службе апекі (*Catholic Relief Service*), *Caritas Italiana*, Рэлігійнай місіі «Дабрачыннае каталіцкае таварыства Карытас» Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў Беларусі, выдавецтву «Про Хрысто». Спадзяюся, што выданне будзе спрыяць развіццю дабрачыннасці ў нашай краіне, асабліва на парафіяльным узроўні.

Стваральнікаў і карыстальнікаў дапаможніка ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца, + і Сына, і Духа Святога.

Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі
Старшыня Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

## Уводзіны

Дарагія сябры!

Мы вельмі рады прадставіць вам дапаможнік па развіцці парафіяльных структураў «Карытаса» «Любі свайго бліжняга». Гэты дапаможнік з'явіўся ў выніку шматгадовага супрацоўніцтва арганізацый «Карытаса» Паўднёвай Еўропы (Албанія, Боснія і Герцагавіна, Балгарыя, Харватыя, Косава, Македонія, Чарнагорыя, Сербія і Славенія) у галіне развіцця парафіяльных структураў «Карытаса» і пашырэння валанцёрскай працы. Усе арганізацыі «Карытаса» прымалі актыўны ўдзел у распрацоўцы гэтага дапаможніка і зрабілі ўнёсак у яго канцэпцыю і змест.

Дапаможнік стаў адказам на патрэбы людзей, якія працуюць у гэтай сферы (парафіяльных і дыяцэзіяльных структурах «Карытаса») і імкнуцца арганізаваць або рэарганізаваць парафіяльны «Карытас». Мы спадзяемся, што падручнік дапаможа ім у гэтым і дасць разуменне таго, што найперш неабходна, каб заснаваць парафіяльны «Карытас». Гэты дапаможнік распрацаваны каардынатарамі нацыянальных арганізацый «Карытас», каб дапамагчы ў парафіях аніматарам, якія займаюцца заснаваннем парафіяльных структураў «Карытаса» і (або) арганізуюць розныя трэнінгі і сустрэчы ў структурах, што ўжо існуюць. Ён распрацаваны такім чынам, каб матэрыялы можна было зручна выкарыстоўваць і абнаўляць.

Карыстаючыся магчымасцю, мы выказваем шчырую падзяку нашым даўнім партнёрам у гэтым праекце: *Caritas Italiana* і *the Catholic Relief Service* (Каталіцкая служба апекі) за іх фінансавую і тэхнічную падтрымку. Без іх дапамогі і гатоўнасці супрацоўнічаць гэты дапаможнік не быў бы падрыхтаваны.

Каардынацыйная група

## Структура дапаможніка

Гэтая кніга распрацавана як практычны дапаможнік для аніматараў у дыяцэзіі, душпастыраў і іншых людзей, што займаюцца развіццём парафіяльных структураў «Карытаса». Кніга ў асноўным прызначаная для трэнінгаў. Тэмы, раскрытыя ў дапаможніку, даюць асноўныя веды, неабходныя для таго, каб арганізаваць добрую працу парафіяльнай структуры «Карытаса».

Гэты дапаможнік прызначаны для правядзення трэнінгаў. У кнізе асветлены чатыры асноўныя тэмы. Кожная тэма мае аднолькавыя па структуры раздзелы, у якіх змешчаны ўводзіны, малітва, тэарэтычная і практычная часткі, а таксама заключэнне. Скарыстаўшыся парадамі і прыкладамі, можна добра арганізаваць трэнінг па развіцці парафіяльнага «Карытаса».

На пачатку кожнага раздзела ёсць кароткія *ўводзіны*, дзе пададзена асноўная інфармацыя, якая датычыць тэмы і мэты трэнінгаў.

Арганізуючы трэнінг перад аўдыторыяй, найлепш спачатку прадставіцца і акрэсліць тэмы, пра якія вы збіраецеся гаварыць. Робячы ўводзіны, не трэба даваць інфармацыю большую, чым прапануе гэты дапаможнік. Больш парадаў пра тое, як распачаць трэнінг, вы знойдзеце ў раздзеле «Вы ў ролі трэнера».

Што датычыць *малітвы*, то мы імкнемся звязаць кожную тэму з тэкстамі са Святога Пісання або з духоўнымі чытаннямі. Гэта дапаможа ўдзельнікам (калі ў большасці гэта вернікі) знайсці сувязь паміж Божым словам і працай у парафіяльным «Карытасе». Вядома, можна далучыць да гэтага сваю традыцыйную малітву, якую вы чытаеце на пачатку сустрэчаў або перад працаю.

У *тэарэтычнай частцы* раскрываюцца асноўныя аспекты вызначанай тэмы. Трэнер павінен вырашыць, як найлепш перадаць інфармацыю ўдзельнікам. Мы рэкамендуем пазбягаць традыцыйных метадаў: замест таго, каб чытаць тэкст або пералічваць парады ўслых, паспрабуйце падрыхтаваць прэзентацыю ў праграме *Power Point* з ключавымі словамі, якія вызначаюць тэму. Паспрабуйце заахвоціць удзельнікаў трэнінгу распачаць дыскусію.

У *практычнай частцы* змешчаны практыкаванні для трэнінгу, пытанні для дыскусіі і лепшыя практычныя прыклады з працы парафіі канкрэтнага рэгіёна. Гэта патрэбна для таго, каб дапамагчы трэнеру матываваць і актыўна далучаць слухачоў да працэсу навучання.

У *заключэнні* абагульняюцца асноўныя думкі кожнай разглядаемай тэмы.

# ТЭАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ «КАРЫТАСА»

## Тэма І

# ПАНЯЦЦЕ *CARITAS* У СВЯТЫМ ПІСАННІ

Паразважаем, як «Карытас» звязаны са Святым Пісаннем. Прааналізуем некаторыя фрагменты са Старога і Новага Запаветаў, каб зразумець, якім чынам яны звязаныя з паняццем *caritas*.

### *Малітва*

*У Хрыста няма іншых рук, апроч нашых,*
*каб рабіць Яго справу.*
*У Хрыста няма іншых ног, апроч нашых,*
*каб весці людзей па Яго шляху.*
*У Хрыста няма іншых вуснаў, апроч нашых,*
*каб гаварыць людзям пра Яго.*
*Мы — адзіная жывая Біблія,*
*якую грамадства ўсё яшчэ чытае.*
*Мы — апошні заклік Бога,*
*заключаны ў словах і ўчынках.*
*А што, калі ногі вядуць нас да граху?*
*А што, калі вусны гавораць тое,*
*што Ён лічыць пустым?*
*Ці можна служыць Яму, не наследуючы Яго?*

Мы павінны быць дзейснымі прыладамі Бога і прыкладам для людзей, каб па нашых учынках яны бачылі, што мы з'яўляемся Божымі дзецьмі, а Езус — наш Збаўца.

### *Тэарэтычная частка*

Давайце разгледзім фрагменты са Святога Пісання, дзе гаворыцца пра любоў да іншых, даецца яе азначэнне, тлумачэнне і сведчанні.

### ВЫСНОВЫ СА СТАРОГА ЗАПАВЕТУ

У Старым Запавеце падкрэсліваецца важнасць запаведзі любові да Бога, пасля якой даецца другая запаведзь — любі бліжняга, як самога сябе (гл. Лев 19, 18).

У найстаражытнейшым тэксце гаворыцца, што той, хто ставіцца да іншых з абыякавасцю і варожасцю, крыўдзіць самога Бога (гл. Быц 3, 12; 4, 9). У запаведзях акрэсленыя патрабаванні

да нашых адносінаў з Богам і адносінаў з людзьмі. Тора вучыць абараняць бедных і бездапаможных — удоваў, нявольнікаў, чужаземцаў (Зых 22, 20–26). Прароцкія кнігі (Ам 1–2; Іс 1, 14–17; 10, 1–2; Ер 9, 2–5; Эзх 18, 5–9; Мал 3, 5) і іншыя кнігі Старога Запавету (Прып 1, 8–19; 3, 27–28; 14, 21; 19, 17; 25, 2–22; Сір 3, 30 – 4, 10; 25, 1; Экл 2, 10 і г.д.) абагульняюць адну думку: чалавек не можа здабыць ласку ў Бога, калі застаецца абыякавым да іншых людзей, асабліва да пакінутых. Людзі Старога Запавету ведалі, што немагчыма шчыра любіць Бога, калі не любіш свайго бліжняга. Таму прарок Ерамія папракнуў караля Яўхіма і ўвесь Ізраэль: «А можа твой бацька не еў і не піў? Але ён спаўняў закон і чыніў справядлівасць, і добра было яму тады. Ён разбіраў справу беднага і няшчаснага, і добра было яму тады. Ці ж не гэта азначае ведаць Мяне? — кажа Пан» (пар. Ер 22, 15–16).

У Старым Запавеце слова «любоў» не часта ўжываецца ў адносінах да бліжніх (гл. Лев 19, 18). Стаўленне да чужынцаў заснаванае на запаведзі любові як успаміну пра тое, што Бог клапаціўся пра выбраны народ падчас яго ўцёкаў з Егіпта: «Хай чужынец будзе пасярод вас як тутэйшы, і любі яго, як самога сябе, бо і вы былі чужынцамі ў зямлі Егіпецкай» (пар. Лев 19, 34).

У ізраэлітаў любоў да бліжняга заснаваная не столькі на пачуцці салідарнасці, колькі на гісторыі збаўлення.

Ізраэліты паглыбілі любоў да сваіх суайчыннікаў яшчэ да Хрыстовага прыйсця. Гэтая любоў праяўлялася таксама і да ворагаў, і да язычнікаў. Любоў да іншага чалавека стала часткаю пасрэдніцкай місіі Ізраэля. Гэта працяг справаў Бога на зямлі.

## ВЫСНОВЫ З НОВАГА ЗАПАВЕТУ

У Старым Запавеце запаведзь любові да чалавека роўная па значнасці з іншымі запаведзямі, але ў Новым Запавеце яна становіцца найважнейшаю.

### *Дзве запаведзі любові*

У Новым Запавеце запаведзь любові да бліжняга непарыўна звязаная з запаведдзю любові да Бога. Абедзве запаведзі любові

маюць найважнейшае значэнне і з’яўляюцца асноваю Закону (гл. Мк 12, 28–33). Асноўнае правіла веры — «у любові служыце адзін аднаму» (Гал 5, 13). Калі хрысціяне дапамагаюць адзін аднаму, несучы цяжар адзін аднаго, яны выконваюць закон Хрыстовы (гл. Гал 6, 2). «Па гэтым усе пазнаюць, што вы Мае вучні, калі будзеце мець любоў адзін да аднаго» (Ян 13, 35). Насамрэч, любоў да бліжняга — гэта адзіная запаведзь. «Калі б хто сказаў: “Я люблю Бога”, а брата свайго ненавідзіць, ён ілгун, бо той, хто не любіць свайго брата, якога бачыць, не можа любіць Бога, якога не бачыць. І мы маем ад Яго такую запаведзь, каб той, хто любіць Бога, любіў і свайго брата» (1 Ян 4, 20–21). Немагчыма аддзяліць любоў да Бога ад любові да бліжняга. Існуе толькі адна любоў.

Любоў да бліжняга вынікае з Божай любові і натхняецца ёю (гл. Мц 5, 44; Эф 5, 1; Ян 4, 11). Таму гэта пабожная любоў, а не звычайная філантропія. Бог усынаўляе нас (гл. 1 Ян 4, 7), ад Яго мы атрымліваем любоў, якая вяртае нас да Яго, таму, калі мы любім сваіх братоў, мы любім Бога (гл. Мц 25, 40). Такім чынам мы складаем Хрыстовае цела (гл. Рым 12, 5–10; 1 Кар 12, 12– 27) і сваім жыццём адказваем на любоў, якою Бог першы палюбіў нас (гл. 1 Ян 3, 16; 4, 19).

Любоў да бліжняга — найважнейшае заданне для Божых вучняў, асабліва ў святле таго, што мы чакаем Яго другога прыйсця, пасля якога адбудзецца суд (гл. Мц 25, 31–46). Гэта тэстамэнт Хрыста: «Новую запаведзь даю вам, каб вы любілі адзін аднаго. Як Я палюбіў вас, так і вы любіце адзін аднаго» (Ян 13, 34). Любоў Хрыста становіцца бачнаю праз дзейсную любоў Ягоных вучняў. Гэтая запаведзь па многіх прычынах можа называцца старою, бо звязаная з першым абвяшчэннем Евангелля (гл. 1 Ян 2, 7), але адначасова яна новая, бо ахвяра Езуса распачала новую эпоху, калі была створаная супольнасць, калісьці прадказаная прарокамі. Ён даў кожнаму духа, які фармуе ў чалавеку новае сэрца. У гэтым духу вымяраюцца абедзве запаведзі, бо менавіта хрысціянская супольнасць распаўсюджвае Хрыстовую любоў ў свеце.

*Любоў аддае*

Хрысціянская любоў не мінае. Бог аддаў свайго адзінароднага Сына дзеля ўсіх людзей, не зважаючы на іх заслугі ( гл. Цім 5, 6). У вучэнні святога Паўла і сінаптычных Евангеллях Божая любоў акрэсліваецца як непрамінальная, яна руйнуе ўсе грамадскія і расавыя бар'еры (гл. Гал 3, 28) і нікім не пагарджае (гл. Лк 7, 39; 14, 13). Нават больш за гэта — Хрыстус патрабуе, каб мы любілі сваіх ворагаў (гл. Мц 18, 21; 6, 12. 14). Любоў праяўляецца ў безумоўным прабачэнні (гл. Мц 18, 21; 6,12.14), у цярплівасці, у здольнасці адказваць дабром на зло (гл. Рым 12, 14–21; Эф 4, 25–5, 2). Сужэнская здольнасць бясконца аддаваць сябе адпавядае сэнсу ахвяры Хрыста за Касцёл (гл. Эф 5, 25–32). Для кожнага любоў азначае ўменне служыць адзін аднаму (гл. Гал 5, 13), калі чалавек адмаўляецца ад самога сябе разам з укрыжаваным Хрыстом (гл. Флп 2, 1–11). У гімне любові (гл. 1 Кар 13) святы Павел сцвярджае прыроду і веліч любові: не забываючыся пра свае штодзённыя патрэбы, яна застаецца цярплівою. Святы Павел падкрэслівае, што без любові ўсе астатняе страчвае сваю каштоўнасць, і толькі любоў здольная перанесці ўсё. Калі мы любім як Хрыстус, тады нам дадзена боская адвечная праўда. Касцёл пабудаваны на любові (гл. 1 Кар 8, 1; Эф 4, 16), і менавіта яна рыхтуе чалавека да прыйсця Хрыста (гл. Флп 1, 9).

*Любоў азначае еднасць*

Апостал Ян часта падкрэслівае, што еднасць Айца, Сына і Духа Святога пабудаваная на любові, і з яе вынікае любоў унутры хрысціянскай супольнасці. Братэрства хрысціянаў павінна ствараць супольнасць, у якой кожны робіць усё, што магчыма, дзеля любові і веры. Свет злых сілаў — гэта той свет, якога святы Ян раіць пазбягаць (гл. 1 Ян 2, 14). Хрысціянін любіць сваіх братоў дзейснаю сапраўднаю любоўю, што патрабуе ахвяры і смерці (гл. 1 Ян 3, 11–18), без якіх не можа ўзрасці сапраўдны плён (гл. Ян 12, 24). Дзякуючы такой любові вернік стварае супольнасць з Айцом і Сынам (гл. 1 Ян 4, 7 – 5, 4). Менавіта гэткаю была апошняя просьба Езуса падчас малітвы ў Вялікі чацвер:

«каб любоў, якою Ты палюбіў Мяне, у іх была, а Я ў іх» (Ян 17, 26). Братэрская любоў — ёю вучні жылі ў свеце, да якога яны не належалі (гл. Ян 17, 11. 15–26), — найвярнейшы знак таго, што Бог прысутны сярод іх, і адначасова гэта знак праўдзівасці місіі (гл. Ян 17, 21). Езус аргументуе запаведзь любові выразнымі словамі: «Па гэтым усе пазна́юць, што вы Мае вучні, калі будзеце мець любоў адзін да аднаго» (Ян 13, 35).

Такім чынам, абвяшчаць Новы Запавет азначае практыкаваць любоў у служэнні кожнаму чалавеку, і толькі такім чынам, і толькі гэта — найдасканалейшы спосаб абвяшчаць Евангелле, якое дае жыццё многім. Кожная супольнасць пакліканая перамагаць грэх з дапамогаю Хрыста і гэтак перамагаць таксама ўсе формы беднасці і грамадскай несправядлівасці, бо гэта адзіны спосаб утвараць еднасць, у чым і заключаецца асноўная задача Касцёла.

## ІНШЫЯ ФРАГМЕНТЫ З БІБЛІІ

Мы ўжо разгледзелі некалькі біблійных фрагментаў, у якіх падкрэсліваецца, што *Caritas* з’яўляецца асноваю хрысціянства. Нагадайма коратка пра некалькі фрагментаў, якія сведчаць, што паняцце *Caritas* прысутнічае ў словах Хрыста. Калі гэтыя фрагменты выключыць з Евангелляў і пакінуць толькі тыя, дзе Хрыстус абвяшчае сваё пасланне не словамі, а выключна справамі, то што застанецца ад Евангелляў?

Звярніце ўвагу на гэтыя евангельскія фрагменты: Мц 6, 1–14; Мц 7, 12; Мц 25, 31–36; Мк 10, 21; Мк 10, 43–45; Мк 12, 28–31; Лк 4, 16–21; Лк 6, 27–36; Лк 7, 22–23; Лк 10, 25–30; Лк 18, 18–22; Ян 13, 1–15.

Могуць быць карыснымі і іншыя фрагменты са Старога Запавету: Быц 18, 1–15; 24, 1–61; Лев 19, 11–18; 19, 33–34; Дрг 14, 22–29; 15, 1–11; 24, 8–22; Суд 19; Рут 2; Тоб 1, 10–22; 4, 7–12; Ёў 31, 1–34; Прып 3, 1–28; Сір 4, 1–10; 27, 30–28, 7; 29, 21–28; Зах 7, 1–14; Іс 25, 4; 41, 17; 49, 13; Ер 22, 13; Ам 2, 6–8; 5, 11–15.

Варта падкрэсліць важнасць наступных фрагментаў з Новага Запавету: Мц 5, 3–11; 6, 1–4; 10,1–9; 19, 16–26; 22, 34–40; 25,

31–46; Мк 6, 53–56; 10, 28–31; 10, 35–45; 10, 46–52; 14, 3–9; Лк 8, 1–3; 10, 25–37; 14, 12–14; 17, 7–10; 17, 11–19; 18, 15–17; 18, 18–30; 19, 1–10; 22, 24–28; Ян 12, 20–26; 13, 3–17; Дз 2, 42–47; 4, 32–37; 6, 1–7; Рым 5, 5; 12, 6–8; 15, 25–27; 1 Кар 12, 1–11; 2 Кар 8, 1–15; 9, 5; 9, 12–13; Гал 2, 8–10; 6, 6–10; Эф 4, 25–5, 2; Флп 4, 12–13; Ціт 3, 1–15; Гбр 13, 1–3; 1 П 4, 9–11; 1 Ян 2, 7–11; 4, 7–11; 4, 16. 21; Як 2, 1–9; 2, 14–17.

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

Гэтую частку рэкамендуецца праводзіць напачатку, адразу пасля малітвы (перад выкладаннем тэарэтычнай часткі).

**Мэта:** абагульніць словы Святога Пісання і зрабіць высновы.

**Сродкі:** карткі з заданнямі і пытаннямі, плакаты, каляровыя асадкі.

**Час:** каля адной гадзіны.

**Ход працы**

1. Трэнер некалькі разоў паўтарае апошняе пытанне малітвы: «Як вы лічыце, ці можна служыць Хрысту, не наследуючы Яго?», а пасля задае іншыя пытанні: «Каго мы наследуем? Якія словы Хрыста з’яўляюцца для нас узорам? Якія ўчынкі?»

2. Раздзяліце ўдзельнікаў на тры або на шэсць групаў (у залежнасці ад іх колькасці). Кожная група атрымлівае адну картку з пытаннем/заданнем. Каб выканаць заданне, групе даецца 30 хвілінаў.

3. Пасля працы ў групах удзельнікі павінны абмеркаваць з іншымі групамі высновы, якія яны зрабілі.

4. Напрыканцы трэнер падагульняе дыскусію наступнымі пытаннямі:

- Якое месца займае *Caritas* у Касцёле і ў асабістым жыцці кожнага хрысціяніна?
- Чым з’яўляецца *Caritas*: неістотным дадаткам або асноваю хрысціянства?

**Карткі**

1. Чаму нас вучыў Езус? Паразважайце над Евангеллем і ўзгадайце Яго вучэнне. Ці можаце вы ўзгадаць якія-небудзь цытаты з вучэння Хрыста? Ці можаце падагульніць іх і зрабіць высновы?

2. Што рабіў Езус? Паразважайце над Евангеллем і ўзгадайце Яго ўчынкі. Якія з іх вы найлепш запомнілі? Ці можаце зрабіць з іх важныя высновы?

3. Як жылі святыя — людзі, якія ажыццяўлялі вучэнне Езуса больш, чым хтосьці іншы? Ці можаце вы знайсці агульнае ў жыцці розных святых?

**Пытанні для дыскусіі**

Гэтыя пытанні трэба задаваць напрыканцы трэнінгу, каб натхніць удзельнікаў падумаць пра ўласную матывацыю праяўляць «міласэрную *Caritas*». Сродкі для трэнінгу і час могуць вызначацца самім трэнерам.

- Наколькі часта я кіруюся Бібліяй у сваім жыцці?
- Наколькі часта я кіруюся Бібліяй у сваёй дабрачыннай дзейнасці?
- Якія прыклады з Бібліі натхняюць мяне быць актыўным у «Карытасе»?
- Ці магу я знайсці асабісты «дэвіз» у Святым Пісанні?
- Ці дастаткова мая праца ў «Карытасе» адпавядае біблійным рэкамендацыям?

## *Заключэнне*

**Любоў да бліжняга і да людзей наогул** (*caritas*) з’яўляецца асноваю хрысціянства.

У Святым Пісанні шмат разоў падкрэсліваюцца ўчынкі і актыўныя праявы Божай любові. Напрыклад, **жыццё і дзейнасць Езуса Хрыста** ў Новым Запавеце паказваюць нам, як практыкаваць любоў у штодзённым жыцці.

# САЦЫЯЛЬНАЕ ВУЧЭННЕ КАСЦЁЛА

На наступным трэнінгу мы разгледзім некаторыя істотныя тэмы, якія датычаць Касцёла і сацыяльнага жыцця, грамадскай актыўнасці, значэння слова *caritas* і рэлігійнай асновы нашых учынкаў. У сваёй працы мы будзем, апроч іншага, абапірацца на энцыкліку папы Бэнэдыкта XVI «*Deus Caritas est*», што з’яўляецца асноўным дакументам, які неабходна ведаць, каб працаваць у структурах «Карытаса».

***Малітва***

*Пане, адкрый +[1] мае вусны, і яны будуць абвяшчаць*
*Тваю хвалу і знаходзіць добрыя словы.*
*Пане, адкрый + мае вочы, каб я бачыў прыгажосць*
*і бачыў людскія нястачы.*
*Пане, адкрый + мае вушы, каб я слухаў Тваё слова*
*і чуў усклíканні бедных.*
*Пане, адкрый + мой нос, каб я мог адчуваць*
*Твой прыемны водар і ўспрымаць любы пах.*
*Пане, адкрый + увесь мой твар, каб я жыў,*
*скіраваўшы яго да Цябе, і заставаўся адкрытым*
*для іншых.*
*Пане, адкрый + маё сэрца, каб я знайшоў там месца*
*для Цябе і для добрых пачуццяў у адносінах*
*да ўсіх людзей.*
*Пане, адкрый + мае рукі, каб я дакранаўся да паўнаты*
*жыцця і быў багатым у здольнасці аддаваць.*

Антон Ротцэтэр

Як хрысціяне, мы не можам заставацца ў ізаляцыі ад свету. Мы павінны быць чулымі да людзей, якія жывуць у патрэбе, таму нашыя органы пачуццяў заўжды павінны заставацца адкрытымі.

## ***Тэарэтычная частка***

### **ЧАМУ *CARITAS*?**

Падмуркам нашага жыцця з'яўляецца той факт, што Бог любіць нас, — «у тым выявілася любоў, што не мы палюбілі Бога, а Ён сам палюбіў нас» (1 Ян 4, 10), і што Божая любоў да нас стала бачнаю ў Езусе Хрысце. У гэтай гісторыі любові, расказанай

[1] + трэба жэстам рукі зрабіць маленькі знак крыжа на гэтай частцы цела.

у Бібліі, мы можам убачыць Бога; Ён зноў і зноў сустракае нас ва ўсіх мужчынах і жанчынах, якія адлюстроўваюць Ягоную прысутнасць, у Ягоным слове, у Ягоных сакрамэнтах і асабліва ў Эўхарыстыі. «Ён першы нас палюбіў і як першы працягвае любіць нас; таму мы таксама можам адказаць любоўю. Бог не загадвае нам мець пачуццё, якога мы не можам абудзіць у сабе. Ён любіць нас, Ён дазваляе нам бачыць і адчуваць Яго любоў, і таму, што Бог "першым" нас палюбіў, любоў можа нарадзіцца ў нас як адказ» (*Deus Caritas est*, 17).

Адказам на Божую любоў з'яўляецца нашая любоў, якая дзейнічае ў абодвух кірунках: «Я люблю ў Богу і з Богам іншага чалавека, якога ў дадзены момант, магчыма, нават і не ведаю або да якога не адчуваю сімпатыі. <...> Менавіта тады я вучуся глядзець на іншую асобу не толькі маімі вачыма і праз мае пачуцці, але таксама з пазіцыі Езуса Хрыста. Яго сябра — мой сябра (*DCE*, 18). Любоў да Бога нараджае любоў да бліжняга — да іншага чалавека. «Калі ў маім жыцці зусім няма кантакту з Богам, я заўсёды буду бачыць у іншым чалавеку толькі іншага і не змагу ўбачыць у ім вобраз Бога» (*DCE*, 18). Папа Бэнэдыкт XVI гаворыць, што гэты прынцып таксама працуе ў абодвух кірунках: «Толькі мая гатоўнасць выйсці насустрач бліжняму і паказаць яму сваю любоў робіць мяне ўражлівым таксама і на Бога. Толькі служэнне бліжняму адкрывае мне вочы на тое, што Бог робіць для мяне, і як Ён мяне любіць» (*DCE*, 18). «Такім чынам, любоў да Бога і любоў да бліжняга непадзельныя; яны з'яўляюцца адным наказам. Аднак абедзве гэтыя формы любові жывяцца любоўю, што паходзіць ад Бога, які першы нас палюбіў. Таму тут не ідзе гаворка пра "наказ" звонку, які патрабуе ад нас нечага немагчымага, але аб вопыце любові, дадзенай знутры, любові, якой, згодна з яе прыродаю, трэба дзяліцца з іншымі» (*DCE*, 18).

У другой частцы энцыклікі папа Бэнэдыкт XVI падкрэслівае важнасць *Caritas*, якая выяўляецца ў трайным прынцыпе:

а) Унутраная натура Касцёла выяўляецца ў трайным заданні: абвяшчэнне Божага слова (*kerygma-martyria*), цэлебрацыя

сакрамэнтаў (*leitourgia*), паслуга любові (*diakonia*). Гэтыя заданні цесна звязаныя паміж сабою і не могуць быць аддзеленыя адно ад другога. *Caritas* не з'яўляецца для Касцёла формаю сацыяльнай апекі, якую можна даручыць каму-небудзь іншаму, але належыць самой яго сутнасці, з'яўляецца неад'емным выяўленнем яго натуры.

б) Касцёл — гэта Божая сям'я ў свеце. У гэтай сям'і не павінна быць нікога, хто б цярпеў з прычыны недахопу самага неабходнага. Але ў той жа час *caritas-agape* выходзіць па-за межы Касцёла; прыпавесць пра добрага самараніна застаецца крытэрыем, які робіць любоў паўсюднаю, скіраванаю да кожнага церпячага, якога мы сустракаем «выпадкова» (пар. Лк 10, 31), кім бы ён ні быў (*DCE*, 25).

Такім чынам, папа Бэнэдыкт XVI дае адказ на нашыя пытанні пра важнасць *Caritas*.

**ДЗЕ ДАПАМАГАЦЬ?**

Карл Маркс назваў рэлігію «опіумам для народа». Згадваючы розныя перыяды чалавечай гісторыі, можна сказаць, што ў пэўным сэнсе ён меў рацыю. Хрысціянства ў сваёй «фанатычна-пабожнай» версіі, асабліва ў часы Сярэднявечча, сапраўды аддалілася ад сутнасці хрысціянскага паслання, цесна звязанага з гэтым светам. Гэты свет, хоць мы і чакаем іншай рэальнасці ў будучыні, з'яўляецца месцам, у якім мы жывём цяпер. Гэты свет — месца, у якім мы пакліканыя дзейнічаць і выконваць сваё хрысціянскае пакліканне. Робячы гэта, мы павінны разам з «прыладамі новай рэальнасці» выкарыстоўваць прылады гэтага свету.

Адзін святар распавядаў: «Нядаўна падчас споведзі я прызначыў жанчыне за пакуту зрабіць любы добры ўчынак. Падчас наступнай споведзі яна распавяла, як выканала пакуту: "Я некалькі разоў памалілася за ўсіх бедных людзей, якія жывуць побач з намі". Калі б я меў на ўвазе гэта, я б прызначыў ёй за пакуту менавіта малітву. Ці жыве яна ў гэтым свеце? Яе духоўнасць лунала недзе ў паветры, для яе вера сапраўды была падобнаю да

опіуму. Нават калі яна фізічна няздольная зрабіць нешта добрае, яна можа спрычыніцца да нейкага добрага ўчынку. Малітва — гэта толькі вішанька на крэмавым торце, апошняя літара ўчынку, ад якога яна ўцякла ў малітву і такім чынам мінімізавала каштоўнасць малітвы або нават цалкам абясцэніла яе».

З іншага боку, пытанне «Дзе дапамагаць?» вядзе нас да пытання пра бліжняга, якое становіцца асабліва вострым, калі Езус гаворыць пра найважнейшую з запаведзяў.

У сваёй энцыкліцы папа Бэнэдыкт XVI гаворыць пра навізну вучэння Езуса: «У той час паняцце *бліжні* адносілася пераважна да землякоў і іншаземцаў, якія пасяліліся на зямлі Ізраэля, іншымі словамі, датычыла салідарнай супольнасці гэтай краіны або народу. Цяпер гэтае абмежаванне скасаванае. Кожны, каму я патрэбны, і каму я магу дапамагчы, з'яўляецца маім бліжнім. Паняцце *бліжні* мае ўніверсальны характар, застаючыся, аднак, канкрэтным. Нягледзячы на яго пашырэнне на ўсіх людзей, яно не зводзіцца да праяўлення агульнай, абстрактнай і непатрабавальнай формы любові, але заклікае мяне да ўласнага актыўнага ўдзелу ў ёй тут і цяпер» (*DCE*, 15).

## КАЛІ ДАПАМАГАЦЬ?

Адзін з прынцыпаў працы каталіцкай арганізацыі скаўтаў — кожны дзень рабі адзін добры ўчынак. З аднаго боку, гэтыя словы гучаць вельмі прывабна, бо нагадваюць скаўтам пра дабрачыннасць і заахвочваюць іх рабіць учынкі любові да бліжніх. З іншага боку, прынцыпы працы скаўтаў здаюцца праблематычнымі. Чалавек сам павінен вырашаць, калі далучацца да дабрачыннасці і ці далучацца наогул, але гэта не вырашае чалавек, які знаходзіцца ў патрэбе. Напрыклад, у адной нашай парафіі скаўты прапанавалі дапамагчы разгрузіць машыны з гуманітарнай дапамогаю, але не ў той час, калі прыедуць грузавікі. Яны жадалі дапамагчы тады, калі будуць абмяркоўваць важнасць добрых учынкаў на сваёй сустрэчы, па сваім раскладзе. Часта здараецца, што дабрачыннасць скаўтаў або парафіяльнага «Карытаса» і іншых супольнасцяў залежыць ад іх раскладаў або праграмаў, а не

ад рэальных патрэбаў людзей. На жаль, як мы ўсе вельмі добра ведаем, сапраўдныя патрэбы не ўзнікаюць па раскладзе, хутчэй расклады павінны ўзнікаць адпаведна тэрміновым патрэбам.

Вучыць рабіць добрыя справы трэба асаблівым чынам. Скаўты са сваімі прынцыпамі арганізаваныя значна лепш, чым некаторыя парафіяльныя катэхетычныя класы, якія часам тэарэтызуюць наконт добрых учынкаў і вельмі абстрактна заахвочваюць вучняў рабіць дабро. Заахвочванне да добрых учынкаў павінна быць рэальным. Яны павінны быць адказам на канкрэтныя патрэбы і не залежаць ад нашага настрою або вольнага часу. Калі людзі ў патрэбе прыходзілі да Езуса, Ён прысвячаў ім час, перарываючы ўласны адпачынак, нягледзячы на тое, што вучыў сваіх паслядоўнікаў, што адпачываць і аднаўляць сілы неабходна: «Езус убачыў мноства людзей і змілаваўся над імі, бо яны былі як авечкі без пастыра, і пачаў іх многаму вучыць» (Мк 6, 34). Гэтак жа, як Езус даў рэвалюцыйна смелы адказ на пытанне «А хто мой бліжні?», Ён даў адказ на пытанне: «Калі я павінен дапамагаць у патрэбе?» — тады, калі яна ўзнікае.

Неабходна паразважаць і над наступным. Калі мераю маёй любові да бліжняга з'яўляецца любоў да мяне самога, і яна ж ёсць перадумоваю любові да іншых людзей, тады я мушу вымяраць сваю рэакцыю на нейкія цяжкасці з любоўю да сябе, са сваімі патрэбамі і патрэбамі дарагіх мне людзей. Раптоўная катастрофа, на якую неабходна зрэагаваць адразу, натуральным чынам адсуне мае ўласныя патрэбы ўбок. Гэты прынцып добра праілюстраваны ў Святым Пісанні: я выратую сваё дзіця і свайго вала, якія зваліліся ў калодзеж, нават у суботні дзень (гл. Лк 14, 5). Аднак мы можам без згрызотаў сумлення сказаць тым, хто звяртаецца да нас сярод ночы па «дапамогу» ў «тэрміновай» патрэбе: «Прыходзьце заўтра».

Дапамога «Карытаса» павінна прыходзіць своечасова. Нярэдка гэта азначае, што трэба «прадугледжваць» бяду і дзейнічаць да таго, як узнікне праблема. Чалавек здольны рабіць прагнозы. Калі ён дзейнічае, як падказваюць яму досвед і абставіны, ён можа прадугледзець, да якіх наступстваў прывядуць тыя ці ін-

шыя ўчынкі. Змяняючы сваю дзейнасць і дзейнасць грамадства, чалавек можа актыўна ўплываць на будучыню. Менавіта таму такую важную ролю адыгрываюць адукацыя і папярэджванне праблемаў. Гэтак «Карытас» не толькі вырашае праблемы, якія ўзнікаюць, але і стварае ўмовы, каб пазбегнуць гэтых праблемаў. Такі тып актыўнасці таксама дапамагае выправіць тое, што было цалкам знішчана.

**ШТО ТРЭБА РАБІЦЬ?**

«Убогіх заўсёды маеце пры сабе», — гаворыць Езус (Ян 12, 8). Ён атаясамлівае сябе з імі ў сваёй вядомай прыпавесці пра Апошні Суд (гл. Мц 25, 35–46). У пастырскай канстытуцыі Другога Ватыканскага Сабору «*Gaudium et spes*» («Радасць і надзея») асабліва падкрэсліваецца, што неабходна паважаць кожнага чалавека: «Кожны павінен без ніякага выключэння ставіцца да бліжняга як да сябе самога, перадусім маючы на ўвазе захаванне ягонага жыцця і сродкаў для таго, каб годна яго весці» (*GS,* 27, 1). «Асабліва ў наш час прыспешвае абавязак, каб мы станавіліся бліжнімі для кожнага без выключэння чалавека і актыўна служылі яму» (*GS,* 27, 2). У канстытуцыі пералічваюцца людзі, для якіх мы павінны быць бліжнімі: пакінуты ўсімі стары, рабочы-іншаземец, бежанец ці незаконнанароджанае дзіця, галодны чалавек (гл. *GS,* 27, 2). Гэта звязана з учынкамі, якія зневажаюць Стварыцеля. Асабліва гэта ўплывае на чалавека ў адзінстве яго фізічнага і духоўнага вымярэння і на грамадства, дзе жывуць людзі.

Ян Павел II у энцыкліцы «*Evangelium Vitae*» асабліва падкрэслівае неабходнасць аднавіць свой «энтузіязм у дабрачыннасці»: «Нагадвае пра гэта сам Хрыстус, жадаючы, каб мы Яго любілі ў братах, закранутых рознымі цярпеннямі: у галодных, прагнучых і іншаземцах, у голых, хворых, у вязнях… Тое, што мы чынім аднаму з іх, чынім самому Хрысту (пар. Мц 25, 31–46)» (Ян Павел II, *EV,* 43). Папа жадае, каб валанцёры працавалі ў цэнтрах кантролю натуральных родаў, кансультацыі па пытаннях сям'і і шлюбу, хоспісах, цэнтрах дапамогі наркаманам, псіхічна

хворым і г.д. Яны павінны служыць чалавечаму жыццю і абараняць яго (гл. Ян Павел II, *EV,* 88–89).

Як было адзначана, гэтая праца не павінна спыняцца па-за домам. У сваёй энцыкліцы «*Redemptoris misio*» Ян Павел II заклікае валанцёраў рупліва працаваць, не толькі дапамагаючы святарам, манахам і свецкім работнікам у місійных краінах, але і спрыяючы цэласнаму развіццю індывідуумаў і грамадства ў школах, медыцынскіх цэнтрах, дамах састарэлых і інвалідаў, цэнтрах даверу для жанчын (гл. Ян Павел II, *Redemptoris missio*, 60).

Вялікае значэнне маюць **гуманнасць і прафесіяналізм**.

Каб наблізіцца да іншых людзей, адчуць іх боль як свой уласны, мы павінны ўпэўніцца, што яны ўспрымуць нашую дапамогу не як прыніжэнне, а як братэрскую падтрымку (гл. *Tertio millennio adveniente*, 50).

Той, хто служыць, не павінен лічыць сябе вышэйшым за таго, каму служыць, у якой бы сітуацыі прыніжэння ён не знаходзіўся ў той момант.

«Глыбокі асабісты ўдзел у патрэбе і цярпенні іншага такім чынам становіцца асабістым дарам: каб дар не прыніжаў іншага, я павінен даваць яму не толькі тое, што з'яўляецца маёй уласнасцю, але і самога сябе, я павінен асабіста прысутнічаць у маім дары» (*DCE*, 34).

Дзейнічайце **незалежна ад партый і ідэалогій** (гл. *DCE*, 31) — у тым ліку і незалежна ад афіцыйнай палітыкі дзяржавы.

**Любоў даецца свабодна!** (гл. *DCE*, 31).

## ХТО ПАВІНЕН РАБІЦЬ ГЭТУЮ ПРАЦУ?

На заканчэнне давайце спытаемся ў сябе: хто павінен рабіць усю гэтую працу? Бэнэдыкт XVI падкрэслівае, што гэта абавязак кожнага хрысціяніна і кожнай хрысціянскай супольнасці: «Любоў да бліжняга, якая грунтуецца на любові да Бога, з'яўляецца, перш за ўсё, абавязкам кожнага вернікага, а таксама абавязкам усёй касцёльнай супольнасці на кожным яе ўзроўні: ад мясцовай супольнасці праз мясцовы Касцёл аж да паўсюднага Касцёла ў яго глабальным вымярэнні. Касцёл як супольнасць абавязаны

практыкаваць любоў. З гэтага вынікае, што любоў павінна быць арганізаванаю, каб упарадкаваным чынам служыць супольнасці» (*DCE*, 20).

«Згодна з біскупскай структурай Касцёла, біскупы, як пераемнікі Апосталаў, першыя адказваюць у кожным мясцовым Касцёле за выкананне праграмы, акрэсленай у Дзеях Апосталаў (пар. Дз 2, 42–44)» (*DCE*, 20).

Неабходна працытаваць яшчэ адну думку Папы: «Ужо з папярэдніх разважанняў стала бачна, што сапраўдным суб'ектам розных каталіцкіх арганізацый, якія займаюцца дабрачыннай дзейнасцю, з'яўляецца сам Касцёл — пры гэтым на ўсіх узроўнях, пачынаючы ад парафіі, праз мясцовыя Касцёлы аж да паўсюднага Касцёла» (*DCE* 32).

Ва ўсім, што мы робім, мы ніколі не павінны заставацца толькі арганізацыяй, рухам, супольнасцю, асацыяцыяй…

**Мы з'яўляемся Касцёлам і пакліканыя да ўсіх людзей, асабліва да тых, хто перажывае няшчасце або знаходзіцца ў патрэбе, каб паказаць ім поўны любові матчын твар Касцёла!**

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

**Мэта:** праверыць, ці збалансаваныя ў нашай супольнасці абвяшчэнне (катэхізацыя), праслаўленне (літургія) і *caritas.*
**Сродкі:** карткі.
**Час:** 45–60 хвілінаў.

**Ход працы**

1. Раздзяліце ўдзельнікаў на маленькія групы (у залежнасці ад іх колькасці) або раздзяліце па парафіях, да якіх яны належаць.

2. Дайце кожнай групе картку і 30 хвілінаў для падрыхтоўкі.

3. Няма патрэбы рабіць асобную прэзентацыю. Напрыканцы трэнінгу можна проста арганізаваць дыскусію з дапамогаю наступных пытанняў:

- Ці ў вашай парафіі/дыяцэзіі існуе гармонія паміж абвяшчэннем, праслаўленнем і *caritas*? Калі так, ці можаце прывесці некалькі прыкладаў? Калі не, то як гэта можна выправіць?
- Ці здольныя вы як супрацоўнікі «Карытаса» адказваць на рэальныя патрэбы тут і цяпер?
- Ці дастаткова добра мы разумеем сутнасць *caritas*? Ці бачым мы «Карытас» у першую чаргу як гуманітарную арганізацыю або як нешта іншае?

**Картка**

| | АБВЯШЧЭННЕ | ПРАСЛАЎЛЕННЕ | CARITAS |
|---|---|---|---|
| Якім чынам праяўляецца вашая актыўнасць, у якіх дзеяннях? | | | |
| Як часта? | | | |
| Колькі людзей павінна ўдзельнічаць у дапамозе? | | | |
| Ці плануецца гэта загадзя? | | | |

Сацыяльнае вучэнне Каталіцкага Касцёла часта падкрэслівае **фундаментальную ролю ўчынкаў** у пашырэнні сапраўднай *caritas*, гэта значыць Божай любові.

*Caritas* з’яўляецца **адным з трох «слупоў», на якія абапіраецца жыццё кожнай парафіяльнай супольнасці,** гэтак жа, як літургія і катэхізацыя. Такая пазіцыя дэтальна тлумачыцца ў энцыкліцы «*Deus Caritas est*».

# *CARITAS IN VERITATE*

Сацыяльнае вучэнне Касцёла (СВК) — гэта збор прынцыпаў, дырэктываў і ўказанняў, якімі Касцёл кіруецца ў сацыяльных справах. Самыя значныя сацыяльныя энцыклікі — «*Rerum novarum*» (1891), «*Quadragesimo anno*» (1931), «*Mater et magistra*» (1961), «*Pacem in terris*» (1963), «*Populorum progressio*» (1967), «*Laborem exercens*» (1981), «*Sollicitudo rei socialis*» (1987) і «*Centesimus annus*» (1991).

Энцыкліка «*Caritas in veritate*» — гэта вельмі важны дакумент, але калі ім не натхняюцца асобныя людзі і групы людзей, ён застаецца проста мёртвымі літарамі на паперы. Погляды папы Бэнэдыкта XVI добрыя, фундаментальныя, моцныя, але трэба ўсведамляць, што гэта толькі погляды, якія не будуць ажыццяўляцца і мець практычную карысць, калі не змогуць уплываць на палітычныя і эканамічныя сферы, якіх не можа замяніць энцыкліка.

Закон Майсея будуецца на любові. Два прынцыпы СВК — справядлівасць і агульнае дабро (*iustitia*, *bonum commune*). Агульнае дабро ў сусветным грамадстве датычыць усёй вялікай чалавечай сям'і. Папа адзначае, што любоў з'яўляецца асноўным рухавіком сацыяльнага вучэння Касцёла, «*Caritas in veritate in re sociali*». Мае сэнс дзейнічаць адпаведна яго бачанню сітуацыі, якое вядзе да будавання «Божага горада» і дазваляе пазбегнуць узнікнення праблемаў.

### *Малітва*

*Калі я гавару мовамі людзей і анёлаў, а любові не маю, я — як медзь звонкая або гулкія цымбалы.*

*Калі маю дар прароцтва і спазнаў усе таямніцы, і маю ўсякія веды і паўнату веры, каб перастаўляць горы, а любові не маю, то я — нішто.*

*Калі раздам усю маёмасць сваю і аддам цела сваё на спаленне, а любові не маю, няма мне з гэтага ніякай карысці.*

*Любоў доўгацярплівая, любоў ласкавая, не зайздросціць, любоў не пыхлівая, не ганарыцца, не бессаромная, не шукае свайго, не гневаецца, не памятае зла, не радуецца несправядлівасці, але радуецца разам з праўдай. Усё зносіць, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё церпіць.*

*Любоў ніколі не мінае. Не так як прароцтвы, якія спыняцца, ці мовы, якія змоўкнуць, ці веды, якія скончацца. Бо мы часткова пазнаем і часткова прарочым, а калі настане дасканалае, тады тое, што частковае, знікне. Калі я быў дзіцём, то як дзіця гаварыў, як дзіця думаў, як дзіця разважаў; а калі стаў мужчынам, то пакінуў дзіцячае. Бо цяпер мы бачым праз люстэрка, цьмяна, а тады — тварам у твар. Цяпер я ведаю часткова, тады ж спазнаю так, як і я спазнаны.*

*А цяпер трываюць вера, надзея і любоў — гэтыя тры, але найбольшая з іх любоў.*

(1 Кар 13, 1–13)

### *Тэарэтычная частка*

Любоў (*caritas*) ідзе ад Бога, які сам ёсць вечнаю Любоўю і абсалютнаю Праўдаю (*Agape in Logos*). Езус робіць чыстымі нашыя пошукі праўды і любові. Калі ж мы спрабуем знайсці шчасце,

замяшчаючы гэтую любоў, узнікаюць залежнасці. «Любоў ззяе, і мы можам пражыць яе па-сапраўднаму толькі ў праўдзе». Любоў мусіць спалучацца з праўдаю. **Хрысціянства, якое прапаведуе любоў без праўды, будзе абмяжоўвацца толькі легкаважкімі мілымі пачуццямі, сентыментальнасцю і «наборам» вераванняў.** Гэта ўжо блізка да тэорыі фідэізму[2]. Эмоцыі патрэбныя для сацыяльнай гармоніі, але яны не павінны адыгрываць кіраўнічую ролю.

Сведчаннем праўды з'яўляецца любоў (гл. 1 Кар, 6). Бог — гэта праўда (гл. Ян 14, 6). Праўда і любоў — гэта аблічча Езуса Хрыста. Езус Хрыстус «хаваецца» ў любові! Тады любоў і праўда становяцца нечым вельмі асаблівым, яны ўцелаўляюцца.

Любоў Божая большая за справядлівасць, і ў той жа час яна не існуе без справядлівасці. «Я не магу "прапанаваць" нікому таго, што маё, у той жа час не даючы яму таго, што належыць яму па справядлівасці». «Справядлівасць — гэта першая сцежка любові або, як гаварыў папа Павел VI, яе ніжэйшая ступень (мінімум)». «З іншага боку, — як гаварыў св. Ян Павел II, — любоў перавышае і дапаўняе яе логікаю дару і прабачэння».

«Горад людзей» не можа быць пабудаваны толькі на адносінах закону і абавязках, для гэтага неабходныя адносіны, у якіх ёсць дабравольнае адданне, міласэрнасць і еднасць. Для развіцця патрэбная праўда, як гаворыць Папа, без праўды функцыянаванне соцыума стане «цацкаю» асабістай выгады і будзе кіраваць логіка ўлады, якая вынішчае грамадства.

Калі мы імкнемся да ўсебаковага грамадскага развіцця, нам неабходная евангелізацыя. СВК з'яўляецца неад'емнаю часткаю евангелізацыі! Езус Хрыстус, які любіць нас, блізкі сэрцу кожнага чалавека!

---

[2] Фідэізм — эпістэміялагічная тэорыя, якая сцвярджае, што вера не залежыць ад розуму, што розум і вера з'яўляюцца варожымі паняццямі, і вера стаіць вышэй за асобныя праўды (гл. *натуральная тэалогія*). Слова «*фідэізм*» паходзіць ад лацінскага «*fides*», што азначае «вера».

«СВК з'яўляецца аб'яўленнем і сведчаннем Касцёла <...> Гэта прылада і абавязковы шлях для ўзрастання веры».

Касцёл цікавіцца пытаннямі развіцця, бо яны звязаныя не толькі з тэхнічнымі справамі, але і з пошукамі сэнсу, галоўнай мэты жыцця. Чалавек сам не здольны вызначыць гэтую мэту. «Сапраўдны гуманізм — толькі той, хто адкрывае сябе Абсалюту як удзячнасць за пакліканне, што дае нам правільнае разуменне чалавечага жыцця» (гл. Павел VI, *Populorum progressio*, 42).

Месіянствы[3], якія базуюцца на адмаўленні трансцэндэнтнага вымярэння развіцця, шмат абяцаюць, але гэта падманны рух, які вядзе людзей да няволі і робіць іх сродкамі для дасягнення мэты.

Прагнае імкненне да выгады вядзе да рассейвання дабротаў і спараджае беднасць. Гонка за ўласным узбагачэннем, нават коштам падаражання прадукцыі, нежаданне думаць пра агульнае дабро знішчаюць багацце і вядуць да беднасці. Эканамічнае развіццё павінна весці да рэальнага росту дабрабыту, устойлівага і даступнага кожнаму. Бэнэдыкт XVI запрашае нас паразважаць пра новы гуманістычны сінтэз. Ён пачынае з таго, што развіццё сёння з'яўляецца поліцэнтрычным паняццем; чалавек, інтэгральнасць яго асобы, з'яўляецца асноўным капіталам, які трэба берагчы і развіваць; павага да чалавечага жыцця не павінна аддзяляцца ад развіцця нацый; развіццё вельмі цесна звязанае з павагаю да рэлігійнай свабоды і заўсёды спалучаецца з забяспечанасцю працаю і самім правам на працу.

Чаму існуе эканамічная адсталасць? Лінія падзелу паміж багатымі і беднымі краінамі ўжо не настолькі яўная, як у часы Паўла VI. Нават у багатых краінах усё больш і больш сацыяльных групаў жыве ў беднасці. «Так, агульнае багацце свету ўзрастае, але няроўнасць таксама павялічваецца» (гл. Ян Павел II, *Sollicitudo rei socialis, 28*). «Сорам раскошы»: з аднаго боку, існуе вялізнае растрачванне багацця, а з іншага — беднасць, якая дэгуманізуе грамадства. Папа гаворыць, што абарона ведаў занад-

[3] Месіянства — рэлігійнае вераванне ў прыйсце Месіі, які вызваліць людзей ад граху і ўсталюе Божае Валадарства на зямлі.

та абмяжоўвае нас. Багатыя краіны абараняюць сваю інтэлектуальную ўласнасць, але ёсць бедныя краіны, якім для развіцця вельмі неабходныя гэтыя веды. Існуе таксама праблема вялізных мытных збораў, новых формаў каланіялізму і ненадзейных лідараў у некаторых краінах.

У існаванні двух супрацьлеглых блокаў папа Ян Павел II бачыў адну з галоўных прычынаў нізкага ўзроўню развіцця. Палітыка распараджалася эканамічнымі і культурнымі рэсурсамі, ідэалогія абмяжоўвала свабоду. Сёння раздзяленне паміж Усходам і Захадам знікла, а беднасць — не. «Але тыя, хто лічыць, што рыначная эканоміка як сістэма патрабуе пэўнай беднасці і адсталасці, каб добра функцыянаваць, памыляюцца». Чаму столькім Лазарам забараняецца сесці за стол з багацеямі? Гэта звязана з пытаннямі міру і стабільнасці на планеце. Бэнэдыкт XVI падкрэсліваў, што мы павінны ўсебакова перагледзець праблему развіцця грамадства пасля падзення камунізму, калі свет ужо не падзелены на два блокі.

Існуюць і добрыя, і дрэнныя аспекты працоўнай мабільнасці. Абмен культураў — станоўчы аспект. Негатыўныя — гэта няпэўнасць працоўных умоваў, псіхалагічная нестабільнасць, павелічэнне цяжкасцяў пры стварэнні сям'і, усё большая нястача ў грамадстве. Беспрацоўе нішчыць чалавечую свабоду і здольнасць ствараць, адмоўна ўплывае на сямейнае жыццё і грамадства ў цэлым. Асноўны капітал, які трэба берагчы і павялічваць, — гэта бясцэннасць чалавека, асобы ў яе цэласнасці.

Інтэркультурны дыялог не эфектыўны, калі суразмоўцы не ўсведамляюць уласнай ідэнтычнасці. Культурная эклектыка, якая выклікае рэлігійны і маральны рэлятывізм, не спрыяе сапраўднаму культурнаму дыялогу, а вядзе да павярхоўнасці ў засваенні культуры.

Дар і дабравольнае ахвяраванне перавышаюць законы справядлівасці. Гэта не азначае, што логіка дару выключае справядлівасць, яна перавышае яе! Прамысловы погляд на жыццё і пошук адной толькі выгады вядуць да таго, што мы больш не цэнім ахвяравання і дару. Сапраўдныя чалавечыя адносіны,

сяброўства і камунікабельнасць, салідарнасць і ўзаемнасць таксама неабходныя, каб стымуляваць эканамічную актыўнасць. Нават у эканоміцы неабходна браць пад увагу прынцыпы пераразмеркавання і салідарнасці, логіку дару, каб нешта аддаваць дабравольна, у тым ліку і абмяжоўваючы прыбыткі. Братэрская ўзаемнасць павінна існаваць ва ўсіх магчымых праявах. Дабравольны дар або ўчынкі з'яўляюцца не толькі дадаткам да справядлівасці. Імкненне даваць нешта дабравольна — гэта аснова для стварэння больш гуманнага свету, дзе прагрэс адных не становіцца перашкодаю для развіцця іншых.

Сама па сабе глабалізацыя не з'ўляецца ні дабром, ні злом. Не варта супраціўляцца ёй ва ўсім, бо яна дае шмат магчымасцяў для развіцця. Глабалізацыя — гэта рэальнасць чалавецтва, яе трэба выкарыстаць. Дзякуючы глабалізацыі можа ўзрастаць братэрства, але ў той жа час у свеце можа павялічыцца беднасць і ўзнікнуць новыя канфлікты. Гэта залежыць ад нас, у тым ліку і ад дзяржавы, заканадаўчай і адміністрацыйнай сістэмы, а таксама ад культуры, дабрабыту і рэлігій.

«Кампаніі з грамадскай адказнасцю», кіраўнічыя кампаніі павінны не толькі прыносіць карысць уладальнікам, але і клапаціцца пра ўсіх, хто спрыяе росту кампаніі: служачых, кліентаў, забеспячэнцаў, супольнасці людзей, якія залежаць ад іх, бо, напрыклад, пераарыентаванне на замежны капітал можа пашкодзіць мясцовым грамадзянам. Інвестыцыі з'яўляюцца не толькі тэхнічнаю, але і этычнаю справаю.

## ***Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі***

Якім чынам «Карытас» на практыцы супрацьстаіць несправядлівасці, эндэмічным хваробам, голаду, непісьменнасці і сучаснаму эканамічнаму крызісу? Ці з'яўляецца «любоў», якую дае «Карытас», эфектыўнаю ці яна ніяк не звязаная з выклікамі сучаснага свету?

Адсталасць у развіцці грамадства мае не толькі фінансавы характар. У асноўным яна выкліканая нежаданнем спрыяць агульнаму дабру і недахопам братэрскага духу паміж народамі і нацыямі. Ці спрыяе «Карытас» развіццю братэрскага духу паміж народамі? Што мы можам дзеля гэтага зрабіць?

Асноваю СВК з'яўляецца Евангелле, таму мы павінны звязваць Евангелле з канкрэтнаю сітуацыяй! Без гэтага асноўнага прынцыпу мы трапляем пад пагрозу ператварыць Евангелле ў сродак для дасягнення пэўных мэтаў (збаўлення) і ў выніку трапіць у пастку марксісцкай ідэалогіі... Насамрэч мы павінны шукаць праўды, спалучаць палітыку і мараль, задаваць сабе пытанні аб тым, што такое дэмакратыя і што ёй шкодзіць. Трэба весці няспынны дыялог, няспынны пошук сэнсу. Ці гатовы «Карытас» да гэтага дыялогу? Як нам падрыхтаваць да гэтага дыялогу людзей?

Апроч эканамічнага крызісу і распаўсюджання інфекцый, назіраецца пандэмія дэпрэсій і суіцыдаў, а таксама небывалы рост псіхічных хваробаў. Здаецца, што мы можам працаваць толькі для «загашэння» гэтых пажараў, і мы не задаем сабе пытанняў пра тое, што выклікала гэтую сітуацыю і што трэба рабіць на ўзроўні сістэмы. Які наш досвед у гэтай галіне?

Няпраўда, што больш няма вялікіх ідэалогій! «Нейтральнасць», этычны плюралізм, рэлігійны плюралізм і рэлятывізм — гэта вялікія ідэалогіі ў сусветным маштабе. Яны нашмат больш стрыманыя, чым было ў мінулым, і створаныя для таго, каб «браць пад увагу чалавечую свабоду». Але факт надання абсалютнай улады тэхнічным сродкам, прызнанне найбольшага прыярытэту за вытворчасцю і продажамі — гэта сапраўды ідэалогія, і яна не залежыць ад таго, які менавіта прадукт вытворчасці. Усё, што мае значэнне, — гэта мэта, каб прадукт прадаваўся і прыносіў прыбытак. Да якой ступені людзі ўсё яшчэ свабодныя, калі падсвядома наш розум перапоўнены патокам рэкламы?

Якім чынам «Карытас» з'яўляецца індыкатарам і крытыкам ідэалогій? Ці рэальна дапамагчы людзям, якія апынуліся ў нястачы па віне гэтых ідэалогій, і адначасова крытыкаваць іх? Як мы можам вучыць свабодзе грамадзянаў сучаснага свету?

Які наш досвед у пошуку «новага гуманістычнага сінтэзу» — адказаў, якія не толькі вырашаюць праблемы, што ўжо існуюць, але і станоўча ўплываюць на сучаснасць і будучыню чалавецтва?

З аднаго боку, мы становімся сведкамі таго, як дзейнічае сістэма «суровага закону», а з іншага — права на жыццё знаходзіцца пад вялікаю пагрозаю. Некаторыя правы, як, напрыклад, доступ да ежы і вады, маюць вялікую важнасць і з'яўляюцца ўніверсальнымі, бо гарантуюць права на жыццё. Як прыцягнуць увагу да супярэчлівасці такой палітыкі, калі нехта бясконца гаворыць аб правах чалавека і адначасова дазваляе парушаць гэтыя правы?

Нягледзячы на цяперашні крызіс, мы не павінны ўпадаць у роспач. Мы не павінны страчваць надзею, давер і рэалізм. Развіццё магчымае! Свету патрэбна глыбокае культурнае аднаўленне і адкрыццё фундаментальных каштоўнасцяў.

Як мы можам разам працаваць у планаванні новых шляхоў, правілаў і абавязкаў?

# КАТОЛІК І ГРАМАДСКАЕ ЖЫЦЦЁ

На гэтых занятках пазнаёмімся з асноўнымі прынцыпамі сацыяльнага вучэння Касцёла і акрэслім пазіцыю Касцёла адносна некаторых грамадскіх пытанняў. Заахвочваем удзельнікаў трэнінгу актыўна ўдзельнічаць у грамадскім і палітычным жыцці.

***Малітва***

*Сапраўды, годна гэта і справядліва, слушна і збавенна,*
*каб мы заўсёды і ўсюды падзяку Табе складалі,*
*Пане, Святы Ойча, міласэрны і верны Божа.*
*Ты даў нам Твайго Сына Езуса Хрыста*
*як Пана і Адкупіцеля.*
*Ён заўсёды атуляе сваёй міласэрнасцю малых і ўбогіх,*
*хворых і грэшнікаў*
*і набліжае да сябе прыгнечаных і гаротных.*
*Ён сваім вучэннем і крыжовай смерцю абвясціў свету,*
*што Ты — Айцец наш і клапоцішся*
*пра ўсіх дзяцей Тваіх.*
*Таму і мы з усімі анёламі і святымі*
*хвалім і благаслаўляем Цябе,*
*і спяваем Табе гімн праслаўлення,*
*няспынна ўсклікаючы:*
*Святы, Святы, Святы,*
*Пан Бог усемагутны,*
*Неба і зямля поўныя хвалы Тваёй.*
*Гасанна на вышынях.*
*Благаслаўлёны Той, хто прыходзіць у імя Пана.*
*Гасанна на вышынях.*

(гл. Рымскі Імшыл для дыяцэзій на Беларусі,
IV эўхарыстычная малітва ў розных патрэбах.
Езус ідзе, робячы дабро)

Жыццё каталіка павінна быць звернутым да праблемаў супольнасці, у якой ён (або яна) жыве. Гэтая малітва дае нам практычныя прыклады грамадскіх праблемаў: бедныя, бездапаможныя, хворыя, грэшнікі, прыніжаныя. Любоў, якую мы павінны праяўляць да іх і перадаваць ім, — гэта тая любоў, з якою бацька клапоціцца пра сваіх дзяцей.

## *Тэарэтычная частка з практычнымі дадаткамі*

## САЦЫЯЛЬНАЕ ВУЧЭННЕ КАСЦЁЛА

Пасля выдання энцыклікі папы Льва XIII «*Rerum novarum*» Каталіцкі Касцёл часта сутыкаўся з пытаннямі, якія датычаць чалавечага жыцця ў грамадстве і дзяржаве. Папскія энцыклікі часта прысвячаюцца такім тэмам, як адносіны паміж living рознымі грамадскімі групамі (сацыяльныя класы, якія змагаюцца за свае правы, сіндыкаты, палітычныя партыі); палітычнае і эканамічнае жыццё; пытанням пра тое, у якой дзяржаве павінны жыць працаўнікі і іх сем'і, на чым павінны будавацца грамадства і дзяржава; праблемам міру і гонцы ўзбраенняў, агульнаму развіццю, міжнародным адносінам і пазыкам. Гэта адыграла важную ролю падчас Другога Ватыканскага Сабору; па змесце энцыклікі вядуцца дыскусіі на тэалагічных факультэтах, і яны становяцца нормаю жыцця Касцёла. Гэта адбываецца таму, што сацыяльнае вучэнне Касцёла з'яўляецца адной з найважнейшых частак хрысціянскага светапогляду, і таму, што грамадскае жыццё з'яўляецца істотнаю часткаю чалавечага жыцця. Умовы, у якіх жыве канкрэтны чалавек у канкрэтным грамадстве, істотна ўплываюць на якасць яго жыцця і заўжды датычаць пытання чалавечай годнасці.

Леў XIII быў не першым, хто займаўся пытаннямі сацыяльнага вучэння Касцёла. І да яго многія тэолагі былі зацікаўленыя надзённымі вострымі праблемамі грамадскага і палітычнага жыцця. Напрыклад, праблема багацця і беднасці (так званае грамадскае пытанне) стаяла перад хрысціянамі ўжо ў першыя стагоддзі нашай гісторыі. Пазней праблема вайны і міру стала нават больш надзённаю, гэтак жа, як і пытанне грашовых пазыкаў пад працэнты. У часы канкістадораў і каланізатараў узнікла праблема правамернасці заваёўвання новых тэрыторый (абаронцы маралі мусілі ставіць пытанне аб чалавечай годнасці тубыльцаў, калі многія гаварылі, што мясцовыя плямёны наогул не з'яўляюцца людзьмі). Гэтыя і многія іншыя прыклады сведчаць пра тое, што тэолагі займаюцца праблемамі грамадства і адносінаў у ім.

## ПРАВАВЫЯ АСНОВЫ САЦЫЯЛЬНАГА ВУЧЭННЯ КАСЦЁЛА

Многія людзі, асабліва па-за Касцёлам, пытаюць, якое права мае Касцёл выказвацца па праблемах эканомікі, грамадскага рэгулявання і палітыкі. Ці мае права кіраўніцтва Касцёла — кіраўніцтва сусветнай рэлігійнай супольнасці — умешвацца ў сферы выключна секулярныя там, дзе хрысціяне часта сутыкаюцца з прадстаўнікамі іншых рэлігій або атэістамі? Або, іншымі словамі, на што павінны абапірацца Рады, Папы, біскупы і іншыя чальцы Касцёла, калі сведчаць пра свае прынцыпы ў разуменні грамадскага жыцця?

**Розныя людзі заўжды трымаюцца ўласных прынцыпаў у эканамічных, грамадскіх і палітычных пытаннях, і іх мараль выяўляецца ў іх учынках і ўзаемаадносінах.** Чалавечыя адносіны могуць быць справядлівыя і несправядлівыя: можна ставіцца адзін да аднаго як браты і сёстры або як гаспадары і нявольнікі. Адносіны ў грамадстве, у сям'і, у бізнесе, у міжнародных стасунках заўжды з'яўляюцца адносінамі маралі. У эканоміцы і палітыцы гаворка ідзе не толькі пра ўласна эканамічныя праблемы, а таксама і пра этычныя, бо яны заўжды звязаныя з пытаннямі справядлівасці і любові.

Кіраўніцтва Касцёла асноўвае свае погляды на:

– вучэнні Бібліі (Мц 5, 1–7, 29; Ян 8, 2–11; Мц 19, 9–30);

– натуральным законе (гэта закон, заснаваны на ведах аб справядлівых чалавечых адносінах, якія мы здабываем з чыстых інтэлектуальных развагаў пра чалавека і яго годнасць — напрыклад, адносінаў да жыцця, вайны, медыцынскіх эксперыментаў і г.д.);

– традыцыі.

## МЕЖЫ САЦЫЯЛЬНАГА ВУЧЭННЯ КАСЦЁЛА

Ва ўсіх праявах эканамічнай, палітычнай, адукацыйнай і культурнай дзейнасці мы сутыкаемся са складанымі шматбаковымі пытаннямі, у якіх асаблівым чынам спалучаюцца два аспекты:

– прафесійны аспект;

– маральны аспект.

У некаторых парафіях валанцёры і супрацоўнікі «Карытаса» дыскутуюць наконт ролі Касцёла ў вырашэнні справаў у іх краіне. Цікавымі могуць быць майстар-класы або дэбаты ў вашым парафіяльным «Карытасе» на тэму, якая горача абмяркоўваецца ў супольнасці. Зусім не складана знайсці такія шматбаковыя пытанні ў вашым асяроддзі і паспрабаваць разам абмеркаваць іх прафесійныя і маральныя аспекты (напрыклад, можа адбыцца дыскусія адносна святкавання нядзелі, у якой будуць закранутыя эканамічныя і маральныя пытанні).

## САЦЫЯЛЬНАЕ ВУЧЭННЕ КАСЦЁЛА І ПАЛІТЫКА

Спачатку давайце разгледзім, што такое насамрэч палітыка, бо ўжыванне гэтага тэрміна ў розных кантэкстах прывяло да тэрміналагічнай блытаніны. Для многіх людзей палітыка асацыюецца з хлуснёю, брудам і дэмагогіяй, хаця насамрэч гэта паталогія ў палітыцы. Наадварот, тэрмін «палітыка» мае станоўчае значэнне, калі ў шырокім сэнсе слова ён азначае клопат пра агульны дабрабыт, абарону справядлівасці і чалавечых правоў, знішчэнне карупцыі і спыненне прыніжэнняў чалавека. У гэтым сэнсе палітыка сапраўды з'яўляецца справаю Касцёла, у тым ліку біскупаў і прэзбітараў. З гэтага пункту гледжання Касцёл павінен займацца палітычнымі справамі. У вузкім сэнсе слова «палітыка» азначае дзейнасць у галіне кіравання і грамадскіх зменаў. Гэтым займаюцца палітычныя партыі, і гэта не датычыць Касцёла ў цэлым, а толькі адной яго часткі — свецкіх вернікаў.

Заўсёды можна выказвацца за розныя эканамічныя і іншыя сацыяльныя вырашэнні праблемаў. Трымаючыся прынцыпаў хрысціянскай маралі, варта звяртаць увагу на навуковыя дадзеныя і асабісты досвед розных людзей, бо такім чынам можна выкарыстаць розныя магчымасці. Хрысціянскае сацыяльнае вучэнне дазваляе розныя практычныя вырашэнні праблемаў і такім чынам з'яўляецца абгрунтавана плюралістычным. Таму ніводная палітычная партыя не можа манапалізаваць сацыяльнае вучэнне Касцёла. Падсумоўваючы, скажам, што маральныя

прынцыпы застаюцца нязменнымі, але апроч іх трэба прымаць правільныя і эфектыўныя меры ў вырашэнні праблемаў. Гэта можа прыводзіць да адрозненняў і, адпаведна, да разнастайнасці палітычных праграмаў розных партый, якія засяроджваюцца на правільных маральных каштоўнасцях.

Вядома, разнастайнасць палітычных поглядаў сярод хрысціянаў не можа быць абсалютнаю. Калі мы сутыкаемся з такімі праблемамі, як, напрыклад, аборты, разводы, знявага чалавечай годнасці, калі пад пагрозаю знаходзяцца фундаментальныя каштоўнасці, хрысціяне павінны аб’яднацца, незалежна ад іх палітычных сімпатый. Свая праграма, каштоўнасці і лад жыцця ў асобных палітычных партыях і іх лідараў таксама павінны адпавядаць сацыяльнаму вучэнню Касцёла. Напрыклад, некаторыя партыі прытрымліваюцца ліберальнай або калектывісцкай пазіцыі[4], ідэалогій, якія парушаюць чалавечыя правы і не адпавядаюць вучэнню Касцёла. Маральныя прынцыпы пабуджаюць хрысціянаў трымацца далей ад гэтых палітычных партый, а далучацца да тых, якія падтрымліваюць агульныя з Касцёлам каштоўнасці. У грамадстве дэмакратычнага ладу звычайна бывае некалькі такіх партый.

Святарам не рэкамендуецца палітычная актыўнасць. Чаму? Бо гэтую ролю выконваюць свецкія людзі.

## ХРЫСЦІЯНІН І ПАЛІТЫКА

Тое, што вышэй гаварылася пра Касцёл, датычыць кожнага асобнага хрысціяніна і хрысціянкі. Хрысціяне павінны адказваць на выклікі грамадства і, хоць не кожны можа прымаць рашэнні аб супакоі ў свеце, але мы можам уплываць на мноства

[4] Калектывізм сцвярджае, што асоба не мае значэння і мусіць падпарадкоўвацца законам масы. Напрыклад, да гэтай мэты ішло камуністычнае грамадства. Асоба павінна ахвяроўваць сабою дзеля мэты або ёю ахвяруюць іншыя. Лібералізм сцвярджае, што ў грамадстве няма агульных маральных каштоўнасцяў або агульнай мэты чалавечага жыцця і дзейнасці. Рынкавы лібералізм дазваляе ўсё. Кожны чалавек сам за сябе — сацыяльны дзяржаўны лад адмаўляецца.

сацыяльных, эканамічных і палітычных рашэнняў. Напрыклад, такім чынам:

– прымаць актыўны ўдзел у працы палітычнай партыі, праграма якой адпавядае вучэнню Касцёла;

– галасаваць за «справядлівыя» партыі (паўтарыце прынцыпы вызначэння справядлівасці партыйнай дзейнасці і пазбягайце канкрэтных прыкладаў, заставайцеся ў межах тэорыі, даючы адказ на пытанне, чаму хрысціянін абавязаны ўдзельнічаць у галасаванні);

– далучацца да іншай грамадскай дзейнасці (у Касцёле і ў грамадстве): лабіраваць пэўныя пытанні, актыўна ўдзельнічаць у рухах і арганізацыях, якія адстойваюць некаторыя аспекты сацыяльнага вучэння Касцёла (рухі пралайф, рухі за абарону чалавечых правоў і г.д.);

– ва ўласнай супольнасці распаўсюджваць веды пра сацыяльнае вучэнне Касцёла.

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

**Мэта:** больш дэтальна разгледзець ролю хрысціяніна ў грамадскім і сацыяльным жыцці супольнасці.
**Сродкі:** Катэхізіс Каталіцкага Касцёла і Біблія.
**Час:** 45 хвілінаў.

**Ход працы**

*Практыкаванні падчас сустрэчы*

1. Раздзяліць удзельнікаў на тры групы.

2. Кожнай групе даецца 30 хвілінаў, каб прачытаць у Катэхізісе Каталіцкага Касцёла[5] наступныя артыкулы і пракаментаваць іх:

– першая група: артыкулы 1877–1889 (або хаця б 1879, 1833, 1884, 1887 і 1890–1896);

[5] Можна таксама выкарыстаць Кампендый Катэхізіса Каталіцкага Касцёла (Мн., 2010).

- другая група: артыкулы 1897–1917 (або хаця б 1906–1909, 1913–1915 і 1918–1927);
- трэцяя група: артыкулы 1928–1942 (або хаця б 1929–1931, 1938, 1939 і 1943–1948).

3. Напрыканцы кожная група коратка прэзентуе іншым змест асноўных тэмаў, якія яны абмеркавалі.

*Магчымае хатняе заданне*

Кожны ўдзельнік вяртаецца дамоў, у Старым і асабліва ў Новым Запавеце шукае прынцыпы, на якіх будуецца сацыяльнае вучэнне Касцёла (можна, напрыклад, выбраць фрагменты: Мц 5, 1–7, 29; Мц 19, 9–39).

Кожны павінен знайсці праграмы палітычных партый і прааналізаваць, наколькі яны адпавядаюць сацыяльнаму вучэнню Касцёла.

## *Заключэнне*

Грамадскае жыццё з’яўляецца часткаю чалавечага жыцця. Ва ўсіх адносінах — у сям’і, з сябрамі, на працы, на дзяржаўным і міжнародным узроўні — мы сутыкаемся **з грамадствам,** і ўсе гэтыя адносіны будуюцца на маральных прынцыпах (некаторыя з іх добрыя, а некаторыя — не). Касцёл не можа ўплываць на прафесійныя або тэхнічныя аспекты жыцця, але мае права выказвацца наконт маральных аспектаў, клапоцячыся пра **любоў і павагу паміж людзьмі.**

Палітыка таксама з’яўляецца часткаю грамадскага жыцця, бо гэта шлях да дабрабыту, справядлівасці, абароны чалавечых правоў. Таму **кожны хрысціянін павінен быць актыўным** у палітычным жыцці праз галасаванне ці праз арганізацыю грамадскай дзейнасці, якая адстойвае сацыяльнае вучэнне Касцёла.

# ПАРАФІЯЛЬНЫЯ СТРУКТУРЫ «КАРЫТАСА»

## Тэма II

CARITAS

# СУТНАСЦЬ ПРАЦЫ ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА»

Тэма нашага разважання — парафіяльны «Карытас». Канкрэтныя пытанні, якія мы будзем разглядаць, гэта:

– Што з’яўляецца і што не з’яўляецца парафіяльным «Карытасам»?

– Якой можа быць структура парафіяльнага «Карытаса»?

– Як арганізаваць парафіяльны «Карытас»?

– Якая асноўная роля парафіяльнага «Карытаса»?

Мэта гэтага трэнінгу — змадэляваць працэс стварэння парафіяльных структураў «Карытаса», вызначаючы неабходныя крокі, яго ролю і структуру.

***Малітва***

*Калі я гавару мовамі людзей і анёлаў, а любові не маю, я — як медзь звонкая або гулкія цымбалы.*

*Калі маю дар прароцтва і спазнаў усе таямніцы, і маю ўсякія веды і паўнату веры, каб перастаўляць горы, а любові не маю, то я — нішто.*

*Калі раздам усю маёмасць сваю і аддам цела сваё на спаленне, а любові не маю, няма мне з гэтага ніякай карысці.*

*Любоў доўгацярплівая, любоў ласкавая, не зайздросціць, любоў не пыхлівая, не ганарыцца, не бессаромная, не шукае свайго, не гневаецца, не памятае зла, не радуецца несправядлівасці, але радуецца разам з праўдай. Усё зносіць, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё церпіць.*

*Любоў ніколі не мінае. Не так як прароцтвы, якія спыняцца, ці мовы, якія змоўкнуць, ці веды, якія скончацца. Бо мы часткова пазнаем і часткова прарочым, а калі настане дасканалае, тады тое, што частковае, знікне. Калі я быў дзіцём, то як дзіця гаварыў, як дзіця думаў, як дзіця разважаў; а калі стаў мужчынам, то пакінуў дзіцячае. Бо цяпер мы бачым праз люстэрка, цьмяна, а тады — тварам у твар. Цяпер я ведаю часткова, тады ж спазнаю так, як і я спазнаны.*

*А цяпер трываюць вера, надзея і любоў — гэтыя тры, але найбольшая з іх любоў.*

(1 Кар 13, 1–13)

*Caritas* — гэта любоў. Святы Павел лічыць любоў да нашых бліжніх найлепшым шляхам у практыцы хрысціянскай веры. Калі хрысціянін лічыць, што яго (або яе) вера можа існаваць без практыкі, ён — толькі «звонкая медзь... нішто».

## *Тэарэтычная частка*

### ШТО ТАКОЕ ПАРАФІЯЛЬНЫ «КАРЫТАС»?

«Дабрачынныя арганізацыі Касцёла ўтвараюць яго *opus proprium*, адпаведнае яму заданне, у якім ён супрацоўнічае не як дадатковы партнёр, але як суб'ект з канкрэтнай адказнасцю, робячы тое, што ўласціва яго натуры. Касцёл ніколі не можа быць вызвалены ад здзяйснення *caritas* як арганізаванай дзейнасці веруючых, і, наадварот, ніколі не будзе такой сітуацыі, калі *caritas* кожнага асобнага хрысціяніна будзе непатрэбнай, бо ў дадатак да справядлівасці чалавек патрабуе і заўсёды будзе патрабаваць любові» (*Deus Caritas est, 29*).

Парафіяльны «Карытас» — гэта пастаральнае «цела» парафіяльнай супольнасці, чыёй задачай з'яўляецца ажыццяўляць, каардынаваць, распаўсюджваць дабрачыннасць і сведчыць пра яе, асабліва звяртаючы ўвагу на яе педагагічную задачу.




«Карытас» — гэта не толькі арганізацыя, якая працуе на карысць Касцёла, у яе ёсць і пастаральная місія. Па сутнасці, «Карытас» — гэта трэцяя галіна пастаральнай актыўнасці (апроч катэхізіса і літургіі), якая дапамагае Касцёлу і хрысціянам жыць паводле запаведзяў любові.

Ключавая роля «Карытаса» — гэта ажыўленне хрысціянскай супольнасці ў сферы дабрачыннасці, у пэўным сэнсе гэта педагагічная задача дзейнасці. «Карытас» не вырашае ўсе праблемы, а падбадзёрвае хрысціянаў, заахвочваючы іх праяўляць дзейсную любоў да бліжніх, каб мы разам, як хрысціянскае грамадства, маглі супрацьстаяць бедам.

Парафіяльны «Карытас» — гэта сродак, які дапамагае парафіяльнай супольнасці арганізавана даваць сведчанне хрысціян-

скай любові ў адносінах да людзей, якія церпяць нястачу. Але мы не павінны забывацца, што «Карытас» — гэта сродак, а не мэта нашай працы.

**Сутнасць парафіяльных структураў «Карытаса»**

– гэта пастаральная арганізацыя;

– яго задача нават у супрацоўніцтве з іншымі арганізацыямі **пашыраць сведчанне любові ўнутры супольнасці Касцёла:**

1) у формах, якія адпавядаюць часу і патрэбам;
2) такім чынам, каб кожны чалавек развіваўся цэласна;
3) імкнучыся да грамадскай справядлівасці і міру;
4) з асаблівай увагаю да грамадскай справядлівасці і міру;
5) з перавагаю педагагічнага аспекту.

(*Паводле статута італьянскага «Карытаса»*)

**Чым не з'яўляецца «Карытас»?**

– «Карытас» не з'яўляецца гуманітарнай арганізацыяй;

– «Карытас» не з'яўляецца дзяржаўнай арганізацыяй або валанцёрскай асацыяцыяй ці проста групай людзей;

– «Карытас» не з'яўляецца арганізацыяй, якая аказвае сацыяльныя паслугі;

– «Карытас» не з'яўляецца дыстрыб'ютарам фінансавых фондаў, ежы і іншага.

**Але «Карытас» з'яўляецца:**

– пастаральным «целам» Касцёла;

– сацыяльным «целам» Касцёла;

– дабрачыннай арганізацыяй;

– заахвочваннем хрысціянскай супольнасці да любові;

– займаецца важнымі справамі і здзяйсняе добрыя ўчынкі.

## ЧАТЫРЫ АСНОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА»

*Педагагічная задача «Карытаса»*

Роля «Карытаса» заключаецца ў тым, каб нагадваць хрысціянам пра дзейсную любоў Езуса да людзей у няшчасці і абуджаць гуманную свядомасць у тых, хто не верыць. «Карытас» павінен быць адкрытым для кожнага чалавека і натхняць усю супольнасць на сведчанне хрысціянскай любові. Без гэтага іншая праца «Карытаса» (сацыяльныя праекты, гуманітарная дапамога, розныя даследаванні і іншае) траціць сэнс і мэту.

*Веданне мясцовасці*

«Карытас», які не ведае патрэбаў людзей у сваёй мясцовасці, не варты насіць імя «Карытас». Супрацоўнікі і валанцёры павінны быць у курсе не толькі агульных патрэбаў, але і ведаць усіх патрабуючых на сваёй тэрыторыі. Супрацоўнікі «Карытаса» часта бываюць першымі і адзінымі, хто выслухоўвае асобаў у патрэбе. Адным з моцных бакоў арганізацыі з'яўляецца тое, што мы можам наладзіць адносіны з кожным чалавекам, і калі не зробім гэтага, а станем працаваць толькі з лічбамі, мы рызыкуем страціць сваё прызначэнне.

*Сацыяльнае служэнне*

Парафіяльны «Карытас» не можа адказаць на ўсе патрэбы ў сваёй мясцовасці, але павінен займацца сацыяльным служэннем у якасці прыкладу для ўсёй супольнасці. Кожная праява сацыяльнага служэння павінна вынікаць з канкрэтных патрэбаў, якія ўзнікаюць у мясцовых людзей, канкрэтных адказаў на праблемы. Мэтаю сацыяльнага служэння «Карытаса» з'яўляецца не проста дапамога людзям, а і заахвочванне ўсёй супольнасці сведчыць сваю любоў.

*Каардынацыя і калектыўная праца*

Добры прыклад парафіяльнага «Карытаса» — наладжваць цесную сувязь з дыяцэзіяльным і (або) нацыянальным «Карытасам», гэтак жа, як і з іншымі парафіяльнымі структурамі «Карытаса», каб абменьвацца досведам, падтрымліваць адзін аднаго і каардынаваць супольную актыўнасць. Парафіяльны «Карытас» павінен падтрымліваць добрыя адносіны з рознымі грамадскімі арганізацыямі ў сваёй мясцовасці і з мясцовымі ўладамі.

Парафіяльны «Карытас» заўжды супрацоўнічае з іншымі пастаральнымі арганізацыямі (Парафіяльнаю радаю, катэхетамі, актывістамі парафіі, пастырствам моладзі, міністрантамі і г.д.), каб ствараць у парафіі больш суладнае жыццё і далучаць парафіянаў да дабрачыннай актыўнасці.

## ЯК СТВАРЫЦЬ ПАРАФІЯЛЬНЫ «КАРЫТАС»

«Калі гаворка ідзе аб супрацоўніках, якія практычна займаюцца дабрачыннай дзейнасцю ў Касцёле, то істотнае ўжо было зазначана: яны не павінны кіравацца ідэямі паляпшэння свету, але павінны кіравацца вераю, якая дзейнічае праз любоў (пар. Гал 5, 6). Гэта павінны быць асобы, да якіх, перш за ўсё, дакранулася любоў Хрыста, і сэрцы якіх Хрыстус здабыў сваёй любоўю, абуджаючы ў іх любоў да бліжняга. Крытэрыем, які натхняе іх дзейнасць, павінен быць выраз з Другога паслання да Карынцянаў: “Любоў Хрыста ахапіла нас” (5, 14). Усведамленне таго, што ў Ім сам Бог ахвяраваў сябе за нас аж да смерці, павінна схіляць нас да таго, каб мы не жылі для саміх сябе, але для Яго, і разам з Ім — для іншых. Хто любіць Хрыста, той любіць Касцёл і прагне, каб Касцёл усё больш быў праяўленнем і прыладаю любові, якая выпраменьвае з Яго. Супрацоўнік кожнай каталіцкай дабрачыннай арганізацыі прагне працаваць з Касцёлам і, адпаведна, з біскупам, каб любоў Бога пашыралася ў свеце. Праз свой удзел у практыкаванні любові Касцёла ён хоча быць сведкам Бога і Хрыста і менавіта таму хоча бескарысліва чыніць дабро людзям» (*DCE*, 33).

**Сцэнар 1**

– Святар або Парафіяльная рада могуць склікаць першую сустрэчу, каб заснаваць парафіяльны «Карытас»;

– сустрэча павінна адбывацца ў парафіяльных памяшканнях, выказваюцца тут розныя меркаванні і гучаць розныя пытанні...

– **людзі** павінны сустрэцца і паразважаць над патрэбамі і магчымасцямі, якія маглі б быць прычынаю заснавання парафіяльнага «Карытаса»;

– неабходна паразмаўляць пра **сутнасць і задачы** «Карытаса»;

– **далучайце** да стварэння «Карытаса» іншых — катэхетаў, аніматараў, моладзь і г.д.;

– зрабіце першы накід **праграмы** працы, напрыклад:

1) даследуйце становішча ў парафіі: патрэбы, колькасць бедных, самыя тэрміновыя праблемы;
2) ацаніце патрэбы і свае сілы, прылады і магчымасці, якія дапамогуць вырашаць праблемы;
3) матывуйце супольнасць з дапамогаю розных сродкаў камунікацыі: парафіяльнага часопіса (сайта), на нядзельнай святой Імшы і г.д.;
4) заахвочвайце да дабрачыннасці ўсю Парафіяльную раду, усю супольнасць.

**Сцэнар 2**

– Дыяцэзіяльны або нацыянальны «Карытас» бачыць патрэбу стварыць парафіяльныя структуры «Карытаса»;

– яны арганізуюць першую сустрэчу ў парафіі і запрашаюць на яе святара і Парафіяльную раду;

– падчас першай сустрэчы яны тлумачаць неабходнасць стварэння парафіяльнага «Карытаса»;

– далей яны, карыстаючыся дапаможнікам, арганізуюць трэнінг;

– падчас трэнінгу або пасля яго трэба акрэсліць структуру «Карытаса» і скласці план першага праекта;

– выконваючы адзін канкрэтны праект, парафіяльны «Карытас» пачынае сваю працу.

## СТРУКТУРА ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА»

У залежнасці ад супольнасці Касцёла і колькасці вернікаў мы можам вызначыць некалькі тыпаў «Карытаса»: ад тых, што працуюць выключна на базе валанцёрскай дзейнасці, бо на іх тэрыторыі шмат вернікаў, да тых, дзе супольнасць вельмі малая, і яны мусяць працаваць без дапамогі валанцёраў.

Ідэальнага «Карытаса» проста не існуе! Мы вядзем гаворку пра аптымальны «Карытас»:

*«Гэта структура з выразнай індывідуальнасцю, якая заўсёды добра разумее сваю місію, зноў і зноў дапасуючыся да сітуацыі, у якой знаходзіцца (няшчасцяў, праблемаў, патрэбаў...) і дзейнічае адпаведна».*

Парафіяльныя структуры «Карытаса» ствараюць людзі, якія становяцца «голасам» іншых, прадстаўнікі розных пастаральных супольнасцяў, якія бяруць на сябе асабістую адказнасць за ўсё мноства задачаў «Карытаса». Колькасць людзей, з якіх фармуецца структура (менеджмент парафіяльнага «Карытаса»), залежыць ад магчымасцяў і рэсурсаў парафіі. Важна, каб парафіяльны «Карытас» быў адкрыты для кожнага чалавека ў той час, калі толькі малая колькасць людзей можа прыняць рашэнне аб дзейнасці арганізацыі і паставіць канкрэтныя мэты. Адной з распаўсюджаных праблемаў «Карытаса» з'яўляецца недахоп актыўных удзельнікаў. Разлічваць трэба на тых, хто быў выбраны, каб увайсці ў структуру парафіяльнага «Карытаса», бо ў іншых людзей можа не быць магчымасцяў праяўляць актыўнасць. У любым выпадку парафіяльны «Карытас» павінен мець пэўную структуру, якая будзе рабіць жыццё лягчэйшым. Існуе некалькі мадэляў стварэння структуры парафіяльнага «Карытаса», і тут мы акрэслім толькі асноўныя ўмовы, неабходныя для гэтага, і найперш — неабходных людзей.

### Святар

Святар з'яўляецца ключавою фігураю ў жыцці парафіяльнага «Карытаса». Ён уваходзіць у кіраўніцтва парафіяльнага «Ка-

рытаса» і звычайна бывае яго старшынём. Вельмі важна, каб святары мелі канкрэтную задачу ў парафіяльным «Карытасе» і каб кожны яе разумеў. Звычайна задачаю парафіяльных святароў з'яўляецца прыняцце розных рашэнняў (датычна праектаў, дзейнасці, метадалогіі), маніторынг і ацэнка (з дапамогаю рэгулярных сустрэчаў, візітаў або справаздачаў), духоўная фармацыя валанцёраў «Карытаса». Не забывайцеся, што парафіяльныя святары могуць быць ключавымі фігурамі, бо яны ведаюць, што адбываецца на тэрыторыі дзейнасці «Карытаса» (менавіта святары наведваюць усіх парафіянаў часцей, чым хтосьці іншы) і здольныя заахвоціць парафіяльную супольнасць (з дапамогаю святой Імшы і іншага).

**Каардынатар**

Гэта чалавек, які клапоціцца пра выкананне ўсёй працы парафіяльнага «Карытаса». Мы рэкамендуем, каб гэтая асоба ўваходзіла таксама ў Парафіяльную раду для прадстаўніцтва ў ёй парафіяльнага «Карытаса». Гэты чалавек павінен матываваць іншых і клапаціцца аб новых шляхах працы і новых ідэях, падтрымцы дзейнасці, якая ўжо існуе, супрацоўніцтве з партнёрамі і іншым. Гэты чалавек з'яўляецца *сэрцам* парафіяльнага «Карытаса», таму павінен быць выбраны з вялікаю ўважлівасцю.

**Валанцёры**

Гэта ўсе людзі, якія жадаюць дапамагчы ў дзейнасці «Карытаса». Моц парафіяльнага «Карытаса» залежыць ад колькасці і «якасці» валанцёраў, якія ў ім працуюць. Па гэтай прычыне ўнутраная структура «Карытаса» выглядае адпаведна з выслоўем: лепш пакрысе ад многіх, чым шмат ад некалькіх.

**Аніматар**

Паколькі педагагічная задача «Карытаса» з'яўляецца першаснаю, лагічна, каб існаваў чалавек, які клапоціцца аб яе выкананні. Вядома, гэтым можа займацца і каардынатар, усё залежыць ад парафіі. Дзейнасць і адказнасць аніматараў заключаецца

ў арганізацыі розных мерапрыемстваў, распрацоўцы метадалогіі і вызначэнні мэтаў, якія заахвочваюць і натхняюць усю супольнасць.

**Менеджар-эканаміст**

Для добрай працы парафіяльнага «Карытаса» важна, каб існаваў адзін чалавек — валанцёр, які паклапоціцца пра фінансавыя і іншыя эканамічныя рэсурсы парафіяльнага «Карытаса». У кожнай парафіяльнай супольнасці павінна быць Рада па эканамічных справах, таму трэба толькі папрасіць аднаго чалавека з гэтай рады прысвяціць крыху больш часу справам парафіяльнага «Карытаса».

**Лідары розных сацыяльных службаў**

Чаму б не мець у парафіі чалавека, адказнага за сацыяльнае служэнне і праблемы, з якімі сутыкаецца парафія? Нават калі мы не маем ніякага канкрэтнага праекта ў гэтай сферы, можна даць некалькім людзям заданне падумаць пра метадалогію і магчымасці, каб распачаць такое служэнне. Напрыклад, гэта можа быць праца з пажылымі людзьмі, моладдзю, інвалідамі, беднымі, залежнымі, ахвярамі насілля, вырашэнне праблемаў экалогіі, стварэнне мірнай прасторы і гэтак далей.

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

*Гэты прыклад выкарыстоўваўся падчас майстар-класу для аніматараў. Ролевая гульня выкарыстоўвалася як прыклад для арганізацыі парафіяльных структураў «Карытаса». Можна дадаваць у гульню іншыя ролі або змяняць прапанаваныя ў залежнасці ад патрэбаў.*

**Мэта:** матываваць удзельнікаў падумаць аб тым, як арганізаваць парафіяльны «Карытас», даследаваць праблемы або пе-

рашкоды, якія могуць узнікнуць падчас яго працы, зрабіць уласны план, каб стварыць парафіяльны «Карытас».

**Сродкі:** аркуш паперы або карткі з ролямі для кожнага чалавека, магнітна-маркерная дошка з папераю і каляровымі маркерамі.

**Час:** каля адной гадзіны.

**Ход працы**

1. Напачатку растлумачце мэту практыкавання. Прачытайце (або папрасіце каго-небудзь прачытаць) пра сітуацыю ў парафіі Мала Буна (*матэрыял 1*).

2. Дайце кожнаму ўдзельніку картку з яго (або яе) роляю (*матэрыял 2*) — усім удзельнікам па ролі. Калі ўдзельнікаў больш, чым роляў, можна зрабіць дадатковыя копіі некаторых роляў і раздаць іх людзям або раздзяліць удзельнікаў на дзве групы з аднолькавым заданнем. Папрасіце іх уважліва прачытаць карткі.

3. Папрасіце ўдзельнікаў разыграць сітуацыі, у якіх кожны будзе выконваць сваю ролю. Мэта гэтых сцэнак — абмеркаваць (з пазіцыі персанажа), як можна заснаваць парафіяльны «Карытас». Папрасіце ўдзельнікаў напісаць свае высновы на паперы. Падчас гульні можна выкарыстоўваць *матэрыял 1*, каб узгадаць апісаную сітуацыю.

4. Пасля прэзентацыі высноваў можна дапамагчы ў правядзенні дыскусіі, задаючы наступныя пытанні:

– Як вы адчувалі сябе ў сваіх ролях?

– Якія іншыя ролі можна дадаць да гэтай сітуацыі?

– Калі б у вас была магчымасць памяняцца ролямі, кім бы вы жадалі быць?

– Што вы думаеце пра высновы, якія зрабілі?

– Ці можна выкарыстаць нешта з гэтага практыкавання ў рэальнасці?

– Як вы лічыце: які спосаб быў бы лепшым для таго, каб заснаваць «Карытас» у вашай парафіі?

*Матэрыял 1*

**Апісанне сітуацыі ў парафіі Мала Буна**

Мала Буна — гэта мястэчка з насельніцтвам 15 000 чалавек. Мястэчка знаходзіцца ў рэгіёне, дзе большасць людзей займаецца вясковаю гаспадаркаю. Праз горад працякае рака, якая часта выходзіць з берагоў і затапляе прыбярэжныя дамы і двары.

У мінулым, у камуністычныя часы, блізка ад Мала Буны знаходзіліся ўранавыя шахты, на якіх працавала большасць мужчынаў. У выніку ў Мала Буне вялікая колькасць людзей хварэе на рак і іншыя цяжкія хваробы.

Насельніцтва Мала Буны на 60% складаецца з праваслаўных вернікаў, на 20% — з мусульманаў, на 10% — з каталікаў і на 10% — з прадстаўнікоў іншых веравызнанняў. Гэта прыблізна адпавядае працэнтным суадносінам насельніцтва ўсёй краіны. У Мала Буне жыве каля 2500 цыганаў. Большасць з іх вызнае сябе мусульманамі, іншыя — праваслаўныя і пратэстанты. Ёсць таксама турэцкая меншасць, каля 1000 чалавек. Туркі ў асноўным займаюцца вырошчваннем тытуню, а большасць цыганаў не працуе, бо працы няма. Яны называюць прычынаю беспрацоўя і недахоп зямлі, але насамрэч культурная традыцыя гэтага народа перашкаджае ім займацца сельскай гаспадаркаю, бо фермеры мусяць укладаць шмат працы і грошай, каб атрымаць вынік праз многія месяцы або нават праз год. Людзі ў Мала Буне жывуць мірна, нягледзячы на тое, што належаць да розных вызнанняў і этнасаў.

Большасць малабунцаў старэйшыя за 55 гадоў. Асноўная частка — пенсіянеры, якія вярнуліся дамоў з большых гарадоў, дзе яны раней працавалі. Пенсій і прадуктаў, якія яны вырошчваюць на зямлі, недастаткова, каб жыць прыстойна. Некаторыя людзі сярэдняга ўзросту і моладзь працуюць на атамнай электрастанцыі (АЭС) за 30 км ад Мала Буны — умовы іх жыцця нашмат лепшыя.

У Мала Буне адна школа (і пачатковая, і базавая), і адзін дзіцячы садок. Дзеці цыганаў звычайна не ходзяць у школу, бо іх бацькі ў гэтым не зацікаўленыя і скардзяцца, што не маюць грошай на падручнікі, сшыткі, школьную форму і гэтак далей. Дзіцячы садок і школа дзяржаўныя, таму бацькі за іх не плацяць.

Грамадская супольнасць Мала Буны дэзарганізаваная. Няма ніякіх грамадскіх арганізацый, якія працавалі б на пастаяннай аснове. Перад парламенцкімі і мясцовымі выбарамі некаторыя арганізацыі раздаюць падарункі, каб матываваць людзей галасаваць за пэўных кандыдатаў. Ёсць адзін праваслаўны святар, які арганізаваў пры царкве памяшканні, дзе могуць жыць бяздомныя. У асноўным гэта маладыя жанчыны з дзецьмі — яны прыходзяць з дзяржаўнага сірочага прытулку, які знаходзіцца ў вёсцы за 5 км ад Мала Буны. Калі маладым людзям спаўняецца 18, іх змушаюць пакінуць сірочы прытулак, але ім няма куды ісці. Некаторыя маладыя жанчыны цяжарныя, іншыя — з малымі дзецьмі. Часам гарадскі мусульманскі дабрачынны фонд ладзіць раздачу патрэбных рэчаў, але толькі для мусульманаў.

Каталіцкая супольнасць Мала Буны налічвае 1500 чалавек. Гэта нашчадкі нямецкіх шахцёраў, якія пасяліліся тут у XVI стагоддзі. Нягледзячы на сваё веравызнанне, каталікі не адчуваюць сябе іншым народам (рэлігія не ўплывае на нацыянальнае самаўсведамленне). Сярод іх таксама большасць пажылых людзей, але ёсць і людзі сярэдняга ўзросту, моладзь. У парафіі адзін касцёл, поўны па нядзелях і святах. Большасць людзей, якія ходзяць у касцёл, — пажылыя жанчыны. Мужчыны і жанчыны сярэдняга ўзросту рэдка ходзяць у касцёл. Ёсць група маладых людзей, якія часта ходзяць у касцёл і актыўна дапамагаюць святару. Яны штотыдзень збіраюцца ў касцёле і абмяркоўваюць розныя тэалагічныя тэмы, а таксама спяваюць на святой Імшы. Мясцоваму святару 26 гадоў, ён нядаўна замяніў папярэдніка, якому споўнілася 75, і ён выйшаў на пенсію. Калі малады святар прыехаў сюды працаваць, ён убачыў, што ў парафіі ёсць Парафіяльная рада з 15-ці чалавек (усе дарослыя). У радзе не было раздзялення абавязкаў, але сустрэчы адбываліся рэгулярна, чатыры разы на год. У парафіі ёсць таксама Рада па эканамічных справах з трох чалавек, якія клапоцяцца пра фінансавае і матэрыяльнае становішча парафіі. На заняткі па рэлігіі і нядзельную святую Імшу ходзіць мала дзяцей. Парафіяльная супольнасць імкнецца прымаць удзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія прапануе дыяцэзія, гэтак жа, як і ў мерапрыемствах дыяцэзіяльнага «Карытаса», але з малым поспехам.

*Матэрыял 2*

**Ролі ўдзельнікаў**

- *Святар*

Вы — святар, які толькі што прыехаў у парафію Мала Буны. Вам 26 гадоў, вы поўны ідэяў арганізаваць плённае парафіяльнае жыццё. Апроч іншага, Вы хочаце арганізаваць парафіяльны «Карытас», але няшмат пра гэта ведаеце. Раней Вы кантактавалі з «Карытасам» 5 гадоў таму, калі ўлетку студэнтам прымалі ўдзел у адной з канферэнцый, арганізаваных дыяцэзіяльным «Карытасам». Вы ўважліва чыталі папскую энцыкліку «*Deus Caritas est*», і яна вам вельмі спадабалася.

- *Дыяцэзіяльны каардынатар*

Вы — дыяцэзіяльны каардынатар, адказны за працу ў парафіяльным «Карытасе». Вы прайшлі шмат трэнінгаў, семінараў і сустрэчаў, прысвечаных працы парафіяльных «Карытасаў», і цвёрда верыце, што кожная парафія павінна арганізаваць свой парафіяльны «Карытас». Вашая праблема — у недахопе фінансавых рэсурсаў у дыяцэзіяльным «Карытасе», таму Вы мусіце выконваць шмат іншай працы (напрыклад, па праграме супрацьдзеяння гандлю людзьмі і іншае). Вы працуеце дыяцэзіяльным каардынатарам ужо пяць гадоў.

- *Дыяцэзіяльны дырэктар*

Вы — каталіцкі святар 29-ці гадоў, і на працягу апошніх чатырох гадоў Вы працуеце дырэктарам дыяцэзіяльнага «Карытаса». Ваша арганізацыя — адна з лепшых у рэгіёне, вы вядзеце шмат сацыяльных праектаў для асобаў у патрэбе. У вас 45 чалавек у падпарадкаванні, яны працуюць над праектамі хатняй апекі, бясплатнай кухні, супрацьстаяння гандлю людзьмі, у цэнтры дзённага прабывання для людзей з асаблівымі патрэбамі і ў моладзевай праграме. Вы лічыце, што парафіяльны «Карытас» можа існаваць толькі тады, калі мае добрую структуру і супрацоўнічае з парафіяльным «Карытасам». Вы ўпэўнены, што ўсё павінна рыхтавацца загадзя.

- *Школьны настаўнік*

Вы — настаўнік мясцовай пачатковай школы і працуеце ўжо 17 гадоў. У вас сям'я і двое дзяцей (14 і 18 гадоў). Вы добра ведаеце амаль усіх у парафіяльнай супольнасці і маеце шмат знаёмых сярод жыхароў Мала Буны. Вы лічыце, што адна з найбольшых праблемаў супольнасці — гэта цыганы, якія не жадаюць, каб іх дзеці вучыліся ў школе. Вы лічыце, што парафіяльная супольнасць мусіць нешта зрабіць, каб пераканаць бацькоў цыганаў адправіць дзяцей у школу.

- *Прадстаўнік моладзевай групы*

Вы — 19-гадовы прадстаўнік моладзевай супольнасці і вельмі зацікаўлены ў працы супольнасці і розных сустрэчах. Нядаўна прыехаў малады святар, таму Вы і некаторыя вашы сябры дапамагаюць яму ў парафіяльным хоры і арганізацыі сутрэчаў на розныя тэмы. Вы чулі пра моладзевыя групы ў іншых парафіях і пра тое, колькі там робіцца добрага для моладзі. Вы верыце, што з дапамогаю некаторых новых прагрэсіўных ідэяў можна зацікавіць больш моладзі ў актыўнай працы ў парафіі, і хочаце прапанаваць некалькі такіх ідэяў святару.

- *Чалец Рады па эканамічных справах супольнасці*

Вы — адзін з трох чальцоў Рады па эканамічных справах супольнасці. Утраіх вы займаецеся ўсімі фінансавымі і матэрыяльнымі пытаннямі ў парафіі. Парафіяльныя рэсурсы — гэта ў асноўным ахвяраванні парафіянаў, часткова грашовыя, але ў большасці — сельскагаспадарчая прадукцыя. Вы вырашаеце, якую колькасць атрыманага ўкласці ў касцёл і парафіяльны дом, а колькі размеркаваць сярод асобаў у патрэбе. Ёсць шмат справаў, якія патрабуюць грашовага ўнёску, але недахоп грошай і валанцёраў — праблема, з якою вы сутыкаецеся пастаянна.

- *Манашка*

Вы — манашка 56-ці гадоў і апошнія 24 гады адказваеце за катэхізацыю дзяцей у пачатковай школе. У парафіі Мала Буны

вельмі мала дзяцей, якія наведваюць вашыя заняткі, і нават тыя, хто наведвае, зусім неактыўныя. Папярэдні святар абвінавачваў Вас у гэтым, бо лічыў, што Вашая методыка састарэлая і не падыходзіць для сучасных дзяцей.

- *Чалец Парафіяльнай рады*

Вы — чалец Парафіяльнай рады. Людзі выбралі Вас для гэтай працы, але, хоць Вы і рэгулярна ходзіце ў касцёл, Вы не маеце ўяўлення, што такое Парафіяльная рада і чым Вы маглі бы там займацца.

- *Пажылая жанчына*

Вы — пенсіянерка, удава 67-мі гадоў. У вас двое дарослых дзяцей і шмат вольнага часу, які Вы хацелі б прысвяціць чаму-небудзь карыснаму. Вы кожны дзень ходзіце ў касцёл і ведаеце, што пяцёра вашых сяброўак маюць падобную праблему. Вы ўшасцёх хочаце бавіць час з нейкай карысцю, а не толькі пляткарачы і п’ючы каву. Але заўжды, калі Вы падыходзіце да новага святара, каб прапанаваць сваю дапамогу, ён, здаецца, пазбягае Вас.

### *Заключэнне*

**«Карытас»** вучыць нас, што мы задоўга пражылі проста **побач**, а цяпер мы мусім **жыць разам**, каб навучыцца гэтаму і ў будучыні жыць **адно дзеля аднаго.**

Парафіяльны «Карытас» — гэта **пастаральнае цела** Каталіцкага Касцёла. Парафіяльны «Карытас» мае чатыры асноўныя задачы: педагагічную (самая важная), веданне мясцовасці, сацыяльнага служэння і каардынацыі, супрацоўніцтва з іншымі людзьмі і арганізацыямі. Парафіяльны «Карытас» павінен мець структуру, якая адпавядае структуры парафіяльнай супольнасці, але ў той жа час поспех дзейнасці парафіяльнага «Карытаса» залежыць ад яго валанцёраў, якія жадаюць прымаць удзел у працы і такім чынам сведчыць пра любоў Езуса.

# АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА» — КЛОПАТ ПРА БЕДНЫХ

Клопат пра бедных — адна з найважнейшых задачаў парафіяльных структураў «Карытаса» (ПК). Мы паспрабуем растлумачыць, чаму «Карытас» павінен ведаць бедных, якія жывуць на тэрыторыі парафіі, як ПК ажыццяўляе клопат пра іх, і чаму трэба ведаць і аналізаваць дадзеныя супольнасці і розныя дэталі.

У гэтым раздзеле падаюцца таксама асноўныя спосабы камунікацыі з найбяднейшымі людзьмі і спосабы клопату пра іх, спосабы вырашэння іх праблемаў, адказу на патрэбы: Цэнтр выслухоўвання, яго функцыі і дзейнасць.

## *Малітва*

*Пане, учыні нас годнымі па ўсім свеце служыць тым людзям, якія жывуць і паміраюць у беднасці і ад голаду. Сёння дай ім праз нашыя рукі іх штодзённы хлеб, а праз нашую чулую любоў — супакой і радасць.*

Маці Тэрэза гаварыла:

*«Я пачула заклік пакінуць усё і ісці за Хрыстом у трушчобы, каб служыць Яму сярод найбяднейшых. Гэта быў загад.*

*Калі бядняк памірае з голаду, гэта адбываецца не таму, што Бог пра яго не клапаціўся. Гэта адбываецца таму, што ні вы, ні я не пажадалі даць гэтаму чалавеку тое, у чым ён меў патрэбу.*

*Мы з вамі з'яўляемся Касцёлам — так? Мы павінны дзяліцца з нашым народам. Сёння пакуты ўзнікаюць таму, што людзі назапашваюць, але не даюць, не дзеляцца.*

*Езус сказаў вельмі дакладна: што вы зрабілі найменшым з Маіх братоў, вы зрабілі Мне. Падаючы шклянку вады, вы падаеце яе Мне. Прымаючы малое дзіця, вы прымаеце Мяне».*

Ключавыя словы, якія дапамогуць актывізаваць працу «Карытаса», — «*я пачуў*». Без выслухоўвання, якое здзяйсняецца не толькі з дапамогаю вушэй, але і з дапамогаю ўважлівых вачэй, мы не зможам знайсці матывацыю і прычыну, каб праявіць сваю любоў. Глядзець на навакольны свет і аналізаваць яго — найлепшы спосаб стаць актыўным распаўсюднікам Божай любові.

## *Тэарэтычная частка*

Увага да бедных заўжды была адною з найважнейшых справаў для Касцёла, аднак сапраўдная патрэба ў вырашэнні гэтай праблемы ўзнікла пасля Другога Ватыканскага Сабору. Дакумент, які быў створаны ў выніку, атрымаў назву «*Gaudium et spes*»; ён засяроджваецца на ўмовах жыцця бедных і прычынах беднасці.

«Радасць і надзея, смутак і трывога сучасных людзей, асабліва бедных і ўсіх прыгнечаных, з'яўляецца таксама радасцю і надзеяй, смуткам і трывогай Хрыстовых вучняў, і ўсё па-сапраўднаму чалавечае знаходзіць водгук у іх сэрцах, таму што іх супольнасць складаецца з людзей, з'яднаных у Хрысце, якія ў сваёй пілігрымцы накіроўваюцца Духам Святым да Валадарства Айца і якія прынялі навіну збаўлення, каб прадставіць яе ўсім. Таму гэтая супольнасць адчувае сябе сапраўды звязанаю з чалавецтвам і ягонай гісторыяй» (*GS*, 1).

Парафіяльныя структуры «Карытаса», якія клапоцяцца пра людзей на сваёй тэрыторыі, абавязаны дакладна ведаць праблемы і патрэбы ў сваёй супольнасці. *Заўжды важна ўсведамляць годнасць кожнага чалавека і сітуацыю, у якой ён апынуўся.*

## СЛУХАЦЬ — НАЗІРАЦЬ — РАСПАЗНАВАЦЬ, КАБ... ПАДБАДЗЁРЫЦЬ!

Метадалогія, прапанаваная ўсім парафіяльным структурам «Карытаса», каб яны маглі лепш выконваць сваю задачу, абагульняецца ў дэвізе: *слухаць, назіраць, разважаць, каб... падбадзёрыць*!

*Слухаць* — азначае для «Карытаса» здольнасць завязваць адносіны. Калі добра выслухаць чалавека, гэта можа стаць першым крокам да таго, каб наладзіць з ім глыбейшыя адносіны, даведацца пра яго жыццё, асабістыя якасці і праблемы. Больш за тое, уважліва выслухоўваючы, мы вучымся цаніць асобу і перадаваць ёй пасланне надзеі, бо такім чынам мы ахвяруем уласны час, каб завязаць станоўчыя адносіны. Нават у Евангеллі Езус часта спыняецца, каб паслухаць гутаркі, просьбы, скаргі простага люду. Такім чынам, выслухоўванне людзей з'яўляецца для «Карытаса» ключавою ўмоваю, якая дае магчымасць скантактавацца з беднымі, наладзіць адносіны, зразумець іх, дасягнуць даверу. Добра арганізаваны парафіяльны «Карытас» (як і кожны хрысціянін) павінен шукаць шляхі, каб выслухоўваць сваю супольнасць і беднякоў, якія жывуць паблізу.

*Назіраць* — азначае для «Карытаса» здольнасць глядзець навокал, аналізаваць сваю мясцовасць, ставіць пытанні, рабіць запыты. Наогул, калі вы прысвеціце час назіранню за чым-небудзь, вы здолееце хутчэй зразумець яго асаблівасці і сувязі з навакольным асяроддзем. Калі парафіяльны «Карытас» прысвячае час назіранню за тэрыторыяй, на якой дзейнічае, ён здольны лепш зразумець, што там адбываецца, убачыць прычыны і наступствы ўчынкаў, пазнаёміцца з жыхарамі, убачыць сувязі паміж людзьмі і арганізацыямі, ацаніць рэсурсы супольнасці. Такім чынам, для «Карытас» клапаціцца пра бедных азначае ўважліва аналізаваць асяродак, у якім узнікае беднасць, разумець, чаму яна ўзнікае і якія могуць быць спосабы дапамагчы бедным і палепшыць іх жыццё.

*Распазнаваць* — азначае для «Карытаса» ўменне выбіраць лепшы варыянт, выбіраць, што рабіць, як рабіць, разумець, каго можна далучыць да справы, як выкарыстоўваць рэсурсы тэрыторыі, каму даручаць інфармацыйную і аніматарскую дзейнасць. Парафіяльны «Карытас», дзейнасць якога заснаваная на інфармацыі, атрыманай пры выслухоўванні і назіранні, павінен разумець, як рэагаваць, як рухацца далей, якія праекты



прапаноўваць, як далучаць да працы супольнасць. Добра арганізаваны парафіяльны «Карытас» не павінен дзейнічаць паасобку: неабходна, каб да яго дзейнасці далучалася як мага больш хрысціянскіх супольнасцяў і мясцовых жыхароў. Парафіяльны «Карытас», які ўважліва выслухоўвае бедных і ўважліва назірае за тым, што адбываецца навокал, але не здольны зразумець, чым яму заняцца, — гэта несапраўдны «Карытас»!

Уся праца робіцца для таго, каб *падбадзёрыць* супольнасць, каб клапаціцца пра мясцовых жыхароў, якія жывуць на тэрыторыі «Карытаса». Добра арганізаваны парафіяльны «Карытас» павінен падбадзёрваць і прапаноўваць канкрэтныя дзеянні разам з працэсам выслухоўвання —назірання — распазнавання, каб правільна рэагаваць на новыя феномены і выклікі, якія ўзнікаюць у свеце.

## УВАЖЛІВАЕ ВЫВУЧЭННЕ ПРАБЛЕМЫ БЕДНАСЦІ

Тэрмін «веданне мясцовасці» азначае многае. Найперш — гэта веданне канкрэтных патрэбаў і праблемаў, якія існуюць цяпер, і здольнасць распазнаваць новыя праблемы, шукаць прычыны іх узнікнення, заклікаць грамадства выказвацца на тэму праблемаў, супрацоўнічаць з іншымі арганізацыямі, якія існуюць на гэтай тэрыторыі, і дзяліцца з імі інфармацыяй. Уся гэтая дзейнасць адрозніваецца для кожнага парафіяльнага «Карытаса», бо яна скіраваная на дабро для бедных, на жаданне зразумець, чаму некаторыя людзі выкінутыя з грамадства, чаму ў іх праблемы, што выклікае гэтыя праблемы, і знайсці адпаведнае вырашэнне. Таму ў гэтым працэсе ключавым элементам з'яўляецца не толькі назіранне, але і выслухоўванне.

Вывучэнне праблемы беднасці ў тым сэнсе, які дае «Карытас», можна апісаць як прыладу мясцовага Касцёла, патрэбную для таго, каб дапамагчы хрысціянскай супольнасці сістэматычна выяўляць на яе тэрыторыі людзей, якія жывуць у беднасці, неспрыяльных умовах і маргіналізацыі, а таксама адсочваць, як развіваецца сітуацыя, размаўляючы з людзьмі, пытаючыся грамадскага меркавання і меркавання касцёльнай супольнасці для

таго, каб стварыць сетку, у якую будуць уключаныя розныя сацыяльныя службы ў дадзенай мясцовасці.

Вось некаторыя прыклады дзейнасці, якія дапамагаюць развіваць вывучэнне праблемы беднасці ў парафіяльных структурах «Карытаса»:

– стварэнне цэнтраў выслухоўвання або падобных арганізацый, дзе валанцёры і супрацоўнікі змогуць сустракацца з людзьмі і выслухоўваць патрэбы бедных;

– аналіз праблемы беднасці, вызначэнне яе надзённасці, прычынаў яе ўзнікнення і магчымых вырашэнняў у супольнасці;

– збор і абнаўленне інфармацыі пра сацыяльныя службы на дадзенай тэрыторыі;

– веданне заканадаўчай базы ў тым, што датычыць праблемы (дзяржаўныя законы, мясцовыя законы...);

– веданне групаў, якія існуюць у дадзенай мясцовасці і ўплываюць на грамадскую, эканамічную, культурную і дэмаграфічную сітуацыі (сацыяльныя службы, грамадскія арганізацыі...).

## ЦЭНТР ВЫСЛУХОЎВАННЯ

### 1. Што такое цэнтр выслухоўвання?

Цэнтр выслухоўвання (ЦВ) — гэта структура парафіяльнага «Карытаса». Гэта **месца**, дзе ўсе людзі, якіх напаткалі цяжкасці, могуць знайсці цёплы прыём і тых, хто выслухае іх праблемы. Гэта адзін з найважнейшых **спосабаў** Касцёла стаць бліжэй да самых бедных і іх патрэбаў. Гэта **«антэна»**, гатовая перадаваць патрэбы навакольнай тэрыторыі і супольнасці.

*Будзьце ўважлівыя: цэнтр выслухоўвання не замяняе парафіяльны «Карытас», а толькі з'яўляецца яго часткаю!*

### 2. Чаго мы жадаем дасягнуць з дапамогаю цэнтра выслухоўвання?

З дапамогаю ЦВ мы жадаем распаўсюджваць хрысціянскую культуру салідарнасці ў парафіяльнай супольнасці і ва ўсім грамадстве:

– паказваючы, што Касцёл здольны выслухоўваць людзей у патрэбе і служыць ім;

– інфармуючы і падкрэсліваючы адказнасць парафіяльных супольнасцяў у адносінах да бедных на іх тэрыторыі.

**3. Чым мы займаемся ў цэнтры выслухоўвання?**

– Мы адкрытыя і **прыязна прымаем** у сябе кожнага чалавека, без ніякіх адрозненняў;

– мы **выслухоўваем**, імкнучыся дакладна зразумець праблемы і агульную сітуацыю чалавека ў патрэбе;

– мы **арыентуем**, даючы чалавеку ў патрэбе самую важную інфармацыю, якая дапаможа яму змагацца з праблемамі;

– мы **спадарожнічаем** чалавеку ў яго цяжкім штодзённым жыцці, імкнучыся разам вырашаць праблемы, якія навалiліся на яго;

... але мы таксама не забываемся даваць **канкрэтныя адказы**!

**4. Хто працуе ў цэнтры выслухоўвання?**

Не існуе дасканалай мадэлі ЦВ: кожны парафіяльны «Карытас» можа арганізаваць свой ЦВ адпаведна з рэсурсамі і патрэбамі. Звычайна валанцёры і супрацоўнікі выконваюць наступныя функцыі.

*Адказны.* Вельмі добра, каб быў нехта адказны за ЦВ. Звычайна гэта мужчына або жанчына, якія актыўна ўдзельнічаюць у парафіяльным жыцці і могуць гарантаваць пастаянства і паслядоўнасць у працы.

*Парафіяльныя валанцёры.* Кожны чалавек, і малады, і пажылы, можа аказаць падтрымку. Кожны валанцёр парафіяльнага «Карытаса» можа актыўна далучацца да працы ЦВ, выконваючы розныя заданні.

*Непарафіяльныя валанцёры.* Кожны спецыяліст, нават калі ён не належыць да парафіі, можа дапамагчы сваімі ведамі.

Звычайна ЦВ працуе як частка сеткі, бо выконвае ролю сувязі, пасрэдніка, «мосту» паміж асобамі ў патрэбе і рэсурсамі, якія ёсць у дадзенай мясцовасці. Таму ЦВ неабходна ў адпавед-

най меры ведаць мясцовых людзей, наладжваючы добрыя кантакты і адносіны з супольнасцю.




*Працаваць у сетцы азначае:*

– ведаць мясцовых людзей настолькі добра, наколькі гэта магчыма;

– ацэньваць рэсурсы ў дадзенай мясцовасці на грамадскім і асабістым узроўні;

– ведаць прававыя нормы, сферы кампетэнтнасці, шляхі для атрымання доступу і выкарыстання грамадскіх рэсурсаў;

– цаніць, актывізаваць і выкарыстоўваць усе даступныя рэсурсы;

– развіваць прафесіяналізм у патрэбных сферах, пазбягаючы дублявання, перакрыцця сфераў дзейнасці і заменаў.

*Працаваць у адзіноце — шлях да паразы... перамога дасягаецца працаю ў супольнасці!*

**5. Як трэба арганізаваць цэнтр выслухоўвання?**

У працы ЦВ могуць прымаць удзел розныя групы. Кожны парафіяльны «Карытас» можа вырашаць, хто стане ўдзельнікам гэтых групаў, і даваць ім заданні.

- Кіраўнічая і каардынацыйная група
  - прадстаўляе ЦВ;
  - каардынуе дзейнасць ЦВ;
  - ставіць мэты;
  - размяркоўвае бюджэт;

  – прапануе змены, новыя праекты;
  – наладжвае кантакты з грамадскімі арганізацыямі і асобнымі спецыялістамі.
- Група кантактаў і выслухоўвання
  – тэхнічна забяспечвае працу ЦВ;
  – з'яўляецца дзейнаю «рукою» ЦВ;
  – непасрэдна кантактуе з асобамі ў патрэбе, якія прыходзяць у ЦВ;
  – выслухоўвае кожнага;
  – разам з людзьмі вырашае, што ім рабіць;
  – скіроўвае людзей у грамадскія арганізацыі, да спецыялістаў або ў службы «Карытаса»;
  – адказвае за аператыўнасць кантактаў з грамадскімі арганізацыямі і спецыялістамі.
- Аналітычная група
  – вызначае поле патрэбаў і рэсурсаў у дадзенай мясцовасці;
  – клапоціцца пра адукацыю валанцёраў і супрацоўнікаў ЦВ;
  – кожныя 6 або 12 месяцаў аналізуе дадзеныя, сабраныя ЦВ;
  – працуе над інфармаваннем і фармаваннем грамадскай думкі па праблеме беднасці;
  – стварае ўнутраныя правілы для ЦВ.

**6. Якія памяшканні неабходныя для цэнтра выслухоўвання?**

Не існуе правілаў адносна памяшканняў, неабходных для добрай арганізацыі ЦВ: многае залежыць ад магчымасцяў парафіі. Звычайна ЦВ дзеліцца на тры часткі:

– *Прыёмны пакой*, дзе асобы ў патрэбе чакаюць, пакуль іх выслухаюць.

– *Пакой выслухоўвання* — ціхае і адасобленае месца, дзе асобы ў патрэбе могуць паразмаўляць з супрацоўнікам ЦВ, захоўваючы прыватнасць.

– *Сакратарыят* — пакой для адміністрацыйнай і лагістычнай працы ЦВ.

**7. Калі працуе цэнтр выслухоўвання?**

ЦВ не павінен працаваць ні 24 гадзіны ў дзень, ні 7 дзён у тыдзень — ён можа быць адчынены, напрыклад, 3 гадзіны ў тыдзень (напрыклад, у другой палове дня ў суботу, з 13:00 да 16:00, або раніцаю ў аўторак з 9:00 да 12:00). Важна, каб ЦВ быў адчынены па магчымасцях валанцёраў і адпаведна з патрэбамі церпячых — няма сэнсу адчыняць ЦВ у гадзіны, калі гэта нязручна людзям, якім патрэбная дапамога.

Лепш за ўсё, каб гадзіны працы былі аднолькавымі і іх прытрымліваліся ўсе супрацоўнікі ЦВ.

Гадзіны працы трэба напісаць на дзвярах ЦВ, каб людзі дакладна ведалі, калі можна туды прыйсці.

***Не забывайцеся, што ЦВ павінен мець падрыхтаваных супрацоўнікаў, утульныя памяшканні і зручны час працы!***

**8. Метадалогія працы ў ЦВ**

Важна ўсведамляць тры пункты, якія вынікаюць з размовы з наведнікам ЦВ: патрэба, просьба і меры.

- **Патрэба**

Патрэба — гэта цяжкасць або праблема, з якой чалавек сутыкаецца ў пэўны момант свайго жыцця. Цяжкасці могуць здарацца знянацку (напрыклад, смерць блізкіх) або бываюць хранічнымі (напрыклад, хвароба). Яны могуць быць працяглымі (напрыклад, алкагалізм або наркатычная залежнасць) або могуць узнікаць час ад часу, і чалавек не пакутуе ад праблемы пастаянна.

*Прыклад.* У ЦВ прыходзіць мужчына і гаворыць, што не можа знайсці працу. Яго патрэба — праца. Але, магчыма, падчас размовы з ім супрацоўнік высветліць, што існуюць таксама іншыя праблемы: канфлікт у сям'і, нізкі ўзровень адукацыі.

- **Просьба**

Просьба — гэта тое, што асоба ў патрэбе выказвае непасрэдна ў размове з супрацоўнікам ЦВ. Часам просьба бывае не звязанаю з патрэбаю напрамую.

*Прыклад.* Мужчына, які не можа знайсці працу, просіць ежы і адзення, бо не можа гэтага набыць. Такім чынам, яго патрэба — праца, а просьба — ежа і адзенне.

- **Меры**

Меры — гэта адказ, які ЦВ дае асобе ў патрэбе. Звычайна супрацоўнік ЦВ пачынае з просьбы, але можа прапанаваць іншыя дзеянні. Таму важна ўсведамляць, што́ ЦВ можа прапанаваць чалавеку, каб задаволіць яго (або яе) патрэбу.

*Прыклад.* Беспрацоўны мужчына просіць ежы і адзення, таму ЦВ прапануе яму пайсці на склад парафіяльнага «Карытаса» і ўзяць там набор прадуктаў, а таксама выбраць адзенне. Але ў той жа час ЦВ прапануе мужчыну звязацца з пэўнай мясцовай арганізацыяй, каб вырашыць праблему беспрацоўя або прыняць удзел у адукацыйнай праграме, якую парафіяльны «Карытас» арганізуе для беспрацоўных у дадзенай мясцовасці.

**9. Матэрыялы, з дапамогаю якіх вядзецца размова ў ЦВ**

Размова з асобаю ў патрэбе — гэта сутнасць працы ЦВ. Яе праводзяць добра падрыхтаваныя і інфармаваныя валанцёры або супрацоўнікі. Размова прыватная, звычайна асноўная інфармацыя запісваецца на папяровым бланку.

Папяровы бланк звычайна дзеліцца на 4 часткі:

**1. Агульная інфармацыя** (хто з валанцёраў працуе з асобаю ў патрэбе, дзе і калі адбываецца размова).

**2. Інфармацыя пра асобу ў патрэбе** (асабістая інфармацыя, інфармацыя пра сям’ю, умовы жыцця).

**3. Асноўная інфармацыя** (патрэбы, просьбы, меры).

**4. Абнаўленне інфармацыі** (калі асоба ў патрэбе прыходзіць некалькі разоў, варта запісваць інфармацыю пра змены ў сітуацыі, новыя дэталі, развіццё).

***Супрацоўнік ЦВ павінен не толькі ведаць, як выслухоўваць асобаў у патрэбе, але і як весці «бюракратычную працу»!***

**10. Архіў**

Гэта не высокая гара паперы, а важная крыніца інфармацыі для супрацоўнікаў ЦВ. Архіў збіраецца з дзвюма мэтамі:

1. *Унутраная*: архіўныя дадзеныя дапамагаюць зразумець асабістую праблему чалавека, каб было лягчэй аказаць яму дапамогу. Дадзеныя павінны быць даступнымі.

2. *Знешняя*: архіўныя дадзеныя дапамагаюць весці агульны аналіз патрэбаў і просьбаў, каб ствараць лепшыя праекты і лепш арганізоўваць дзейнасць, дапамагаючы людзям. Важна захоўваць як мага больш інфармацыі.

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

Прапануем вам прыклады апытанняў для збору інфармацыі, якія можна выкарыстоўваць у цэнтры выслухоўвання, распачынаючы працу па вывучэнні праблемы беднасці. Іх трэба адаптаваць да ўмоваў, у якіх вы пражываеце.

**Мэта:** вывучаць сітуацыю ў парафіі; даведвацца, штó апытаныя ўжо ведаюць пра беднасць, якая існуе ў парафіі.

**Матэрыялы:** папера, каляровыя алоўкі, матэрыялы для раздачы.

**Час:** каля адной гадзіны.

**Ход працы**

1. Раздзяліце ўдзельнікаў на маленькія групы па 3–5 чалавек.

2. Раздайце кожнай групе па адным матэрыяле.

3. Папрасіце людзей абмеркаваць у групе пытанні, якія задаюцца ў матэрыяле, і даць на іх адказ. Для гэтай працы дастаткова будзе каля 30-ці хвілінаў.

4. Папрасіце, каб прадстаўнік кожнай групы агучыў адказы.

5. Пасля ўсіх прэзентацый арганізуйце дыскусію паводле агучаных адказаў.

*Матэрыял 1*

**Аналіз рэальнай сітуацыі**

1. Якія спосабы і ініцыятывы выкарыстоўвае парафіяльны «Карытас», каб уяўляць карціну беднасці на сваёй тэрыторыі?

– Інфармацыя, атрыманая ад святароў і законніцаў.

– Цэнтр выслухоўвання «Карытаса».

– Даследаванні, якія праводзяцца ў дадзенай мясцовасці.

– Інфармацыя ад іншых супрацоўнікаў парафіі (катэхеты, міністранты, аніматары).

– Благаслаўленне і наведванне сем'яў.

– Іншыя спосабы (удакладніце): ................................................

2. Якія формы беднасці існуюць на тэрыторыі вашай парафіі?

– Нямоглая старасць.

– Інваліднасць.

– Хваробы.

– Праблемы з жыллём і цяжкія жыццёвыя ўмовы.

– Беспрацоўе і праблемы з працаўладкаваннем.

– Адукацыйныя праблемы.

– Сямейныя праблемы.

– Грашовыя праблемы (малы прыбытак, расходы, даўгі і г.д.).

– Залежнасці (наркотыкі, алкаголь і г.д.).

– Іншыя праблемы: ...................................................................

3. Наколькі добра пералічаныя асобы і арганізацыі ведаюць праблемы, якія існуюць у дадзенай мясцовасці?

| | Вельмі добра | Дастаткова | Мала | Зусім не ведае |
|---|---|---|---|---|
| Святар | | | | |
| Дыякан | | | | |
| Манашкі | | | | |
| Парафіяльны «Карытас» | | | | |
| Парафіяльная рада | | | | |
| Іншыя парафіяльныя супольнасці | | | | |
| Насельніцтва на тэрыторыі парафіі | | | | |
| «Карытас» у дэканаце | | | | |
| Дыяцэзіяльны «Карытас» | | | | |

*Матэрыял 2*

**Бланк для вывучэння праблемы беднасці на тэрыторыі парафіі**

ПАРАФІЯ ..........................................................................................................
НАСЕЛЬНІЦТВА (колькасць асобаў) ..............................................................
КОЛЬКАСЦЬ СЕМ'ЯЎ .........................................................................................
У ДАДЗЕНАЙ МЯСЦОВАСЦІ НАЗІРАЕЦЦА НАСТУПНАЯ СІТУАЦЫЯ:

| | Зусім няма | Няшмат | Шмат | Вельмі шмат |
|---|---|---|---|---|
| 1. Іміграни ў складаным становішчы | | | | |
| 2. Прастытуткі | | | | |
| 3. Наркаманы | | | | |
| 4. Алкаголікі | | | | |
| 5. Асуджаныя і былыя асуджаныя | | | | |
| 6. Інваліды | | | | |
| 7. Псіхічна хворыя | | | | |
| 8. Пажылыя | | | | |
| 9. Бедныя | | | | |
| 10. Меншасці ў складанай сітуацыі | | | | |
| 11. Моладзь у рызыцы | | | | |
| 12. Беспрацоўныя | | | | |
| 13. Бяздомныя | | | | |
| 14. Звязаныя з крыміналам | | | | |

Выкарыстаныя матэрыялы з кнігі: *«Percorsi di osservazione: Manuale operative per gli osservatori delle povertà» a cura di Giovani Bursi, Gianpietro Cavazza, Walter Nanni. — Roma, gennaio, 2000.*

## *Заключэнне*

**Ведаць праблемы, якія існуюць, і выяўляць новыя праблемы**, якія ўзнікаюць на тэрыторыі парафіі, — задача парафіяльнага «Карытаса». Веданне праблемаў паказвае, якім чынам парафіяльны «Карытас» можа дапамагчы вырашаць гэтыя праблемы.

**Цэнтр выслухоўвання** можна лічыць асноваю парафіяльнага «Карытаса»: гэта месца, прылада і «антэна», скіраваная на мясцовых людзей — яго дзверы заўжды адчыненыя для людзей з іх патрэбамі.

# АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА» — ПЕДАГАГІЧНАЯ ЗАДАЧА

Асноўная задача «Карытаса» — педагагічная. Гэта азначае, што сапраўдны парафіяльны «Карытас» павінен клапаціцца пра адукацыю супольнасці. Служыць асобам у патрэбе, даваць сведчанне хрысціянскай любові — гэта шлях да Божага Валадарства, *Добрая Навіна,* якую даў нам Езус. У гэтым раздзеле мы растлумачым, чаму наш абавязак — не толькі ісці за Ім, але і вучыць іншых, як гэта рабіць, паказваць кожнаму, што дапамагаць бліжняму магчыма і неабходна.

### *Малітва*

*Учыні мяне, Пане, прыладаю Твайго спакою,*
*каб нёс любоў туды, дзе пануе нянавісць,*
*каб прабачаў там, дзе абражаюць,*
*каб яднаў там, дзе сварка і звада,*
*каб праўду казаў там, дзе ёсць фальш,*
*каб нёс веру туды, дзе ёсць сумненне,*
*каб абуджаў надзею там, дзе пануе роспач,*
*каб распаліў святло там, дзе валадарыць цемра,*
*каб нёс радасць туды, дзе турбуе неспакой.*
*Учыні, каб не шукаў я суцяшэння, а суцяшаў іншых,*
*каб не толькі прагнуў разумення, але каб разумеў іншых,*
*каб не шукаў уласнай любові да сябе, а любіў іншых.*
*Бо той, хто дае, заўсёды атрымлівае,*
*хто не шукае свайго, той знаходзіць,*
*хто прабачае, таму будзе прабачана,*
*бо, паміраючы, мы нараджаемся для жыцця вечнага.*
*Амэн.*

*(«Малітва св. Францішка»)*

Праца ў «Карытасе» — не асабісты эксперымент, а практыка любові, якая рэалізуецца ў супольнасці. Таму неабходна так весці справы, каб заўжды далучаць да сваёй дзейнасці іншых людзей, раздзяляючы з імі клопат пра асобаў у патрэбе, якія ёсць у нашай супольнасці.

### *Тэарэтычная частка*

У 1972 г. падчас сустрэчы нацыянальных і дыяцэзіяльных арганізацый «Карытас» у Італіі папа Павел VI падкрэсліў ролю «Карытаса» як пастаральнага арганізму, які дзейнічае для таго, каб пашыраць любоў ва ўсёй хрысціянскай супольнасці: «Асноў-

ная задача «Карытаса» — педагагічная, яе духоўны аспект нельга вызначыць з дапамогаю лічбаў і грошай, ён вызначаецца толькі здольнасцю заклікаць мясцовы Касцёл і асобных індывідаў да дабрачыннасці і хрысціянскай любові, адпаведна з патрэбамі, якія існуюць у гэтай мясцовасці».

Іншымі словамі, «Карытас» — гэта месца, адчыненае для кожнага і насустрач кожнаму. Яго ключавою задачаю, педагагічнай канцэпцыяй, з'яўляецца заахвочванне хрысціянскай супольнасці да дабрачыннасці. Гэта азначае, што «Карытас» не дае прамых адказаў на выпрабаванні і патрэбы, якія ўзнікаюць у людзей, а ў асноўным актывізуе хрысціянаў і натхняе іх праяўляць дзейсную любоў да бліжніх, гэтак, каб мы ўсе, як хрысціянскае грамадства, маглі дапамагаць ім у патрэбах.

Таму можна сказаць, што «Карытас» выконвае сваю педагагічную задачу:

– калі нагадвае супольнасці пра абавязак праяўляць дзейсную любоў да бліжніх;

– калі ведае праблемы дадзенай мясцовасці і заахвочвае пэўных асобаў і групы людзей вырашаць іх;

– калі рыхтуе валанцёраў, каб яны давалі дзейсны адказ на патрэбы людзей;

– калі знаходзіцца ў кантакце з катэхізацыяй і літургіяй, каб лепш перадаваць хрысціянскую любоў;

– калі прапануе людзям розныя шляхі, каб зрабіць іх любоў да бліжніх рэальнаю.

Калі мы гаворым, што парафіяльны «Карытас» — не толькі дабрачынная супольнасць валанцёраў і што яго мэта — не толькі праца напрамую з беднымі, але і адукацыя ўсіх чальцоў супольнасці, гэта вельмі прыгожая заява, але вялікі выклік зрабіць яе рэальнасцю, якая канкрэтызуецца і ажыццяўляецца ў парафіяльнай супольнасці. Змяніць разуменне таго, што «Карытас» — не толькі набор грамадскіх паслугаў, а сацыяльнае служэнне, якое дзейнічае пастаральным чынам, жадаючы ўключыць супольнасць у практыкаванне любові, — гэта доўгі і складаны шлях.

Таму, калі валанцёр «Карытаса» гаворыць: «Мы заўжды — тая самая невялікая група людзей, якія працуюць у парафіяльным «Карытасе», і кожны раз, калі чалавек, які не працуе ў «Карытасе», гаворыць: «Я хацеў бы быць актыўным і дапамагаць іншым, але ў маёй парафіі няма чаго рабіць», гэта азначае, што парафіяльны «Карытас» не клапоціцца пра свой абавязак выконваць педагагічную задачу!

Такім чынам, на ўзроўні парафіі роля «Карытаса» заключаецца ў тым, каб далучаць вернікаў да дзейснага выяўлення любові, у імкненні змяняць іх ментальнасць. Гэтаму часта не ўдзяляецца дастаткова ўвагі ў парафіяльных супольнасцях, бо «педагогіка» асацыюецца з ведамі валанцёраў і аніматараў, і вельмі цяжка навучыць іх камунікацыі і ўменню падкрэсліваць на публіцы, чаму і як яны прапануюць сваё служэнне і ў чым яго асаблівасць.

Кожны парафіяльны «Карытас» павінен мець аднаго аніматара, адказнага за прапанову магчымасцяў паслужыць і цікавых праектаў для вернікаў, каб заахвоціць іх да дзейсных праяваў любові.

## ЯК РАЗВІВАЦЬ ПЕДАГАГІЧНЫ АСПЕКТ ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА»

Педагагічны аспект можна развіваць трыма спосабамі: актывізацыяй, анімацыяй і адукацыяй.

*Актывізацыя*

Пад словам *актывізацыя* маецца на ўвазе абуджэнне разумення супольнасцю тых патрэбаў, якія існуюць у дадзенай мясцовасці. Гэта адбываецца з дапамогаю інфармавання людзей аб патрэбах, якія ўзнікаюць, і неабходнасці іх вырашэння ўсім разам. Гэта можна зрабіць з дапамогаю медыя кампаній, сустрэчаў, канферэнцый, кніг, брашураў і іншымі спосабамі.

Важна падкрэсліць, што мэтаю парафіяльнага «Карытаса» з'яўляецца распаўсюджванне прыкладаў і манеры паводзінаў, заснаваных на дабрачыннасці і салідарнасці, клопаце пра людзей, якія перажываюць праблемы ў супольнасці, і клопаце аб

вырашэнні вялікіх сусветных праблемаў, такіх як войны, несправядлівасць, упадак.

У парафіяльных структурах выкананне педагагічнай задачы праз актывізацыю можа адбывацца наступным чынам: сустрэчы ў групах, арганізацыя розных мерапрыемстваў, прамовы і малітва падчас святой Імшы, спецыяльныя лекцыі на катэхезах або пры падрыхтоўцы да шлюбу, артыкулы ў парафіяльных бюлетэнях (аркушах навінаў).

Калі гэта адрасуецца дзяржаўным уладам, мясцовым арганізацыям, грамадскім службам, палітыкам, то называецца словам «лобі» (практыка ўплыву на рашэнні, якія прымаюць інстытуты ўлады, што ўключае любыя спробы паўплываць на заканадаўцаў, выбарцаў або арганізаваныя групы) і «прапагандаю» (прадуманыя выказванні на важныя тэмы, каб паўплываць на распаўсюджванне нейкіх ідэяў або на людзей).

Калі людзі ўсведамляюць, што пэўныя праблемы існуюць, парафіяльны «Карытас» павінен далучыць іх да працэсу вырашэння гэтых праблемаў, што робіцца з дапамогаю анімацыі.

*Анімацыя*

Як нам ужо вядома, метадалогія працы «Карытаса» заснаваная на выслухоўванні, назіранні і распазнаванні, і ўсё гэта робіцца для таго, каб забяспечыць лепшую анімацыю ў парафіяльнай супольнасці. Анімацыя — гэта працэс далучэнння людзей да пэўнай дзейнасці. Для парафіяльнага «Карытаса» гэта азначае здольнасць далучаць новых чальцоў супольнасці да актыўнасці, дзейнасці і служэння на карысць асобаў у патрэбе.

Існуе два тыпы анімацыі: *індывідуальная* — далучэнне аднаго чалавека да дзейнасці або ўключэнне ў групу з дапамогаю прамой размовы і асабістых адносінаў, і *групавая* — далучэнне некалькіх людзей да дзейнасці або ўключэнне ў групу.

Інакш кажучы, анімацыя — гэта запрашэнне да актыўнасці, і пэўным чынам гэта з’яўляецца асноўнаю задачаю «Карытаса», бо азначае перадачу кожнаму чалавеку Добрай Навіны.

*Адукацыя*

«Карытас» можа дзейсна выконваць сваю педагагічную задачу ў тым ліку і праз адукацыю валанцёраў і супрацоўнікаў, занятых у праектах парафіяльнага «Карытаса». Гэтая адукацыя можа датычыць тэалагічна-пастаральных асноваў «Карытаса», прафесійных і тэхнічных навыкаў, неабходных у працы, або шляхоў і спосабаў камунікацыі з супольнасцю і яе анімацыі.

Адукацыйныя праекты звычайна прапануе і ажыццяўляе дыяцэзіяльны «Карытас», імі напрамую займаюцца дыяцэзіяльныя аніматары або спецыялісты. Калі вы жадаеце прапанаваць адукацыйны курс валанцёрам або супрацоўнікам парафіяльнага «Карытаса», не забудзьцеся папрасіць падтрымкі ў дыяцэзіяльнага «Карытаса»: верагодна, што ёсць добрыя трэнеры і аніматары, гатовыя вам дапамагчы!

**ПЕДАГОГІКА ДЗЕЯННЯ**

*Атывізацыя*, *адукацыя* і *анімацыя* — гэта спосабы і шляхі распаўсюджвання педагагічнай задачы парафіяльнага «Карытаса», але будзьце ўважлівыя: яны не з'яўляюцца асноваю педагогікі «Карытаса»!

Асноваю педагогікі ў «Карытасе», які належным чынам клапоціцца пра выкананне сваёй педагагічнай задачы, з'яўляецца арганізаваная ім дзейнасць і служэнне. Можна арганізаваць шмат сацыяльных праектаў у парафіяльным «Карытасе» (наступны раздзел будзе прысвечаны тлумачэнню гэтай працы), але важна, якім чынам яны арганізуюцца: калі гэта праекты працы з беднымі, ці ўключаюць яны супольнасць, ці канцэнтруюцца на ўвазе да бліжняга і клопаце пра яго? Калі так, то гэта найлепшы спосаб распаўсюджваць пасланне любові!

Гэта называецца таксама «педагогікай дзеяння» і становіцца магчымым, калі сацыяльнае служэнне і асаблівы стыль працы «Карытаса» не раздзяляюцца, а становяцца часткамі аднаго і таго ж падыходу ў дапамозе асобам у патрэбе.

Добра арганізаваны парафіяльны «Карытас» — не той, што прапануе больш сацыяльных праектаў, у якіх задзейнічана невялікая група супрацоўнікаў і валанцёраў. Найлепш, каб парафіяльны «Карытас» кожны дзень імкнуўся далучаць да сваёй дзейнасці парафіяльную супольнасць, робячы гэта няспынна, як нармальны спосаб дзеяння, бо глыбокую сутнасць парафіяльнага «Карытаса» можна акрэсліць такім чынам: ***Лепш патроху ад большай колькасці людзей, чым шмат ад малой іх колькасці!***

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

**Мэта:** перамяняць звычайнае сацыяльнае служэнне ў служэнне, якое выконвае педагагічную задачу, далучаючы да яго мясцовую супольнасць.

**Матэрыялы:** аркушы паперы, магнітна-маркерная дошка з папераю і каляровымі маркерамі, копіі прыкладнага плана (*матэрыялы 1 і 2*).

**Час:** 45 хвілінаў.

**Ход працы**

1. Раздзяліце ўдзельнікаў на дзве групы.
2. Дайце кожнай групе па адным матэрыяле.
3. Растлумачце, што ў іх ёсць 30 хвілінаў, каб змяніць грамадскую дзейнасць, апісаную ў дадзеным матэрыяле, на дзейнасць, якая выконвае педагагічную задачу. Групы павінны знайсці спосаб далучыць да справы мясцовую супольнасць праз *актывізацыю*, *адукацыю* і *анімацыю*, далучыць новых валанцёраў.
4. Кожная група прапануе свае ідэі.

*Матэрыял 1*

**Склад «Карытаса»**

Ваш парафіяльны «Карытас» мае вельмі простую структуру: ён складаецца са святара і маленькай групы валанцёраў, сустрэчы адбываюцца ў другой палове дня ў нядзелю.

Парафіяльны «Карытас» мае маленькі цэнтр выслухоўвання, адчынены з 14:00 да 16:00, дзе 2–3 валанцёры выслухоўваюць людзей, якія прыходзяць са сваімі праблемамі.

У гэты ж самы дзень з 14:00 да 16:00 адчынена адзіная сацыяльная служба парафіяльнага «Карытаса», дзе працуюць іншыя валанцёры: маленькі склад з розным адзеннем, ежаю і медыкаментамі, якія валанцёры раздаюць асобам у патрэбе.

Па правілах людзі спачатку павінны прыйсці ў цэнтр выслухоўвання, а пасля (калі ім патрэбна матэрыяльная дапамога) цэнтр выслухоўвання накіроўвае іх на склад.

Вы — група валанцёраў парафіяльнага «Карытаса» і жадаеце змяніць працу склада. У вас 30 хвілінаў, каб прапанаваць свае ідэі і дзеянні святару для развіцця педагагічнай задачы ў гэтым грамадскім служэнні.

*Матэрыял 2*

**Сацыяльная сталоўка «Карытаса»**

Ваш парафіяльны «Карытас» мае вельмі простую структуру: ён складаецца са святара і маленькай групы валанцёраў. Сустрэчы адбываюцца па нядзелях пасля святой Імшы, у асноўным з 10:30 да 13:00.

У парафіяльным «Карытасе» ёсць маленькі цэнтр выслухоўвання, адчынены па нядзелях з 10:30 да 12:00, дзе 2–3 валанцёры выслухоўваюць людзей, якія прыходзяць са сваімі праблемамі. Асобы ў патрэбе спачатку прыходзяць у цэнтр выслухоўвання, а пасля (калі гэта патрэбна), цэнтр выслухоўвання накіроўвае іх у адзіную сацыяльную службу ў парафіяльнай супольнасці: сацыяльную сталоўку, дзе яны могуць з’есці ня-

дзельны абед і паразмаўляць з валанцёрамі. Зразумела, што абед бясплатны.

Падчас працы цэнтра выслухоўвання (з 10:30 да 12:00) іншыя валанцёры гатуюць ежу, ахвяраваную на працягу тыдня імі самімі, святаром і некаторымі вернікамі з супольнасці. Калі ежы дастаткова, яны збіраюць пакункі, каб перадаць ежу на тыдзень бедным сем'ям.

Сацыяльная сталоўка адчыненая з 12:00 да 13:00 і раздае каля 20–25 абедаў кожную нядзелю.

Вы — група валанцёраў парафіяльнага «Карытаса» і жадаеце змяніць працу сацыяльнай сталоўкі. У вас 30 хвілінаў, каб прапанаваць свае ідэі і дзеянні святару для развіцця педагагічнай задачы ў гэтым грамадскім служэнні.

### *Заключэнне*

Парафіяльны «Карытас» не толькі дае адказы на праблемы, якія існуюць на дадзенай тэрыторыі, але і **актывізуе ўсю парафіяльную супольнасць:** такім чынам ён дае магчымасць кожнаму хрысціяніну праяўляць дзейсную любоў да бліжніх. Гэта называецца *педагагічнай задачай* «Карытаса». Інакш кажучы, парафіяльны «Карытас» не толькі арганізуе звычайнае грамадскае служэнне ў супольнасці, але павінен мець дакладныя правілы гэтага служэння: яно павінна скіроўвацца на карысць бедным і далучаць да працы ўсю супольнасць.

Гэтая **педагогіка дзеяння, як і актывізацыя, анімацыя і адукацыя**, з'яўляецца спосабам выканання педагагічнай задачы «Карытаса».

# АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА» — САЦЫЯЛЬНАЕ СЛУЖЭННЕ

Паразважаем пра важнасць грамадскага служэння і дзейнасці ў парафіяльным «Карытасе».

Самае істотнае — памятаць, што, «як цела без духу мёртвае, так і вера мёртвая без учынкаў» (Як 2, 26), і гэтак жа «Карытас» мёртвы без учынкаў міласэрнасці. Служыць сваім бліжнім і быць адкрытымі для маргіналаў і найбяднейшых людзей — гэта канкрэтнае сведчанне любові, сведчанне міласэрнасці.

Можна бясконца пералічваць паслугі, якія могуць прапаноўвацца бедным. Сучаснасць стварае ўсё новыя тыпы беднасці і кідае нам усё больш выклікаў. Парафіяльны «Карытас», магчыма, не можа вырашыць іх цалкам, але дакладна здольны зменшыць іх на сваёй тэрыторыі.

***Малітва***

*Якая карысць, браты мае, калі нехта кажа, што мае веру, а ўчынкаў не мае? Ці можа вера збавіць яго? Калі брат ці сястра знаходзяцца ў галечы, не маючы штодзённай ежы, а нехта з вас скажа ім: «Ідзіце ў спакоі, грэйцеся і насычайцеся», але не дасць ім неабходнага для цела, то якая з гэтага карысць? Так і вера без учынкаў мёртвая сама па сабе. Але нехта скажа: «Ты маеш веру, а я маю ўчынкі». Пакажы мне веру тваю без учынкаў, а я пакажу табе веру маімі ўчынкамі. Ты верыш, што ёсць адзін Бог? Добра робіш. Злыя духі таксама вераць і дрыжаць! Але ці хочаш ведаць, пусты чалавеча, што вера без учынкаў мёртвая? Ці не праз учынкі быў апраўданы айцец наш Абрагам, калі прынёс свайго сына Ісаака на ахвярнік? Ты бачыш, што вера супрацоўнічала з яго ўчынкамі і дзякуючы ўчынкам вера ўдасканалілася. Так споўнілася Пісанне, якое кажа: «Абрагам паверыў Богу, і гэта залічылася яму як справядлівасць», і ён быў названы сябрам Божым. Бачыце, што чалавек апраўдваецца праз учынкі, а не толькі праз веру. Таксама і Рахаб, распусніца, ці ж не ўчынкамі была апраўдана, калі прыняла пасланцоў і адправіла іх іншай дарогай. Бо, як цела без духу мёртвае, так і вера мёртвая без учынкаў.*

(Як 2, 14–26)

Карані нашай любові трэба шукаць у Святым Пісанні. Такім чынам, нашая вера павінна быць дзейснаю, як сказаў святы Якуб, і павінна адыгрываць важную ролю ў нашым жыцці — мы не толькі павінны слухаць Божае слова, але і выконваць яго. Гэта асаблівым чынам увасабляецца ў дзейнасці «Карытаса» і дабрачыннасці.

### *Тэарэтычная частка*

Кожны хрысціянін павінен рабіць для сваіх бліжніх нешта канкрэтнае, дапамагаць ім добрымі ўчынкамі. Для нас Езус Хрыстус з’яўляецца найлепшым прыкладам, бо сваімі добрымі і знакавымі ўчынкамі Ён паказаў нам правільны шлях, які вядзе да Божага Валадарства.

Некаторыя фрагменты са Святога Пісання паказваюць прыклад таго, як хрысціянін можа ажыццяўляць словы Езуса і як можна клапаціцца і служыць у пакоры, без пагарды, аддаючы свой час бескарысліва, дабравольна, вяртаючы людзям надзею. Прыклады гэтага апісаныя ў наступных фрагментах Новага Запавету: Лк 10, 29–37 (прыпавесць пра добрага самараніна); Мц 25, 31–46 (прыпавесць пра авечак і казлоў); Дз 4, 32–37 (вернікі дзеляцца сваёю маёмасцю).

Давайце разгледзім адзін з гэтых прыкладаў: прыпавесць пра добрага самараніна. Цікава было б прачытаць яе і прааналізаваць у групе, пачаўшы са сцверджанняў, якія асабліва падкрэсліваюць важнасць учынкаў самараніна: гэта мадэль таго, як трэба прапаноўваць дапамогу іншым людзям (Езус гаворыць кніжніку напрыканцы прыпавесці: «Ідзі і ты рабі так»).

– «*Адзін чалавек ішоў з Ерузалема ў Ерыхон і трапіў у рукі разбойнікаў, якія знялі з яго адзенне, пабілі яго і пайшлі, пакінуўшы ледзь жывога*» (Лк 10, 30). Гэты чалавек — кожны чалавек у нашай супольнасці, які можа трапіць у бяду, усе мы, з кім здараюцца праблемы, каго напаткалі беднасць і патрэбы. Чалавек ішоў па складаным шляху (нават сёння дарога з Ерузалема ў Ерыхон скалістая і пакручастая), магчыма, ён не вельмі добра спланаваў свой шлях і нейкім чынам трапіў у небяспеку так, што ў рэшце рэшт сам аказаўся «вінаватым» у тым, што адбылося, у тым, што застаўся без нічога. Але неістотна, як і чаму ён трапіў у нястачу, у беднасць; яму патрэбна дапамога, і мы пакліканыя дапамагчы яму, не асуджаючы яго. Гэты чалавек увасабляе ўсіх бедных вакол нас.

– «*А нейкі самаранін, падарожны, натрапіў на яго і, убачыўшы, злітаваўся*» (Лк 10, 33). Мы, гэтак жа, як самаранін, мусім найперш убачыць прысутнасць бедных і адчуць да іх літасць («клопат пра бедных»), і не праходзіць міма, як святар і левіт у прыпавесці. Самараніну трэба было рухацца далей, але ён спыніўся: ён дапамагаў не ў свой вольны час, а быў гатовы адкласці ўласныя планы, каб дапамагчы беднаму, бо гэта было найважнейшым. Мы таксама пакліканыя паўтараць за ім: не трэба чакаць, пакуль бедныя з'явяцца там, дзе мы звычайна бываем; мы павінны ісці і шукаць іх вакол сябе.

– «*Падышоў, перавязаў яму раны, палівачы алеем і віном. І, пасадзіўшы яго на сваю жывёліну, прывёз у заезд і паклапаціўся аб ім*» (Лк, 10, 34). Мадэль дапамогі, увасобленая самаранінам, — гэта сукупнасць канкрэтных дзеянняў і маральнай падтрымкі. Перш за ўсё самаранін аказаў беднаму ўсю магчымую матэрыяльную дапамогу: даў віно, алей, жывёліну, зрабіў перавязку. Ён даў усё, што мог. Але мы пакліканыя клапаціцца не толькі пра матэрыяльныя патрэбы бедных (у гэтым выпадку — пра раны), а мусім памятаць і пра іх духоўныя праблемы (у гэтым выпадку — патрэба ў любові і клопаце; калі вы добра прачытаеце прыпавесць, то заўважыце, што самаранін пасяліўся ў заездзе разам з церпячым, каб быць побач з ім уночы).

– «*А на другі дзень, ад'язджаючы, дастаў два дынары, даў карчмару*» (Лк 10, 35). Самаранін — сапраўдны валанцёр, бо гатовы бескарысліва аддаць тое, што яму належыць (грошы)!

– «*І сказаў яму: "Паклапаціся аб ім. А калі патраціш больш, я аддам табе, калі вярнуся"*» (Лк 10, 35). У многіх даследаваннях падкрэслівалася, што «заезд» азначае «супольнасць». У такім выпадку самаранін клапоціцца не толькі пра бедных, але і далучае да гэтага мясцовую супольнасць людзей: гэта значыць, што нашыя сацыяльныя службы павінны чыніць гэтак жа, не толькі клапоцячыся пра асобаў у патрэбе, але і як мага больш далучаючы да гэтай справы супольнасць (педагагічная задача). Больш за тое, самаранін мусіў працягваць свой шлях, але адчуваў да

беднага сапраўдную літасць. Ён сказаў: «Я вярнуся», упэўнены, што не забудзецца пра гэтага чалавека, які стаў ягоным бліжнім, і будзе падтрымліваць з ім адносіны.

У гэтым сэнсе «Карытас» не можа не рабіць канкрэтных учынкаў любові, бо служэнне бліжняму з'яўляецца сапраўдным знакам любові. Парафіяльны «Карытас» не можа функцыянаваць, займаючыся аднымі толькі размовамі і распазнаваннем цяжкасцяў, — неабходны канкрэтныя ўчынкі. Калі ў парафіяльнай супольнасці ёсць «Карытас» і ёсць разуменне праблемаў і патрэбаў, якія існуюць у гэтай мясцовасці, «Карытас» павінен імкнуцца даць адказы на гэтыя праблемы! Гэтыя адказы і называюцца сацыяльным служэннем.

Сацыяльнае служэнне ў межах «Карытаса» неабходнае — яно з'яўляецца ключавою часткаю працы. Яно мае вялікае значэнне, і без яго «Карытас» дэманструе бяздзейсную веру, веру без учынкаў.

Сацыяльнае служэнне ў межах парафіяльнага «Карытаса» павінна быць адказам на канкрэтныя праблемы супольнасці як канчатковы «прадукт» аналізу патрэбаў мясцовых людзей: добра арганізаваны парафіяльны «Карытас» рэагуе на сітуацыю, калі добра ведае яе!

Таму на пачатку сацыяльнага служэння неабходна добра прааналізаваць сітуацыю. Толькі калі аналіз праблемаў тэрыторыі завершаны, калі мы ведаем людскія патрэбы і рэсурсы, мы павінны даць свой канкрэтны адказ на гэтыя патрэбы. Проста ведаць іх — недастаткова!

Выклікі, з якімі неабходна змагацца, цяжка пералічыць: адзінота, хваробы, матэрыяльная беднасць, залежнасць, расізм, вайна, маргіналізацыя, надзвычайныя здарэнні... спіс можа быць бясконцым!

Існуе мноства відаў сацыяльнага служэння, каб супрацьстаяць гэтым выклікам, але ў кожным «Карытасе» яны могуць быць свае. Кожны арганізуе служэнне паводле сваіх магчымасцяў.

Вось некаторыя прыклады: грамадская кухня, наведванне хворых і пажылых у іх дома, раздача адзення бедным... Папа Ян Павел II у сваёй працы «*Novo millennio ineunte*» адзначыў, што калі мы думаем і арганізоўваем сацыяльнае служэнне ў парафіяльным «Карытасе», «фантазія ў міласэрнасці — карыстайцеся ёю!».

Сацыяльнае служэнне дае супольнасці магчымасць сведчыць пра Божую любоў. Сацыяльнае служэнне — гэта знак для тых, хто можа дапамагчы, бо яны становяцца «голасам» асобаў у патрэбе ў дадзенай мясцовасці. Сацыяльнае служэнне найперш з'яўляецца знакам для асобаў у патрэбе, даючы ім надзею і шлях выйсця са складанай сітуацыі.

***Не забывайцеся:***

***1) Мэтаю сацыяльнага служэння «Карытаса» з'яўляюцца найбяднейшыя — «Карытас» працуе, каб клапаціцца пра людзей, забытых грамадствам.***

***2) Галоўная мэта сацыяльнага служэння не ў тым, каб вырашаць усе праблемы цалкам — «Карытас» не павінен вырашаць усе праблемы грамадства!***

## МЭТАВАЯ АЎДЫТОРЫЯ САЦЫЯЛЬНАГА СЛУЖЭННЯ «КАРЫТАСА»

У Евангеллі паводле Мацвея Езус ясна вызначае, хто з'яўляецца мэтавай аўдыторыяй нашай працы як хрысціянаў, і дае некалькі канкрэтных прыкладаў, каб лепш гэта разумець:

*«“Бо Я быў галодны, і вы далі Мне есці; прагнуў, і вы напаілі Мяне; быў падарожным, і вы прынялі Мяне; быў голы, і вы апранулі Мяне; быў хворы, і вы адведалі Мяне; быў у вязніцы, і вы прыйшлі да Мяне”. Тады адкажуць Яму справядлівыя: “Пане, калі мы бачылі Цябе галодным і накармілі, ці сасмяглым і напаілі? Калі мы бачылі Цябе падарожным і прынялі, ці голым і апранулі? Калі мы бачылі Цябе хворым ці ў вязніцы і прыйшлі да Цябе?” І Валадар скажа ім у адказ: “Сапраўды кажу вам: тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі”»* (Мц 25, 35–40).

Такім чынам, мэтавая аўдыторыя сацыяльнага служэння «Карытаса» — гэта найбяднейшыя. Кожны раз, калі мы робім нешта для іх, мы практыкуем Божую любоў, як вучыў нас Езус. Прыклады, якія Ён даў, падыходзяць для кожнай краіны і кожнай гістарычнай эпохі: галодныя, прагнучыя, тулягі, голыя, хворыя, асуджаныя. Гэтыя катэгорыі людзей — і ўсе людзі, якія жывуць ва ўмовах беднасці і адкінутасці грамадствам, — павінны быць нашай мэтавай аўдыторыяй.

## ПЕДАГАГІЧНАЯ ЗАДАЧА САЦЫЯЛЬНАГА СЛУЖЭННЯ

Усё сацыяльнае служэнне ў межах «Карытаса» павінна існаваць з усведамленнем яго педагагічнай задачы: любая актыўнасць «Карытаса», у тым ліку і грамадская, павінна мець за мэту далучэнне да працы ўсёй супольнасці. Такім чынам «Карытас» павінен сапраўды стаць парафіяльнай арганізацыяй, а грамадскае служэнне ў межах парафіяльнага «Карытаса» павінна быць сведчаннем дзейснай любові (*caritas*) і яе пашырэння.

Пашырэнне сацыяльнага служэння мае ключавую ролю: яно не павінна існаваць толькі для некаторых асобаў. На жаль, часта здараецца, што многія сацыяльныя службы парафіяльнага «Карытаса» працуюць нена належным узроўні, бо забываюцца пра сваю педагагічную задачу. Людзі, якія працуюць у гэтых службах, часта гавораць, што маюць праблемы з прычыны адсутнасці валанцёраў.

Такім чынам, калі вы плануеце арганізаваць сацыяльнае служэнне, думайце, як вы будзеце далучаць да яго новых людзей — валанцёраў, і тады вашае служэнне будзе адкрытым для кожнага, а яго праца стане выразным хрысціянскім сведчаннем.

Не забывайцеся далучаць да працы ўсю супольнасць і новых людзей з самага пачатку ініцыятывы. Калі вы спрабуеце знайсці валанцёраў тады, калі ўжо тэрмінова патрэбная іх дапамога, гэта звычайна не спрацоўвае!

## МАГЧЫМАЯ РЫЗЫКА

1. Калі ў парафіяльным «Карытасе» арганізоўваецца сацыяльная служба, нельга лічыць яе адзінаю дзейнасцю «Карытаса», гэта толькі адна яе частка. Такім чынам, сацыяльнае служэнне не можа заняць месца «Карытаса», а парафіяльны «Карытас» нашмат важнейшы і складанейшы за любую сацыяльную службу.

2. Існуе рызыка выбарачнай дзейнасці. Выбіраючы магчымае сацыяльнае служэнне, неабходна ўлічваць наступнае:
- патрэбы і рэсурсы дадзенай мясцовасці (іх неабходна добра ведаць);
- дапамогу найбольш маргіналізаваным людзям (парафіяльны «Карытас» павінен дапамагаць ім);
- педагагічную задачу (выбіраючы дзейнасць, супольнасць мусіць улічваць, што ўсе яе чальцы павінны быць далучанымі да гэтай справы і рабіць свой унёсак).

## ПРЫНЦЫПЫ СУМЛЕННАГА САЦЫЯЛЬНАГА СЛУЖЭННЯ

Плануючы распачаць сацыяльнае служэнне або ўжо працуючы (кіруючы) нейкай сацыяльнай службаю, не забывайцеся аналізаваць, ці выконваеце вы галоўныя прынцыпы сумленнага служэння «Карытаса»:

**1. Прынцыпы для пачатку служэння.**

Ці з’яўляецца сацыяльнае служэнне:
- вынікам аналізу праблемаў мясцовасці;
- вынікам даследавання, паводле якога высветлілася, што не існуе (або мала) падобных службаў у дадзенай мясцовасці;
- неабходнасцю, каб уся супольнасць разам вырашала праблемы;
- арганізаваным так, каб ролі і адказнасць былі зразумелыя ўсёй групе «Карытаса»?

**2. Прынцыпы рэалізацыі дапамогі.**

Ці з’яўляецца сацыяльнае служэнне:

- развіццём для асобаў у патрэбе або толькі дабрачыннаю падтрымкаю для іх;
- спосабам для бедных выйсці з ўласнага стану беднасці;
- знакам для бедных, які сведчыць, што Бог — гэта любоў, і знакам для ўсіх хрысціянаў, бо паказвае, як наследаваць прыклад Езуса;
- не толькі канкрэтным дзеяннем, але і шляхам, які дапамагае лепш зразумець прычыны ўзнікнення праблемы;
- кантактаваннем з сацыяльнымі інстытутамі і службамі?

**3. Прынцыпы выканання педагагічнай задачы «Карытаса».**

Ці з’яўляецца сацыяльнае служэнне:

- не толькі клопатам пра найбяднейшых, але і далучэннем да працы супольнасці;
- прапановаю новай ментальнасці, новых падыходаў, новых нормаў жыцця ў парафіяльнай супольнасці;
- клопатам пра адукацыю валанцёраў, супрацоўнікаў і супольнасці ў цэлым?

**4. Прынцыпы аналізу працы «Карытаса»**.

Ці з’яўляецца сацыяльнае служэнне:

- спланаваным так, што супрацоўнікі і валанцёры могуць рэгулярна праводзіць і атрымліваць аналіз выкананага служэння;
- рэгулярным аналізам праблемаў мясцовасці з мэтаю адаптавання да новых формаў беднасці, калі гэта будзе неабходна;
- найлепшым выкарыстаннем рэсурсаў (людзей, структураў, фінансаў)?

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

Майстар-клас

**Як арганізаваць сацыяльнае служэнне ў парафіі**

**Мэта:** спланаваць аснову сацыяльнага служэння ў парафіяльным «Карытасе».

**Матэрыялы:** аркушы паперы, алоўкі, магнітна-маркерная дошка або звычайная дошка.

**Час:** 1 гадзіна 30 хвілінаў.

**Ход працы**

1. Арганізуйце сустрэчу з парафіяльным «Карытасам». Запрасіце ўсіх актыўных чальцоў і патэнцыяльных валанцёраў.

2. Прапануйце правесці кароткую (20 хв.) адкрытую дыскусію (мазгавы штурм) для ўсёй групы на тэму: «Якія формы беднасці ёсць у нашай супольнасці?» (запішыце адказы на дошцы).

3. Раздзяліце групу на дзве часткі. Група А выбірае адну з найважнейшых праблемаў са спісу, група В выбірае іншую з найважнейшых праблемаў са спісу.

4. Праца ў малых групах (30 хв.). Групы А і В запісваюць на паперы:

– асноўныя групы **парафіяльнай супольнасці** (сямейныя, моладзевыя, валанцёры, кансэкраваныя асобы) або **службы,** якія працуюць на тэрыторыі (грамадскія і прыватныя) і ўжо займаюцца выбранымі праблемамі;

– тых, хто можа даць **дакладную інфармацыю** па гэтых праблемах у дадзенай мясцовасці (сацыяльныя службы, якія існуюць у дадзенай мясцовасці, могуць ужо валодаць дастатковай інфармацыяй пра яе: варта ведаць, хто самы інфармаваны ў парафіі, ці ёсць у мясцовасці нейкія іншыя суб’екты, якія займаюцца гэтаю праблемаю);

– якія-небудзь **шляхі/віды дзейнасці, каб ахапіць людзей, якія пакутуюць ад праблемаў, выбраных вамі для вырашэння.** Заўсёды сачыце, каб бедныя не сталі «рэцыпіентамі» або «аб'ектамі», яны павінны быць пратаганістамі, суб'ектамі ў працэсе вызвалення ад беднасці; да іх неабходна ставіцца з любоўю і павагаю.

5. Намалюйце (30 хв.) простую схему, якая стане вашым планам дзеяння. Не забывайцеся пра педагагічную задачу (прыведзеная ніжэй схема — у якасці прыкладу).

| Неабходная дзейнасць | Адказны ў групе | Матэрыял / Месца / Неабходныя людзі | Даступныя рэсурсы |
|---|---|---|---|
| Знайсці інфармацыю па праблеме | Дзмітрый | аналіз праблемы беднасці, зроблены дзяржаўнымі службамі; дадзеныя са шпіталя; інтэрв'ю са святаром | – |
| Далучаць і навучаць валанцёраў | Павел | пакой для трэнінгаў, добры трэнер, прынамсі 4 валанцёры | пакой у парафіі |
| Наведванне пажылых людзей у патрэбе | Ганна | прынамсі 4 валанцёры, архіў, каб збіраць інфармацыю аб наведваннях | аўтамабіль парафіяльнага «Карытаса» |
| Педагагічная дзейнасць: інфармацыйная кампанія для заахвочвання людзей, прамовы на святой Імшы | Юлія | грошы для друку і распаўсюджвання 500 брашураў | святар можа зрабіць казанне па канкрэтнай праблеме падчас святой Імшы |
| ... | ... | ... | ... |

6. Распавесці пра вынікі іншай групе і крыху абмеркаваць прапановы (10 хв.).

## *Заключэнне*

Сацыяльнае служэнне ў межах «Карытаса» неабходнае, бо з’яўляецца сапраўдным і **канкрэтным сведчаннем хрысціянскай любові.** Яно з’яўляецца знакам для асобаў у патрэбе, які сведчыць, што надзея жыве і ёсць выйсце з іх праблемаў. Без сацыяльнага служэння «Карытас» будзе дэманстраваць толькі бяздзейсную веру, бо ў ім не будзе дзейснай любові.

Мэтавай аўдыторыяй сацыяльнага служэння «Карытаса» **з’яўляюцца найбяднейшыя людзі і супольнасць** у цэлым, якую трэба далучаць да працы, каб ажыццяўляць педагагічную задачу «Карытаса» на практыцы.

# АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА» — КААПЕРАЦЫЯ, КААРДЫНАЦЫЯ І КАЛЕКТЫЎНАЯ ПРАЦА

Ніводная арганізацыя не можа існаваць без добрай унутранай каардынацыі, калектыўнай працы і кааперацыі з іншымі арганізацыямі ў дадзенай мясцовасці і нават за яе межамі.

У гэтым раздзеле тлумачыцца, што такое каардынацыя ўнутры парафіі, што ўяўляюць з сябе кааперацыя, каардынацыя і калектыўная праца (ККК) у кантэксце мясцовых рэаліяў.

### *Малітва*

*Слухай, Ізраэль: Пан, Бог наш, Пан адзіны! Любі Пана Бога твайго ўсім сэрцам тваім, усёй душою тваёю, усім розумам тваім і з усіх сілаў тваіх. Няхай гэтыя словы, якія сёння Я наказваю табе, будуць у сэрцы тваім. Будзеш навучаць ім дзяцей сваіх і гаварыць пра іх, калі будзеш дома, падчас твайго падарожжа, кладучыся спаць і ўстаючы. Прывяжаш іх, як знак, да рукі сваёй, і яны будуць табе як павязка паміж вачыма тваімі.*

(Дрг 6, 4–8)

Божая любоў — не індывідуальны досвед, а супольная дзейнасць. Таму неабходна падтрымліваць камунікацыю і інфармаваць іншых пра тое, чым мы займаемся, імкнучыся супрацоўнічаць з імі (кааперацыя) і злучаць нашыя намаганні (каардынацыя), каб вырашаць праблемы ў сваёй мясцовасці. Гэты падыход павінен быць штохвілінным: калі сядаеш, калі ідзеш, калі кладзешся, калі ўстаеш...

### *Тэарэтычная частка*

Парафіяльны «Карытас» — не адзіная дзейсная арганізацыя ў хрысціянскай супольнасці і ў грамадстве. Яна можа штодня быць у кантакце з іншымі арганізацыямі і асобамі парафіяльнага жыцця (прэзбітар і біскуп, Парафіяльная рада, катэхеты, законніцы, іншыя парафіяльныя супольнасці, дыяцэзіяльны «Карытас»), гэтак жа, як і з грамадскімі інстытутамі (выканаўчыя арганізацыі, шпіталі, сацыяльныя службы, служба занятасці, школы). У штодзённым жыцці яна можа падтрымліваць кантакт з прыватнымі арганізацыямі — індывідуальнымі прадпрымальнікамі і гандлёвымі фірмамі.

Улічваючы ролі назірання за праблемамі ў мясцовасці і анімацыі супольнасці, якія павінен выконваць кожны парафіяльны

«Карытас», неабходна разумець, як заставацца ў кантакце і падтрымліваць плённыя ўзаемаадносіны з усімі гэтымі дзейснымі асобамі і арганізацыямі.

Існуе тры віды сумленных узаемаадносінаў, якія могуць стварыцца ў парафіяльным «Карытасе» — яны маюць назву «ККК»:

- **Кааперацыя —** гэта раздзяленне працы; кожная асоба і арганізацыя нясе адказнасць за сваю частку вялікай працы. Звычайна гэта адбываецца нефармальна, мэты не вызначаюць супольна, планы не абмяркоўваюць разам, але, па неабходнасці, дзеляцца інфармацыяй.
- **Каардынацыя** — развіццё больш блізкага супрацоўніцтва, для якога неабходна супольнае планаванне некаторых дзеянняў і больш цеснае супрацоўніцтва.
- **Калектыўная праца** — гэта агульная ўключанасць усіх удзельнікаў групы, каардынаваныя супольныя высілкі з мэтаю вырашыць праблему. Гэта азначае супольную працу, супольныя мэты, якія акрэсліваюцца ў ходзе партнёрскай працы. Лідарства, рэсурсы, рызыка, кантроль вынікаў з’яўляюцца супольнымі. Калектыўная праца дазваляе дасягнуць большага, чым індывідуальныя намаганні.

Няма ўніверсальнага найлепшага тыпу адносінаў: усё залежыць ад дзейнасці і праектаў. Усе пералічаныя тыпы могуць прынесці **карысць удзельнікам ККК працэсаў:** яны дазваляюць ведаць пра ўсё, што адбываецца, даюць падтрымку вашым дзеянням, доступ да агульных рэсурсаў і навыкаў, дазваляюць дасягнуць мэтаў, якіх арганізацыі і асобы не ў стане дасягнуць самі па сабе, фармуюць базу для дзейнасці, якая можа прывабіць іншыя арганізацыі, пашыраюць базу падтрымкі.

## КААРДЫНАЦЫЯ ПРАЦЫ ЎНУТРЫ ПАРАФІІ

Існуюць два асноўныя пункты, якія датычаць каардынацыі працы ўнутры парафіі:

– каардынацыя роляў у парафіяльным «Карытасе»;
– каардынацыя дабрачынных акцый у парафіі.

**У межах парафіяльнага «Карытаса»** трэба вельмі дакладна падзяляць ролі, каб не ўзнікала блытаніны. Неабходна загадзя вырашыць, хто чым займаецца. Чальцы добра арганізаванай групы практыкуюць кааперацыю, а не канкурэнцыю: яны адказваюць за выкананне ўласных функцый у дасягненні агульных мэтаў, а таксама прызнаюць, што камандны падыход у працы спрыяе ўзаемнай падтрымцы.

Звычайна людзі ў паспяховых камандах/супольнасцях:

– вызначаюць функцыі, адносіны, заданні і адказнасць;

– дзеляць лідарскія функцыі ў групе і выкарыстоўваюць усе магчымыя чалавечыя рэсурсы (у «Карытасе» не бывае «вялікай паразы»!);

– церпяць нявызначанасць, недакладнасць і ўяўную недакладнасць структуры;

– цікавяцца дасягненнямі кожнага чальца гэтак жа, як і дасягненнямі групы;

– застаюцца адкрытымі да зменаў, інавацый і крэатыўнага падыходу ў вырашэнні праблемаў;

– лічаць сваім абавязкам падтрымліваць групавую камунікацыю ў выкананні заданняў і раскладах, дапускаючы ўзнікненне нестыковак;

– падтрымліваюць канструктыўную крытыку і карысныя водгукі;

– імкнуцца да даверу, надзейнасці і адказнасці ў групе;

– імкнуцца ўсталяваць такія нормы працы, якія дазволілі б усім чальцам падтрымліваць і паважаць адзін аднаго, застаючыся рэалістамі ў тым, чаго яны чакаюць адзін ад аднаго.

Асноўная каардынацыя **ў межах парафіі** — гэта няспыннае супрацоўніцтва з групамі або часткамі парафіяльнай супольнасці. У кожнай парафіі ёсць шмат дзейсных асобаў і арганізацый, якія выконваюць розныя ролі: святар, каардынатар «Карытаса», сакратар, пратакаліст, скарбнік, аніматары, валанцёры, моладзь, законніцы, чальцы Парафіяльнай рады, чальцы Рады па экана-

мічных справах, прадстаўнікі супольнасці жанчын, мясцовы школьны настаўнік, катэхеты — гэты спіс можна працягваць.

Калі вы дзеліцеся інфармацыяй і каардынуеце сваю працу, вашая дзейнасць не будзе ізаляванаю, а ўсе яе этапы можна будзе планаваць разам. Такім чынам, парафіяльны «Карытас» нічога не робіць сам па сабе: ён дзейнічае ад імя парафіі і дзеля дабра ўсёй супольнасці.

Таксама важна далучаць да працы розныя групы, бо гэта забяспечыць лепшы вынік працы. Супольна можна стварыць гадавы план працы для кожнай групы.

*Напрыклад: дабрачынную дзейнасць парафіяльнага «Карытаса» павінны падтрымліваць катэхеты, гэтая дзейнасць павінна планавацца разам з імі, каб яны таксама маглі распавядаць пра яе ў межах сваёй працы, або разам з літургічнай групай яны могуць зрабіць спецыяльную літургію, ахвяраваўшы яе за пэўную дзейнасць.*

## КАЛЕКТЫЎНАЯ ПРАЦА НА ЎЗРОЎНІ ДЫЯЦЭЗІІ

Не забывайцеся далучаць да сваёй дзейнасці ваш дыяцэзіяльны «Карытас» і падтрымліваць з ім кантакт! Падтрымлівайце з ім адносіны — гэта важна, каб мець доступ да інфармацыі, да таго ж, такім чынам вас будуць уключаць у разнастайныя трэнінгі і фармацыйныя праграмы, якія арганізуюцца ў дыяцэзіі, што таксама можа дапамагчы вам у вырашэнні вашых праблемаў.

## ККК І ІНШЫЯ РЭАЛІІ Ў ДАДЗЕНАЙ МЯСЦОВАСЦІ

### Уменне знаходзіць партнёраў

У любой дзейнасці самыя моцныя партнёрскія сувязі і праекты маюць тыя, у каго найлепшыя арганізацыі-партнёры. Для парафіяльнага «Карытаса», які мае вызначанае поле дзейнасці (працэс слухаць — назіраць — распазнаваць), вельмі важна:

– убачыць у супольнасці, якія партнёры будуць мець большае значэнне ў працы;

– выкарыстоўваць розныя магчымасці — і сярод кантактаў, якія ўжо ёсць, і шляхам стварэння новых;

– выбіраць лепшых партнёраў і забяспечваць іх актыўны ўдзел у працы.

*Напрыклад: парафіяльны «Карытас», выслухаўшы людзей і правёўшы назіранні ў сваёй мясцовасці, вырашае дзейнічаць у кірунку клопату пра пажылых адзінокіх людзей, якія хварэюць і не могуць рухацца, і якіх не наведвае ніхто з сацыяльных службаў. Парафіяльны «Карытас» прапаноўвае наведваць пажылых чальцоў супольнасці раз на тыдзень, прыбіраць у іх і ствараць магчымасць для сацыялізацыі. Гэтым можа займацца сам «Карытас»... але ўявіце, наколькі лепш будзе далучыць да гэтай дзейнасці сацыяльных работнікаў, дактароў са шпіталя, іншыя грамадскія арганізацыі. Усе разам могуць дзяліцца сваімі ведамі, інфармацыяй, рэсурсамі, прыкладаць агульныя высілкі.*

Вы зусім не траціце час, калі вырашаеце сабраць больш інфармацыі з дапамогаю вашых магчымых партнёраў, напрыклад, улічваючы іх мінулы досвед у гэтай сферы (можна прачытаць іх гадавыя справаздачы, праверыць вэбсайт, арганізаваць з імі сустрэчу або папрасіць кансультацыі).

Знайшоўшы добрых партнёраў, неабходна, каб парафіяльны «Карытас» папрасіў сустрэчы з прадстаўніком партнёрскай арганізацыі. Сустрэчы могуць мець важнае значэнне, даючы арганізацыям магчымасць вырашыць, ці жадаюць яны супрацоўнічаць. Вы павінны ясна растлумачыць іншай арганізацыі, у чым карысць такога супрацоўніцтва, які ўнёсак яны могуць зрабіць у працу, якія выгоды могуць атрымаць. Можна арганізаваць спецыяльныя майстар-класы (майстэрні, наведванні, абмен досведам), каб лепш зразумець ідэю партнёрства.

Звычайна цяжэй наладзіць трывалае супрацоўніцтва з мясцовымі ўладамі (цяжэй, чым з грамадскімі арганізацыямі): трэба прыкласці шмат намаганняў, пераконваючы іх актыўна далучацца да супрацоўніцтва, паказаць ім усе выгоды, якія яны могуць атрымаць, і мэты, якіх могуць дасягнуць.

Усе сектары арганізацый — і грамадскія, і прыватныя — маюць уласныя чалавечыя, тэхнічныя і прафесійныя рэсурсы рознага кшталту. Разам яны могуць аб’яднаць шмат рэсурсаў для ажыццяўлення патрэбнай дзейнасці.

**ККК з грамадскім сектарам арганізацый**

Грамадскі сектар складаецца з урадавых арганізацый і сацыяльных службаў: шпіталяў, выканаўчых арганізацый, школаў, інстытутаў мясцовай улады. Грамадскі сектар можа палегчыць доступ да вялікай колькасці інфармацыі, забяспечыць стабільнасць і легітымнасць дзейнасці.

Іх можна далучыць не толькі да анімацыйнай працы, але і да працы па вывучэнні праблемы беднасці, бо звычайна яны маюць статыстычныя дадзеныя, сутыкаючыся ў сваёй дзейнасці з маргінальнымі катэгорыямі насельніцтва. Таму супрацоўніцтва з імі можа быць вельмі карысным для парафіяльнага «Карытаса», калі яму спатрэбіцца пэўная інфармацыя. Гэта азначае, што вы сэканоміце ўласны час, не праводзячы сваіх даследаванняў і апытанняў.

Яны таксама могуць гарантаваць вам лепшае супрацоўніцтва на ўзроўні *Public Relations* — супрацоўніцтва з мясцовымі журналістамі, прэс-службамі, тэлеканаламі, радыёстанцыямі. Калі парафіяльны «Карытас» наладжвае добрыя кантакты ў грамадскім сектары арганізацый, яму лепш удаецца развіваць свае ініцыятывы, добрыя праекты, пашыраць удзел у іх.

**ККК з прыватным сектарам арганізацый**

Прыватны сектар арганізацый звычайна складаецца з малых і вялікіх прадпрымальніцкіх кампаній. Іх падмуркам з’яўляецца прыбытак, таму іх матывацыі адрозніваюцца ад матывацый парафіяльнага «Карытаса», але ў той жа час прыватны сектар вынаходлівы, прадуктыўны, засяроджаны на справе і хутка дзейнічае.

У апошні час прыватны сектар арганізацый усё часцей і часцей звяртае асаблівую ўвагу на беднасць, якая нас атачае. Звычайна прыватны сектар не ўсведамляе ўласных магчымасцяў, каб стаць карпаратыўна сацыяльна адказным. «Карытас» можа паказаць яму розныя формы беднасці і падказаць, што можна зрабіць, падкрэсліваючы, што фірма, якая актыўна вырашае праблемы беднасці, можа зарабіць не толькі грошы, але і стварыць лепшы імідж у грамадстве.

Паколькі гэта прыбытковыя арганізацыі, іх неабходна далучаць да працы з маргінальнымі катэгорыямі насельніцтва, каб яны дапамагалі вырашаць такія праблемы, як беспрацоўе, сацыялізацыя людзей з інваліднасцю.

**ККК з грамадскімі арганізацыямі**

Існуе вялікі шэраг грамадскіх арганізацый: гуманітарныя фонды, асацыяцыі (напрыклад: аховы экалогіі, помнікаў культуры), арганізацыі для моладзі, спартовыя каманды, музычныя гурты, палітычныя партыі, гандлёвыя саюзы.

Падмуркамі грамадскіх арганізацый з'яўляюцца каштоўнасці: яны дзейнічаюць, натхнёныя вераю ў пэўныя ідэі (напрыклад: салідарнасць, ахова навакольнага асяроддзя, палітычныя ідэі, абарона правоў). Звычайна грамадскія арганізацыі працуюць хутка, яны інклюзіўныя і крэатыўныя. Гэта спрыяе развіццю грамадства:

– праз дапамогу ў індывідуальным развіцці і крэатыўнасць;

– праз падтрымку і служэнне тым, хто знаходзіцца пад пагрозаю і перажывае маргіналізацыю;

– праз абарону агульных грамадскіх інтарэсаў.

Па ўсіх гэтых прычынах «Карытас» можа лічыцца грамадскаю арганізацыяй, таму яму лягчэй наладжваць адносіны ККК з іншымі гэткімі ж арганізацыямі.

| Магчымае партнёрства з грамадскімі сацыяльнымі інстытутамі | Магчымае партнёрства з прыватным сектарам і грамадскімі арганізацыямі |
|---|---|
|  |  |

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

### Падрыхтоўчая гульня — «Гордыеў вузел»

**Мэта:** паказаць, як каардынацыя і камунікацыя могуць вырашаць нават вельмі складаныя праблемы («Гордыеў вузел»).
**Матэрыялы:** не патрэбны.
**Час:** 10 хвілінаў.

**Ход працы**

Гульню трэба праводзіць на пачатку сустрэчы, адразу пасля малітвы.

1. Усе гульцы становяцца ў кола і сыходзяцца як мага бліжэй да сярэдзіны, каб стаяць вельмі цесна.

2. Усе падымаюць рукі, заплюшчваюць вочы і бяруцца за рукі.

3. Далей трэба расплюшчыць вочы і «развязаць вузел», рухаючыся куды заўгодна, але не адпускаючы рук.

## Майстар-клас

**Мэта:** на розных узроўнях наладзіць ККК.
**Матэрыялы:** раздаюцца загадзя падрыхтаваныя матэрыялы.
**Час:** 30 хвілінаў.

**Ход працы**

**1.** Раздзяліце ўдзельнікаў на маленькія групы па 4–5 чалавек.

**2.** Раздайце кожнай групе загадзя падрыхтаваныя матэрыялы. Усе маюць 20 хвілінаў, каб выканаць заданне.

**3.** Кожная група прэзентуе вынікі сваёй працы, іншыя групы каментуюць і абмяркоўваюць арганізаваны працэс ККК.

*Матэрыял 1*

Дырэктар дыяцэзіяльнага «Карытаса» запрошаны на сустрэчу з Парафіяльнаю радаю (ПР) з мэтаю развіваць парафіяльны «Карытас». У вас няма інфармацыі пра парафію, але вы ведаеце, што ПР складаецца з 10-ці чалавек, прадстаўнікоў розных сектараў парафіяльнай дзейнасці (скарбнік, катэхет, харавы дырыжор, законніца, прадстаўнік пажылых людзей і валанцёры, якія наведваюць хворых). Сустрэча адбудзецца ўвечары з 20:30 да 22:30.

Вашая задача, як дырэктара дыяцэзіяльнага «Карытаса», падрыхтаваць сустрэчу.

*Матэрыял 2*

У вашым дыяцэзіяльным «Карытасе» валанцёры займаюцца прамацыйнай дзейнасцю на карысць «Карытаса». Адказны з гэтай групы запрошаны сустрэцца з групаю пастаральных аніматараў, якія жадаюць заснаваць новы парафіяльны «Карытас». У вас няма інфармацыі пра парафію, але вы ведаеце, што аніматары займаюцца катэхізацыяй і літургіяй, і што іх 10 чалавек. Некаторыя ўжо чулі размовы пра арганізацыю парафіяльнага

«Карытаса» і таму прапанавалі групе арганізаваць сустрэчу. Сустрэча адбудзецца ў другой палове дня і будзе доўжыцца тры гадзіны.

Вашая задача — падрыхтаваць сустрэчу.

*Матэрыял 3*

Мясцовы парафіяльны «Карытас» запрошаны на сустрэчу, якая адбудзецца ў выканкаме і якую арганізуе тэрытарыяльны цэнтр сацыяльных паслуг. Там будуць прадстаўнікі мясцовых арганізацый, якія займаюцца сацыяльнаю працаю. Вас папрасілі расказаць пра сацыяльнае служэнне «Карытаса» (напрыклад, пра хатнюю апеку, працу з дзецьмі з вуліцы, бяздомнымі).

Вашыя праблемы:

– неабходна знайсці партнёра ў мясцовым шпіталі, бо вы жадаеце распачаць працу з хворымі дзецьмі; таму паразважайце, як далучыць шпіталь да вашай працы і як атрымаць ад яго інфармацыю;

– у вас не хапае грошай; на сустрэчы будзе прысутнічаць прадстаўнік найбуйнейшай мясцовай кампаніі па вытворчасці сокаў.

У вас 20 хвілінаў, каб прадставіць сваю дзейнасць і зацікавіць людзей у вашай працы.

*Матэрыял 4*

Вы жадаеце распачаць супрацоўніцтва з мясцовымі ўладамі і прадстаўляеце ім «карту беднасці» вашай тэрыторыі. Вы працуеце з дзецьмі-інвалідамі і маеце Цэнтр дзённага прабывання для псіхічна хворых людзей.

Вы хочаце, каб мясцовыя ўлады прызналі вашую працу добрай ініцыятывай на мясцовым узроўні. Вы хочаце, каб палова вашых выдаткаў на ўтрыманне Цэнтра дзённага прабывання была ўключаная ў мясцовы бюджэт.

Вашая задача — падрыхтаваць сустрэчу.

### *Заключэнне*

Ніводная арганізацыя не можа функцыянаваць, калі не мае **цвёрда вызначаных задачаў і калі яе ўласная структура не адрэгуляваная.** Важна каардынаваць усю дзейнасць і ведаць, хто якую задачу выконвае.

Функцыянаванне парафіяльнага «Карытаса» толькі паляпшаецца, калі вядзецца праца па **ўдасканаленні каардынацыі, калектыўнай працы і кааперацыі з іншымі ўстановамі** ў дадзенай мясцовасці. Стварэнне сеткі супрацоўніцтва з іншымі мясцовымі рэаліямі можа даць **добры плён у розных сферах.**

# ВАЛАНЦЁРСТВА

## Тэма III

CARITAS

# ХРЫСЦІЯНСКАЕ ВАЛАНЦЁРСТВА

Падчас гэтага трэнінгу мы пазнаёмімся з тэалагічнымі асновамі валанцёрства, мэтаю і значэннем валанцёрскай працы, а таксама зможам больш даведацца пра сутнасць хрысціянскага валанцёрства і арганізацыю працы валанцёраў.

***Малітва***

*Езус атаясамлівае сябе са слугою, Ён «выракся самога сябе, прыняўшы постаць слугі, прыпадобніўшыся да людзей. І з выгляду стаўшы як чалавек» (Флп 2, 7).*

*У апошні вечар Ён сведчыць пра сваю любоў сімвалічным учынкам: «Вы Мяне называеце Настаўнікам і Панам, і добра кажаце, бо Я ім ёсць. Калі ж Я, Пан і Настаўнік, абмыў вам ногі, то і вы павінны абмываць ногі адзін аднаму. Я даў вам прыклад, каб і вы рабілі, як Я зрабіў вам» (Ян 13, 13–15).*

*У штодзённай працы мы часам забываемся, каму служым і ў чыё імя дапамагаем асобам у патрэбе. Гэты вобраз — Езус як слуга — заўжды павінен быць у нас перад вачыма!*

***Тэарэтычная частка***

**ТЭАЛАГІЧНАЯ АСНОВА ВАЛАНЦЁРСТВА**

Слова «валанцёрства» мае лацінскае паходжанне і раней азначала «бескарыслівую і добраахвотную вайсковую службу». Цяпер гэты тэрмін выкарыстоўваецца для таго, каб акрэсліць бескарыслівую працу або служэнне, але найперш азначае альтруістычную, высакародную інтэнцыю, якая дапамагае чалавеку дасягаць мэты, прыкладваючы намаганні, ахвяруючы час, веды, уменні.

Валанцёр — гэта чалавек, які застаецца верным сваім абавязкам у школе, сям'і, на працы і жадае прысвяціць сябе працы дзеля шырэйшага кола грамадства. Гэта не азначае, што ў яго (або яе) няма асабістых праблемаў або ўсе яны ўжо вырашаныя, хутчэй, ён (або яна) жыве ў агульначалавечай рэальнасці не толькі дзеля сябе, а заўжды застаючыся ў адносінах з іншымі людзьмі.

У Касцёле паняцці «валанцёр» і «валанцёрства» адносна новыя, хоць і падкрэсліваецца, што з самага пачатку існаван-

ня Касцёла сярод Хрыстовых вучняў былі валанцёры, людзі, натхнёныя прыкладам Хрыста, якія прысвячалі сябе высокай місіі служэння тым, каму гэта найбольш патрэбна. Магчыма, занадта смела было б выкарыстоўваць гэты тэрмін замест слова «Апосталы», але гэты сэнс чытаецца ў словах Хрыста, у іх можна ўбачыць зачаткі валанцёрства: «Хворых аздараўляйце, мёртвых уваскрашайце, пракажоных ачышчайце, злых духаў выганяйце. Задарма атрымалі, задарма давайце. Не бярыце з сабою ні золата, ні срэбра, ні медзі ў паясы свае, ні торбы ў дарогу, ні дзвюх вопратак, ні сандаляў, ні кія. Бо варты працаўнік сваёй стравы» (Мц 10, 8–10).

Такім чынам, хрысціянскае валанцёрства паходзіць ад сакрамэнту хросту і з'яўляецца часткаю пакліканя кожнага хрысціяніна.

Касцёл засяроджваўся на тым, як павялічваць колькасць новых вучняў Хрыста, і гэтак узнікала патрэба ў пэўных відах служэння, якія павінны выконвацца валанцёрамі, па выбары і дзеля асвячэння, дзеля дабра супольнасці, без аплаты. «Тады Дванаццаць склікалі ўсіх вучняў і сказалі: "Нягожа, каб мы занядбалі слова Божае і служылі пры сталах. Таму, браты, выберыце з вашага ліку сем мужоў добрай славы, поўных Духа і мудрасці, якім даручым гэтую паслугу. А мы будзем трываць у малітве і ў служэнні слова"» (Дз 6, 2–4).

Такім чынам, паняцце дыяканату таксама звязанае з зараджэннем валанцёрства ў Касцёле, што асабліва заўважна ў служэнні для ўдоваў. Нам вядома, у якім цяжкім становішчы знаходзіліся ўдовы ў тыя часы, таму не трэба здзіўляцца, што нехта дапамагаў ім публічна і служыў іх сем'ям, не патрабуючы за гэта кампенсацыі. Гэта не азначае, што Усемагутны не заклікае да служэння іншых чальцоў Касцёла. Гэта датычыць і вернікаў, і тых, хто наўрад ці далучыцца да Касцёла.

«Бог ёсць любоў *(Deus Caritas est)*» (1 Ян 4, 8), — усклікае ўлюбёны вучань Езуса і адразу ж дадае, што мы павінны любіць адзін аднаго гэтак жа, як любім Бога (гл. 1 Ян 4, 12), і вельмі

цвёрда гэта сцвярджае: «Калі б хто сказаў: “Я люблю Бога”, а брата свайго ненавідзіць, ён ілгун, бо той, хто не любіць свайго брата, якога бачыць, не можа любіць Бога, якога не бачыць» (1 Ян 4, 20).

Напрыканцы свайго зямнога жыцця Езус, гаворачы пра Апошні Суд, выразна кажа Яну: «Калі прыйдзе Сын Чалавечы ў славе сваёй і ўсе анёлы з Ім, тады сядзе на троне славы сваёй. Перад Ім сабраныя будуць усе народы, і Ён аддзеліць адных ад другіх, як пастух аддзяляе авечак ад казлоў. Авечак паставіць праваруч, а казлоў — леваруч. Тады скажа Валадар тым, хто праваруч Яго: “Прыйдзіце, благаслаўлёныя Айца Майго, прыміце ў спадчыну Валадарства, падрыхтаванае вам ад стварэння свету. Бо Я быў галодны, і вы далі Мне есці; прагнуў, і вы напаілі Мяне; быў падарожным, і вы прынялі Мяне; быў голы, і вы апранулі Мяне; быў хворы, і вы адведалі Мяне; быў у вязніцы, і вы прыйшлі да Мяне”» (Мц 25, 31–36).

Калі вы верыце ў Езуса Хрыста, то будзеце ўвасабленнем Яго вучэння, матэрыяльна, духоўна і разумова дапамагаючы людзям у іх патрэбах. Нашая вера і дапамога бліжняму павінны ісці не адна за адною, а спалучацца, яны насычаюць адна адну, шукаюць адна адну, адна з’яўляецца ключом да іншай. Гэта непарыўнае кола.

Калі мы верым, але не дапамагаем, то хлусім, гаворыць святы Ян, і гэта азначае, што мы — фальшывыя вернікі. А калі мы толькі дапамагаем, то не вельмі адрозніваемся ад мноства людзей, глыбока ўпэўненых у тым, што гуманнасць укаранёная ў волі чалавека. Разумеючы гуманнасць толькі па-чалавечы, яны з’яўляюцца небяспекаю для тых, хто называе сябе вернікамі. У той самай прамове пра Апошні Суд Езус выразна папярэджвае, што, дапамагаючы асобам у патрэбе, нельга рабіць разлікаў. Там, дзе ёсць Бог, няма разлікаў, таму што Бог — гэта любоў, а там, дзе вядзецца разлік, любові няма. Таму Езус выказваецца вельмі дакладна: «І Валадар скажа ім у адказ: “Сапраўды кажу вам: тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы

Мне зрабілі”. <...> А Ён скажа ім у адказ: “Сапраўды кажу вам: чаго вы не зрабілі аднаму з гэтых меншых, таго не зрабілі Мне”» (Мц 25, 40. 45). Любоў не можа існаваць без канкрэтных учынкаў. Жыццё прапаноўвае нам і вучыць нас бясконцым канкрэтным праявам любові.

## СУТНАСЦЬ І КАШТОЎНАСЦІ ХРЫСЦІЯНСКАГА ВАЛАНЦЁРСТВА

### Дух служэння

Валанцёрства прыносіць у грамадства новыя каштоўнасці, напрыклад, супольныя даброты і асабліва дух служэння, натхнёны жаданнем дапамагаць іншым людзям.

Валанцёры імкнуцца разумець усю складанасць праблемаў, у дадатак да звычайных патрэбаў распазнаваць новыя надзённыя патрэбы. Дух служэння заключаецца ва ўважлівасці да патрэбаў, крэатыўным разуменні таго, калі патрэбная дапамога і якой яна павінна быць, калі трэба змяніць форму служэння.

Да таго ж, дух служэння азначае таксама імкненне да эфектыўнай падрыхтоўкі і пастаяннай адукацыі, якая павінна заключацца не толькі ва ўменні арганізаваць патрэбную матэрыяльную дапамогу, але і ва ўменні аналізаваць мясцовасць, улічваць формы служэння, якія ўжо існуюць, законы і, пры патрэбе, іншы валанцёрскі досвед у супрацоўніцтве з іншымі сацыяльнымі службамі.

Урэшце тое, пра што гаворыць Біблія, — служэнне і здольнасць дзяліцца з іншымі, даказвае, што Божая любоў заахвочвае нас быць гатовымі служыць іншым. Езус атаясамлівае сябе са слугою: «але выракся самога сябе, прыняўшы постаць слугі, прыпадобніўшыся да людзей. І з выгляду стаўшы як чалавек» (Флп 2, 7). Падчас Апошняй Вячэры Езус сведчыць пра сваю любоў сімвалічным учынкам: «Вы Мяне называеце Настаўнікам і Панам, і добра кажаце, бо Я ім ёсць. Калі ж Я, Пан і Настаўнік, абмыў вам ногі, то і вы павінны абмываць ногі адзін аднаму. Я даў вам прыклад, каб і вы рабілі, як Я зрабіў вам» (Ян 13, 13–15).

Важна падкрэсліць, што калі набліжаецца Пасха, мы ўзгадваем і Эўхарыстычную дыяконію, і дыяконію Пана як два ўзаемазвязаныя паняцці. У рэальнасці мы часта памятаем пра Эўхарыстычную дыяконію, але не «абмываем ногі» найбяднейшым людзям, аднак гэтыя два паняцці нельга раздзяляць. Супольнасць, заснаваная на Эўхарыстыі, — гэта супольнасць, **заснаваная на служэнні.**

**Салідарнасць і ўзаемаадказнасць**

Іншыя каштоўнасці, якія праяўляюцца дзякуючы валанцёрскай працы, — гэта пачуццё салідарнасці і ўзаемнай адказнасці. Гэтыя словы маюць мноства значэнняў, якія датычаць розных слаёў і вымярэнняў чалавечага існавання. У любым выпадку, яны з'яўляюцца першаснай і неадменнай умовай чалавечага існавання: чалавек цесна звязаны з усімі іншымі чальцамі супольнасці, дзеліць з імі агульны лёс, як клеткі арганізма, з якіх складаецца непаўторнае жывое стварэнне. Мы не можам пазбегнуць гэтай формы салідарнасці, з яе складаецца нашае жыццё. Аднак яе трэба спалучаць са свабодаю, бо яна абмяжоўвае нашую свабоду, надаючы ёй адказнасць. Чалавечая свабода існуе не толькі як свабода, абмежаваная салідарнасцю з іншымі свабодамі, існуе яшчэ і адказнасць за нашыя дзеянні.

Пра гэтую форму салідарнасці і ўзаемнай адказнасці пісаў Ян Павел II ў энцыкліцы «*Sollicitudo rei socialis*»: «Салідарнасць <...> гэта не туманнае пачуццё спачування, выкліканае пакутамі многіх людзей, блізкіх і далёкіх. Наадварот, гэта выразны і моцны намер прысвяціць сябе агульнаму дабру, гэта значыць на карысць усіх і кожнага, бо мы ўсе нясем адказнасць за ўсіх» (38).

Таму для хрысціянскага валанцёра «дзяліцца з іншым чалавекам» азначае дапамагчы яму вызваляцца ад беднасці і залежнасці; «быць з некім» азначае жадаць яго (або яе) развіцця і дапамагаць яму (або ёй) станавіцца свабоднымі, незалежнымі ўдзельнікамі і пратаганістамі ў працэсе будавання грамадства разам з іншымі людзьмі.

**Бескарыслівасць**

Валанцёр — гэта чалавек, які дзеліцца з іншымі сваім вольным часам, сіламі, грашыма, пачуццямі, часам нават жытлом, і ўсё гэта без аніякага асабістага інтарэсу, а толькі з жадання зрабіць дабро іншым.

Валанцёрства выключае любыя формы эканамічнага і палітычнага абмену, бо імкненне палегчыць чалавечыя пакуты пазбаўленае выгады — гэта толькі ўчынкі любові, блізкасці і надзеі.

У грамадстве, заснаваным на валоданні рэчамі, бескарыслівасць валанцёрства азначае жаданне адкрываць годнасць кожнай чалавечай асобы, незалежна ад таго, дзе чалавек працуе і што стварае. Гэта азначае, што праца — гэта не толькі выраб тавараў. Бескарыслівасць дае людзям магчымасць ствараць большую прастору для грамадскага жыцця і адсоўваць убок уласную важнасць.

## ЗНАКАМІТЫЯ ВАЛАНЦЁРЫ-ХРЫСЦІЯНЕ

(у якасці крыніцы інфармацыі выкарыстоўваўся вэбсайт *Wikipedia*)

### Маці Тэрэза з Калькуты

**Маці Тэрэза з Калькуты** (26 жніўня 1910 г. — 5 верасня 1997 г.), якая пры нараджэнні атрымала імя Агнэс Гонджа Баяджыў, была албанкаю, законніцаю Рыма-каталіцкага Касцёла, грамадзянкаю Індыі, заснавальніцаю Кангрэгацыі сясцёр місіянерак любові ў індыйскай Калькуце ў 1950 годзе. Больш за 45 гадоў яна клапацілася пра бедных, хворых, сіротаў і паміраючых, распаўсюджваючы дзейнасць місіянерак любові спачатку ў Індыі, а пасля і ў іншых краінах.

У 1970-я гады яна стала міжнародна вядомаю за сваю гуманітарную дзейнасць і апеку над хворымі і бездапаможнымі, калі Малькальм Магерыдж зняў пра яе дакументальны фільм і напісаў кнігу «Штосьці прыгожае для Бога». У 1979 г. яна была ўзнагароджаная Нобелеўскай прэміяй і ў 1980 г. атрымала найвышэйшую невайсковую ўзнагароду Індыі, *Bharat Ratna*, за сваю

гуманітарную дзейнасць. Кангрэгацыя сясцёр місіянерак міласэрнасці пашырала сваю дзейнасць і пасля смерці маці Тэрэзы мела ўжо 610 місій у 123-х краінах, у тым ліку хоспісы і прытулкі для людзей з ВІЧ і СНІДам, лепразорыі і тубдыспансеры, кухні з бясплатным супам, праграмы кансультацый для сем'яў і дзяцей, сірочыя прытулкі і школы.

Мноства людзей, урадаў краінаў і арганізацый ухвалялі яе дзейнасць, але яна сутыкалася таксама і з вялікаю крытыкаю.

Папа Ян Павел II беатыфікаваў яе, а ў 2016 г. папа Францішак кананізаваў **маці Тэрэзу Калькуцкую**.

## Брат Ражэ

**Брат Ражэ** (12 мая 1915 г. — 16 жніўня 2005 г.), які пры хросце атрымаў імя Ражэ Луі Шуц-Марсош, быў заснавальнікам і прыёрам супольнасці Тэзэ, экуменічнай манаскай супольнасці.

Ражэ нарадзіўся у Швейцарыі, ён быў апошнім, дзявятым дзіцем у сям'і. У 1937–1940 гг. ён вывучаў рэфармацкую тэалогію ў Страсбургу і Лазане.

У 1940 г. ён выехаў на ровары з Жэневы ў Тэзэ, невялічкае мястэчка каля Макона, што за 390 км на паўднёвы ўсход ад Парыжа. Тэзэ знаходзілася ў неакупаванай частцы Францыі, вельмі блізка да лініі дэмаркацыі і тэрыторыі, занятай нямецкім войскам. На працягу двух гадоў брат Ражэ хаваў у сябе габрэйскіх бежанцаў, пакуль яго не вымусілі пакінуць Тэзэ. У 1944 г. ён вярнуўся ў Тэзэ, каб заснаваць сваю супольнасць, якая мела блізкі да манаскага статут і складалася з мужчынаў, якія жылі разам у беднасці і паслухмянасці.

З канца 50-х гадоў тысячы маладых людзей з многіх краінаў прыязджаюць у Тэзэ, каб прыняць удзел у тыднёвых рэкалекцыях, прысвечаных малітве і разважанню. Браты Тэзэ наведваюць іншыя краіны і праводзяць вялікія і малыя сустрэчы ў Афрыцы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы і Еўропе — «пілігрымкі спакою на зямлі».

Духоўны лідар заўжды вёў сціплае жыццё, рэдка даваў інтэрв'ю і не дазваляў ніякіх праяваў асаблівай пашаны да сябе. Яшчэ да смерці ён вымушаны быў перадаць абавязкі прыёра супольнасці з прычыны пажылога ўзросту і слабога здароўя. Ён адчуваў сябе вельмі стомленым і мусіў перасоўвацца на інвалідным вазку.

У 1988 г. брат Ражэ атрымаў узнагароду ЮНЭСКА за выхаванне ў духу міру, ён напісаў шмат кнігаў, прысвечаных малітве і разважанню, у якіх прасіў моладзь давяраць Богу і быць аддадзенымі сваёй мясцовай рэлігійнай супольнасці і чалавецтву. Ён пісаў кнігі, прысвечаныя хрысціянскай духоўнасці і малітве, некаторыя з іх — у суаўтарстве з маці Тэрэзаю, з якою іх звязвала цёплае сяброўства. 16 жніўня 2005 г. падчас вячэрняй малітвы брат Ражэ загінуў ад ранаў, нанесеных румынкай.

### Жан Ванье

**Жан Ванье** (нарадзіўся 10 верасня 1928 г.) з'яўляецца заснавальнікам *L'Arche* — міжнароднай арганізацыі, што стварае асяродкі, у якіх разам жывуць людзі з інваліднасцю і тыя, хто ім дапамагае. У 1964 г. Жан Ванье пасябраваў з айцом дамініканінам Тамашом Філіпам і дзякуючы яму зразумеў, у якім становішчы знаходзяцца ў спецыялізаваных установах тысячы інвалідаў з асаблівасцямі развіцця. Ён адчуў Божы заклік і запрасіў Рафаэля Сімі і Філіпа Сё, пакінуць установы, дзе яны жылі, і пасяліцца разам з ім у французскім мястэчку Тróслі-Брой. Ён назваў дом, у якім яны пасяліліся, *L'Arche*, што значыць «каўчэг» (як сімвал каўчэга Ноя). З гэтай першай супольнасці ў Францыі вырасла яшчэ 131 супольнасць: у Еўропе, Афрыцы, Азіі, Аўстраліі, Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы.

Хаця супольнасці *L'Arche* заснаваныя ў розных краінах з рознымі культурамі і арыентуюцца на этнічныя і рэлігійныя асаблівасці краінаў, у якіх існуюць, усе яны маюць агульную філасофію і методыку. Мэта супольнасцяў — сабраць разам людзей

з асаблівасцямі развіцця і людзей, якія дапамагаюць ім жыць і працаваць, у агульныя дамы, дзе можна было б жыць і пазнаваць непаўторную каштоўнасць і адоранасць кожнага.

У 1964 г., натхнёны вераю ў тое, што яго супольнасць можа змяніць свет, Жан Ванье заснаваў сусветна вядомы рух «Вера і дзяленне», які арганізуе рэкалекцыі для людзей з усіх слаёў грамадства. У 1971 г. разам з Мары Хэлен Мацьё ён стаў сузаснавальнікам руху «Вера і святло». У групы гэтага руху ўваходзяць людзі з асаблівасцямі развіцця, іх сем'і і сябры, якія рэгулярна сустракаюцца і гавораць пра свае надзеі і цяжкасці, а таксама моляцца разам. Ванье адзначае, што, сутыкаючыся з горам і слабасцю, людзі часта знаходзяць Бога і Яго бязмежную любоў.

Да канца 1970-х гадоў Жан Ванье быў адказным за супольнасць *L'Arche* ў Трослі-Брой у Францыі і за Міжнародную федэрацыю *L'Arche*. Пасля ён пакінуў гэтую працу, каб прысвячаць больш часу кансультаванню і падтрымцы людзей, якія прыехалі жыць у *L'Arche*, і дапамагаць інвалідам. Ванье жыве ў першай супольнасці ў Францыі, у Трослі-Брой. Ён шмат падарожнічае, наведвае іншыя супольнасці *L'Arche*, засноўвае новыя, чытае лекцыі і праводзіць рэкалекцыі. Людзі, якія ведаюць Жана Ванье, сведчаць, што ён усё сваё жыццё прысвяціў тым, каго адкідвае наш свет, хто застаецца ў адзіноце і выгнанні.

У 2007 г. існавала ўжо 130 супольнасцяў *L'Arche* ў 30-ці краінах свету. Міжнародны рух падтрымкі сем'яў, дзе ёсць інваліды, «Вера і святло», сузаснавальнікам якога стаў Жан Ванье, у 2007 г. налічваў больш за 1400 супольнасцяў ва ўсім свеце.

Жан Ванье і цяпер жыве ў першай заснаванай ім супольнасці *L'Arche* ў Францыі. Нядаўна ён напісаў кнігу ў суаўтарстве з тэолагам Стэнлі Хаўэрвасам з інстытута тэалогіі Дьюка, якая атрымала назву «Жыць у пяшчоце сярод жорсткасці свету» («*Living Gently in a Violent World*»). Гэтая кніга — другая з серыі, надрукаваных цэнтрам пакаяння ў Дзьюку.

## Шарль дэ Фуко

**Шарль Эжэн дэ Фуко** (15 верасня 1858 г. – 1 снежня 1916 г.) — манах, які стаў натхняльнікам заснавання Кангрэгацый малых братоў Езуса і малых сясцёр Езуса.

Ён нарадзіўся ў Страсбургу ў сям'і арыстакратаў. У 1876 г. Шарль пачаў навучанне ў Вайсковай Акадэміі Сэн-Сір. Ён служыў афіцэрам французскай арміі ў Алжыры, але пакінуў службу ў 1882 г. і выправіўся ў Марока ў якасці даследчыка.

У 1890 г. ён далучыўся да ордэну трапістаў, а ў 1897 г. выйшаў з яго, адчуваючы пакліканне да манаства, але ў іншым, нявызначаным харызмаце. Ён накіраваўся ў Святую Зямлю і стаў садоўнікам пры жаночым кляштары. Яму прапанавалі прыняць пасвячэнне. Шарль вярнуўся ў Алжыр і жыў як пустэльнік. Ён пасяліўся ў мястэчку Бені-Акбес, побач з мараканскаю мяжою, пабудаваў маленькую пустэльніцкую хатку «адарацыі і гасціннасці», якая хутка стала братэрствам, бо Шарль жадаў быць і сапраўды быў братам для кожнага, хто прыходзіў да яго, незалежна ад рэлігійных поглядаў, паходжання або сацыяльнага статусу. Пазней ён пераехаў у Таманрасэт, у паўднёвым Алжыры, каб быць бліжэй да народу туарэгаў. Гэтая мясціна знаходзіцца ў Цэнтральнай Сахары, на захадзе ў перадгор'і Ахаггар. Шарль адыходзіў ад свету, каб быць у адзіноце, у найвышэйшае горнае месца, Асекрэм. Жывучы блізка да туарэгаў і раздзяляючы з імі жыццёвыя цяжкасці, ён на працягу дзесяці гадоў вывучаў іх мову і традыцыі. Вывучыўшы мову туарэгаў, ён стаў працаваць над слоўнікам і граматыкай. Манускрыпт у 4-х тамах быў апублікаваны пасля яго смерці і стаў папулярным сярод лінгвістаў-берберолагаў праз багатыя і дакладныя апісанні. Ён сфармуляваў ідэю заснавання новай манаскай кангрэгацыі, якая ўзнікла ўжо пасля ягонай смерці, атрымаўшы назву Кангрэгацыі малых братоў Езуса.

У 1916 г. яго застрэлілі арабскія паўстанцы. Гэта здарылася 1 снежня побач з яго жытлом у Таманрасэце падчас бунту супраць французскай каланіяльнай улады ў Першую сусветную

вайну. Папа Бэнэдыкт XVI беатыфікаваў яго 13 лістапада 2005 года. Шарль дэ Фуко лічыцца мучанікам Касцёла.

*Спадчына каталіцкага манаха*

Хоць Шарль памёр у адзіноце і ў яго адразу не было паслядоўнікаў, якія б раздзялілі ягоны лад жыцця па прыкладзе Езуса ў Назарэце і гасціннасць ў алжырскай пустэльні, ён натхніў і дапамог арганізаваць братэрства ў Францыі, якое падтрымала яго ідэю. Арганізацыя стала называцца Асацыяцыяй братоў і сясцёр Найсвяцейшага Сэрца Езуса; у яе ўвайшлі кансэкраваныя і свецкія асобы (усяго да смерці Шарля дэ Фуко ў ёй налічвалася 48 чалавек). Менавіта дзякуючы гэтай супольнасці, і асабліва намаганням Луі Масіньёна, сусветна вядомага даследчыка ісламу, а таксама дзякуючы папулярнасці біяграфіі Шарля дэ Фуко, напісанай Рэнэ Базінінам у 1921 г., «Шлях Шарля дэ Фуко, даследчыка Марока, пустэльніка з Сахары» («*La vie de Charles de Foucauld explorateur en Maroc, eremite du Sahara*»), захаваліся яго думкі і настаўленні, якія натхнілі на заснаванне іншых братэрстваў: «“Карытаса” Езуса», Кангрэгацый малых братоў Езуса і малых сясцёр Езуса ў ліку 18-ці розных манаскіх кангрэгацый. Спачатку яны ўзнікалі як французскія супольнасці, а пасля распаўсюдзіліся ў мностве культураў і моваў на розных кантынентах.

## АСНОВЫ МЕНЕДЖМЕНТУ ВАЛАНЦЁРСКАЙ ПРАЦЫ

У «Карытасе», як і ў іншых недзяржаўных арганізацыях і ўстановах, важна захоўваць прафесійны падыход да валанцёрскай працы, каб стварацьнайлепшыя прапановы для людзей, зацікаўленых у гэтым служэнні, і дазволіць арганізацыі добра выкарыстоўваць іх рэсурс для працы. Таму неабходна разумець, як стварыць добрую праграму дзейнасці для любога валанцёра.

Назавем шэсць асноўных крокаў распрацоўкі валанцёрскай праграмы:

1. Вызначэнне дзейнасці і распрацоўка плана.
2. Набор супрацоўнікаў.

3. Суразмоўе.
4. Арыентаванне і трэнінг.
5. Супервізія (догляд).
6. Удзячнасць.

Добра распрацаваная валанцёрская праграма абапіраецца на гэтыя шэсць крокаў, праходзячы іх адзін за адным. Спрабуючы скараціць гэты цыкл або выканаць пазнейшыя крокі, не завяршыўшы папярэднія, вы сутыкнецеся з праблемамі ў будучыні. Напрыклад, многія арганізатары імкнуцца набраць валанцёраў, не вызначыўшы дакладна, якую працу ім трэба выконваць. Гэта толькі блытае валанцёраў і супрацоўнікаў.

Трэба падыходзіць да валанцёрскай праграмы гэтак, як да любой іншай. Дбайна плануйце, вядзіце сістэматычную працу, і вашыя намаганні прынясуць поспех. Ставячыся да праграмы неаб'ектыўна, напрыклад, уяўляючы, што валанцёры — гэта заўсёды даступны рэсурс, вы сутыкнецеся з праблемамі.

**1. Вызначэнне дзейнасці і распрацоўка плана**

Неабходна, каб валанцёры мелі дакладна вызначанае поле дзейнасці, адпаведна падрыхтаванае. Прынцып набору супрацоўнікаў, матывацыі і супервізіі валанцёра — у апісанні працы. Апісанне працы — гэта вызначэнне абавязкаў і адказнасці асобы ўнутры арганізацыі (напрыклад, у парафіяльным або дыяцэзіяльным «Карытасе»).

Апісанне працы павінна ўключаць чатыры базавыя ўмовы. Калі яны дакладна вызначаныя, гэта забяспечвае большую эфектыўнасць працы і патрабуе меншых высілкаў у менеджменце. Вось гэтыя ўмовы:

– **Адказнасць.** Гэта канкрэтнае заданне, якое існуе цяпер, або заданні, выканання якіх чакаюць ад валанцёра. Умова ўключае мэту, над дасягненнем якой працуе валанцёр, і віды дзейнасці, якія валанцёр будзе выконваць.

– **Паўнамоцтвы.** Гэтая ўмова вызначае межы, у якіх працуе валанцёр і ў якіх ён можа прымаць рашэнні адносна таго, як павінна выконвацца праца.

– **Улік.** Валанцёр павінен мець мэту, арыентаваную на дасягненне выніку. Калі валанцёр не нясе адказнасці за вынік сваёй працы, гэта сведчыць пра тое, што яго праца не мае важнасці і каштоўнасці.

– **Ацэнка.** Гэтая ўмова дае валанцёру магчымасць зразумець, наколькі паспяхова ён выканаў працу. Неабходныя вынікі працы трэба загадзя абмеркаваць і ўзгадніць з валанцёрам.

Арыентаваны на вынік падыход да вызначэння дзейнасці добры для вас, вашых валанцёраў і вашага парафіяльнага «Карытаса». Па-першае, лягчэй кіраваць добра акрэсленай праграмай, чым не распрацаванай да канца. Па-другое, вашыя валанцёры будуць адчуваць задаволенасць, разумеючы, у чым сэнс іх працы. Па-трэцяе, вашая арганізацыя будзе працаваць паводле больш эфектыўнай праграмы, бо людзям будзе больш зразумела, што яны павінны рабіць, а гэта дае большую гарантыю таго, што яны гэта выканаюць.

Апісанне дзейнасці — частка вашай працы, неабходная для таго, каб дапамагчы валанцёрам зразумець, якіх вынікаў трэба дасягнуць, якія заданні трэба выканаць, якія ўменні патрэбныя для гэтага. Апісанне дзейнасці вызначае сродкі арганізацыі працы, якія дазваляюць перадаваць працу ад аднаго валанцёра да іншага па меры яе выканання. Гэта дакумент, які патрабуе актыўнага абнаўлення і зменаў па меры таго, як змяняецца вашая праграма і развіваюцца валанцёры падчас свайго служэння разам з парафіяльным або дыяцэзіяльным «Карытасам».

Апісанне дзейнасці — гэта цаглінкі вашай валанцёрскай праграмы, паколькі набор супрацоўнікаў, суразмоўе, прызначэнне, супервізія і ацэнка залежаць ад інфармацыі, дадзенай у апісанні дзейнасці. Добрае апісанне дзейнасці павінна быць кароткім, канкрэтным і зразумелым.

### 2. Набор супрацоўнікаў

Гэта працэс пошуку валанцёраў. Гэта здаецца простым спачатку, але эфектыўны набор супрацоўнікаў азначае здольнасць знайсці дастаткова кваліфікаваных валанцёраў, якія могуць

выконваць патрэбную для праграмы працу. Гучыць дзіўна, але занадта паспяховы набор супрацоўнікаў можа стварыць сур'ёзныя праблемы для праграмы, бо ў выніку вы або наймаеце валанцёраў, працу якіх не выкарыстоўваеце, або адмаўляеце жадаючым і рызыкуеце пакрыўдзіць іх.

Ёсць тры асноўныя метады планавання праграмы набору супрацоўнікаў.

1) *Першы* метад звычайна называюць *Рэзервовы набор супрацоўнікаў*. Ён выкарыстоўваецца, калі праграма адпавядае адной або абедзвюм наступным характарыстыкам:

– патрэбна вельмі вялікая колькасць валанцёраў на кароткі перыяд часу (напрыклад, для правядзення нейкага мерапрыемства);

– неабходная валанцёрская праца не патрабуе ніякай спецыяльнай кваліфікацыі; большасць людзей можа выканаць яе пасля невялікай падрыхтоўкі.

Асноўны метад для рэзервовага набору супрацоўнікаў — гэта звычайнае распаўсюджанне інфармацыі аб праграме: раздача брашураў, постары, адкрытыя лекцыі, артыкулы ў прэсе, вусныя аповеды.

2) *Другі* метад называецца *Мэтавы набор супрацоўнікаў*.

Мэтавы набор супрацоўнікаў — гэта працэс свядомага планавання кампаніі, паспяховы вынік якой залежыць ад таго, як вы данясеце інфармацыю аб патрэбных супрацоўніках да малой аўдыторыі.

Мэтавы набор пажаданы, калі праца, для якой вы шукаеце валанцёраў, патрабуе спецыяльных уменняў або навыкаў, якія сустракаюцца не часта.

Каб спланаваць кампанію па мэтавым наборы супрацоўнікаў, неабходна адказаць на наступныя пытанні:

– Што нам патрэбна?

– Хто можа гэта выканаць?

– Як звязацца з гэтымі людзьмі?

– Што можа стаць для іх матывацыяй?

Адказаўшы на гэтыя пытанні, вы зможаце вызначыць для любой валанцёрскай працы метад, што дапаможа знайсці патэнцыяльных валанцёраў, якія маюць патрэбную кваліфікацыю.

3) *Трэці* метад набору супрацоўнікаў называецца *Набор па канцэнтрычных колах*.

Гэты метад патрабуе вызначыць колы людзей, якія ўжо кантактуюць з вашай арганізацыяй, і паспрабаваць набраць іх для патрэбнай працы. Звычайна мэтавая аўдыторыя можа складацца з:

– вашых парафіянаў, іх сем’яў і сваякоў;

– сяброў вашых валанцёраў і супрацоўнікаў;

– людзей, якія жывуць побач з тэрыторыяй вашай дзейнасці;

– людзей, закранутых праблемаю, якую вы імкнецеся вырашыць.

Перавага набору па канцэнтрычных колах у тым, што мэтавая аўдыторыя ўжо знаёмая з вашай арганізацыяй («Карытас») ці з праблемаю, якой вы займаецеся, або гатовая супрацоўнічаць па сяброўстве. Гэтыя фактары дазваляюць лягчэй пераканаць кандыдатаў стаць валанцёрамі.

*Пасланне да супрацоўнікаў*: кожная кампанія па наборы супрацоўнікаў павінна мець сфармуляванае пасланне. Гэтае пасланне тлумачыць, чаму вашай арганізацыі варта ахвяраваць свой час для патрэбнай валанцёрскай працы. Яно павінна коратка, проста і дакладна раскрыць валанцёрам патрэбу ў іх паслугах і паказаць тое дабро, якога можна дасягнуць праз валанцёрскую працу. Упэўніцеся, што ў пасланні вы падкрэсліваеце неабходнасць працы для грамадства і супольнасці, а не толькі для вашай арганізацыі.

Фінальны крок у наборы супрацоўнікаў — **папрасіць** некага стаць валанцёрам. Самая эфектыўная тэхніка набору, калі

вашыя супрацоўнікі або валанцёры просяць сваіх сяброў і знаёмых далучыцца да валанцёрскай працы. Можна дапамагчы ім, даючы патрэбную інфармацыю, каб эфектыўна набіраць супрацоўнікаў праз вусную просьбу.

**3. Суразмоўе**

У працэсе суразмоўя трэба заўсёды памятаць, што вы шукаеце для працы чалавека, які падыходзіць найлепш. Для гэтага трэба, каб суразмоўе было спланавана вельмі дэталёва, што дазволіць высветліць усю інфармацыю, неабходную для ацэнкі кваліфікацыі кандыдата.

Кожнае суразмоўе дзеліцца на некалькі частак:

– **Пачатак суразмоўя.** Цёпла прывітайце валанцёраў і папрасіце іх уладкавацца ўтульна. Прапануйце кавы, гарбаты або вады — гэта добры спосаб пазбегнуць няёмкасці напачатку. Супрацоўнік, які праводзіць суразмоўе, павінен прыкласці ўсе намаганні, каб усталяваць кантакт з валанцёраммі і дапамагчы ім адчуваць сябе зручна.

– **Суразмоўе**. Плануючы пытанні для суразмоўя, трэба ўлічваць, для якой працы вы шукаеце чалавека. Трэба ўважліва падумаць, у якой форме праводзіць суразмоўе: як вусны тэст або як сяброўскую гутарку. Гэта залежыць ад таго, якія ўменні патрэбныя для выканання працы. Калі ў вас некалькі кандыдатаў на месца, будзьце ўпэўненыя і ўсім задайце асноўныя неабходныя пытанні.

Падчас суразмоўя неабходна захоўваць упэўненасць і слухаць, што гаворыць кандыдат. Дазвольце валанцёру свабодна адказваць на вашыя пытанні, не перабівайце. Памятайце, што валанцёр таксама ацэньвае вас і вашую арганізацыю. Дазваляйце і яму задаваць пытанні, нешта каментаваць і ўдакладняць, каб вы абодва маглі атрымаць патрэбную інфармацыю.

– **Завяршэнне суразмоўя**. Гэта, напэўна, самая складаная частка суразмоўя, і лепш за ўсё, калі яна будзе кароткаю. У некалькіх словах падсумуйце суразмоўе, каб упэўніцца, што абодва

бакі добра зразумелі тую самую інфармацыю, і пасля распавядзіце валанцёру пра свае наступныя крокі. Неабходна, каб валанцёры адчулі вашую зацікаўленасць і ведалі, калі дакладна будзе прынятае канчатковае рашэнне. Гэта лёгка, калі вы сапраўды зацікаўленыя ў кандыдаце. Калі чалавек вам не падыходзіць, скажыце гэта адразу. Мы мусім быць шчырымі і адкрытымі з людзьмі, якія прыходзяць да нас. Яны заслугоўваюць ведаць, чаму яны нам падыходзяць (або не падыходзяць).

– **Нарэшце падзякуйце патэнцыяльным валанцёрам** за іх зацікаўленасць і намаганні.

Вылучэнне валанцёра на працу павінна быць заснаваным на інфармацыі, сабранай падчас аналізу праведзеных суразмоўяў. Гэта павінна адбывацца са згоды абодвух бакоў: і валанцёра, і адказнага за набор супрацоўнікаў. Нарэшце, рашэнне павінна быць прынятае з разуменнем таго, што і валанцёр, і адказны могуць перадумаць, калі выбар акажацца няўдалым.

**4. Арыентаванне і трэнінг**

Арыентаванне і трэнінг — паралельныя працэсы забяспечвання валанцёраў інфармацыяй, неабходнай для эфектыўнага выканання працы.

**Арыентаванне** азначае неабходнасць даць валанцёрам асноўныя веды пра арганізацыю, яе дзейнасць і метады. Арыентаванне неабходнае для таго, каб валанцёр стаў часткаю арганізатарскага асяродку, разумеў, што гэта за арганізацыя і як яна дзейнічае.

Мэта арыентавання ў тым, каб валанцёр зразумеў кантэкст, у якім ён будзе дзейнічаць. Калі валанцёр адпаведна зразумее гэты кантэкст, яму лягчэй будзе наладзіць сваю працу, каб яна адпавядала метадыцы арганізацыі, і праяўляць ініцыятыву ў распрацоўцы новых метадаў на карысць арганізацыі.

**Трэнінг** — гэта працэс удасканальвання валанцёраў у асаблівых уменнях і навыках, патрэбных для выканання канкрэтнай валанцёрскай працы.

Трэнінг праводзіцца для таго, каб растлумачыць валанцёрам:

– як яны павінны выконваць сваю канкрэтную працу;

– што канкрэтна яны павінны зрабіць;

– што ім рабіць у сітуацыі небяспекі або ў непрадбачанай сітуацыі.

У эфектыўнай праграме трэнінгу вызначаецца, якія ўменні, веды і навыкі патрэбныя для добрага выканання працы, і прапануецца форма адукацыі валанцёра. Трэнінг павінен прысвячацца практыцы, засноўвацца на досведзе і адпавядаць індывідуальным патрэбам валанцёра.

Падчас валанцёрскага трэнінгу вельмі карысна далучаць да яго распрацоўкі і правядзення іншых супрацоўнікаў і валанцёраў.

**5. Кантроль**

Кантроль за валанцёрамі па сваёй сутнасці і выкананні нічым не адрозніваецца ад кантролю за супрацоўнікамі любой іншай арганізацыі. Ён патрабуе такіх самых дзеянняў і навыкаў у міжчалавечай камунікацыі.

Аднак у валанцёрскай працы трэба звяртаць асаблівую ўвагу на некаторыя аспекты кантролю:

– **Хто праводзіць кантроль?** Ці павінен кантроль праводзіцца каардынатарам-валанцёрам ці супрацоўнікам, з якім будзе працаваць кандыдат? Абедзве формы паказваюць добрыя вынікі, але неабходна ўпэўніцца ў тым, што ўсе бакі згодныя з выбраным спосабам і ведаюць штодзённыя абавязкі ў выкананні гэтай працы.

– **Гнуткі менеджмент.** Да валанцёраў трэба ставіцца як да асобаў, чыя матывацыя і стыль дзейнасці могуць адрозніваецца. Кантралёр павінен падладжвацца да іх індывідуальных патрэбаў. У валанцёрскай працы часам здараюцца сітуацыі, якіх не бывае, калі чалавек атрымлівае грошы за сваю працу, бо валанцёрская дзейнасць можа быць менш прыярытэтнай для чалавека, чым іншая дзейнасць.

– **Вызначэнне часу для менеджменту.** Вельмі распаўсюджаны міф пра тое, што валанцёры заўжды маюць вольны час, нярэдка перашкаджае эфектыўнаму менеджменту.

Супрацоўнікі, якія нясуць адказнасць за валанцёраў, павінны ўсведамляць, што іх час залежыць ад адносінаў, магчымасцяў і занятасці валанцёраў. Супрацоўнікі павінны мець час, каб быць даступнымі для валанцёраў, падтрымліваць з імі добрую камунікацыю на аснове прафесійных і асабістых адносінаў.

**6. Удзячнасць**

Удзячнасць валанцёру — гэта ўзнагароджванне і матывацыя валанцёраў, якія эфектыўна працавалі на карысць арганізацыі. Ёсць два асноўныя спосабы падзякаваць валанцёру за прыкладзеныя намаганні: узнагарода і кампенсацыя.

*Узнагарода*

Узнагароды выдаюцца валанцёрам перыядычна, індывідуальна або ў прысутнасці групы. Падобныя мерапрыемствы карысныя, каб ствараць пачуццё каманды, бо дапамагаюць сабраць разам валанцёраў, якія часта не маюць такой магчымасці.

Узнагароды звычайна дзеляцца на дзве катэгорыі. Першая — гэта розныя **рэчы**: сертыфікаты, значкі, супольныя фотаздымкі, прадметы адзення, напрыклад, цішоткі або бейсболкі і інш.; маленькія падарункі.

Другая катэгорыя — гэта розныя **падзеі**: абеды і вячэры, пікнікі, вечарыны і святкаванні, экскурсіі і падарожжы, святкаванне Міжнароднага дня валанцёраў.

*Кампенсацыя*

Кампенсацыя — гэта, хутчэй, нематэрыяльныя штодзённыя праявы ўдзячнасці валанцёрам і ўчынкі дзеля іх матывацыі. Але яны з’яўляюцца самай эфектыўнай і доўгай матывацыяй для валанцёраў. Гэта: словы ўдзячнасці; павага і аднолькавае стаўленне да валанцёраў; рэгулярнае запрашэнне валанцёраў да ўдзелу

ў сустрэчах супрацоўнікаў; падтрыманне ў валанцёрах асабістай зацікаўленасці; ахвяраванне часу і высілкаў для кантроля; даручэнне валанцёрам больш адказных справаў.

Для эфектыўнасці абедзвюх сістэмаў удзячнасці варта прытрымлівацца некалькіх прынцыпаў:

– важна публічнае выказванне ўдзячнасці, пажадана ў коле калегаў валанцёра;

– выказванне ўдзячнасці адразу пасля выканання валанцёрскай працы, без непатрэбных затрымак: позна выказаная ўдзячнасць — самая неэфектыўная форма кампенсацыі, таму для добрай працы вельмі важная штодзённая кампенсацыя;

– удзячнасць павінна быць індывідуальнай: імкніцеся вызначыць, якая форма ўдзячнасці найбольш каштоўная для чалавека: камусьці больш прыемнае публічнае «дзякуй», а камусьці больш падабаецца атрымліваць удзячнасць індывідуальна;

– упэўніцеся, што вашая ўдзячнасць шчырая, бо штучная яе праява або зробленая «для галачкі» адразу бачная і выклікае абурэнне; не гаварыце і не рабіце нічога няшчырага;

– пераканайцеся, што ўдзячнасць заслужаная: калі вы дзякуеце валанцёрам, якія не выконваюць сваю працу, вы дэматывуеце тых, хто працуе добра.

## МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ВАЛАНЦЁРАЎ

**Міжнародны дзень валанцёраў** (**МДВ**) адзначаецца 5 снежня. Гэта міжнароднае свята, заснаванае Генеральнай асамблеяй Арганізацыі Аб’яднаных Нацый паводле рэзалюцыі 40/212 ад 17 снежня 1985 года. З таго часу ўлады розных краінаў, ААН і грамадскія арганізацыі аб’ядноўваюць валанцёраў па ўсім свеце для святкавання гэтага дня.

Мэта гэтага мерапрыемства — падзякаваць валанцёрам за іх працу і пашырыць у грамадстве ўсведамленне вялікага грамадзянскага ўнёску валанцёраў. Гэты дзень адзначаецца ў большасці краінаў свету.

Міжнародны дзень валанцёраў адзначае большасць недзяржаўных арганізацый, такіх як Чырвоны Крыж, Скаўцкая асацыяцыя і іншыя. Яго адзначаюць і падтрымліваюць валанцёры ААН.

Міжнародны дзень валанцёраў дае валанцёрам адзіночкам і тым, хто працуе ў розных арганізацыях, магчымасць разам працаваць над праектамі і ўдзельнічаць у акцыях, і рабіць важны ўнёсак у эканамічнае і сацыяльнае развіццё на мясцовым, нацыянальным і міжнародным узроўнях. Спалучаючы падтрымку ААН з падтрымкаю на мясцовым узроўні, МДВ такім чынам дае ўнікальную магчымасць дзяржаўным арганізацыям, дабрачынным арганізацыям, супольнасцям, прыватнаму сектару і валанцёрам, якія працуюць у розных арганізацыях, весці супольную працу, каб дасягаць агульных мэтаў.

Ідэя святкавання Міжнароднага года валанцёраў на пачатку XXI ст. павінна была стымуляваць дэбаты ў галіне нацыянальнай і міжнароднай палітыкі, спрыяць прызнанню дабрачыннай дзейнасці, палягчэнню яе арганізацыі, яе распаўсюджанню і аб’яднанню. Гэта нашмат палепшыла сітуацыю і паспрыяла большай павазе да валанцёрства і яго магчымасцяў ва ўсіх формах валанцёрскай працы, а таксама большай падтрымцы валанцёрства.

Асаблівым вынікам стала ўмацаванне пазіцыі МДВ. У 1996 г. у мерапрыемстве прымалі ўдзел валанцёры 69-ці краінаў, а ў 2003 г. — валанцёры 125-ці развітых індустрыяльных краінаў прынялі ўдзел у МДВ. Асвятляючы і прызнаючы валанцёрскую дзейнасць, многія краіны (у 2003 г. іх было 76) стратэгічна выкарысталі МДВ, каб звярнуць увагу на валанцёрскую працу для дасягнення *Мэтаў развіцця тысячагоддзя*[6] — комплексу мэтаў

[6] Мэты развіцця тысячагоддзя (МРТ) — гэта восем міжнародных мэтаў развіцця, якія 193 дзяржавы-чальцы ААН і, па меншай меры, 23 міжнародныя арганізацыі дамовіліся дасягнуць да 2015 года. Мэты ўключаюць у сябе скарачэнне маштабаў крайняй галечы, зніжэнне дзіцячай смяротнасці, барацьбу з эпідэмічнымі захворваннямі, такімі, як СНІД, а таксама пашырэнне сусветнага супрацоўніцтва з мэтаю развіцця.

і дзеянняў для змагання з беднасцю, голадам, хваробамі, непісьменнасцю, пагаршэннем стану навакольнага асяроддзя і з дыскрымінацыяй жанчынаў.

Арганізацыя МДВ — гэта ў асноўным вынік супрацоўніцтва ААН, дзяржаўных уладаў, грамадскіх арганізацый разам з нацыянальнымі і (або) міжнароднымі валанцёрамі, якія працуюць у гэтых арганізацыях, і зацікаўленых асобаў. Часта да іх далучаюцца прадстаўнікі СМІ, навукоўцы, розныя фонды, сектар прыватных арганізацый, супольнасці вернікаў, спартовыя і забаўляльныя арганізацыі.

Праграма валанцёраў ААН у падтрымку МДВ запусціла інтэрнэт-партал сусветнай сеці валанцёраў, дзе можна знайсці і спампаваць мноства матэрыялаў і рэсурсаў, звязаных з МДВ.

У раздзеле «Спланаваць мерапрыемства» на партале сусветнай сеткі валанцёраў даюцца найлепшыя практычныя прыклады і ўрокі з папярэдніх МДВ. Раздзел пачынаецца з парады аб стварэнні камітэта планавання або далучэнні да камітэта планавання МДВ, а пасля распісвае крокі па развіцці валанцёрства ў краіне, планаванні дзейнасці, міжнароднага супрацоўніцтва, па стварэнні рэкламных матэрыялаў, развіцці медыйнай стратэгіі і, нарэшце, вядзенні дакументацыі.

У раздзеле даецца спасылка на іншыя карысныя рэсурсы, даступныя на партале: ідэі таго, што можна зрабіць для МДВ, парады, як далучыцца да працы над *Мэтамі развіцця тысячагоддзя*, інфармацыя аб рэкламных матэрыялах і методыках і аб тым, як імі скарыстацца, інструкцыі для спампоўвання і змянення эмблемы МДВ і постара.

Адным з ключавых відаў дзейнасці дзеля пашырэння ўплыву МДВ з’яўляецца стратэгічная камунікацыя і абмен досведам. Партал сусветнай сеткі валанцёраў стварыў паказальнік розных нацыянальных арганізацый, каб валанцёры адзіночкі маглі звязвацца з камітэтам МДВ краіны, калі ён існуе.

Дзякуючы гэтаму парталу валанцёры могуць даведацца, што цяпер плануюць арганізатары на МДВ і ці можна далучыцца да

каманды. У краінах, дзе камітэт МДВ яшчэ трэба ствараць, зацікаўленыя арганізацыі могуць скарыстацца паказальнікам, каб узаемадзейнічаць і сфармаваць камітэт.

Партал сусветнай сеткі валанцёраў дае магчымасць дзяліцца рэсурсамі ў межах вялікай сеткі валанцёраў і валанцёрскіх арганізацый. Калі набліжаецца чарговы МДВ, расце колькасць карыстальнікаў, якія шукаюць на партале інфармацыю. Большасць камітэтаў МДВ і іншых зацікаўленых асобаў пачынаюць дасылаць свае планы МДВ, навіны і падрабязнасці праектаў правядзення мерапрыемства за некалькі месяцаў да 5 снежня.

Пасля МДВ камітэты заахвочваюць падзяліцца досведам аб праведзеных мерапрыемствах. Гэты досвед дапамагае арганізатарам, валанцёрам і наведнікам партала ацаніць падзеі, якія адбыліся ў гэты дзень. Абмен інфармацыяй дапамагае развіваць патэнцыял МДВ і паказваць вартасць валанцёрства для агульнага грамадскага развіцця.

*Матэрыял 1*

**Адносіны паміж валанцёрамі і супрацоўнікамі**

Эфектыўная праца валанцёрскай праграмы патрабуе спрыяльных працоўных адносінаў паміж супрацоўнікамі і валанцёрамі. Калі нейкая з групаў не разумее патрэбаў іншай або не давярае іншай, валанцёрская праграма не будзе функцыянаваць эфектыўна.

Галоўная задача каардынатара валанцёраў — забяспечыць умовы, у якіх валанцёры і супрацоўнікі маглі б эфектыўна і ўзгоднена працаваць разам. Каб дасягнуць падтрымкі супрацоўнікаў, каардынатар валанцёраў павінен пазбягаць пагардлівага стаўлення да валанцёраў у арганізацыі, паклапаціцца пра тое, каб супрацоўнікі адчувалі:

– што валанцёрская праца карысная для супрацоўнікаў і арганізацыі, што атрыманыя выгоды вартыя зробленай працы;

– што яны кантралююць працэс працы валанцёраў, у тым ліку могуць вызначаць, якім чынам далучаць да працы іншых валанцёраў або наогул не выкарыстоўваць валанцёрскую працу, калі хочуць.

Каб атрымаць падтрымку супрацоўнікаў, каардынатар валанцёраў павінен прыкласці намаганні ў наступных пытаннях:

– загадзя даведацца, які папярэдні досвед працы з валанцёрамі маюць супрацоўнікі, у тым ліку, ці працавалі яны самі валанцёрамі;

– далучыць супрацоўнікаў да планавання і вызначэння валанцёрскай дзейнасці, што дазволіць вызначыць сапраўды важныя для супрацоўнікаў віды дзейнасці, якія могуць быць даручаныя валанцёрам, і гэта прынясе карысць арганізацыі ў цэлым;

– далучыць супрацоўнікаў да суразмоўяў з валанцёрамі, арыентавання і трэнінгаў, што дасць супрацоўнікам упэўненасць у тым, што валанцёры атрымалі інфармацыю, якая дазволіць ім працаваць кваліфікавана;

– упэўніцца, што супрацоўнікі і каардынатар валанцёраў згодныя з тым, хто нясе адказнасць за кожнага валанцёра; дакладнае раздзяленне абавязкаў дапаможа пазбегнуць блытаніны і крыўдаў у будчыні;

– далучыць супрацоўнікаў да кантроля за валанцёрамі, што можа выглядаць па-рознаму: ад паўнамоцтваў па кіраванні, дадзеных супрацоўнікам, да кансультацый з супрацоўнікамі па пытаннях кантроля (меру паўнамоцтваў можна выпрацаваць з кожным супрацоўнікам паасобку ў залежнасці ад яго/яе пажаданняў);

– забяспечыць магчымасць водгукаў ад супрацоўнікаў па выніках выкарыстання валанцёрскай працы; даць ім магчымасць выказвацца пра вынікі, якія прынесла валанцёрская праца ў іх дзейнасці; інфармаваць, наколькі эфектыўнаю была іх праца разам з валанцёрамі;

– паклапаціцца, каб супрацоўнікі, якія эфектыўна працавалі з валанцёрамі, атрымалі падзяку і кампенсацыю.

Аднолькава неабходна, каб валанцёры таксама разумелі патрэбы і клопаты супрацоўнікаў. Прайдзіце крокі, апісаныя вышэй, разам з вашымі валанцёрамі, упэўніваючыся, што яны працуюць разам з адпаведным супрацоўнікам і добра разумеюць сваю ролю і якую працу павінны выконваць.

Думайце пра адносіны паміж валанцёрамі і супрацоўнікамі не як пра спаборніцтва дзвюх групаў людзей, а як пра адносіны ў трохкутніку: супрацоўнікі — валанцёры — каардынатар валанцёраў. У гэтым трохкутніку роля каардынатара заключаецца ў тым, каб забяспечваць супрацоўніцтва іншых складнікаў, падтрымліваць баланс і ўзаемаразуменне.

*Матэрыял 2*

### Дванаццаць асноўных умоваў для кожнага валанцёра

(паводле Хэлен Літл, «Валанцёры — як знайсці і ўтрымаць іх»)

Існуе 12 асноўных умоваў, агульных для кожнага валанцёра і лідара валанцёраў. Іх выкананне неабходнае для таго, каб валанцёры паспяхова працавалі і каб вы маглі год за годам далучаць іх да сваіх праектаў. Прызнанне гэтых умоваў і ўменне іх задаволіць дапаможа вам павялічыць колькасць валанцёраў і колькасць гадзінаў, якія яны гатовыя будуць аддаць супрацоўніцтву з вамі.

1. Канкрэтнае пасільнае заданне, якое мае пачатак і завяршэнне.
2. Заданне, якое адпавядае зацікаўленасці і мэтам валанцёрскай працы.
3. Годная прычына для выканання задання.
4. Пісьмовыя інструкцыі.
5. Разумныя тэрміны для выканання задання.
6. Свабода выконваць заданне там і тады, калі гэта найбольш зручна для валанцёра.
7. Усё патрэбнае, каб выканаць заданне без перашкодаў.
8. Неабходнае навучанне.
9. Бяспечны, зручны, сяброўскі працоўны асяродак.

10. Кантроль, каб бачыць, што заданне выкананае.

11. Магчымасць пакінуць водгук, калі заданне выкананае.

12. Ацэнка, удзячнасць і кампенсацыя, якія адпавядаюць мэтам валанцёрскай працы.

*Матэрыял 3*

**Вартасць валанцёраў і валанцёрскай працы**

На аснове «Спісу вартасцяў валанцёрства»
(«*Carta dei valori del volontariato*»).

**Валанцёр — гэта чалавек**, які, выканаўшы свае грамадскія абавязкі, ахвяруе свой вольны час і здольнасці для іншых людзей, для супольнасці, да якой належыць, і для чалавецтва ў цэлым. Ён або яна працуе добраахвотна і бескарысліва, творча і эфектыўна адказваючы на патрэбы, з якімі сутыкаецца, і спрыяючы агульнаму дабрабыту.

**Валанцёры праяўляюць сваю актыўнасць індывідуальна,** на нефармальных сустрэчах, у розных арганізацыях. Іх матывацыя, культурныя карані і веравызнанні могуць адрозніваецца, але яны маюць агульнае жаданне паляпшаць чалавечае жыццё і будаваць лепшы свет.

**Валанцёрства — гэта бескарыслівая дзейнасць.** Адсутнасць платы — ключавы момант, які адрознівае валанцёрства ад арганізацый трэцяга сектару і іншых формаў грамадскай дзейнасці. Валанцёрства не мае эканамічнай выгады, бо не мае ніякіх формаў улады і адмаўляе яе прамыя і нябачныя перавагі. Такім чынам, валанцёрства становіцца **годным веры сведчаннем** свабоды ў адрозненне ад індывідуалісцкай логікі і эканамічнай выгады, бо адмаўляе тыя мадэлі грамадства, якія засяроджаны на валоданні і спажывальніцтве. З уласнага досведу служэння валанцёры атрымліваюць матывацыю, дасягаючы ўнутранага ўзбагачэння і паўнаты адносінаў з людзьмі.

Валанцёрства ва ўсіх сваіх формах і праявах — гэта выява **вартасці сумеснай працы і ўмення дзяліцца** з іншым чалавекам. У цэнтры валанцёрства знаходзяцца людзі, засяроджаныя

на чалавечай годнасці, грамадстве, сям'і, сацыяльных і культурных адносінах, у якіх яны жывуць. Кожны чалавек мае свае грамадзянскія правы, і валанцёры пашыраюць веды пра гэтыя правы, клапоцяцца пра іх захаванне канкрэтнымі дзеяннямі і ўсведамленнем, імкнучыся, каб усе яны прысутнічалі ў грамадскім развіцці.

Валанцёрства — гэта **школа салідарнасці**, бо фармуе чалавека як асобу, гатовую дапамагаць, і як адказнага грамадзяніна. Валанцёрства заклікае кожнага прыняць удзел у працы, адпаведна з магчымасцямі, вырашаючы мясцовыя і глабальныя праблемы, і праз гэты ўдзел рабіць унёсак у сацыяльныя змены. Такім чынам, валанцёрства аб'ядноўвае людзей, наладжвае добрыя адносіны, заснаваныя на даверы і супрацоўніцтве ў розных праектах і з рознымі арганізацыямі, на карысць сацыяльнага кантэксту, у якім існуе і працуе.

Валанцёрства — гэта досвед салідарнасці і практычнага дзеяння: яно працуе дзеля ўзрастання мясцовай, нацыянальнай і міжнароднай супольнасці, падтрымлівае ў грамадстве самых безабаронных людзей, якія перажываюць складаную сітуацыю, дапамагае пераадольваць цяжкасці і ўпадак. Падтрымка — гэта любое дзеянне, якое вяртае людзям іх правы, якасць жыцця, дапамагае пераадольваць дыскрымінацыю, эканамічныя і сацыяльныя перашкоды, аднаўляе каштоўнасць культуры, прыроднага асяроддзя і тэрыторыі. У валанцёрстве **падмуркам салідарнасці з'яўляецца справядлівасць.**

Валанцёр **нясе адказнасць за практычныя праявы грамадскай падтрымкі,** якая працуе для таго, каб выкараняць эканамічную, культурную, сацыяльную, рэлігійную і палітычную няроўнасць, і вядзе да распаўсюджання, абароны і квітнення агульнага дабра. Валанцёрства не абвінавачвае, а шукае адказы і прапануе праекты, далучаючы ўсё больш людзей да будавання лепшага жыцця ўсяго грамадства.

Валанцёрства выконвае **культурную функцыю,** выхоўваючы крытычную свядомасць у пытаннях размеркавання каштоў-

насцяў свету, міласэрнасці, свабоды, правоў і закону, талерантнасці і, перадусім, уласным прыкладам спрыяе ладу жыцця, поўнага адказнасці, гасціннасці, салідарнасці і сацыяльнай справядлівасці. Яно клапоціцца пра гэтыя вартасці, бо яны з'яўляюцца агульначалавечай спадчынай.

Валанцёрства мае **палітычную ролю:** яно прымае актыўны ўдзел у розных працэсах грмадскага жыцця, спрыяючы развіццю дэмакратычнай сістэмы. Валанцёрскія арганізацыі дапамагаюць ведаць і шанаваць правы чалавека, паказваюць патрэбы грамадства і фактары небяспекі для яго, прапануюць розныя ідэі і праекты, прымяняюць індывідуальны падыход і эксперыментуюць у вырашэнні праблемаў і аказанні розных відаў паслугаў, здзяйсняюць планаванне і аналіз раўнапраўнай сацыяльнай палітыкі ў грамадскіх арганізацыях, якія клапоцяцца найперш пра адказнасць у сферы правоў чалавека.

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

**Мэта:** паглыбіць веды аб валанцёрскай працы і знайсці спосаб далучаць да працы вашага парафіяльнага «Карытаса» новых валанцёраў.
**Матэрыялы:** магнітна-маркерная дошка, папера і каляровыя маркеры.
**Час:** карацейшыя заняткі — 45 хвілінаў, даўжэйшыя заняткі — 1 гадзіна 30 хвілінаў.

### *Ход працы*

Заняткі дзеляцца на 3 часткі па тэмах: «Дзе знайсці валанцёраў у нашай парафіі?», «Апісанне дзейнасці валанцёраў», «Набор і запрашэнне валанцёраў». Неабходна падзяліць удзельнікаў на 3 групы, а пасля вырашыць, як весці заняткі.

Першы варыянт (карацейшы) — размеркаваць 3 заданні па групах (першы матэрыял — першай групе, другі матэрыял —

другой групе, трэці матэрыял — трэцяй групе). Кожнай групе даецца 30 хвілінаў, каб абмеркаваць заданне, і 5 хвілінаў, каб прадставіць яго іншым групам. Такім чынам вы зберажэце час, але кожная група зможа абмеркаваць толькі адзін аспект валанцёрскай дзейнасці і паслухаць пра два іншыя аспекты.

Другі варыянт (даўжэйшы) — даць першае заданне кожнай групе. Яны маюць 20 хвілінаў, каб абмеркаваць яго. Тады трэба раздаць усім другое заданне і даць 20 хвілінаў, каб папрацаваць над ім. Нарэшце групы атрымліваюць трэцяе заданне і яшчэ 20 хвілінаў для дыскусіі. Напрыканцы вы распачынаеце дэбаты па ўсіх трох заданнях (усяго 30 хвілінаў) і абмяркоўваеце вынікі працы кожнай групы.

*Заданне 1*

**Дзе знайсці валанцёраў у нашай парафіі?**

A. Адкажыце на пытанні індывідуальна.

B. Падзяліцеся адказамі ў сваёй групе.

1. Чаму людзі становяцца валанцёрамі? Што прываблівае людзей у валанцёрстве?

2. Які ваш асабісты досвед валанцёрства?
   – Станоўчы/адмоўны?
   – Чаму?

3. Што вы адчуваеце, гледзячы на іншых парафіяльных валанцёраў?
   – Станоўчыя/адмоўныя пачуцці?
   – Чаму?

4. Дзе ў нашай супольнасці можна знайсці валанцёраў?
   – Ці шукае іх хто-небудзь?

5. Як іх зацікавіць?
   – Што спрацоўвае?
   – Што не спрацоўвае?

*Заданне 2*

**Апісанне дзейнасці валанцёраў**

Апішыце дзейнасць валанцёраў для выбранай паслугі або праграмы. Кожнае апісанне павінна ўключаць наступныя пункты:

1. Мэта паслугі, камітэта або праграмы.
2. Кваліфікацыя валанцёра.
3. Адказнасць валанцёра.
4. Колькасць часу, які патрабуецца ад валанцёра.
5. Трэнінг валанцёра.

*Заданне 3*

**Набор і запрашэнне валанцёраў**

Вось метады, якія можна выкарыстоўваць для пошуку валанцёраў. Выберыце два з іх, каб прымяніць у вашым парафіяльным «Карытасе», і дэтальна распрацуйце.

– Асабістае запрашэнне.
– Запрашэнне падчас літургіі.
– Выкарыстанне літургічнага каляндара.
– Брашура, прысвечаная праграме «Карытаса».
– Сведчанні валанцёраў.
– Абвесткі з амбоны.
– Бюлетэнь «Карытаса».
– Парафіяльны вэбсайт.
– Парафіяльная газета.
– Лісты ўдзячнасці ахвярадаўцам.
– Прамовы ў парафіяльных групах.
– Дзень адчыненых дзвярэй.
– Майстэрні.
– «Кірмаш» паслугаў.
– Адукацыя.
– Адпачынак.

## Некалькі ідэяў для святкавання Дня валанцёра

*Тэалагічнае тлумачэнне і абгрунтаванне валанцёрскай працы*

Прапанаваць вернікам тэалагічнае тлумачэнне і абгрунтаванне валанцёрскай дзейнасці — гэта мудра. Усе хрысціяне павінны ўсведамляць, што жаданне «рабіць добрыя ўчынкі» залежыць не толькі ад «добрай волі чалавека», — гэта асноўны абавязак хрысціяніна. У Дзень валанцёра святар можа прысвяціць гэтаму казанне або арганізаваць лекцыю, надрукаваць артыкул на гэтую тэму для вернікаў і ў свецкіх СМІ (у гэтым могуць дапамагчы тэксты, якія вы знойдзеце ў кнізе).

*Рэклама нашых праграмаў і валанцёрскай працы праз СМІ*

У Дзень валанцёра можна рэкламаваць сябе ў СМІ, распавядаючы пра свае праграмы. Мы арыентуемся на свецкія СМІ, але і не ігнаруем рэлігійныя. Прэзентацыя павінна быць добра падрыхтаванаю, каб выглядаць пераканаўча. У яе трэба ўключаць гісторыі і нават гумар з валанцёрскага жыцця. Мы павінны запрашаць прадстаўнікоў СМІ на майстар-класы. Нельга забывацца, што журналісты любяць канкрэтныя дадзеныя, рэальныя гісторыі, бо гэтак ім лягчэй напісаць артыкул.

*Святкаванне дня св. Мікалая для маргіналізаваных групаў*

Міжнародны дзень валанцёра святкуецца ў вігілію ўспаміну св. Мікалая. У многіх краінах гэта дзень, калі «святы Мікалай» наведвае дзяцей уначы, прыносячы ім падарункі. У гэты дзень хрысціяне ўзгадваюць святога і ягоную шчодрасць. Можна знайсці мноства легендаў пра тое, як шчодрасць святога выяўлялася ў добрых учынках. Святы Мікалай можа стаць нашай «ролевай мадэллю» ў валанцёрскай працы.

Мы, парафіяльны «Карытас», можам па-featureознаму адсвяткаваць дзень св. Мікалая:

– прынесці падарункі дзецям з бедных сем’яў;

– падрыхтаваць невялікую культурную і забаўляльную праграму для адкінутых грамадствам людзей і зрабіць ім маленькія падарункі.

Гэтыя дзеянні павінны ахапіць таксама працаўнікоў і валанцёраў «Карытаса».

*Публічныя дэбаты пра валанцёрства*

Можна арганізаваць публічныя дэбаты і запрасіць на іх розныя арганізацыі, рэлігійныя і грамадскія, звязаныя з валанцёрскай дзейнасцю. Гэтыя арганізацыі і парафіяльны «Карытас» могуць прадставіць свае праграмы, абмеркаваць тэмы, звязаныя з валанцёрствам (якую каштоўнасць мае валанцёрская дзейнасць у нашым грамадстве; што трэба зрабіць, каб умацаваць грамадскую салідарнасць і г.д.). Важна арганізаваць публічныя дэбаты на свецкай пляцоўцы, каб пашыраць кола магчымых удзельнікаў. З дапамогаю добра арганізаванай рэкламы (асабліва ў свецкіх СМІ) і пры ўдзеле Касцёла публічныя дэбаты могуць стаць асноваю для прэзентацыі «Карытаса» шырокаму колу людзей і рэкламаю яго дзейнасці.

*Валанцёрскі «кірмаш»*

Можна арганізаваць у парафіі або ў іншым зручным месцы валанцёрскі «кірмаш», дзе мы будзем распаўсюджваць інфармацыю пра валанцёрства з дапамогаю постараў і іншай прадукцыі, правядзення майстар-класаў. Валанцёры могуць адказваць на пытанні наведнікаў і, магчыма, заахвочваць некаторых далучыцца да валанцёрскай дзейнасці. Можна запрасіць да ўдзелу іншыя валанцёрскія арганізацыі (падрыхтаваўшы для іх месца). Калі ёсць сумненні ў тым, што наведнікаў можа быць мала, варта аб’яднаць «кірмаш» з іншымі падзеямі (напрыклад, арганізаваць яго пасля нядзельнай святой Імшы).

*Рамесніцкія вырабы*
*ў падтрымку валанцёрскіх праграмаў*

Можна папрасіць розных майстроў і рамеснікаў ахвяраваць іх вырабы ў падтрымку валанцёрскіх праграмаў. Трэба распавесці ахвярадаўцам, для якой канкрэтнай праграмы яны аддаюць свае вырабы. Падчас «кірмашу» або іншых мерапрыемстваў можна прадаваць гэтыя вырабы па вызначаных коштах або арганізаваць аўкцыён.

*Прэзентацыя валанцёрскіх праграмаў у школах*

Мы павінны загадзя наладжваць кантакт з кіраўніцтвам школаў у нашай мясцовасці і спрабаваць дамовіцца з імі аб прэзентацыі нашай працы ў Дзень валанцёра. Трэба рабіць акцэнт на праграмах для дзяцей, асабліва тых, у якіх могуць удзельнічаць дзеці. Падчас прэзентацыі мы спрабуем зацікавіць дзяцей у валанцёрскай працы і паказаць яе вартасць. Калі дамовіцца аб правядзенні мерапрыемства не атрымліваецца, можна прапанаваць свой удзел у якіх-небудзь школьных праектах. Калі і гэта не атрымліваецца, трэба зрабіць так, каб кіраўніцтва навучальных установаў убачыла ў нас вартую даверу арганізацыю і пажадала супрацоўнічаць з намі ў будучыні.

*Узнагароджанне лепшага валанцёра*

У Дзень валанцёра можна ўзнагародзіць лепшага валанцёра сімвалічным прызам. Можна выбраць гэтага чалавека самастойна або арганізаваць маленькі конкурс сярод валанцёраў ці парафіянаў. Такая ўзнагарода — добры спосаб натхняць валанцёраў да працы, бо яна сведчыць, наколькі іх праца важная і як яна цэніцца.

*Пікнік, свята, пілігрымка для валанцёраў*

Можна арганізаваць для валанцёраў пікнік, свята або пілігрымку, каб паказаць, як мы цэнім іх, і заахвоціць іх да актыўнай дзейнасці. Нельга забываць, што калі мы жадаем згуртаваць ва-

ланцёраў, трэба рабіць нешта і для іх. Яны не просяць многага — нават малыя знакі ўдзячнасці і павагі чыняць цуды.

*Супрацоўніцтва ў арганізацыі святой Імшы*

Супрацоўнікі і валанцёры «Карытаса» могуць паўдзельнічаць у арганізацыі святой Імшы, выбіраючы тэксты або чытаючы выбраныя тэксты (некаторыя прапановы ёсць у гэтай кнізе).

*Раздача паветраных шарыкаў са слоганамі*

Напярэдадні Дня валанцёраў супрацоўнікі «Карытаса» рыхтуюць шмат паветраных шарыкаў са слоганамі Дня валанцёраў: можна напісаць на іх асабістыя пасланні або заахвочванні (падыходзіць для парафіяльнага «Карытаса»). Гэтыя шарыкі можна раздаваць на вуліцах.

*Трэнінг для валанцёраў*

Арганізуючы тэматычны трэнінг для валанцёраў у гэты час, можна дадаць да яго агульную частку, якая датычыць валанцёрства. Тэмамі могуць быць: хрысціянскае валанцёрства; вартасць валанцёраў і валанцёрства; неабходнасць займацца валанцёрскай працай і гэтак далей.

*Будаванне валанцёрскай «сцяны»*

Вельмі цікавую ідэю прапанавала адна балгарская парафія. На касцёльным падворку парафіяне атрымалі кавалачак зямлі, дзе разам пабудавалі сцяну і выкарыстоўваюць яе для аб’яваў і інфармацыі пра валанцёрскую дзейнасць і розныя валанцёрскія праекты ў парафіі і па-за ёю.

*Сабраць валанцёраў і папрацаваць разам*

З нагоды Дня валанцёраў можна сабраць валанцёраў, якія працуюць у адной канкрэтнай галіне (з пажылымі людзьмі, з інвалідамі і г.д.). Мы прапануем ім падрыхтаваць паштоўкі на Божае Нараджэнне, раздаем патрэбныя матэрыялы (алоўкі, фарбы,

паперу, нажніцы і іншае). Яны павінны напісаць на паштоўках віншаванні з Божым Нараджэннем і Новым годам, падпісаць сваё імя і месца жыхарства. Пасля гэтыя паштоўкі можна раздаць асобам у патрэбе, з якімі вы працуеце.

*Прэзентацыя дзейнасці валанцёраў*

З нагоды Дня валанцёраў можна зрабіць прэзентацыю іх дзейнасці, бо гэта вельмі важна для развіцця валанцёраў. Валанцёры могуць выказаць жаданне паўдзельнічаць у нейкіх праектах у будучыні, калі будуць ведаць запланаваную праграму дзейнасці ў цэлым.

*Даць імпульс валанцёрскай дзейнасці*

Правядзіце акцыю па «ахвяраванні часу», падчас якой людзі дораць пэўную колькасць уласнага часу для валанцёрскай працы над канкрэтнымі праектамі.

– Дапамажыце кампаніям распрацаваць карпаратыўныя валанцёрскія праграмы.

– Стварыце агульнае кіраўніцтва валанцёрскіх арганізацый у краіне.

– Стварыце Нацыянальны цэнтр або Фонд для распаўсюджання валанцёрскай дзейнасці.

– Арганізуйце конкурс на стварэнне валанцёрскага гімна, песні або лозунга.

– Станьце заснавальнікамі ўзнагароды або прэміі для лепшага валанцёра. Запрасіце прадстаўніка дзяржаўных уладаў або якую-небудзь важную асобу ўзнагародзіць валанцёраў і валанцёрскія арганізацыі.

– Выдайце кнігу, зрабіце даклад або даследаванне, прысвечаныя валанцёрскай дзейнасці ў краіне.

– Складзіце спіс паслугаў, немагчымых без валанцёрскай дзейнасці.

– Спрабуйце спрыяць прыняццю законаў аб пашырэнні валанцёрскай дзейнасці.

– Распаўсюджвайце інфармацыю пра Мэты развіцця тысячагоддзя. Заахвочвайце ўлады краіны, рэгіянальныя і мясцовыя ўлады прыняць адну або некалькі з гэтых мэтаў як асноўную мэту стратэгіі развіцця валанцёрства. Абуджайце свядомасць грамадскай супольнасці з дапамогаю майстар-класаў, дыскусійных форумаў, канферэнцый, выставаў, СМІ і г.д., каб гаварыць пра важнасць унёску валанцёраў у дасягненні васьмі Мэтаў развіцця тысячагоддзя.

– У сваёй дзейнасці засяродзьцеся на адной з узгаданых мэтаў, напрыклад, на аднаўленні прыродных рэсурсаў.

– Старайцеся, каб камунікацыя і прапаганда валанцёрскай дзейнасці звязваліся з Мэтамі развіцця тысячагоддзя.

*Выкараняць беднасць і паляпшаць адукацыю*

– Мабілізуйце валанцёраў для раздачы ежы, адзення і медыкаментаў бяздомным і бедным.

– Арганізуйце адукацыйныя і забаўляльныя мерапрыемствы для сіротаў і вулічных дзяцей.

– Мабілізуйце валанцёраў для прыбірання публічных месцаў, пасадкі дрэваў і г.д. у бедных раёнах горада.

– Будуйце дарожкі, дзіцячыя пляцоўкі і месцы адпачынку з ахвяраваных матэрыялаў.

– Збірайце грошы, каб дапамагаць пачатковым школам, або збірайце патрэбныя для навучання матэрыялы для школьнікаў.

– Арганізуйце бацькоўскія, грамадскія групы і недзяржаўныя арганізацыі, каб абмяркоўваць сацыяльную сітуацыю ў вашай мясцовасці, патрэбы і інавацыйны падыход да адукацыі.

## Тэксты для святой Імшы ў Дзень валанцёраў

*Пачатак*

Браты і сёстры!

Мы цэлебруем Эўхарыстыю ў Дзень валанцёра. Мы бачым мноства людзей, якія з любові да Бога і бліжняга прыходзяць на службу Пана. У шматлікіх сферах яны ўвасабляюць сапраўдную любоў і распаўсюджваюць Божую любоў, перадаючы яе асобам у патрэбе, нібы рукі Езуса, якія дапамагаюць іншым, і Яго ногі, якія ідуць туды, дзе Ён патрэбны. На пачатку святой Імшы перапросім Пана Бога за нашыя грахі. Мы павінны спытаць сябе: калі мы бываем прыладаю ў Божых руках? Мы павінны спытаць сябе: што добрага я мог бы зрабіць у сваім жыцці і ўсё ніяк не раблю? Мы павінны ўзгадаць пра гэта і праз учынкі праяўляць любоў да бліжніх.

*Малітва вернікаў*

У Дзень валанцёраў мы молімся нашаму Пану і прыносім Яму свае пакорныя просьбы:

**1.** Дарагі Ойча, просім Цябе за усіх, хто аддае свой вольны час, сілы і маёмасць тым, хто ў патрэбе.

**Н.:** Цябе просім, выслухай нас, Пане.

**2.** Дарагі Ойча, просім Цябе за ўсіх, хто ў бядзе і нястачы, каб мы маглі дапамагаць ім, як толькі здолеем.

**Н.:** Цябе просім, выслухай нас, Пане.

**3.** Дарагі Ойча, просім Цябе, каб мы адчувалі Тваю любоў і шчодрасць да іншых людзей, калі яны пакутуюць.

**Н.:** Цябе просім, выслухай нас, Пане.

**4.** Дарагі Ойча, просім Цябе за ўсіх памерлых, якія сваім жыццём сведчылі пра Тваю любоў да нас.

**Н.:** Цябе просім, выслухай нас, Пане.

**5.** Дарагі Ойча, кожны з нас просіць Цябе асабіста... (*хвіліна цішыні*).

**Н.:** Цябе просім, выслухай нас, Пане.

Просім нашага Пана: дарагі Ойча, прымі і выслухай усе нашыя просьбы, молім цябе ў імя Езуса Хрыста, Пана нашага.

**Н.:** Амэн.

*Уводзіны ў Панскую малітву*

Мы часта чытаем малітву «Ойча наш...», звяртаючыся да Нябеснага Айца. Молячыся, мы павінны прасіць Яго ўчыніць нас Яго супрацоўнікамі ў выкананні таго, аб чым мы Яго просім.

Памолімся.

*Знак супакою*

Калі я паціскаю некаму руку, гэта не павінна быць фармальным халодным жэстам. Гэтыя людзі — мой брат і мая сястра, мяне радуе іх прысутнасць, яны патрэбныя мне, а я — ім. Няхай гэты жэст будзе знакам таго, што яны важныя для мяне, што я гатовы стаць побач з імі і стаць ім сябрам.

Перадайма адзін аднаму знак супакою.

## *Заключэнне*

Валанцёр — гэта чалавек, які жадае прысвяціць сябе добрым учынкам у супольнасці.

**У Евангеллі шмат прыкладаў** людзей, якія дзейнічаюць, нібы валанцёры, напрыклад, сам Езус і Апосталы. Матывацыя іх дзейнасці — не толькі добрая воля, але і вера ў тое, што валанцёрства — спосаб праяўляць хрысціянскую любоў. І ў Касцёле, і ў грамадстве валанцёры дзейнічаюць адпаведна з **важнымі каштоўнасцямі,** такімі як служэнне, салідарнасць, узаемная адказнасць і бескарыслівасць.

Істотна, каб парафіяльны «Карытас» не ставіўся да валанцёраў як да невычэрпнага рэсурсу, які ў любы момант вольны і даступны, а ўспрымаў іх як **частку працоўнай групы.** Таму каардынатары «Карытаса» павінны ставіцца да валанцёраў прафесійна, адпаведна з шасцю асноўнымі крокамі:

1) стварэнне працоўных месцаў;

2) набор валанцёраў;

3) правядзенне суразмоўя (інтэрв'ю);

4) клопат пра іх арыентаванне і прафесійную падрыхтоўку;

5) кантроль;

6) праяўленне да іх удзячнасці ў выглядзе ўзнагародаў і кампенсацый.

# ПРАКТЫЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ САЦЫЯЛЬНАЙ СІТУАЦЫІ Ў ПАРАФІІ

На прыкладзе парафіяльнага «Карытаса» Влёры ў Паўднёвай Албаніі мы прааналізуем працу рэгіянальнага парафіяльнага «Карытаса», яго структуры і функцыі. Гэты парафіяльны «Карытас» быў выбраны намі, бо мае цікавую гісторыю, арганізацыю, удзельнікаў, дзейнасць і падыход. Гэта добры прыклад для іншых парафіяльных «Карытасаў», якія жадаюць распачаць або палепшыць сваю працу. Асаблівую ўвагу мы звярнулі на апісанне валанцёрскай дзейнасці, бо ў гэтым парафіяльным «Карытасе» валанцёраў шмат і яны вельмі актыўныя.

У прапанаваным прыкладзе відаць, як працуе добра арганізаваны «Карытас», вопыт дзейнасці якога можна прымяніць і ў іншых сферах.

***Малітва***

*О мой Езу,*
*дзякую Табе за тое,*
*што дазваляеш мне быць тут сёння,*
*дзякую Табе за тое,*
*што дазваляеш мне служыць Табе ў бедных.*
*Няхай у іх тварах я ўбачу Твой твар,*
*няхай у іх патрэбах я пачую Твае патрэбы.*
*О мой Езу,*
*няхай я стану Тваёю прыладаю міласэрнасці*
*для кожнага чалавека, якога сёння сустрэну,*
*няхай мае словы будуць Тваімі міласэрнымі словамі,*
*няхай мае вочы бачаць іншых*
*Тваімі міласэрнымі вачыма,*
*няхай мае рукі і ногі рухаюцца з міласэрнасцю,*
*як Твае, калі Ты прабываў на гэтай зямлі.*
*О мой Езу,*
*няхай мяне атуляе сэрца Тваёй Маці Марыі,*
*і дазволь мне прынесці Цябе іншым, як гэта рабіла Яна,*
*з вялікаю пакораю і ўдзячнасцю.*

(Валанцёр пры Кангрэгацыі Місіянераў Маці Божай Міласэрнасці)

Гэтая малітва, напісаная валанцёрам, дапамагае нам задумацца над тым, як падыходзіць да парафіяльнага «Карытаса» і людзей, што ў ім працуюць. Слухаць, назіраць і распазнаваць, каб падбадзёрваць — гэта асноўныя прынцыпы педагагічнай функцыі «Карытаса», якую кожны валанцёр і супрацоўнік «Карытаса» кожны дзень выконвае ў сваім служэнні ў супольнасці.

Слухаць — вушамі і сэрцам, даючы месца эмоцыям; назіраць — вачыма і розумам, каб разумець сітуацыю ў цэлым; лепш распазнаваць — каб падбадзёрваць усімі спосабамі і жаданнем далучаць супольнасць да працы, якая стане сведчаннем хрыс-

ціянскай любові. Усё гэта дазволіць не толькі нам, але і іншым людзям быць атуленымі сэрцам Маці Хрыста, Марыі.

### *Тэарэтычная частка*

Парафіяльны «Карытас» можа быць арганізаваны па-рознаму і мець мноства розных падыходаў да вырашэння праблемаў. Гэта залежыць ад многіх фактараў: рэлігійнага, сацыяльнага і культурнага кантэкстаў; стаўлення святара і супольнасці; колькасці маладога насельніцтва там, дзе існуе парафіяльная супольнасць; патрэбаў і клопатаў парафіяльнай супольнасці ў цэлым; мясцовых канкрэтных формаў беднасці і грамадскай адкінутасці.

Мы прывядзем прыклад працы албанскага парафіяльнага «Карытаса», арганізаванага паводле тыповых элементаў, прааналізаваных у гэтай кнізе.

Парафіяльны «Карытас», які мы апісваем, гэта не ідэальны «Карытас» і не найлепшая мадэль для парафіяльнага «Карытаса», бо ідэальнага «Карытаса» проста не можа быць! Гэта толькі прыклад добрага парафіяльнага «Карытаса», які можна выкарыстоўваць для параўнання з нашай мясцовасцю, нашымі патрэбамі і арганізацыяй.

### ГІСТАРЫЧНЫ І ГЕАГРАФІЧНЫ КАНТЭКСТ

Парафія Влёры (Валона) знаходзіцца ў дыяцэзіі Паўднёвай Албаніі і ўключае мястэчка Влёра і тры навакольныя вёскі.

У мястэчку каля 120 000 жыхароў, яно знаходзіцца на марскім узбярэжжы, у паўднёвай частцы Адрыятыкі. Ва апошнія 15 гадоў многія жыхары выехалі адтуль і прыехала шмат іншых людзей. Тыя, хто пакінуў краіну, найчасцей эмігравалі ў Італію, тыя, хто прыехаў, у асноўным прыбылі з горных раёнаў — вельмі беднага рэгіёна, цяпер амаль ненаселенага. Новыя жыхары найчасцей селяцца ў прадмесцях. У влёрскіх прадмесцях многія жывуць у беднасці, хваробах і пакутуюць ад грамадскай ізаляцыі.




Большасць жыхароў Влёры — мусульмане і праваслаўныя, каля 3% — каталікі. Мясцовы касцёл быў зноў адчынены па ініцыятыве каталікаў у 1992 г. пасля падзення камуністычнага рэжыму. Цяпер там працуе місіянер. Апроч яго, у парафіяльнай супольнасці працуюць 3 манаскія жаночыя кангрэгацыі пры пастаральных цэнтрах: Орыкум, Пус Мэзін, Бабіцэ і Влёра.

Орыкум — маленькае мястэчка на марскім узбярэжжы, вядомае тым, што ў камуністычныя часы там знаходзіўся вайсковы порт. Цяпер мясцовыя жыхары сутыкаюцца з дзвюма галоўнымі праблемамі — беспрацоўе і эміграцыя. У Орыкуме ёсць жаночы кляштар.

Пус Мэзін знаходзіцца побач з прадмесцямі, і там таксама жывуць законніцы.

Бабіцэ — гэта вёска за 5 кіламетраў ад Влёры; у камуністычныя часы там была шахта, а цяпер людзі ў асноўным жывуць з вясковай гаспадаркі. З Бабіцэ таксама з’ехала шмат людзей.

Дыяцэзія Паўднёвай Албаніі займае большую палову албанскай тэрыторыі. Дыяцэзіяльны «Карытас» складаецца са старшыні — біскупа, адной з манашак, якая з’яўляецца дырэктарам, і чатырох асобаў, якія ўваходзяць у кіраўнічую групу, адказваючы за чатыры раёны, на якія падзеленая дыяцэзія: Корча, Фіер-Влёра, Эльбасан і Саранда.

Такой вялікай тэрыторыяй кіраваць вельмі складана: там ёсць вялікія гарады і вясковыя раёны, марскае ўзбярэжжа

і горы. У дыяцэзіі шмат розных відаў беднасці і розных праблемаў у залежнасці ад рэгіянальных умоваў.

У рэгіёне Фіер-Влёра, дзе знаходзіцца парафіяльны «Карытас», існуюць такія праблемы як міграцыя, «сацыяльныя» хваробы ў прадмесцях, ізаляванасць далёкіх вёсак, горных пасёлкаў, беспрацоўе. Пастаральныя цэнтры, якімі кіруюць манашкі, па-рознаму звязаныя з парафіяй. З аднаго боку, на ўласнай тэрыторыі яны дзейнічаюць свабодна, займаючыся рознымі праектамі, у залежнасці ад умоваў і патрэбаў мясцовай супольнасці. З іншага боку, яны цесна супрацоўнічаюць у адной місіі і з аднолькавай стратэгіяй пастаральнай дзейнасці.

## СТРУКТУРА ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА» ВЛЁРЫ

Парафія Влёры пачала сваю дзейнасць у 1992 годзе. Парафіяльны «Карытас» Влёры складаецца з парафіяльных структураў і трох манаскіх жаночых супольнасцяў. Арганізацыя не зацверджана афіцыйнымі дакументамі або статутам, такім чынам, гэта неафіцыйны «Карытас», а гэта азначае — добра арганізаваная і актыўная супольнасць, але без афіцыйнай рэгістрацыі. Парафія настолькі моцна звязаная з дзейнасцю парафіяльнага «Карытаса», што многія людзі ўжываюць словы «парафія» і «парафіяльны “Карытас”» як сінонімы.

Структура парафіяльнага «Карытаса» арганізаваная наступным чынам:

– святар;
– Парафіяльная рада;
– каардынатар;
– тры манаскія жаночыя супольнасці;
– асобы, адказныя за розныя віды працы;
– валанцёры;
– сувязь.

Цяпер мы дэтальна растлумачым ролю ўсіх узгаданых дзейных асобаў «Карытаса».

*Святар*

Святар — місіянер італьянец, які належыць да Кангрэгацыі слугаў Марыі. Ён працуе ў Влёры з 1992 года. Яму каля 50-ці гадоў. Да яго прыезду парафія не існавала, гэтак жа, як і парафіяльны «Карытас», які і цяпер не зацверджаны афіцыйна, але вядзе актыўную дзейнасць.

*Парафіяльная рада*

Парафіяльная рада адказвае за касцёл і дзеянне ўсёй парафіяльнай супольнасці, яна заклікае да актыўнай дзейнасці ў пастаральнай сферы і супрацоўніцтва свецкіх вернікаў і кансэкраваных асобаў.

Рада складаецца з чатырох асобаў: святара і трох сясцёр настаяцелек.

Яе задачаю з'яўляецца вывучэнне, планаванне і кантроль пастаральнай дзейнасці супольнасці. Яна асаблівым чынам імкнецца развіваць пастаральную свядомасць свецкіх вернікаў і ўсёй супольнасці і распрацоўвае пастаральныя планы з перспектываю агульнага супрацоўніцтва, аб'ядноўваючы розныя ініцыятывы і праекты ў арганічную пастаральную дзейнасць.

*Каардынатар*

Каардынатарам з'яўляецца 22-гадовая дзяўчына, якая вучылася ў салезіянскай школе «Дон Боска» на сацыяльнага аніматара. Яна вельмі зацікаўленая ў працы парафіі: удзельнічала і цяпер удзельнічае ва ўсіх справах, якія арганізоўваюцца на парафіяльным узроўні, таму нацыянальны «Карытас» прызначыў яе каардынатарам нацыянальнага праекта для моладзі і дзяцей Влёры. Яна адказвае за аніматарскую дзейнасць у гэтай мясцовасці і каардынуе нацыянальную праграму «Карытаса» гэтак жа, як і дзейнасць чатырох пастаральных цэнтраў у мясцовасці.

Яе задача — вучыць групы маладых валанцёраў і падтрымліваць сувязь паміж групамі ў чатырох пастаральных цэнтрах. Разам з цэнтрамі яна стварыла каляндар анімацыйнай дзейнасці па месяцах, яна адказвае за тэхнічную і арганізацыйную частку

працы, падрыхтоўку справаздачаў, маніторынгавыя і аналітычныя сустрэчы.

Яна з'яўляецца кантактнаю асобаю па анімацыйнай дзейнасці ў дыяцэзіяльным і нацыянальным «Карытасе». Яна прымае ўдзел у каардынацыйных сустрэчах нацыянальнага «Карытаса» па пытаннях анімацыі.

*Тры манаскія жаночыя супольнасці*

Кожная манаская супольнасць складаецца з 3–5 сёстраў. Іх задача (разам з парафіяльным святаром) — пастаральная анімацыя на тэрыторыі і праца з людзьмі.

Яны кіруюць пастаральнымі цэнтрамі і вядуць наступную дзейнасць:

– катэхізацыя;

– праца з моладдзю і дзецьмі: дзіцячы садок і араторый, трэнінгі для аніматараў; візіты для навучання і абмену досведам; экскурсіі, летнікі, скаўцкія групы;

– дзейнасць па выслухоўванні і назіранні: існуюць чатыры цэнтры выслухоўвання; таксама сёстры наведваюць сем'і;

– асноўная медыцынская дапамога, якая адбываецца ў амбулаторыі, а таксама сёстры наведваюць хворых дома;

– культурная дзейнасць: бібліятэка;

– спартыўная дзейнасць: арганізацыя спаборніцтваў і іншых спартыўных мерапрыемстваў;

– сустрэчы з жанчынамі, прысвечаныя адукацыі і выхаванню дзяцей, адносінам бацькоў і дзяцей і г.д.

*Асобы, адказныя за розныя віды працы*

У кожным пастаральным цэнтры прызначаюцца адказныя за кожны сектар дзейнасці асобы: манашкі і свецкія вернікі. Напрыклад, адзін чалавек адказвае за праекты, прысвечаныя дзецям і моладзі ў кожным з 4-х пастаральных цэнтраў.

Яны сустракаюцца раз на тыдзень пасля нядзельнай святой Імшы і аналізуюць, правяраюць і плануюць канкрэтныя праекты ў кожнай сферы дзейнасці. На гэтых сустрэчах яны

абменьваюцца інфармацыяй, навінамі, магчымасцямі, ініцыятывамі і гэтак далей.

*Валанцёры*

Пастаральныя цэнтры звычайна наведвае шмат маладых людзей, многія выхоўваюцца ў араторыі. Гэта моладзь 14–25 гадоў, не толькі каталікі, але і мусульмане, і праваслаўныя.

Важна падкрэсліць, што ў Орыкуме, Бабіцэ і Пус Мэзіне пастаральныя цэнтры — адзінае месца, дзе моладзь можа бавіць час, а ў Влёры ёсць іншыя моладзевыя асацыяцыі і групы, некаторыя з іх — пры ўніверсітэце Влёры.

Моладзь займаецца валанцёрскаю працаю, дапамагаючы аніматарам арганізоўваць розныя мерапрыемствы для дзяцей, працуючы разам з сёстрамі ў бібліятэцы і разам з імі наведваючы сем'і ў патрэбе. Яшчэ яны займаюцца перакладамі і дапамагаюць арганізоўваць спартыўныя мерапрыемствы.

Адказныя за гэтыя сектары працы таксама клапоцяцца пра няспынную адукацыю валанцёраў: арганізуюцца трэнінгі на тэмы адносна важнасці валанцёрскай працы, правоў чалавека і тэхнічнай падрыхтоўкі да розных мерапрыемстваў і г.д. Больш за гэта, «Карытас» Албаніі прапануе моладзі далучацца да іншых арганізаваных адукацыйных праграмаў у сферы анімацыі, моладзевай інтэграцыі ў грамадства і валанцёрскай працы.

У моладзевай групе звычайна 2–3 лідары/аніматары, якія арганізуюць і далучаюць да працы ўсю групу. Штотыдзень яны праводзяць сустрэчы, дзе плануюць і распрацоўваюць праекты, а ўлетку яны найбольш занятыя ў дзіцячых летніках і экскурсійных праграмах.

*Сувязь*

Сувязь наладжваецца на 3-х узроўнях:

1) *Планаванне агульнай пастаральнай дзейнасці* з удзелам Пастаральнай рады парафіі і падчас каардынацыйных сустрэчаў кожнага сектара. Гэта робіцца для таго, каб дзейнічаць супольна, дзяліцца інфармацыяй і новымі ініцыятывамі.

2) *Планаванне каардынацыйнай дзейнасці* ў Фушэ і ў наваколлі. Фушэ — раён побач з Влёраю, прадмесце, у якім узровень беднасці і сацыяльнай дэградацыі вельмі высокі і зусім няма дзяржаўнай падтрымкі, не вядзецца ніякай дабрачыннай працы і адсутнічаюць сацыяльныя паслугі. Гэты раён знаходзіцца на тэрыторыі парафіі, але вельмі далёкі ад чатырох пастаральных цэнтраў. Парафіяльны «Карытас» правёў ацэнку гэтай сітуацыі, і па выніках яе вывучэння парафіяльная супольнасць вырашыла дзейнічаць. Спачатку было запланавана правядзенне анімацыйнай дзейнасці, каб бліжэй пазнаёміцца з дзецьмі і іх сем'ямі, іх канкрэтнымі праблемамі і клопатамі. Дадатковым плюсам з'яўляецца тое, што пастаральнай дзейнасцю ў гэтым раёне кіруе каардынацыйная група, якая складаецца з трох манашак, лідараў моладзевых супольнасцяў і каардынатара, а старшынёй з'яўляецца святар.

3) *Назіранне за сітуацыяй беднасці і грамадскай адкінутасці.* У гэтыя гады пачаўся збор інфармацыі, вывучэнне стану тэрыторыі і відаў беднасці. Гэтым займаюцца адна законніца і каардынатар, адказныя за збор дадзеных ва ўсіх 4-х цэнтрах. Яны вядуць назіранне і сістэматызуюць інфармацыю, важныя дадзеныя пра ўмовы жыцця асобных людзей і сем'яў, з якімі сустракаліся працаўнікі і валанцёры парафіяльнага «Карытаса» падчас рознай анімацыйнай дзейнасці. Аналіз гэтых дадзеных у асноўным патрэбны парафіяльнай супольнасці, каб лепш ведаць мясцовасць, дынаміку сітуацыі і віды беднасці, ведаць, хто знаходзіцца ў зоне рызыцы, каб аказваць лепшую дапамогу. З іншага боку, гэтае назіранне разам са зборам дадзеных па сітуацыі беднасці ў іншых албанскіх дыяцэзіях дае нацыянальнаму «Карытасу» лепшую карціну становішча на ўсёй тэрыторыі Албаніі: гэта тая прылада Касцёла, якая дае магчымасць праяўляць актыўную міласэрнасць і чуць голас тых, хто пазбаўлены голасу.

СХЕМА СТРУКТУРЫ
ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА» ВЛЁРЫ




**ДЗЕЙНАСЦЬ**
**ПАРАФІЯЛЬНАГА «КАРЫТАСА» ВЛЁРЫ**

Парафіяльны «Карытас» Влёры прапануе розныя праекты і праграмы.

*Сацыяльнае служэнне*

– *Базавая медыцынская дапамога* аказваецца ў амбулаторыі ў Влёры. Пры іншых пастаральных цэнтрах сёстры даглядаюць хворых дома і, калі трэба, дапамагаюць пацыенту звязацца з амбулаторыяй.

– *Бібліятэка* была адчыненая ў пастаральным цэнтры ў Бабіцэ чатыры гады таму; гэта адзінае месца, дзе вясковая моладзь можа чытаць і браць у карыстанне кнігі. Тут ёсць розная літаратура, у тым ліку падручнікі для пачатковай і сярэдняй школы, каб дзеці і моладзь маглі вучыцца па зацверджанай праграме. У 2007 г. было атрымана фінансаванне для набыцця некаторых кнігаў.

– Праводзяцца *сустрэчы з жанчынамі* аб адукацыі і выхаванні дзяцей, адносінах паміж бацькамі і дзецьмі. Гэтыя сустрэчы арганізоўваюцца ў чатырох пастаральных цэнтрах, індывідуальна і ў групах. Мэтаю сустрэчаў з'яўляецца навучанне адносінам у сям'і і ўмацаванне становішча жанчынаў у сем'ях і ў грамадстве.

– Праводзяцца *мерапрыемствы ў араторыях*. У чатырох пастаральных цэнтрах адбываюцца розныя падзеі для дзяцей і моладзі, незалежна ад веравызнання: гульні, спорт, творчасць, анімацыя. Араторыі пачынаюць працаваць пасля абеду. Час ад часу валанцёры арганізуюць спаборніцтвы і іншыя спартыўныя мерапрыемствы. Працуе скаўцкая арганізацыя.

– Манашкі і валанцёры арганізуюць *летнікі*, у якіх на працягу тыдня прымаюць удзел каля 100 дзяцей. Кожны летнік прысвечаны нейкай тэме. Усе мерапрыемствы ў летніках арганізуюць валанцёры.

– Ёсць два *дзіцячыя садкі*, адзін — у Пус Мэзіне, другі — у Бабіцэ, дзе даглядаюць каля 70-ці дзяцей. Садкі працуюць адпаведна з патрабаваннямі і праграмамі Міністэрства адукацыі Албаніі, у іх чатыры выхавацелі.

*Педагагічная задача*

– Праводзяцца *трэнінгі для аніматараў*. Іх арганізуюць спецыялісты з нацыянальнага «Карытаса» Албаніі паводле Нацыянальнай праграмы падрыхтоўкі сацыяльных аніматараў. Прымаць удзел у адукацыйных праграмах запрошаны маладыя валанцёры, якія актыўна ўдзельнічаюць у розных праектах.

Трэнінгі адбываюцца па выходных, лідары прыязджаюць з чатырох пастаральных цэнтраў, сустракаюцца і разам удзельнічаюць у трэнінгах. Тэмы сустрэчаў розныя: анімацыйныя навыкі, планаванне дзейнасці, дынаміка групаў, камунікацыя, а таксама грамадскія праблемы, такія як наркаманія і злоўжыванне алкаголем, жорсткасць, канфлікты, сямейныя адносіны.

– Манашкі арганізуюць *абмен досведам і навучанне*, наведваючы іншыя цэнтры ў Албаніі, якія займаюцца падобнай дзейнасцю і маюць падобныя праграмы.

– *Экскурсіі* арганізоўваюцца, каб матываваць валанцёраў, спрыяць дынаміцы ў групах, знаёміцца з новымі мясцінамі і вывучаць экалагічную сітуацыю.

*Дзейнасць па выслухоўванні і назіранні*

Цэнтраў выслухоўвання для збору інфармацыі не існуе, але манашкі і святар займаюцца выслухоўваннем і назіраннем за тэрыторыяй падчас сваёй штодзённай дзейнасці. У гэтай сферы вялікае значэнне мае наведванне сем’яў. Падчас гэтых візітаў парафіяльны «Карытас» можа ўбачыць і ацаніць рэальныя ўмовы, у якіх жывуць бедныя сем’і. Нядаўна парафіяльны «Карытас» Влёры далучыўся да праграмы нацыянальнага «Карытаса» Албаніі па стварэнні Цэнтраў назірання за сітуацыяй беднасці і ацэнкі рэсурсаў, мэтаю якіх з’яўляецца паляпшэнне збору інфармацыі і яе аналіз.

Дзейнасць парафіяльнага «Карытаса» ў асноўным фінансуюць манаскія кангрэгацыі, некаторыя праекты фінансуе нацыянальны «Карытас» Албаніі, частку малых праектаў фінансуюць дабрачынцы.

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

Гэты падраздзел сам па сабе з'яўляецца практыкай, таму няма патрэбы арганізоўваць асобны практыкум. Гісторыя парафіяльнага «Карытаса» ў Влёры — гэта сапраўды добрая тэма для дыскусіі. Адказны ў групе можа пераказаць або прачытаць інфармацыю пра досвед Влёры іншым удзельнікамі і правесці дыскусію, абапіраючыся на наступныя пытанні:

– Ці спадабаўся вам гэты прыклад?

– Чым да яго падобны і чым адрозніваецца ад яго ваш уласны досвед?

– Што б вы жадалі пераняць з гэтага прыкладу?

– Што б вы змянілі, калі б былі чальцом парафіяльнага «Карытаса» ў Влёры?

– Які падыход да валанцёраў яны практыкуюць? Як вы думаеце, чаму яны паспяхова набіраюць валанцёраў і заахвочваюць іх да актыўнай дзейнасці?

## *Заключэнне*

Парафіяльны «Карытас» можа быць арганізаваны па-рознаму, у залежнасці ад рэсурсаў і праблемаў канкрэтнай мясцовасці. Тут быў прапанаваны прыклад добра арганізаванага парафіяльнага «Карытаса» ў Влёры, у Албаніі, каб звярнуць увагу **на некаторыя істотныя рэчы, важныя для арганізацыі**.

Гэта неафіцыйны «Карытас», але ў ім ёсць **дакладнае раздзяленне задачаў і адказнасці** для ўсіх, хто дзейнічае ў арганізацыі: для святара, Парафіяльнай рады, каардынатара, манашак, адказных за сацыяльнае служэнне, валанцёраў. Гэта таксама дазваляе валанцёрам адчуваць сябе істотнаю часткаю парафіяльнага «Карытаса».

Парафіяльны «Карытас» вядзе дзейнасць па выслухоўванні і назіранні, праводзіць трэнінгі і візіты, выконваючы педагагічную задачу, а таксама некаторыя віды сацыяльнага служэння. Валанцёры прымаюць удзел у працы адпаведна з іх магчымасцямі і маюць у праектах сваю дакладна вызначаную задачу.

# АСНОЎНЫЯ НАВЫКІ ВАЛАНЦЁРАЎ

## Тэма IV

# АРГАНІЗАЦЫЯ[7] І ФАСІЛІТАЦЫЯ[8] СУСТРЭЧАЎ

Тут пададзена інфармацыя па планаванні, арганізацыі і правядзенні сустрэчаў. Звяртаецца асаблівая ўвага, як неабходна праводзіць фасілітацыю сустрэчаў, а таксама прапануюцца заданні, метады, падказкі, праверачныя тэсты, якімі варта карыстацца, каб сустрэчы адбываліся эфектыўна.

---

7 Арганізацыя сустрэчаў — гэта дзейнасць па планаванні і падрыхтоўцы да сустрэчаў, якая праводзіцца загадзя і мае пэўныя ключавыя элементы.

8 Фасілітацыя сустрэчаў — гэта свядомы працэс кіравання сустрэчамі ў правільным кірунку, дзе кожны прымае належны ўдзел і дасягаюцца важныя мэты.

### *Малітва*

*Калі Езус і вучні былі ў дарозе, Ён зайшоў у адно паселішча. Нейкая жанчына, якую звалі Марта, прыняла Яго. У яе была сястра імем Марыя, якая села каля ног Пана і слухала Ягоныя словы. Марта ж, занятая многімі паслугамі, падышоўшы, сказала: «Пане, ці Табе ўсё адно, што сястра мая пакінула мяне адну прыслугоўваць? Таму скажы ёй, каб дапамагла мне». Але Пан сказаў ёй у адказ: «Марта, Марта, ты турбуешся і клапоцішся пра многае, а патрэбна толькі адно. Марыя ж выбрала добрую частку, якая не адымецца ў яе».*

(Лк 10, 38–42)

Часам бывае недастаткова проста працаваць: трэба сесці і паслухаць. Трэба слухаць Божае слова і іншых людзей, трэба дзяліцца з імі досведам і думкамі, дасягаць згоды, разам прымаць рашэнні. Трэба планаваць не толькі тое, як выканаць працу, але і як слухаць.

### *Тэарэтычная частка*

**ШТО ТАКОЕ СУСТРЭЧА І КАЛІ ЯНА ПАТРЭБНАЯ?**

Сустрэча — гэта збор двух або большай колькасці людзей у адным месцы; яе мэтаю з’яўляецца абмен інфармацыяй, каб трымаць адзін аднаго ў курсе падзеяў і (або) вырашэнне праблемы «мазгавым штурмам», супольнае прыняцце рашэння. Характарыстыкі эфектыўнай сустрэчы:

– Ёсць загадзя агавораныя мэты.

– Прысутнічаюць патрэбныя людзі.

– План дзеянняў (з вызначанымі часавымі рамкамі) рыхтуецца і раздаецца загадзя.

– Асноўная інфармацыя раздаецца загадзя.

– Размяркоўваюцца задачы для ўдзельнікаў.

– Вядзецца актыўнае кіраванне сустрэчай і фасілітацыя.

– Сустрэча мае завяршэнне, у тым ліку вырашаюцца пастаўленыя пытанні і размяркоўваюцца заданні.

– Захоўваюцца вызначаныя часавыя рамкі.

– Ёсць некаторыя асноўныя пытанні, якія трэба задаць сабе, збіраючыся арганізаваць сустрэчу.

Упэўніцеся, што сустрэча патрэбная для таго, каб дасягнуць пастаўленых мэтаў. Планаванне і правядзенне сустрэчаў каштуе дорага, калі ўлічваць час, які людзі праводзяць на сустрэчы. Таму трэба ўсведамляць, што сустрэча з'яўляецца лепшым спосабам вырашыць праблему, палепшыць дзейнасць або стварыць эфектыўны план дзейнасці.

– Ці існуе нейкая праблема, якую лепш за ўсё вырашаць у групе?

– Ці патрэбная нам камунікацыя?

– Якія адносіны існуюць у групе? Ці патрэбнае нам у групе ўмацаванне або лепшая згуртаванасць?

Асноўная прычына неэфектыўнасці сустрэчаў у тым, што яны насамрэч не патрэбныя, арганізоўваюцца не ў тым месцы і не ў той час, не маюць добрай падрыхтоўкі, на іх запрашаюць не тых удзельнікаў, іх дрэнна праводзяць і не выкарыстоўваюць фасілітацыі сустрэчаў.

## АСНОЎНЫЯ ФУНКЦЫІ СУСТРЭЧЫ

1. Сустрэча вызначае яе ўдзельнікаў. Тыя, хто прысутнічае, належаць да каманды, тыя, хто не прысутнічае, не ўваходзяць у каманду.

2. Сустрэча адбываецца, калі група нешта пераглядае, абнаўляе інфармацыю, дадае нешта новае да ведаў групы.

3. Сустрэча дапамагае кожнаму лепш зразумець агульную мэту групы і спрыяе таму, каб праца кожнага чалавека была ўнёскам у поспех групы.

4. Сустрэча фармуе ва ўсіх прысутных гатоўнасць выконваць прынятыя рашэнні і дасягаць вызначаных мэтаў.

5. Сустрэча можа быць адзіным спосабам сабраць групу разам і працаваць групаю, а кантралёр успрымаецца тады як лідар каманды.

## ПАДРЫХТОЎКА СУСТРЭЧЫ

*Чаго мы жадаем дасягнуць напрыканцы гэтай канкрэтнай сустрэчы?*

Прычыны, па якіх людзі звычайна сустракаюцца, гэта: абмен інфармацыяй, вывучэнне нейкіх тэмаў або навучанне важным навыкам, крэатыўнае мысленне і стварэнне ідэяў («мазгавы штурм»), крытычнае мысленне (аналіз, пастаноўка мэтаў, вырашэнне праблемаў, прыняцце рашэнняў) або наладжванне адносінаў і фармаванне гатоўнасці працаваць.

Да таго, як арганізоўваць сустрэчу, трэба вызначыць прычыну, па якой праводзіцца сустрэча, паставіўшы канкрэтную мэту (мэты) і ўдакладніўшы пажаданы вынік (вынікі). Напрыклад:

Мэта 1: прыняць рашэнне адносна задачаў парафіяльнага «Карытаса».
Вынік 1: статут «Карытаса».

Мэта 2: стварыць план працы парафіяльнага «Карытаса».
Вынік 2: праект плана працы парафіяльнага «Карытаса» на год.

*Што неабходна зрабіць падчас сустрэчы, каб дасягнуць жаданых мэтаў і вынікаў (план сустрэчы)?*

Трэба дакладна разумець, чаго вы хочаце дасягнуць напрыканцы сустрэчы. Неабходна вызначыць, якія тэмы трэба абмеркаваць падчас сустрэчы. Трэба прадумаць кожны крок, патрэбны для дасягнення жаданага выніку, і час, які для гэтага неабходны. Распрацоўваючы план, памятайце пра наступнае:

– Колькі павінна доўжыцца сустрэча?

– Якія тэмы трэба ўключыць у план, каб атрымаць патрэбны вынік?

– Якім чынам найлепш зрабіць уводзіны ў кожную тэму; як будзе выглядаць гэты працэс?

– Як удзельнікі будуць прымаць рашэнне (кансэнсус, галасаванне або рашэнне лідара)?

– Як доўга будзе працягвацца абмеркаванне кожнай тэмы?

Ключавыя моманты для дасягнення згоды па вызначаных тэмах — гэта магчымасць выказваць меркаванні, задаваць пытанні і тлумачыць сваю пазіцыю. Тут скарачэнне і спрашчэнне метаду можа прывесці да недахопаў і памылак.

*Хто павінен наведваць сустрэчы?*

Правільна выбраныя ўдзельнікі — адна з галоўных умоваў эфектыўнасці сустрэчы. Крытэрыі выбару ўдзельнікаў сустрэчы бываюць рознымі.

– Найважнейшае, каб удзельнікі былі дасведчаныя адносна тэмы сустрэчы.

– Рашэнне адносна таго, хто павінен прыняць удзел у сустрэчы, залежыць ад мэтаў, якіх вы жадаеце дасягнуць. Гэта можа здавацца цалкам відавочным, але часам здзіўляе той факт, як шмат сустрэчаў адбываецца пры адсутнасці патрэбных там людзей.

– Не давярайце толькі свайму меркаванню пра тое, хто павінен прыйсці на сустрэчу. Папрасіце некалькі людзей выказаць свае думкі.

Калі магчыма, патэлефануйце кожнаму чалавеку, каб распавесці пра сустрэчу, яе мэты і сказаць, чаму яго або яе прысутнасць важная.

Істотна, у якіх адносінах знаходзяцца ўдзельнікі. Паспрабуйце даведацца пра гэта, асабліва пра тое, ці існуюць паміж гэтымі людзьмі якія-небудзь канфлікты.

*Што трэба загадзя раздаць удзельнікам? І нават больш: якія матэрыялы і інфармацыя будуць патрэбныя нам падчас сустрэчы (напрыклад, мапы, дошкі, ранейшыя справаздачы, прапановы і г.д.)?*

Пажадана загадзя даслаць удзельнікам план сустрэчы, каб яны маглі задаць пытанні і, калі трэба, падрыхтавацца да сустрэчы — гэта спрыяе добраму тону сустрэчы, як у бізнесе. Калі падчас сустрэчы ўдзельнікам трэба будзе прачытаць або

адрэдагаваць дакументы, іх таксама неабходна даслаць загадзя. (Нават калі матэрылы даслалі загадзя, мудра будзе падчас сустрэчы даць час прагледзець іх яшчэ раз.)

Упэўніцеся, што вы даслалі ўсім удзельнікам:

– запрашэнне;
– план;
– звесткі пра мэты і пажаданыя вынікі сустрэчы;
– дадатковыя матэрыялы, калі патрэбна;
– інфармацыю па лагістыцы.

*Як найлепш падрыхтаваць месца для сустрэчы?*

Месца, дзе праводзіцца сустрэча, можа мець вырашальную ролю для яе поспеху. Часам здараецца, што нават калі ў вас ёсць добра падрыхтаваны план, правільна выбраныя ўдзельнікі, канкрэтная мэта, сустрэча ўсё роўна можа пайсці ў няправільным кірунку, бо арганізацыя месца сустрэчы не адпавядае яе мэтам. Выбіраючы месца сустрэчы, абавязкова праверце:

– акустыку, святло, ацяпленне, вентыляцыю ў памяшканні;
– крэслы і сталы (вырашыце, як найлепш расставіць мэблю);
– аўдыё-візуальную апаратуру, іншае абсталяванне, электрычнасць;
– іншыя фактары, якія могуць «зруйнаваць» сустрэчу;
– парадак дзеянняў у надзвычайных абставінах.

**Кароткі праверачны спіс для падрыхтоўкі сустрэчы**

☐ Мэты і вынікі — канкрэтныя і рэальныя.
☐ Ёсць дакладны план з тэмамі, вызначэннем часу, метадамі, фасілітацыяй.
☐ Выбраныя адпаведныя ўдзельнікі.
☐ Запрашэнні і дадатковыя дакументы загадзя высланыя ўдзельнікам.
☐ Памяшканне для сустрэчы адпаведна падрыхтаванае.

**ПАДЧАС СУСТРЭЧЫ**

Ёсць розныя спосабы праводзіць сустрэчы. Раней сустрэчамі звычайна кіраваў старшыня. Сёння звычайная практыка планавання — запрашаць незалежнага фасілітатара або прызначаць аднаго з удзельнікаў на гэтую ролю.

Канцэпцыя фасілітацыі сустрэчы азначае яе спрашчэнне. Гэта спосаб весці сустрэчу, дапамога ў планаванні і кіраванні сустрэчаю. Фасілітацыя дапамагае ўдзельнікам лепш працаваць для дасягнення запланаваных мэтаў.

Фасілітатар — гэта чалавек, які робіць правядзенне сустрэчаў лягчэйшым, а сустрэчы — больш прадуктыўнымі. Фасілітатар засяроджаны на **працэсе** (як весці сустрэчу), а за яе змест (тое, што неабходна вырашыць) адказваюць удзельнікі.

Для старшыні і фасілітатара ідэальная арганізацыя — супольная праца па планаванні і правядзенні сустрэчы. Старшыня захоўвае аўтарытэт лідара і адказвае за стабільнасць. Фасілітатар аналізуе працэс, дапамагае збалансаваць удзел у сустрэчы і вядзе групу, дапамагаючы пераадольваць няпростыя тэмы, кантраверсію і складаныя праблемы. Дасведчаны фасілітатар палягчае працу групы, працуючы адпаведна, з пэўнымі прынцыпамі.

1. Неабходна захоўваць як мага больш **нейтральную пазіцыю.** Вашая праца — забяспечваць камунікацыю і здольнасць групы вырашаць праблемы, выкарыстоўваючы досвед і ідэі ўдзельнікаў групы. Калі фасілітатар умешваецца ў гэты працэс з уласным меркаваннем, праз вербальную або невербальную камунікацыю дае «лепшы» адказ, гэта можа сарваць сустрэчу. Удзельнікі пачнуць шукаць адказаў на пытанні ў фасілітатара замест таго каб імкнуцца знайсці ўласныя адказы, або адчуюць, што фасілітатар прымае той ці іншы бок у дыскусіі ці настойвае на ўласным плане вырашэння праблемы.

2. Загадзя падрыхтуйце **прастору для сустрэчы,** дзе ўдзельнікам будзе зручна і дзе прадумана ўсё, што можа спатрэбіцца людзям. Праверце, каб было падрыхтаванае ўсё патрэбнае абсталяванне і матэрыялы. Фасілітатары не павінны самі рабіць

гэтую падрыхтоўку, але павінны праверыць, каб усё было зроблена своечасова.

3. Пазнаёмцеся з **мэтавай аўдыторыяй,** яе зацікаўленасцю і пазіцыяй, а таксама вызначце меркаванні, якія могуць прывесці да канфлікту. Вядома, заўжды могуць узнікнуць непрадбачаныя сітуацыі, але, ведаючы пра гэта загадзя, фасілітатар можа псіхалагічна падрыхтавацца да сустрэчы. Гэта асабліва важна ў сітуацыях, калі ў групе існуе значнае разыходжанне ў поглядах.

4. Фасілітатары павінны разам з камандаю планавання **праверыць план сустрэчы;** пажадана, каб фасілітатар удзельнічаў у распрацоўцы плана сустрэчы з самага пачатку. Дакладна вызначце, хто за што адказвае, напрыклад: хто распачынае сустрэчу, робіць уводзіны, пачынае дыскусію, завяршае сустрэчу? Хто інфармуе групу пра бытавыя дэталі: нагадвае пра перапынкі; паказвае, дзе знаходзяцца прыбіральні; гаворыць, ці можна карыстацца тэлефоннаю сувяззю? Ці будзе нехта дапамагаць у раздачы матэрыялаў? Хто будзе запісваць неабходную інфармацыю на дошцы? Ці будзе весціся аўдыёзапіс, і хто будзе гэтым займацца? Ці патрэбныя лідары малым групам, і як яны зразумеюць, што трэба рабіць?

5. Неабходна ўлічваць **дынаміку групавога працэсу**, ведаць, як вырашаць канфліктныя сітуацыі, калі, напрыклад, нехта з удзельнікаў настроены варожа, нехта не ўдзельнічае ў сустрэчы, дыскусія развальваецца, не атрымліваецца камунікацыя. Памятайце, што калі нешта можа пайсці няўдала, звычайна так і адбываецца. Захоўвайце спакойную і прафесійную манеру паводзінаў, як бы ні склалася сітуацыя, і заахвочвайце ўдзельнікаў да гэтага.

6. Умела выкарыстоўвайце **тэхнікі,** якія дапамагаюць падтрымліваць групу ў тонусе і заставацца засяроджанаю на заданні; заахвочвайце да крэатыўнага мыслення, дасягнення кансэнсусу і дапамагайце ўсім удзельнікам групы далучацца да дыскусіі (так, каб ніхто не адчуваў сябе няўтульна). Не бойцеся дадаваць да працы крыху гумару.

7. Выкарыстоўвайце навыкі **эфектыўнай камунікацыі,** такія, як уменне слухаць, пераказваць каментарыі гэтак, каб уся група магла іх памятаць, назіраць за «моваю цела», адпаведна выпраўляць тон і ход сустрэчы.

8. Стварайце **пачуццё адкрытасці.** Стварайце атмасферу, якая спрыяе камунікацыі групы, напрыклад, выкарыстоўвайце для сустрэчы малыя круглыя сталы, расстаўляйце крэслы ў форме літары «U» або ў форме іншых фігураў, каб расстаноўка спрыяла роўнасці і даступнасці. Калі ўдзельнікі не чуюць адзін аднаго, гэта не прынясе карысці.

9. Стварайце камфортную **цішыню.** Неабходна даваць час і месца для дыскусіі, натхняць інтравертных людзей выказвацца, што дапаможа групе адчуваць свабоду і прымаць абдуманыя рашэнні без неабходнасці спяшацца.

10. **Пазбягайце сітуацыі збянтэжанасці** ва ўдзельнікаў групы. Жартуйце асцярожна і прадумана. Калі асноўныя правілы патрабуюць падмацавання, каб група працавала эфектыўней, рабіце гэта ў духу місіі групы і абапірайцеся на агульнае рашэнне групы ў тым, што задача, якая перад ёю стаіць, сапраўды важная і вартая таго, каб удзельнікі прыклалі ўсе намаганні для яе выканання.

## НЕКАТОРЫЯ АСНОЎНЫЯ ТЭХНІКІ ДЛЯ ФАСІЛІТАТАРАЎ

*Камунікацыйныя здольнасці.* Фасілітатар найперш слухае і задае пытанні. Уменне ўважліва слухаць дапамагае фасілітатару запомніць змест, звязаць змест з дыскусіяй, запісаць яго сутнасць на дошцы, адзначыць рэакцыю прысутных на тое, што гаворыцца, і сачыць, каб удзельнікі трымаліся акрэсленай тэмы, вызначаючы, калі перадаваць слова наступнаму прамоўцу.

Падсумоўваючы думку прамоўцы або запісваючы ідэю на дошцы, фасілітатар пацвярджае, што прамоўцу пачулі і зразумелі.

Фасілітатары задаюць пытанні, каб кантраляваць працэс і стымуляваць мысленне. Пытанні сведчаць аб прагрэсе, дапа-

магаюць няспынна працаваць адпаведна з планам: «Ці можам мы пачаць?», «Якіх вынікаў вы спадзяецеся дасягнуць напрыканцы сустрэчы?». Пытанні дапамагаюць вяртаць дыскусію да вызначанай тэмы: «Вы жадаеце, каб мы ўнеслі гэтую тэму ў план наступнай сустрэчы?».

«Рэфрэймінг» спалучае камунікатыўныя здольнасці і здольнасці аналізаваць ход сітуацыі. Фасілітатар нейтралізуе правакацыйнасць або негатыўнасць сцвярджэнняў і вызначае, што стала прычынаю і матывацыяй для такіх сцвярджэнняў.

***Пачатак сустрэчы***

– Заўсёды пачынайце ў прызначаны час; гэта сведчыць пра павагу да тых, хто прыйшоў своечасова, і нагадвае тым, хто спазняецца, як важна прытрымлівацца раскладу.

– Прывітайце ўдзельнікаў і падзякуйце за тое, што знайшлі час, каб прыйсці.

– На пачатку кожнай сустрэчы нагадайце яе план, дайце ўдзельнікам магчымасць зразумець важнасць прапанаваных тэмаў, змяніць іх і прыняць.

– Адзначце, што дыктафон (калі ён выкарыстоўваецца) робіць запісы, і перашліце гэтыя запісы кожнаму ўдзельніку неўзабаве пасля сустрэчы.

– Сустракаючы ўдзельнікаў, стварыце ў іх патрэбны настрой і вызначце іх патрэбы.

– Удакладніце сваю ролю падчас сустрэчы.

*Асноўныя правілы.* Не трэба выпрацоўваць асноўныя правілы для кожнай асобнай сустрэчы, аднак варта памятаць некалькі галоўных правілаў, якіх можна прытрымлівацца падчас большасці сустрэчаў. Гэтыя правілы адпавядаюць асноўным прынцыпам, неабходным для правядзення паспяховай сустрэчы.

– Чатыры найважнейшыя асноўныя правілы — актыўны ўдзел, засяроджанасць, паскарэнне тэмпу і выніковасць (магчыма, вы пажадаеце далучыць да гэтага правіла канфідэнцыйнасці).

– Запішыце вашыя асноўныя правілы ў план.

– Калі прыходзяць новыя ўдзельнікі, якія не прывыклі да вашых сустрэчаў, можна нагадаць *пра кожнае* асноўнае правіла.

– Заўжды прытрымлівайцеся асноўных правілаў.

***Размеркаванне часу***

Адна з самых складаных задачаў фасілітатара — размеркаванне часу. Заўжды здаецца, што час мінае да таго, як будуць выкананыя ўсе заданні, таму найцяжэй трымацца паскарэння тэмпу сустрэчы, каб стымуляваць ход працэсу. Можна папрасіць удзельнікаў дапамагчы вам сачыць за часам. Калі не атрымліваецца трымацца запланаванага часу, скажыце пра гэта групе і папрасіце ўдзельнікаў зрабіць высновы.

*Аналіз.* Каб дапамагчы ўдзельнікам групы натуральна адчуваць сябе ў самакрытыцы падчас працы, можна папрасіць іх прааналізаваць сустрэчу, задаўшы наступныя пытанні: «Якія аспекты сустрэчы вам спадабаліся? Якія заключэнні вы маглі б зрабіць? Што было не так? Што б вам хацелася змяніць наступным разам?».

***Завяршэнне сустрэчы***

– Заўсёды завяршайце сустрэчу своечасова і імкніцеся да таго, каб гэта адбывалася на пазітыўнай ноце.

– Напрыканцы сустрэчы ўзгадайце, што было зроблена і дасягнута, выберыце час для наступнай сустрэчы і спытайце кожнага, ці зможа ён або яна прыняць удзел у сустрэчы.

– Нагадайце, што пратакол сустрэчы і (або) высновы і задачы будуць перададзеныя ўдзельнікам на працягу тыдня (гэта дапамагае паскараць тэмп працы).

*Наступныя крокі.* Фасілітатар павінен добра разумець, што будзе адбывацца на наступнай сустрэчы і якімі павінны быць наступныя крокі, каб прыняць рашэнне. Варта прысвяціць гэтаму

15 хвілінаў напрыканцы сустрэчы, каб задаць пытанні: «Куды нам накіроўвацца далей?» або «Што трэба зрабіць, каб рухацца далей у гэтай справе?». Абавязкова падагульніце, хто якое заданне будзе выконваць, з кім і калі.

**ПРАТАКОЛ**

Пратакол — гэта афіцыйны запіс ходу сустрэчы. Пратакол нагадвае пра тое, што адбывалася на сустрэчы. Весці пратакол карысна, каб дапамагчы людзям прааналізаваць тое, што яны пачулі. Пратакол выкарыстоўваецца для архіва, ім можна карыстацца на сустрэчах у будучыні, каб пацвярджаць прынятыя рашэнні і нагадваць пра падзеі і зробленую працу. Людзі менш схільныя паўтарацца на сустрэчах, калі ведаюць, што іх словы запісваюцца.

***Перад сустрэчаю***

– Выберыце, як будзеце весці пратакол: запісваць на паперы, выкарыстоўваць ноўтбук або дыктафон.

– Праверце, каб тэхніка працавала, і на ўсялякі выпадак дублюйце запіс.

– Выкарыстоўвайце план сустрэчы, каб даць агульную інфармацыю.

***Падчас сустрэчы***

– Зрабіце спіс удзельнікаў сустрэчы.

– Складзіце спіс чальцоў камітэта і ўпэўніцеся, што ведаеце, хто ёсць хто.

– Адзначце час, калі пачалася сустрэча.

– Не імкніцеся запісаць кожны каментар — толькі важныя ідэі.

– Запішыце прапановы і вынікі галасавання, калі яно праводзіцца. Не варта запісваць, хто якую прапанову ўнёс.

– Адзначце прапановы, за якія трэба прагаласаваць на наступных сустрэчах.

– Адзначце час, калі завяршылася сустрэча.

***Пасля сустрэчы***

– Надрукуйце пратакол як мага хутчэй пасля сустрэчы, пакуль вы яшчэ ўсё добра памятаеце.

– Адзначце назву арганізацыі, імёны ўздельнікаў камітэта, від сустрэчы (штодзённая, штотыднёвая, штомесячная, гадавая або надзвычайная) і яе мэту.

– Адзначце час, калі пачалася і завяршылася сустрэча.

– Праверце і папраўце пратакол перад тым, як яго адсылаць.

***Што трэба ўключаць у пратакол?***

– Назву групы, месца, час і дату сустрэчы.

– Імёны і абавязкі прысутных удзельнікаў (падчас сустрэчы перадайце аркуш паперы, каб удзельнікі запісаліся), імёны людзей, якія адпрасіліся або не прыйшлі.

– Ключавыя пытанні, якія абмяркоўваліся, у тым парадку, як гэта запісана ў плане, з кароткім апісаннем самой дыскусіі (дакладны запіс не патрэбны), важныя каментары, рашэнні, пытанні і дзеянні. Калі нехта з чальцоў камітэта атрымаў асаблівую задачу, абавязкова адзначце імя чалавека і яго заданне.

– Час і дату, калі быў падрыхтаваны пратакол.

– Імя і подпіс таго, хто вёў пратакол.

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

### Практыкаванне «Удалая сустрэча і няўдалая сустрэча»

**Мэта:** удакладніць папярэднія веды аб правядзенні сустрэчаў, зрабіць уводзіны ў тэму і распачаць дыскусію.
**Сродкі:** без спецыяльных сродкаў.
**Час:** 1 гадзіна.

**Ход працы**

1. Раздзяліце ўдзельнікаў на дзве групы.

2. Папрасіце адну групу выйсці з пакоя і дайце ёй заданне падрыхтаваць і паказаць удалую сустрэчу, гэтак, як яны яе бачаць. Яны разыграюць ход гэтай сустрэчы перад іншымі ўдзельнікамі. Для падрыхтоўкі даецца 20 хвілінаў і 10 хвілінаў, каб разыграць сітуацыю.

3. Дайце другой групе такое самае заданне, але яна будзе разыгрываць няўдалую сустрэчу. Папрасіце групу творча паставіцца і вызначыць галоўныя прычыны няўдалай сустрэчы.

4. Рыхтуючы групу, папрасіце яе ўдзельнікаў разыграць сітуацыю, як у тэатры, і няхай у кожнага будзе свая роля.

5. У гэтым дзеянні вялікае значэнне мае дыскусія. Паспрабуйце развязаць дыскусію з дапамогаю наступных пытанняў:

– Як бы вы дапоўнілі разыгрыванне сітуацыі?
– Пра што вы размаўлялі?
– У чым была розніца паміж дзвюма групамі?
– Чаму сустрэча была ўдалаю (што пра гэта сведчыць)?
– Што няўдалага было ў другой сустрэчы?
– Якія элементы з’яўляюцца ключавымі для ўдалай сустрэчы і чаму?

### *Заключэнне*

Каб сустрэча была паспяховаю, неабходна загадзя ўсё дэтальна спланаваць. Падчас самой сустрэчы планаванне неабходнае, каб вызначыць дакладныя мэты і пажаданыя вынікі. Для лепшага правядзення сустрэчы варта выкарыстоўваць дапамогу фасілітатара, чыя задача — засяроджвацца на працэсе правядзення сустрэчы, а яе змест вызначаюць удзельнікі. Падчас сустрэчы важна, каб усе ўдзельнікі далучаліся да плённай дыскусіі, а таксама важна пазбягаць усяго, што можа перашкодзіць дасягненню мэтаў.

# АРГАНІЗАЦЫЯ КАМАНДЫ І ПРАЦА Ў КАМАНДЗЕ

Праца ў парафіяльнай супольнасці — гэта праца ў камандзе, таму важна ведаць галоўныя прынцыпы, якія могуць дапамагчы ўдзельнікам каманды быць больш эфектыўнымі ў супольнай працы. Напрыканцы вы зможаце вызначыць, што такое каманда, пералічыць як мінімум 5 фактараў, якія ўплываюць на эфектыўнасць працы каманды і 5 метадаў прыняцця рашэнняў; зразумееце, што такое лідарства, менеджмент канфліктаў і працэс арганізацыі каманды — тым-білдынг.

### *Малітва*

*Бо як у адным целе маем шмат членаў, і не ўсе яны выконваюць тыя самыя функцыі, так і мы, многія, складаем адно цела ў Хрысце, а паасобку адзін для аднаго — члены.*

(Рым 12, 4–5)

Працаваць і служыць у парафіяльным «Карытасе» і ў больш шырокім сэнсе весці хрысціянскае жыццё азначае раздзяляць дзейнасць і правы з іншымі чальцамі супольнасці. Не забывайцеся, што кожная супольнасць падобная да «цела, у якім шмат членаў», і што «кожны член цела належыць усім іншым». Таму неабходна ведаць, як арганізаваць працу супольнасці ў цэлым і працу каманды парафіяльнага «Карытаса» ў прыватнасці.

### *Тэарэтычная частка*

Калі б іншапланецянін выправіўся на Зямлю вывучаць жыццё на планеце, то пасля вяртання дамоў ён мог бы даць такую справаздачу, сказаўшы пра нас: «Яны амаль усё робяць у групах. Яны растуць у групах, вучацца ў групах, гуляюць у групах, жывуць у групах і працуюць у групах». Праца ў супольнасці — гэта камандная праца, і, ведаючы галоўныя яе прынцыпы, можна дапамагчы чальцам каманды больш эфектыўна прыкладаць намаганні ў працы.

**КАМАНДА**

Каманда арганізуецца з групы людзей, якія працуюць разам, каб дасягнуць агульнай мэты. Эфектыўная каманда мае пэўныя характарыстыкі, якія дазваляюць яе чальцам працаваць больш плённа і прадуктыўна. Эфектыўная каманда распрацоўвае свае спосабы раздзяляць лідарскія ролі і адказнасць за плён працы, пераносячы акцэнт з індывіда на некалькі індывідаў у камандзе. Каманда вызначае канкрэтную мэту і вынікі, над дасягненнем якіх яе чальцы разам працуюць.

**Як гэта працуе?**

Эфектыўныя каманды праводзяць адкрытыя сустрэчы, распрацоўваюць дзейсныя стратэгіі вырашэння праблемаў, якія выходзяць па-за дыскусіі, рашэнні і раздачу заданняў; яны сапраўды працуюць разам. Калі неабходна, індывіды ў камандзе адкладуць уласную працу, каб дапамагчы іншым яе чальцам. У эфектыўнай камандзе выкананне працы залежыць не толькі ад здольнасці аднаго чальца кіраваць іншымі, а дасягаецца агульнымі высілкамі ўсёй каманды. Вынікі, дасягнутыя працаю ўсіх чальцоў каманды, падкрэсліваюць важнасць агульнай каманднай адказнасці.

## 5 ФАКТАРАЎ, ЯКІЯ ДАПАМАГАЮЦЬ ДАСЯГАЦЬ ЭФЕКТЫЎНАЙ ПРАЦЫ Ў КАМАНДЗЕ

**1. Уплыў навакольнага асяродку** — уплыў арганізацыі і навакольнага свету на працу ў камандзе. Арганізацыя стварае кантэкст для функцыянавання каманды.

– Палітыка, методыка і ўнутраная сістэма арганізацыі могуць або дапамагчы, або перашкодзіць эфектыўнай працы каманды. Цудоўны прыклад — тое, як сістэма ўзнагароджання ў арганізацыі ўплывае на камандную працу. Звычайна арганізацыі адзначаюць індывідуальны ўнёсак і рэдка ўзнагароджваюць каманды.

– Давер — вера ў праўдзівасць, здольнасці, адданасць і адкрытасць у працы чальца каманды.

– Нормы — гэта стыль працы каманды. Яны сведчаць пра тое, што можа і чаго не можа каманда ў пэўных сітуацыях. Нормы — гэта правілы. Напрыклад: «Мы ўсе адкрыта выказваем свае пачуцці, а не пляткарым за спінаю. У нас няма права адмаўляць ідэі іншага чалавека падчас дыскусіі. Каманда прымае рашэнні дасягненнем кансэнсусу. Вы маеце права быць сабою, і я маю права быць сабою, пакуль гэта не шкодзіць эфектыўнасці працы каманды».

– На прыняцце рашэння і выбар вельмі ўплывае час. Імкнучыся сэканоміць час, мы страчваем здольнасць прымаць абду-

маныя рашэнні. Крэатыўныя задачы патрабуюць згоды ў прыняцці рашэння.

*Звярнуць увагу*: каманда раз'яднаная, яна не прыкладае дастаткова высілкаў, каб выканаць працу, людзі не імкнуцца да каманднай працы.

**2. Мэты** — тое, што павінна выканаць каманда.

Каманда існуе, калі яе чальцы нясуць адказнасць за дасягненне агульнай мэты. Праца ў камандзе становіцца больш эфектыўнаю, калі яе чальцы разам вызначаюць працоўныя мэты, рэгулярна іх удакладняюць і папраўляюць. Для каманднай матывацыі неабходна ставіць дасягальныя мэты. Эфектыўная каманда ўсведамляе і ажыццяўляе наступнае:

– Вызначаныя мэты павінны быць дакладныя, зразумелыя і вядомыя ўсёй камандзе.

– Камандныя мэты павінны быць агульнымі.

– Мэты павінны быць канкрэтнымі і дасягальнымі.

– Каманда павінна мець згоду ў вызначэнні і дасягненні мэтаў.

– Канфлікты і разыходжанні ў меркаваннях не павінны перавышаць меры.

*Звярнуць увагу*: на мэты размытыя і незразумелыя, калі кожны робіць сваё і не прымае ўдзелу ў выкананні агульных задачаў.

***3. Задачы*** — як размяркоўваецца праца ў камандзе.

– Ці ўсе чальцы каманды разумеюць, што яны павінны рабіць, каб выканаць сваю задачу? Ці ўсведамляюць яны сваю асабістую адказнасць і межы паўнамоцтваў? У новых камандах некаторы час займае дыскусія, размеркаванне задачаў і адказнасці. Каманда развіваецца, а для людзей характэрныя ўласныя чаканні і спадзяванні на іншых чальцоў каманды. Яны рэдка гавораць пра гэта, але неабходна абмяркоўваць такія рэчы і прыходзіць да згоды ў найбольш важным.

– Могуць здарацца канфлікты з прычыны таго, што спадзяванні розных чальцоў каманды адрозніваюцца. Частковае

накладванне задачаў адна на адну стварае канфлікты, асабліва, калі двое або больш чальцоў каманды адчуваюць сябе адказнымі за адно і тое ж заданне.

*Звярнуць увагу*: адказнасць дрэнна размеркаваная, відавочны «правал» у абавязках, чальцы каманды дзейнічаюць адасоблена і пазбягаюць адказнасці.

**4. Рабочы працэс** — тое, як чальцы каманды працуюць разам.

Калі чальцы каманды разумеюць, штó павінны рабіць і хтó павінен гэта рабіць, яны павінны вызначыцца, як працаваць разам. Звычайна трэба браць пад увагу наступнае:

– Прыняцце рашэнняў — як кожны член каманды ўдзельнічае ў прыняцці рашэнняў.

– Камунікацыя — крывяносная сістэма каманды, якая перадае ідэі, прымае рашэнні і вырашае канфлікты: што павінна перадавацца праз камунікацыю ўнутры каманды, кім, якім чынам, калі і як часта?

– Сустрэчы — чаго імкнецца дасягнуць каманда, якія тэмы неабходна абмеркаваць; хто нясе адказнасць за розныя заданні; як будзе праводзіцца сустрэча і хто будзе на яе запрошаны?

– Стыль кіравання — лідар і каманда павінны мець згоду ў тым, як найлепш вырашаць сітуацыю, лідар павінен быць адкрытым на водгукі адносна свайго кіравання.

*Звярнуць увагу*: сустрэчы непрадуктыўныя, і людзі не наведваюць іх, рашэнне прымаюць адзін-два чалавекі; праца вядзецца без планавання, камунікацыя толькі аднабаковая.

**5. Адносіны** — якасць узаемаразумення паміж чальцамі каманды.

У працэсе каманднай працы адносіны часта становяцца напружанымі. Чальцам каманды трэба вырашаць праблемы і падтрымліваць добрыя працоўныя ўзаемаадносіны. Эфектыўныя каманды вырашаюць канфлікты адкрыта і даверліва. Часам

праблемы ў адносінах выкліканыя розніцаю ў разуменні каштоўнасцяў, асабістых якасцях або нестыкоўкаю ў стылі працы. Менеджары могуць узяць на сябе актыўную ролю ў «змякчэнні» канфліктаў у складаныя часы. Чым больш энергіі ідзе на канфлікты, тым менш яе застаецца для дасягнення агульнай мэты.

*Звярнуць увагу*: асабістыя канфлікты, чальцы каманды займаюць абарончую пазіцыю або пачынаюць спаборнічаць.

Развіццё каманды — гэта працэс, неабходны для таго, каб палепшыць працу каманды па некаторых або па ўсіх пяці фактарах у сістэме функцыянавання каманды. Пасля аналізу каманднай працы ў гэтых сферах, вы, як менеджар, павінны вызначыць, на чым трэба засяродзіцца, каб каманда развівалася.

## МЕТАДЫ ПРЫНЯЦЦЯ РАШЭННЯ

Лепшае рашэнне — гэта тое, якое:

1) не было прынятае адным чалавекам;

2) з'яўляецца разумным вырашэннем праблемы;

3) заснаванае на ўнёску кожнага чальца каманды, аб'ектыўнае;

4) звязанае з каманднаю мэтаю.

*Рашэнні, якія прымаюць кіраўнікі без абмеркавання ў групе,* — гэта простыя рашэнні, калі часу, каб прыняць іх, вельмі мала і для рашэння не патрэбны ўдзел усёй каманды.

*Рашэнні, якія прымае спецыяліст каманды,* — гэта рашэнні па выніках даследаванняў, калі выбар відавочны і для рашэння не патрэбны ўдзел усёй каманды.

*Рашэнні, якія прымаюцца з улікам меркавання выбраных асобаў з каманды,* — гэта рашэнні, якія трэба прыняць за абмежаваны час; у іх неабходны ўдзел каманды, але доўгая дыскусія непажаданая, калі для рашэння не патрэбны ўдзел усёй каманды.

*Рашэнні, якія прымаюць кіраўнікі пасля абмеркавання ў групе* — гэта рашэнні, прынятыя тады, калі час дазваляе правесці

дыскусію ў групе, але каманда не прыходзіць да згоды ў рашэнні, хоць відавочна згодная ў тым, хто мае паўнамоцтвы прыняць рашэнне; каб яго прыняць, пажаданы ўдзел усёй каманды, але гэта неабавязкова.

*Рашэнні, якія прымаюцца большасцю галасоў,* — гэта рашэнні, якія трэба прыняць за абмежаваны час; група прыйшла да згоды і галасуе; каб прыняць рашэнне, патрэбны ўдзел усёй каманды.

*Рашэнні, якія прымаюцца кансэнсусам*, — гэта рашэнні, якія трэба прыняць, калі час дазваляе дасягнуць поўнай згоды; каманда дастаткова здольная, каб дасягнуць кансэнсусу, але абавязковы ўдзел усёй каманды. Гэты метад прыносіць станоўчыя доўгатэрміновыя вынікі.

## ЛІДАРСТВА

Найлепшыя лідары спрыяюць развіццю каманды і палягчаюць дасягненне мэты. Сваімі дзеяннямі і стылем кіравання яны развіваюць сістэму і прынцыпы арганізацыі, неабходныя для паспяховай працы. У перыяды зменаў яны працягваюць трымацца пастаўленых мэтаў. Калі гэта патрэбна, такія лідары здольныя змяніць кірунак працы арганізацыі і натхніць іншых ісці за сабою.

### Лідарскія якасці

– Уменне быць прыкладам для іншых.
– Яснае разуменне мэтаў і задачаў.
– Ініцыятыўнасць і дасціпнасць.
– Харызма і натхнёнасць.
– Асаблівыя ўменні ў выкананні важных заданняў.
– Адданасць і зацікаўленасць.
– Арыентаванасць на вынік, здольнасць засяродзіцца на прыярытэтах.
– Уменне супрацоўнічаць.
– Непрыманне дэтэрмінізму, вера ў чалавечы патэнцыял.

– Веданне сябе і ўсведамленне сваіх здольнасцяў.
– Здольнасць бачыць пераможцаў сярод розных людзей.
– Уменне слухаць іншых.
– Уменне заслужыць давер.

**Лідарства і менеджмент**

| **Лідары:** | **Менеджары:** |
|---|---|
| ● Змяняюць і аднаўляюць | ● Кіруюць |
| ● Пытаюцца, што і чаму | ● Пытаюцца, як і калі |
| ● Засяроджваюцца на людзях | ● Засяроджваюцца на сістэме |
| ● Робяць правільныя ўчынкі | ● Чыняць патрэбнае правільна |
| ● Развіваюць | ● Захоўваюць дасягнутае |
| ● Выклікаюць давер | ● Спадзяюцца на кантроль |
| ● Бачаць далёка наперад | ● Не заглядаюць далёка |
| ● Выпрабоўваюць статус-кво | ● Прымаюць статус-кво |
| ● Бачаць перспектыву | ● Глядзяць уніз |
| ● Арыгінальныя | ● Імітатары |
| ● Лідар дасягае вынікаў праз патэнцыяльныя магчымасці | ● Менеджар мінімізуе магчымыя страты і рызыку |

**Стылі кіравання**

*Аўтакрат* — дамінуе, аднабаковы ў дасягненні адзінай мэты.

*Кіраўнік па прынцыпе неўмяшальніцтва* — амаль не кантралюе групу, дазваляе людзям самім выбіраць задачы і выконваць сваю працу.

*Дэмакрат* — прымае рашэнні, раючыся з камандаю, але пры гэтым кантралюючы групу.

## ВЫРАШЭННЕ КАНФЛІКТАЎ

**Што такое канфлікт і менеджмент канфліктаў?**

Канфліктам можна назваць барацьбу або спаборніцтва паміж людзьмі з супрацьлеглымі патрэбамі, ідэямі, вераваннямі, каштоўнасцямі або мэтамі. У камандзе непазбежныя канфлікты, аднак вынікі канфліктаў непрадказальныя. Канфлікт можа

разваліць каманду і зрабіць яе неэфектыўнаю, але калі канфлікт паспяхова вырашаецца, гэта вядзе да лепшых вынікаў. Канфлікт узнікае з прычыны непаразуменняў паміж людзьмі, якія трымаюцца сваіх патрэбаў, ідэяў, вераванняў, мэтаў або каштоўнасцяў. Тэорыя менеджменту канфліктаў сцвярджае, што не ўсе канфлікты можна вырашыць, але навучыцца вырашаць канфлікты неабходна, каб паменшыць непаразуменні і нязгоду. Менеджмент канфліктаў патрабуе ўменняў разраджаць канфлікты, ведання іх тыпалогіі; камунікатыўных здольнасцяў у канфліктных сітуацыях; умення знаходзіць способы вырашаць канфлікты ў канкрэтным асяроддзі.

**Як людзі рэагуюць на канфлікты? Атака ці ўцёкі?**

Мы рэагуем на канфлікт двума спосабамі — жадаем уцячы ад канфлікту або гатовыя атакаваць кожнага, хто стане на нашым шляху. Важна, нягледзячы на першую псіхалагічную рэакцыю, вучыцца свядома дзейнічаць у адказ на канфлікт. Нягледзячы на тое, ці хочацца нам пачаць з некім бойку або ўцячы, калі ўзнікае канфлікт, мы можам дабравольна выбраць, як вырашаць канфліктную сітуацыю. Вось 5 мадэляў паводзінаў, якія можна выкарыстаць у канфліктнай сітуацыі.

***1. Спаборнічаць***

Спаборніцтва патрабуе вялікай рашучасці і азначае адсутнасць або амаль адсутнасць супрацоўніцтва. Гэтая мадэль паводзінаў падыходзіць, калі неабходна хутка прыняць рашэнне або прыняць непапулярнае рашэнне, калі справа датычыць жыццёва важных рэсурсаў або калі чалавек абараняе ўласныя інтарэсы.

*Уменні*: спрачацца і весці дэбаты; выкарыстоўваць службовае становішча або ўплыў; адстойваць свае меркаванні і пачуцці, быць упэўненым, выразна акрэсліваць сваю пазіцыю.

***2. Пазбягаць***

Пазбяганне канфлікту азначае малую рашучасць і нізкую здольнасць супрацоўнічаць. Людзі часта пазбягаюць канфліктаў ад страху і няўпэўненасці ў сваіх сілах пераадолець канфліктную сітуацыю. Варта пазбягаць канфліктаў, калі справа датычыць неістотных рэчаў, калі трэба паменшыць напружанне, сэканоміць час або калі вы знаходзіцеся ў залежным становішчы.

*Уменні*: здольнасць адмовіцца; здольнасць саступіць; здольнасць пакідаць справы без вырашэння; пачуццё часу.

***3. Прыстасоўвацца***

Прыстасаванне азначае малую рашучасць і высокую здольнасць да супрацоўніцтва. Варта скарыстацца гэтай мадэллю паводзінаў, каб дэманстраваць разважлівасць, развівацца ў працы, падтрымліваць рэпутацыю, ствараць добразычлівую атмасферу, захоўваць мір. Некаторыя людзі выбіраюць прыстасаванне, калі справа або яе вынік не маюць для іх вялікай важнасці.

*Уменні*: забываць пра ўласныя жаданні; не праяўляць эгаізму; вучыцца саступаць і слухацца загадаў.

***4. Ісці на кампраміс***

Кампраміс патрабуе сярэдняй меры рашучасці і здольнасці супрацоўнічаць. Некаторыя людзі акрэсліваюць уменне вырашаць канфлікт як уменне «саступаць у большым, чым сам жадаеш», а іншыя бачаць у кампрамісе перамогу абодвух бакоў.

*Уменні*: здольнасць весці перамовы; шукаць «залатую сярэдзіну»; даваць ацэнку; ісці да ўзаемных саступак.

***5. Арганізоўваць калектыўную працу***

Калектыўная мадэль паводзінаў патрабуе вялікай рашучасці і цеснага супрацоўніцтва. Варта звяртацца да калектыўнай працы, калі канфлікт мае вялікае значэнне для людзей, якія шукаюць агульнага рашэння, калі справы занадта важныя, каб ісці на кампраміс, калі трэба аб’яднацца, праявіць адказнасць

і адданасць працы, палепшыць узаемаадносіны або нечаму навучыцца.

*Уменні*: актыўна слухаць; пазбягаць канфрантацый; вызначаць самае важнае; аналізаваць унёсак кожнага.




**Пяць мадэляў паводзінаў у канфліктнай сітуацыі**

**Як выбраць для сябе спосаб вырашэння канфліктаў?**

Час ад часу мы мусім вырашаць: уваходзіць у канфлікт або пазбягаць яго. Калі вы стаіце перад гэтым выбарам, варта ўлічваць наступнае:

– У якіх вы адносінах з канфліктуючым бокам?

– Наколькі важная для вас справа стала прадметам канфлікту?

– Ці маеце вы сілы на канфлікт?

– Ці ўсведамляце вы магчымыя наступствы?

– Ці гатовыя вы да наступстваў?

– Што адбудзецца, калі вы адмовіцеся ўваходзіць у канфлікт?

## АРГАНІЗАЦЫЯ КАМАНДЫ — ТЫМ-БІЛДЫНГ

Галоўная мэта тым-білдынгу — палепшыць камандную працу і дасягнуць задавальнення ад назірання за рабочым працэсам і вырашэння канфліктных сітуацый. Гэтая мэта ўключае ў сябе некалькі дадатковых мэтаў:

1) лепшае разуменне задачы кожнага чальца каманды ў групавой працы;

2) лепшае разуменне самой каманды — яе задачы і мэтаў у агульным функцыянаванні арганізацыі;

3) паляпшэнне камунікацыі паміж чальцамі каманды ў пытаннях, якія ўплываюць на эфектыўнаць працы;

4) умацаванне падтрымкі паміж чальцамі каманды;

5) лепшае разуменне ўнутрыгрупавых працэсаў: паводзінаў і дынамікі ў групе, якая цесна супрацоўнічае;

6) знаходжанне больш эфектыўных шляхоў вырашэння праблемаў, уласцівых камандзе і ў працы, і ва ўзаемаадносінах;

7) здольнасць выкарыстоўваць канфлікты дзеля станоўчага выніку, а не дэструктыўным чынам;

8) паляпшэнне калектыўнай працы чальцоў каманды і змяншэнне жадання спаборнічаць, якое дорага каштуе асобе, групе і арганізацыі;

9) павелічэнне здольнасці супрацоўнічаць з іншымі працоўнымі групамі ў арганізацыі;

10) умацаванне пачуцця ўзаемнага даверу паміж чальцамі групы.

## *Практычная частка — прыклады і пытанні для дыскусіі*

**Арганізацыя каманды (тым-білдынг)** — гэта супольнае выкананне заданняў, мэтаю якога з’яўляецца дапамога чальцам каманды ў развіцці іх здольнасці эфектыўна працаваць разам. Важнаю часткаю тым-білдынгу з’яўляюцца рэфлексія і дыскусія ўдзельнікаў на тэму выкананых заданняў, аналіз таго, як яны

падыходзілі да вырашэння сітуацыі, чаму гэта іх навучыла. Напрыклад, працэс тым-білдынгу можна запісаць на відэа, а пасля праглядаць яго, аналізаваць і абмяркоўваць, каб вынесці як мага большы ўрок з працэсу тым-білдынгу.

Мы прапануем вам тры віды гульняў, якія можна разыграць у групе, каб паразважаць пра тым-білдынг. Можна арганізаваць усе тры гульні адну за адной або выбраць самую цікавую, або раздзяліць удзельнікаў на тры групы і гуляць адначасова.

**Час:** 30 хвілінаў на кожную гульню.

*Гульня 1: Усе звязаныя*

**Мэта:** прадэманстраваць, як важна быць актыўным чальцом каманды.

**Сродкі:** не трэба спецыяльна падрыхтаваных матэрыялаў.

**Ход гульні**

1. У гэтай гульні вы можаце раздзяліць удзельнікаў на малыя групы.

2. Папрасіце ўсіх стаць у кола тварам адзін да аднаго і выцягнуць рукі. Звяжыце ўдзельнікаў групы так, каб кожны быў прывязаны да запясцяў суседа.

3. Калі ў групе «ўсе звязаныя», дайце ім агульнае заданне. Напрыклад: запакаваць падарункі ў спецыяльную паперу, завязаць банцік і падпісаць паштоўку; паабедаць; зрабіць бутэрброды; стварыць мастацкі праект; разліць ваду ў кубкі для ўсёй групы.

4. Абмяркуйце заданне, выкарыстоўваючы наступныя пытанні: ці ўсе ў групе здолелі выканаць заданне? Што адбывалася, калі нехта з групы не дапамагаў? Чаму вы здолелі (або не здолелі) выканаць заданне? Ці спадабалася вам быць прывязаным да некага і разам выконваць працу, імкнучыся да поспеху? Чаму вы адчувалі сябе так ці інакш і як спраўляліся са сваімі пачуццямі?

*Гульня 2: Высокая вежа*

**Мэта:** прадэманстраваць, як працуе каманда.

**Сродкі:** набор матэрыялаў для кожнай групы (папера; негатаваныя спагеці, мармеладкі і зубачысткі; саломінкі для піцця і заціскачкі для паперы; саломінкі для піцця і стужка; папяровыя кубачкі і пачак жуйкі; шнур і папяровыя кубачкі; печыва).

**Ход гульні**

1. Раздзяліце групу на каманды ад 2-х да 6-ці чалавек у кожнай.
2. Дайце кожнай групе набор матэрыялаў і папрасіце пабудаваць як мага больш высокую «вежу», выкарыстоўваючы толькі гэтыя матэрыялы.
3. Вызначыце час для будавання — 15 хвілінаў. Напрыканцы папрасіце групы прадэманстраваць свае «вежы».
4. Абмяркуйце заданне, выкарыстоўваючы наступныя пытанні: Як вы распачалі працу? Што было цяжэй: распачынаць або будаваць? Ці стваралі вы план або кожны будаваў як мог? Ці выконваў сярод вас нехта ролю лідара? Калі так, як вы сябе пры гэтым адчувалі? Калі не, ці хацелі б вы, каб быў лідар? Ці здолеў бы нехта выканаць гэтае заданне самастойна? Якія перавагі былі ў супольнай каманднай працы?

*Гульня 3: Сляпая творчасць*

**Мэта:** прадэманстраваць важнасць камунікацыі ў камандзе, абмеркваць ролі ўдзельнікаў групы.

**Сродкі:** набор тых жа самых матэрыялаў для кожнай групы (папера; негатаваныя спагеці, мармеладкі і зубачысткі; саломінкі для піцця і заціскачкі для паперы; саломінкі для піцця і стужка; папяровыя кубачкі і пачак жуйкі; шнур і папяровыя кубачкі; печыва).

**Ход гульні**

1. Выберыце з удзельнікаў аднаго жадаючага, астатніх раздзяліце на групы па 5–6 чалавек.

2. Жадаючы павінен стварыць з дадзеных матэрыялаў малюнак, скульптуру, упрыгожванне і г.д. Дайце на гэта 15 хвілінаў.

3. Раздайце малым групам тыя самыя матэрыялы. Яны, працуючы ў групе, павінны паўтарыць твор першага чалавека, кіруючыся толькі яго/яе інструкцыямі. Той, хто стварaў малюнак або аб’ект, не павінен бачыць працу іншых групаў, а групы не павінны бачыць яго/яе і сам твор. Можна дазволіць групам задаваць пытанні або гуляць без пытанняў.

4. Калі кожная група будзе ўпэўненая, што скапіявала арыгінальны твор, дазвольце паглядзець, што з гэтага атрымалася.

5. Абмяркуйце заданне, выкарыстоўваючы наступныя пытанні: Што было лягчэй: даваць інструкцыі або атрымліваць? Чаму? Было б лягчэй або цяжэй выконваць гэтае заданне індывідуальна, а не ў групе? Чаму? Ацаніце камунікацыю ў групе. Чаму камунікацыя мае такое вялікае значэнне для групы? Ці кожны зрабіў унёсак у працу або яе выконвала некалькі людзей? Чаму? Ці бывалі вы калі-небудзь часткаю групы, дзе ўсё бяруць на сябе некалькі чалавек? Як вы сябе адчувалі пры гэтым? Што можна зрабіць, каб дапамагчы групе працаваць больш эфектыўна?

## *Заключэнне*

Каманда — гэта група людзей, якія павінны супрацоўнічаць, каб дасягнуць індывідуальных і агульных мэтаў. Каб зрабіць **каманду эфектыўнаю**, трэба ўлічваць наступнае:

1) акрэсліць правілы і манеры паводзінаў;

2) ставіць усім чальцам каманды дакладныя мэты;

3) дакладна размяркоўваць заданні, каб усе былі з імі згодныя і прымалі іх;

4) разумна арганізоўваць рабочы працэс: камунікацыю, планаванне, прыняцце рашэнняў;

5) захоўваць адкрытыя і поўныя даверу адносіны.

Лепшае каманднае рашэнне — тое, якое дасягаецца кансэнсусам. Часам абставіны патрабуюць **іншых рашэнняў:** аўтарытарных; экспертных; рашэнняў з улікам меркаванняў асобных чальцоў каманды; рашэнняў, якія прымае кіраўнік пасля каманднага абмеркавання; рашэнняў шляхам галасавання.

Лепшыя лідары развіваюць і палягчаюць **выкананне задачаў.** Чалавек можа аднначасова быць лідарам і менеджарам, але мусіць дакладна раздзяляць дзве гэтыя ролі і паводзіць сябе адпаведна. Некаторыя нараджаюцца лідарамі, але лідарскія якасці ў сабе можна развіваць.

**Канфлікты непазбежныя,** і не ўсе з іх можна вырашыць, але чальцы каманды павінны ведаць, як іх вырашаць, каб пазбегнуць напружання, якое паралізуе працу каманды. У розных канфліктных сітуацыях могуць выкарыстоўвацца розныя мадэлі паводзінаў. Незалежна ад таго, наколькі добраю з’яўляецца каманда, заўжды можна палепшыць яе працу, рэгулярна арганізуючы тым-білдынгі, якія вучаць супольна выконваць заданні і разам вырашаць усе праблемы.

# РАСПРАЦОЎКА І НАПІСАННЕ ПРАЕКТАЎ

Мэта гэтай размовы — палепшыць уменне ўдзельнікаў ствараць эфектыўныя планы і праекты, выклікаць большы давер у адносінах з ахвярадаўцамі. Мы паспрабуем паказаць вам асноўныя крокі гэтага працэсу, пачынаючы з аналізу праблемы і распрацоўкі праекта да фінальнай стадыі аналізу і ацэнкі праекта. Паспрабуем таксама растлумачыць вам, што такое праект, даць яго характарыстыкі і ў агульных рысах распавесці аб праектным менеджменце і напісанні праектаў.

## *Малітва і рэфлексія*

*Я садзіў, Апалос палівАў, але ўзрасціў Бог. Таму неістотна, хто садзіць і хто палівае, бо гэта Бог дае ўзрастанне. Хто садзіць і хто палівае — гэта адно, і кожны атрымае сваю ўзнагароду паводле сваёй працы. Бо мы — супрацоўнікі Божыя, а вы — Божая ніва, будоўля Божая.*

(1 Кар 3, 6–9)

Ва ўсім, што мы робім, неабходна ўважліва планаваць кожны крок, рупліва працаваць, і тады мы можам разлічваць на Божую дапамогу. Бог жадае ўбачыць, як мы дзейнічаем. Мы нічога не зможам дасягнуць, не прыклаўшы намаганняў.

## *Тэарэтычная частка*

Праект — гэта набор спланаваных, звязаных адно з адным дзеянняў дзеля дасягнення вызначанай мэты ў межах пэўнага бюджэта ў канкрэтны перыяд часу. Праектны цыкл (гл. схему ніжэй) ілюструе набор дзеянняў: задума, планаванне, выкананне, маніторынг, аналіз, справаздача і навучанне. Гэта ўзаемазвязаныя дзеянні, якія павінны выконвацца ў строгім парадку. Цыкл праектаў паказаны ў выглядзе кола, бо тое, што мы зразумелі, чаму навучыліся ў ходзе аналізу аднаго праекта, служыць карыснай інфармацыяй для распрацоўкі новых.

Асаблівую ўвагу трэба звяртаць на фазу задумы цыклу праекта. Якасць распрацоўкі задумы праекта мае вялікае значэнне, бо ўплывае на ўсе іншыя крокі ў праектным цыкле. Гэта важны крок для распачацця працы, але распрацоўка задумы трывае на працягу ўсяго цыклу. Напрыклад, новыя веды, якія ўзнікаюць падчас выканання праекта, павінны змусіць праектных менеджараў змяніць задуму праекта.




Кожны праект можна распрацоўваць з дапамогаю цыклічнага працэсу, які называецца «**Праектны цыкл**»: мы **рыхтуем** праект, пасля **ажыццяўляем** яго і напрыканцы (або пасля завяршэння) **аналізуем** яго.

Аналіз павінен паказаць нам, як праект паўплываў на патрэбу або праблему, якой быў прысвечаны, і як ён быў выкананы. Аналізуючы праект, мы павінны нечаму навучыцца, каб палепшыць выкананне наступнага праекта. Таму аналіз можа (хоць і не абавязкова) прывесці да падрыхтоўкі наступнага праекта, і менавіта таму гаворка ідзе пра цыклічны працэс.

У асноўным гэты раздзел прысвечаны планаванню, у меншай ступені — напісанню праекта і пошукам фінансавання (фанд-рэйзінгу). Гэта не вызначае ступень важнасці трох адзначаных элементаў, а сведчыць пра іх узаемазвязанасць. Усе гэтыя часткі можна распрацоўваць далей (існуе мноства патрэбнай літаратуры і сайтаў на гэтую тэматыку), але ў гэтым падраздзеле мы жадаем даць вам самую важную інфармацыю і самыя карысныя спосабы распачаць праектны цыкл у вашым парафіяльным «Карытасе».

## ЧАСТКА 1. ПЛАНАВАННЕ

### А) Падрыхтоўка да праекта

*Праектная каманда.* Да таго, як пачаць працэс падрыхтоўкі, мы мусім зразумець, хто будзе працаваць над праектам. Чалавек, які збіраецца кіраваць праектам, звычайна вядзе і працэс падрыхтоўкі. Аднак стварэннем плана праекта звычайна займаюцца некалькі чалавек. Улічваючы, колькі розных уменняў, ведаў і досведу для гэтага патрэбна, нашмат лепш, каб распрацоўкаю плана займалася каманда, а нехта адзін каардынаваў высілкі ўдзельнікаў і спалучаў усе элементы падрыхтоўкі. Калі гэта магчыма, то людзі, якія займаюцца распрацоўкаю і ажыццяўленнем праекта, самі павінны быць бэнэфіцыярыямі гэтага праекта, атрымліваць ад яго карысць. Такім чынам забяспечваецца сапраўдная матывацыя; праект будзе актуальным для асобаў у патрэбе і, самае важнае, яны змогуць самі размяркоўваць патрэбныя рэсурсы. Гэта група людзей называецца праектнай камандаю.

*Распрацоўка праектнага плана.* У плане вызначаецца, **што** збіраецца рабіць праектная каманда, **чаму, калі, дзе, як, хто** будзе выконваць працу і **якія** рэсурсы будуць выкарыстоўвацца. План будзе стварацца і ажыццяўляцца па-рознаму, але многія часткі плана «захоўваюцца» ў нашых галовах. Звычайна дастаткова пачаць з плана распрацоўкі праекта, раскладаў і бюджэ-

та. Падзяліцеся планам з чальцамі праектнай каманды — чым большым вы падзеліцеся, тым больш людзі будуць адчуваць зацікаўленасць і адказнасць за праект, план будзе лепшым, і больш шанцаў на тое, што праект будзе паспяховым.

**B) Ацэнка сітуацыі і аналіз праблемы**

Наступны крок — гэта ацэнка сітуацыі і праблемаў, каб вырашыць іх з дапамогаю праекта, які мы збіраемся ажыццявіць. Гэта вызначае поле для нашых дзеянняў, таму важна ведаць як мага больш.

Вось прапановы для забеспячэння аб'ектыўнай ацэнкі сітуацыі і аналізу праблемаў:

– Збярыце як мага больш інфармацыі аб праблемах ад людзей, якія на іх скардзяцца.

– Не забывайцеся пра ўласныя вочы і вушы. Назірайце за людзьмі, якія пакутуюць ад праблемы, слухайце іх гісторыі і задавайце ім пытанні.

– Не спрабуйце на гэтай стадыі судзіць аб прычынах, якія выклікалі пэўную складаную сітуацыю: проста паспрабуйце сабраць столькі фактаў, колькі зможаце (і майце на ўвазе, што не заўжды лёгка зрабіць гэта аб'ектыўна, бо людзі схільныя перажываць усё эмацыйна, асабліва ўласнае гора).

– Рабіце запісы, яны спатрэбяцца вам пазней.

Напрыканцы паспрабуйце адсартаваць усе факты і назіранні, стварыўшы «дрэва праблемаў». Вызначце корань праблемы, асноўныя іх прычыны і наступствы; гэтыя наступствы могуць выклікаць іншыя наступствы і гэтак далей.

*Што такое прычына?*

Дэфініцыя: прычына — гэта фактар, які ляжыць у аснове праблемы, узнікаючы дома, у супольнасці, арганізацыі і ў соцыуме.

*Што такое наступства?*

Дэфініцыя: наступства — гэта змены сацыяльных, экалагічных, палітычных або эканамічных умоваў, выкліканыя праблемаю.

Запішыце ўсе назіранні або ўмовы на асобным аркушы паперы, падсумаваўшы ўсё ў двух-трох словах. Пасля паспрабуйце размеркаваць свае назіранні па катэгорыях, стварыўшы «дрэва» ад «каранёў» да «вяршыні».

*Стварэнне «дрэва праблемаў»*




**С) Дакладна апісаць сутнасць праблемы**

Калі вы прааналізавалі праблему, вельмі карысна зрабіць яе апісанне. Гэта калектыўнае апісанне, зробленае ўсёй камандай. Гэта вельмі дапаможа вам тады, калі вы будзеце пісаць заяву на праект. Калі апісанне праблемы зробленае, яно служыць паказальнікам таго, што трэба рабіць, каб яе вырашыць. Апісанне праблемы абавязкова павінна адказваць на некалькі пытанняў: маштаб праблемы; каго яна напаткала; у чым яе сутнасць; магчымыя прычыны; магчымыя наступствы, калі нічога не будзе зроблена.

Памятайце, што ***добра сфармуляваная праблема — ужо палова яе вырашэння.***

Дарэчы, на этапе апісання праблемы не трэба шукаць яе вырашэння. Напрыклад, не апісвайце праблему так: «Праблема ў тым, што ў нас няма цэнтра для трэнінгаў». Хутчэй за ўсё, такі цэнтр для трэнінгаў будзе добрым вырашэннем праблемы, а праблема заключаецца ў высокім узроўні беспрацоўя, дрэннай кваліфікацыі і г.д.

**Ператварыць «дрэва праблемаў» у «дрэва мэтаў»**

«Дрэва мэтаў» — адлюстраванне праблемы. Адмоўныя апісанні праблемы (паводле «дрэва праблемаў») пераменяюцца ў станоўчае апісанне мэтаў на «дрэве мэтаў».

У той час як «дрэва праблемаў» паказвае адносіны «прычына — наступства», «дрэва мэтаў» раскрывае адносіны «сродак—задача», пра што сведчыць наступны прыклад.

*Прычыны і наступствы*

Дрэннае забеспячэнне асноўнымі прадуктамі харчавання.

↑

Малыя інвестыцыі ў вясковую гаспадарку.

Шмат пашкоджанняў ад насякомых.

*Сродкі і задачы*

Палепшыць забеспячэнне асноўнымі прадуктамі харчавання.

↑

Павялічыць інвестыцыі ў вясковую гаспадарку.

Паменшыць колькасць пашкоджанняў ад насякомых.

**Заўвага:** у гэтым дапаможніку няма тлумачэння:

1) як «дрэва праблемаў» звязана з «дрэвам мэтаў» і ў чым заключаецца іх лагічная структура.

2) як апісаць мэту, асноўныя задачы і вынікі.

## ЧАСТКА 2. ЛАГІЧНАЯ СТРУКТУРА

Лагічная структура — гэта комплексны, ясны і лагічны спосаб сабраць усю інфармацыю па праекце ў табліцу. Гэта вельмі карысна, каб зразумець якасць падрыхтоўкі праекта, адпаведна выконваць яго, кантраляваць і аналізаваць, ці развіваецца ён у правільным кірунку.

Той, хто ўпершыню глядзіць на лагічную структуру, палохаецца! Але не трывожцеся, гэта насамрэч не так складана: мы паспрабуем растлумачыць вам усё ў дэталях крок за крокам (гл. табліцу на наступнай старонцы).

***Мэты, вынікі, дзейнасць***

Давайце разгледзім 1-ю і 2-ю калонкі ў *Лагічнай структуры*.

Задачаю мы называем кожную мэту, якой жадаем дасягнуць сваім праектам.

**Мэта/галоўная задача** — гэта агульная мэта, дасягненню якой спрыяе праект. Напрыклад, нашаю галоўнаю задачаю з'яўляецца *памяншэнне беднасці ў нашым горадзе*.

**Спецыяльныя задачы** — гэта задачы, выкананне якіх паспрыяе дасягненню галоўнай мэты. У нашым прыкладзе задачаю № 1 можа быць *паменшыць працэнт беспрацоўя ў нашым горадзе*, а задачаю № 2 — *павялічыць прыбытак сем'яў, якія жывуць у нашым горадзе*.

**Чаканыя вынікі (вытворчасць)** — гэта вынікі па выкананні спецыяльных задачаў. Чаканым вынікам спецыяльнай задачы № 1 можа быць *стварыць 100 новых працоўных месцаў у нашым горадзе*.

**Дзейнасць** — гэта справы, якія вы будзеце выконваць у адпаведным парадку, каб дасягнуць чаканых вынікаў. У нашым прыкладзе, каб дасягнуць чаканага выніка № 1, дзейнасцю можа быць *заснаваць 15 сельскагаспадарчых кааператываў у нашым горадзе*.

# Лагічная структура

| | **Паслядоўнасць дзеянняў** | **Аб’ектыўныя пацвярджальныя індыкатары дасягненняў** | **Крыніцы і спосабы пацвярджэння** | **Дапушчэнні** |
|---|---|---|---|---|
| **Мэта/галоўная задача** | 1. Шырока акрэсленая мэта, для дасягнення якой будзе працаваць праект. Гэта доўгатэрміновыя, глыбокія змены ў жыцці людзей і (або) умовах іх жыцця, якім паспрыяе праект. Сам праект — толькі частка працы дзеля дасягнення галоўнай мэты. | 8. Ключавыя індыкатары, звязаныя з галоўнаю мэтаю. | 9. Крыніцы інфармацыі для гэтых індыкатараў. | |
| **Спецыяльныя задачы** | 2. Задачы, выкананне якіх спрыяе дасягненню агульнай мэты. Кожная спецыяльная задача мусіць весці да рэальнай, вымяральнай, звязанай з праектам мэты. | 10. SMART-індыкатары, якія сведчаць, што задача выкананая. | 11. Крыніцы інфармацыі і метады збору інфармацыі. | 7. Фактары і ўмовы па-за межамі адказнасці бэнэфіцыярыя, неабходныя для выканання задачы. Рызыка, якую трэба ўлічваць. |
| **Чаканыя вынікі (вытворчасць)** | 3. Вынікі — гэта прадукты, паслугі, веды, уменні, адносіны або паляпшэнне рэалій, якім паспрыяў праект. | 12. Індыкатары, якія сведчаць, у якой меры дзеянне (праект) дасягнула чаканых вынікаў. | 13. Крыніцы інфармацыі. | 6. Знешнія ўмовы, якім трэба адпавядаць, каб дасягнуць чаканых вынікаў своечасова. |
| **Дзейнасць (унёсак)** | 4. Ключавыя дзеянні ў лагічнай паслядоўнасці. Дзеянні апісваюць службовае кола абавязкаў, якія неабходна выканаць, каб дасягнуць вынікаў. | 14. Патрэбныя сродкі: персанал, абсталяванне, трэнінгі, навучанне, матэрыялы, працоўныя магчымасці і г.д. | 15. Крыніцы інфармацыі пра тое, як ідзе праца. Поўныя працоўныя выдаткі. | 5. Умовы, неабходныя загадзя, да таго, як пачнецца праца. Знешнія ўмовы па-за межамі прамога кантролю бэнэфіцыярыя, неабходныя для выканання запланаваных дзеянняў. |
| | **Адпаведнасць/ паслядоўнасць (адносіны «прычына — вынік»)** | **Магчымасць ацэнкі** | | **Рэальнасць** |

Вертыкаль у гэтай частцы *Лагічнай структуры* выглядае так:

**Мэта/ галоўная задача**

↑

*Калі выконваюцца* ***спецыяльныя задачы****, гэта спрыяе дасягненню мэты.*

↑

*Калі працуе* ***вытворчасць****, тады выконваюцца задачы.*

↑

*Калі адпаведна вядзецца* ***дзейнасць****, чаканыя вынікі будуць дасягнутыя.*

***Аб'ектыўныя пацвярджальныя індыкатары (АПІ)***

Гэта калонка № 3 у *Лагічнай структуры*.

Індыкатарам мы называем тое, што дапамагае нам зразумець, на якім этапе працы мы знаходзімся, куды накіроўваемся і як далёка знаходзімся ад мэты. Гэта могуць быць канкрэтныя лічбы, працэнты, рэйтынгі, каэфіцыенты. Індыкатары дазваляюць нам зразумець, наколькі паспяховымі з'яўляюцца нашыя дзеянні.

Мы акрэсліваем індыкатары дзейнасці па трох прычынах:

1) каб удакладніць характарыстыкі галоўнай задачы, мэты і вынікаў;

2) каб аб'ектыўней ацэньваць выкананне праекта;

3) каб ствараць базу для больш аб'ектыўнага маніторынгу і аналізу.

*Як вызначыць АПІ:*

– Асноўным прынцыпам павінна быць мінімальная колькасць інфармацыі, патрэбнай для таго, каб дапамагчы менеджарам праекта і аналітыкам вызначыць, ці дасягнутыя (або дасягаюцца) пастаўленыя мэты.

– Яны асаблівыя для кожнай задачы і выніку (колькі, што, хто, калі і як доўга, дзе);

– Праверце, наколькі дакладна індыкатары адлюстроўваюць галоўную мэту або вынік.

Звяртайце ўвагу на арыенціры для ахвярадаўцаў і на міжнародна прынятыя стандарты індыкатараў, асабліва на ўзроўні спецыяльных задачаў і чаканых вынікаў.

*Крытэрыі для выбару індыкатараў:*

– Наколькі дакладна выбраны індыкатар апісвае *значэнне* задачы?

– Ці з'яўляецца выбраны індыкатар вымярэннем для *адзінага феномену?*

– Ці можна вызначыць *выніковую мэту* для ўдасканалення і паляпшэння?

– Ці магчымы *збор дадзеных* для выбранага індыкатара (якія чалавечыя і фінансавыя рэсурсы для гэтага патрэбныя)?

***Крыніцы пацвярджэння***

Гэта калонка № 4 у *Лагічнай структуры.*

Крыніцы пацвярджэння — **дакументы, справаздачы і іншыя** крыніцы, якія даюць інфармацыю, што дазваляе ацаніць, наколькі мы наблізіліся да чаканых вынікаў і мэты праекта.

Пры напісанні праекта варта вызначыць:

– хто мусіць збіраць і падаваць інфармацыю (самі працаўнікі, нанятыя каманды даследчыкаў, каманда менеджараў праекта);

– калі і наколькі рэгулярна будзе падавацца інфармацыя (штомесяц, раз на квартал, штогод).

***Дапушчэнні***

Гэта калонка № 5 у Лагічнай структуры.

Дапушчэнні — гэта **знешнія фактары,** якія могуць паўплываць (і нават стаць перашкодаю) на поспех праекта, але знаходзяцца па-за межамі прамога кантролю менеджараў праекта. Гэта адказ на пытанне: «Якія знешнія фактары могуць паўплываць на выкананне праекта і доўгатэрміновыя станоўчыя вынікі, і якія не могуць пракантраляваць менеджары?».

## ЧАСТКА 3. ІНШЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ ПРАЕКТА

### Бэнэфіцыярыі

Бэнэфіцыярый — гэта **індывід** або **інстытуцыя**, якія атрымліваюць або могуць атрымаць **карысць ці прыбытак** ад рэалізацыі праекта. **Прамыя бэнэфіцыярыі** — гэта тыя, хто атрымлівае карысць ад працы праекта адразу (напрыклад, наша задача — даць працу ста людзям, таму прамыя бэнэфіцыярыі — гэтыя сто людзей). **Непрамыя бэнэфіцыярыі** — гэта тыя, хто не ўключаны ў праект напрамую, але ў любым выпадку рэалізацыя праекта ўплывае на іх станоўча (у тым жа самым прыкладзе ста новых працоўных месцаў непрамыя бэнэфіцыярыі — сем'і тых ста нанятых на працу людзей, чые ўмовы жыцця паляпшаюцца, бо павялічваецца іх прыбытак).

Важна правільна вызначыць групы бэнэфіцыярыяў нашай дзейнасці.

### Рызыка

*Рызыка* — гэта знешнія фактары, якія не паддаюцца кантролю менеджараў праекта і якія падчас рэалізацыі могуць перашкодзіць поспеху. Важна добра ўсведамляць магчымую рызыку і распрацоўваць стратэгіі яе пераадолення.

### Дыяграма Ганта — Часавыя рамкі

*Дыяграма Ганта* — гэта графічная прэзентацыя выканання працы з цягам часу. Гэта самы карысны метад для планавання і распрацоўкі раскладу праектаў, таму што ён:

– дапамагае разлічыць, колькі часу спатрэбіцца на выкананне праекта;

– вызначае парадак, у якім трэба выконваць заданні;

– дапамагае ўбачыць узаемазалежнасць заданняў.

Дыяграма дапамагае кантраляваць выкананне праекта, таму што:

– дапамагае адразу ўбачыць, чаго трэба дасягнуць у пэўны момант часу;

– дапамагае ўбачыць, якое дзеянне можа выправіць праект і дапамагчы вярнуцца да вызначанага графіка.

Дыяграма Ганта такім чынам вызначае наш расклад:

| Дзейнасць | Расклад (месяцы, тыдні, дні) | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| Задача 1. | x | x | x | x | x | | | | | | |
| Задача 2. | | | x | x | x | x | x | | | | |
| Задача 3. | | | | | | | | x | x | x | x |

*На гэтым прыкладзе, калі наш адрэзак часу — гэта, напрыклад, месяц, можна зразумець, што задача 1 павінна пачацца ў першым месяцы і скончыцца ў пятым месяцы.*

**Уздзеянне і наступныя крокі**

Рыхтуючы заяўку па праекце, важна знайсці адказ на наступныя пытанні:

– Як выкананне праекта паўплывае на вызначаную праблему?

– Ці будзе праект мець дадатковы эфект?

– Што вы будзеце рабіць, калі скончацца грошы дабрачынцаў?

– Што вы зробіце, каб забяспечыць наступныя крокі?

**Маніторынг**

*Маніторынг праекта* — гэта збор інфармацыі пра выкарыстанне рэсурсаў у праграме, ход і методыку працы.

У плане маніторынгу важна вызначыць адказнасць і абавязкі:

– Каму і для чаго патрэбная сістэма маніторынгу? (менеджар праекта; каманда праекта; ахвярадаўцы; бэнэфіцыяры; партнёры, інш.)

– Якую інфармацыю неабходна сабраць?

– Якія метады трэба выкарыстоўваць (пісьмовыя і вусныя апытанні; інтэрактыўныя метады; кантроль уменняў і ведаў; карткі кантролю і справаздачы; прадметныя даследаванні; інш.)

– Хто павінен займацца зборам інфармацыі? Калі?

– Калі павінна быць падрыхтаваная справаздача?

## ЧАСТКА 4. ПЛАН ЗБОРУ СРОДКАЎ (ФАНД-РЭЙЗІНГУ)

### Спланаваць бюджэт

Бюджэт — гэта звычайна пералік матэрыялаў або паслугаў, якія трэба аплочваць (выдаткі) і спіс крыніцаў, з якіх вы атрымліваеце грошы (прыбытак). Бюджэт збалансаваны, калі выдаткі праекта і прыбытак роўныя.

Падлічваць **выдаткі** трэба вельмі ўважліва, не прапускаючы ніводнай падрабязнасці і дэталі. Калі вы не ведаеце, колькі каштуе тое ці іншае, не спрабуйце ўгадаць: складаючы бюджэт, гэта трэба дакладна высветліць.

| ВЫДАТКІ<br>Пункты бюджэту | Адзінкі | Кошт за адзінку | У ЦЭЛЫМ: |
|---|---|---|---|
| Заробкі<br>- Каардынатар праграмы<br>- Іншы персанал | | | |
| Арэнда памяшкання | | | |
| Тэлефон | | | |
| Матэрыялы для працы | | | |
| Паліва | | | |
| .... | | | |

**Прыбыткі** таксама трэба падлічваць уважліва. Можна зрабіць гэта ў выглядзе табліцы з трыма калонкамі: найгоршае, здавальняючае, найлепшае. «Найгоршае» — гэта нулявы варыянт. Калонка «Здавальняючае» — гэта кампраміс. Калонка «Найлепшае» паказвае, што будзе, калі ўсе пункты заяўкі атрымаюць фінансаванне.

| **ПРЫБЫТАК Крыніца** | **Найгоршае** | **Здавальняючае** | **Найлепшае** |
|---|---|---|---|
| Асноўныя ахвяраванні | | | |
| Новае | | | |
| Паўтор | | | |
| Чальцы арганізацыі | | | |
| Новае | | | |
| Паўтор | | | |
| Фонды | | | |
| ... | | | |
| ... | | | |

Калі вы бачыце, што лічбы ў калонцы выдаткаў блізкія да лічбаў у калонцы здавальняючых прыбыткаў, іх можна прыняць як патрэбны бюджэт.

**Прапановы**

– для складання бюджэту выкарыстоўвайце фармат, які вам прапаноўваюць або да якога абавязваюць вас ахвярадаўцы;

– рабіце дакладныя разлікі;

– прытрымлівайцеся дазволенага максімуму і мінімуму;

– пакажыце цесную сувязь паміж дзеяннем і яго коштам;

– не прасіце зашмат або замала;

– распрацуйце стратэгію фанд-рэйзінгу.

Існуе яшчэ адна магчымасць знайсці добры спосаб справіцца з улікам фінансаў вашага бюджэту, падлічыўшы грошы, атрыманыя ад асобных ахвярадаўцаў. Вы працуеце ў добрых умовах, калі прапорцыі вашага бюджэту наступныя:

– 60% грошай вы атрымліваеце ад 10% вашых ахвярадаўцаў — буйных ахвярадаўцаў;

– 20% грошай вы атрымліваеце ад 20% вашых ахвярадаўцаў — пастаянных ахвярадаўцаў;

– астатнія 20% вы атрымліваеце ад 70% вашых ахвярадаўцаў — тых, якія даюць грошы ўпершыню.

Прааналізуйце спіс вашых ахвярадаўцаў, адказаўшы на наступныя пытанні:

– Колькі ахвярадаўцаў у вас цяпер у гэтых трох катэгорыях?

– Колькі з іх пастаянных (павінна быць каля 66%)?

– Якія вашыя моцныя бакі ў працы з ахвярадаўцамі?

– Якая дынаміка колькасці вашых ахвярадаўцаў на працягу апошніх трох гадоў: яна вырасла, паменшылася або засталася нязменнаю?

## ЧАСТКА 5. ЗАЎВАГІ ПА НАПІСАННІ ЗАЯЎКІ НА ПРАЕКТ

**Пераканаць ахвярадаўцаў**

Вашая асноўная задача ў тым, каб абгрунтаваць вашую праектную прапанову. Вы павінны пераканаць ахвярадаўцаў у тым, што ваш праект нешта зменіць (таму ён варты і неабходны). Трэба асвятліць ключавыя тэмы:

– праблема;

– кантэкст;

– задачы, у тым ліку вызначэнне бэнэфіцыярыяў і мэтавых групаў;

– стратэгія працы.

**Мова праекта**

Жадаючы пераканаць ахвярадаўцу, гаварыце з ім на той мове, якую ён найлепш можа зразумець.

**Коратка і проста**

– пішыце сцісла;

– выкарыстоўвайце кароткія сказы;

– пішыце для адрасата, які не разбіраецца ў пытанні;

– пазбягайце прафесійнага жаргону і расшыфроўвайце ўсе тэрміны і акронімы;

– пазбягайце занадта акадэмічнай і складанай манеры напісання;

– дазвольце гісторыям канкрэтных людзей паўплываць на адрасата, але без агітацыі.

**Фармальнасці**

– уважліва прачытвайце загалоўкі, форму падачы і ўсе суправаджальныя дакументы;

– калі ёсць сумненні, пытайцеся!

– упэўніцеся, што запоўнілі ўсе патрэбныя пункты ў форме падачы заяўкі;

– прытрымлівайцеся прапанаванага фармату і памеру прапанаванай заяўкі;

– загадзя падрыхтуйце і належным чынам падпішыце ўсе дакументы;

– вышліце ўсе патрэбныя дакументы ў належны час і па правільным адрасе;

– не дадавайце непатрэбных дакументаў.

### *Практычная частка — прыклады*

**Мэта:** падрыхтаваць заяўку на праект.

**Сродкі:** не патрэбны.

**Час:** 1 гадзіна.

**Ход працы**

1. Раздзяліце сабраных на дзве групы.

2. Кожнай групе дайце па адным заданні (гл. матэрыялы 1 і 2). Задача групы — прааналізаваць праблему, скласці *Лагічную структуру*, вызначыўшы мэту, спецыяльныя задачы і паслядоўнасць дзеянняў, падрыхтаваць *дыяграму Ганта* і бюджэт.

3. Для падрыхтоўкі дайце групам 40 хвілінаў, а пасля ўдзельнікі зробяць кароткую прэзентацыю сваіх праектаў і арганізуюць дыскусію.

*Матэрыял 1*

Маленькая парафія ў Маліне ўзнікла ў 1979 годзе. У гэтай парафіі ёсць вельмі добра арганізаваны парафіяльны «Карытас» і шмат маладых валанцёраў, гатовых дапамагчы ў розных справах. Адна з найбольшых праблемаў — у парафіі шмат хворых пажылых людзей, у асноўным адзінокіх, якіх пакінула сям’я. Святар, які з’яўляецца дырэктарам парафіяльнага «Карытаса», жадае вырашыць гэтую праблему, бо кожны дзень нехта звяртаецца па дапамогу. Ён жадае далучыць маладых валанцёраў да падрыхтоўкі праекта, каб аказваць добрую прафесійную дапамогу старым парафіянам.

*Матэрыял 2*

У гэтай супольнасці асноўная праблема — наркаманія сярод падлеткаў. Парафіяльны «Карытас» быў створаны нядаўна, ёсць некалькі маладых валанцёраў, гатовых аддана працаваць і дапамагчы святару падрыхтаваць праект, каб вырашыць гэтую праблему. Мясцовыя ўлады гатовыя падтрымаць гэтую ініцыятыву і чакаюць дзеянняў ад «Карытаса».

### *Заключэнне*

Трэба многае дэтальна ўлічваць, каб добра падрыхтаваць праект.

У **сферы планавання** важна ведаць, як падрыхтавацца да праекта, як ацаніць патрэбы і прааналізаваць праблемы, як аб'ектыўна апісаць праблемы.

**Лагічная структура —** гэта спосаб вызначыць дзеянні, звязаныя з мэтаю-вынікам, аб'ектыўныя пацвярджальныя індыкатары (АПІ), крыніцы пацвярджэння і дапушчэнні.

**Іншыя элементы**, якія трэба ўлічваць, — гэта вызначэнне бэнэфіцыярыяў, рызыка, часавыя рамкі (з дыяграмаю Ганта), уздзеянне і наступныя крокі, працэс маніторынгу.

**Фінансавую частку** праекта трэба распрацоўваць, складаючы бюджэт з улікам балансу выдаткаў і прыбыткаў і вызначаючы стратэгію збору сродкаў.

Нарэшце, варта ўлічыць усе **заўвагі па напісанні** праекта: пераканаць ахвярадаўцаў, гаварыць на іх мове, пісаць заяўку па прынцыпе «коратка і проста» і ўважліва ставіцца да фармальнасцяў.

# ДЗЕЙНАСЦЬ ПА АБАРОНЕ ГРАМАДСКІХ ІНТАРЭСАЎ (АДВАКАЦЫЯ)

Існуе шмат дэфініцый адвакацыі, паколькі існуе шмат групаў і арганізацый, якія займаюцца абаронаю грамадскіх інтарэсаў. Адвакацыю можна вызначыць як практычнае выкарыстанне пэўнай інфармацыі і ведаў дзеля станоўчых зменаў у грамадстве. Гэтыя змены могуць датычыць дзяржаўнай палітыкі, заканадаўства, судовай сістэмы, але часам дзейнічаюць і незалежна. Такім чынам, адвакацыя — гэта аказанне падтрымкі ў пэўнай справе і здольнасць пераканаць іншых дзейнічаць у падтрымку гэтай справы. Гэтае азначэнне паказвае, што лабіраванне працэсу — не аднабаковая дзейнасць. Адвакацыя заахвочвае і мабілізуе супольнасць. Працэс пачынаецца з маленькай групы, якая

дзеліцца сваімі перажываннямі з прычыны канкрэтнай праблемы і гатовая прысвяціць свой час, уменні і даступныя рэсурсы, каб дасягнуць жаданых зменаў.

Кожная дэфініцыя супадае ў галоўным і сведчыць пра аднолькавыя прынцыпы дзеяння. Адвакацыя — перш за ўсё працэс, які доўжыцца нявызначую колькасць часу, магчыма, коратка, але найчасцей доўга. Адвакацыя — гэта стратэгічная і добра распрацаваная з улікам канкрэтнай мэты дзейнасць, пакліканая ўплываць на ключавых партнёраў і важных асобаў, якія прымаюць рашэнне. І ў рэшце рэшт, адвакацыя заўсёды ўплывае на палітыку, законы, нарматыўна-прававыя акты, праграмы, фінансавыя сферы на самым высокім узроўні інстытуцый дзяржавы і прыватнага сектара. Адвакацыя складаецца з разавых, абмежаваных у часе акцый і пастаяннай працы над шэрагам праблемаў. Дзейнасць па абароне грамадскіх інтарэсаў можа весціся на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях.

### *Малітва*

*Ты вусны свае адкрый для нямога...*

(пар. Прып 31, 8)

Адвакацыя — гэта прамаўленне і хадайніцтва ад імя іншых. Абараняючы грамадскія інтарэсы, мы шукаем магчымасці паўплываць на стаўленне іншых людзей да праблемы, плануючы і распрацоўваючы спосабы гэтага ўздзеяння. Мы імкнемся матываваць іншых дзейнічаць. Для нас адвакацыя — гэта спосаб заахвочваць хрысціянаў актыўна дзейнічаць, разумеючы патрэбу сучаснага свету ў праўдзе Евангелля, абавязак і магчымасць Касцёла даць адказ на гэтую патрэбу.

Адвакацыя можа быць голасам людзей у Касцёле і па-за ім. Яны пашыраюць у свеце ўсведамленне надзённых патрэбаў і магчымасцяў для ўсіх асобаў у патрэбе. Абаронцы грамадскіх інтарэсаў могуць планаваць розныя падзеі і канферэнцыі, ра-




біць даследаванні па стане культуры, збіраць і распаўсюджваць просьбы аб малітве, мабілізоўваць наяўныя рэсурсы, дапамагаць у групах усынаўлення і развіваць розныя стратэгічныя ініцыятывы.

Гэтак жа, як і ў найважнейшых жыццёвых задачах, каб навучыцца эфектыўна абараняць грамадскія інтарэсы, неабходная зацікаўленасць, энергічнасць і настойлівасць.

## *Тэарэтычная частка*

### Базавыя элементы адвакацыі

Існуе тры віды дзейнасці, якія выклікаюць змены ў стратэгіях і праграмах: вызначэнне праблемы, пошук вырашэння і абарона грамадскіх інтарэсаў. Вызначэнне праблемы і пошук альтэрнатыўных вырашэнняў выкарыстоўваюцца для таго, каб выклікаць патрэбныя змены, а патрэбу ў сістэматычнай і паўторнай адвакацыі разумеюць не так добра. Дыяграма паказвае, што працэс адвакацыі неабходны, каб выклікаць змены ў стратэгіях і праграмах. З нядаўняга часу даследчыкі, кіраўнікі, персанал недзяржаўных грамадскіх арганізацый і іншыя зацікаўленыя групы і асобы зразумелі неабходнасць выкарыстання адвакацыі, але часта ў іх мала ведаў па гэтай тэме.

У гэтых ўводзінах апісваюцца спосабы, якія дапамагаюць далучыцца да працэсу абароны грамадскіх інтарэсаў. Мэты адвакацыі:

– Інфармаваць разнастайную аўдыторыю аб патэнцыяльных спецыялістах у адвакацыі, аб самой адвакацыі і яе метадах.

– Навучыць некаторым базавым элементам адвакацыі.

– Павялічыць выкарыстанне разнастайных дадзеных у інфармаванні аб працэсе адвакацыі.

– Дадаць упэўненасці тым, хто пачынае адвакацыйную дзейнасць.

– Пачаць працэс дэмакратызацыі, вучачы людзей прамаўляць так, каб іх галасы былі пачутыя.

Спецыяльныя тэхнікі і стратэгіі адвакацыі адрозніваюцца, але гэтыя элементы з’яўляюцца галоўнымі «цаглінамі» ў будаванні эфектыўнай адвакацыі. Гэтак жа, як і ў будоўлі, каб стварыць стратэгію адвакацыі, не трэба выкарыстоўваць усе да адной «цагліны». Да таго ж, не трэба выкарыстоўваць гэтыя элементы ў тым парадку, у якім яны прадстаўленыя. Можна выбіраць і камбінаваць іх так, як зручна вам. Разглядаючы дыяграму (гл. наступную старонку), вы можаце заўважыць, што некаторыя з яе канцэптаў узятыя з паліталогіі, грамадскага маркетынгу і арганізацыйна-эканамічнага аналізу.

- **Выбар задачаў у адвакацыі**

Праблемы могуць быць надзвычай складанымі. Каб дзейнасць па абароне грамадскіх інтарэсаў была паспяховаю, яе мэта павінна быць звужаная да задачаў, выбар якіх заснаваны на адказах на наступныя пытанні: Ці можа гэтая справа сабраць разам розныя групы, каб стварылася магутная кааліцыя? Ці адпавядае задача пастаўленай праблеме?

- **Выкарыстанне розных дадзеных і даследаванняў у адвакацыі**

Збор розных дадзеных і даследаванні неабходныя, каб прыняць інфармаванае рашэнне ў выбары праблемы, над якою трэ-




**Базавыя элементы адвакацыі**

ба працаваць, каб шукаць вырашэння гэтай праблемы і ставіць рэальныя мэты. Да таго ж аб'ектыўныя дадзеныя самі па сабе могуць быць вельмі пераканаўчым аргументам. Ці зможаце вы рэальна дасягнуць мэты з выкарыстаннем гэтых дадзеных? Якія дадзеныя можна выкарыстаць у падтрымку вашых аргументаў?

- **Вызначэнне аўдыторыі для адвакацыі**

Як толькі былі выбраныя мэты і задачы, трэба звярнуцца да людзей, якія маюць уладу прымаць рашэнні і, у ідэале, да людзей, якія ўплываюць на тых, хто прымае рашэнні: чыноўнікі, дарадчыкі, заслужаныя дзеячы, СМІ і грамадства. Назавіце імёны прадстаўнікоў улады, чые рашэнні могуць дапамагчы рэалізаваць вашыя мэты. Хто або што можа паўплываць на гэтых людзей?

- **Распрацоўка і перадача асноўных ідэяў адвакацыі**

Розная аўдыторыя адказвае на розныя формы перадачы ідэяў. Напрыклад, палітык можа быць матываваны, калі даведаецца,

колькіх людзей у яго мясцовасці трывожыць пэўная праблема. Міністр адукацыі або міністр аховы здароўя можа далучыцца да справы, калі ўбачыць падрабязныя дадзеныя і лічбы, якія датычаць распаўсюджанасці праблемы. Якую ідэю трэба прадставіць аўдыторыі, каб яна згадзілася супрацоўнічаць з вамі?

- **Стварэнне кааліцый**

Часта эфектыўнасць дзейнасці па абароне грамадскіх інтарэсаў заключаецца ў колькасці людзей, якія падтрымліваюць вашую ідэю.

Там, дзе дэмакратыя і адвакацыя — новыя з’явы, вялікая колькасць людзей, якія прадстаўляюць розныя інтарэсы, можа забяспечыць плённасць адвакацыйнай дзейнасці і палітычную падтрымку. Нават унутры адной арганізацыі стварэнне кааліцый, напрыклад, далучэнне супрацоўнікаў з розных аддзелаў да працы над новым праектам, можа дапамагчы прыйсці да згоды ў дзейнасці. Каго яшчэ вы можаце запрасіць далучыцца да вашай спрвы? Хто можа стаць вашым аднадумцам?

- **Рабіць пераканаўчыя прэзентацыі**

Часта магчымасці паўплываць на ключавую аўдыторыю бываюць абмежаваныя. Палітык можа прызначыць вам адну сустрэчу для абмеркавання вашай справы, у міністра можа быць толькі пяць хвілінаў падчас канферэнцыі, каб паразмаўляць з вамі. Уважлівая і ўдумлівая падрыхтоўка пераканаўчых аргументаў і стыль вашай прэзентацыі могуць ператварыць гэтыя малыя магчымасці ў паспяховую адвакацыю. Калі ў вас будзе толькі адна магчымасць паразмаўляць з чалавекам, які прымае рашэнне, *што* вы яму скажаце і *як* вы гэта скажаце?

- **Збор сродкаў для адвакацыі**

Большасць відаў дзейнасці, у тым ліку і адвакацыя, патрабуюць рэсурсаў. Эфектыўнасць высілкаў, укладзеных у адвакацыю на працягу доўгага часу, залежыць ад таго, колькі часу і энер-

гіі было выдаткавана на збор сродкаў і іншых рэсурсаў, на якіх трымаецца праца. Як вы можаце сабраць патрэбныя рэсурсы, каб весці дзейнасць па абароне грамадскіх інтарэсаў?

- **Ацэнка адвакацыі**

Каб паспяхова займацца адвакацыяй, трэба пастаянна атрымліваць водгукі пра вашую працу і ацэнку прыкладзеных высілкаў. Як вы даведаецеся, што паспяхова дасягнулі мэты сваёй адвакацыйнай дзейнасці? Як можна палепшыць стратэгію вашай дзейнасці?

*Глядзі практыкаванне 1 (с. 242).*

## КАНЦЭПТУАЛЬНАЯ АСНОВА АДВАКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Адвакацыя — гэта дынамічны працэс з розным складам дзейных асобаў, у якім распрацоўваюцца розныя ідэі, праграмы дзейнасці, стратэгіі. Гэты разнапланавы працэс можна раздзяліць на пяць зменлівых стадый (гл. наступную старонку): вызначэнне праблемы, даследаванне і аналіз, планаванне, дзейнасць і ацэнка. Гэтыя стадыі трэба бачыць як працэсы, якія перацякаюць адзін у адзін, бо яны могуць працякаць адначасова або паступова. Працэс можа затрымацца або пайсці ў адваротным кірунку.

*Першая стадыя* — гэта вызначэнне праблемы, для вырашэння якой будзе распрацоўвацца стратэгія дзеяння. Гэтая стадыя таксама звязаная з распрацоўкаю плана дзейнасці. Ёсць вялізная колькасць праблемаў, якія патрабуюць нашай увагі, але не для ўсіх іх можна распрацаваць канкрэтны план вырашэння. Для адвакацыі неабходна вырашыць, якой праблемаю трэба займацца, і звязацца з пэўнай інстытуцыяй, якая пацвердзіць, што праблема патрабуе вырашэння. Звычайна адразу пасля гэтага ідзе *другая стадыя* — даследаванні і аналіз. Тыя, хто займаецца адвакацыяй, і іншыя ключавыя для праекта асобы збіраюць патрэбную інфармацыю, прапануюць вырашэнні праблемы і выбіраюць з іх тое, якое з’яўляецца палітычна, эканамічна і сацыяльна рэаль-




ным і абгрунтаваным. *Трэцяя стадыя* — гэта планаванне. Калі прымаецца рашэнне, што адвакацыя будзе адпаведным спосабам звяртацца да праблемы, неабходна выпрацаваць стратэгію дзеяння: вызначыць мэту, задачы, індыкатары поспеху, спосабы ацэнкі, кантрольныя паказчыкі, методыку і дзейнасць, знайсці аднадумцаў, даследаваць рызыку і дапушчэнні, разлічыць шкалу часу, размеркаваць адказнасць. *Чацвёртая стадыя*, дзейнасць, пачынаецца тады, калі праблема вызначаная, вырашана, як яе ліквідаваць, ёсць стратэгія дзеяння, і ўсё гэта адбываецца адначасова. Гэтае накладанне справаў стварае толькі маленькае «акенца» магчымасцяў, якім мусіць скарыстацца той, хто вядзе адвакацыйную дзейнасць. Разуменне працэсу прыняцця рашэння і сур'ёзная адвакацыйная стратэгія павялічаць імавернасць узнікнення такіх «акенцаў», якія даюць магчымасць дзейнічаць. *Фінальную стадыю* ацэнкі часта прапускаюць, хоць яна

мае вялікае значэнне. Добрыя спецыялісты ў галіне адвакацыі ацэньваюць эфектыўнасць сваёй працы і на аснове гэтага досведу ставяць перад сабою новыя мэты. Тыя, хто займаецца адвакацыяй, і інстытуцыі, якія прымаюць стратэгію зменаў, павінны перыядычна ацэньваць эфектыўнасць гэтых зменаў.

## 1. ВЫЗНАЧЭННЕ ПРАБЛЕМЫ

Першы крок у любой паслядоўнасці дзеянняў — гэта звычайна вызначэнне праблемы, на вырашэнне якой будзе скіраваная дзейнасць. Распрацоўка праектаў, адвакацыйныя ініцыятывы і адукацыя — гэта шляхі вырашэння праблемы. Толькі аналізуючы прычыны яе ўзнікнення, можна ўбачыць, якая паслядоўнасць дзеянняў будзе найбольш эфектыўнаю. Праблема можа здавацца відавочнаю, як, напрыклад, абмежаванасць зямельных рэсурсаў або недаступнасць адукацыі. Аднак часам яе не так лёгка сфармуляваць, і супольнасць павінна дэталёва даследаваць патрэбы і праблемы, з якімі яна сутыкаецца.

*Згода па прыярытэтных патрэбах*

Пасля даследавання супольнасць або адпаведны спецыяліст павінен згрупаваць адказы па наяўнасці праблемаў. Не так істотна, як канкрэтна яны будуць згрупаваныя: галоўнае, каб людзі бачылі, што іх клопаты ўпісаныя ў схему дзеянняў, якую вы ім прапануеце. Калі патрэбы згрупаваныя, супольнасць збіраецца разам і вырашае, якія патрэбы для іх прыярытэтныя. Калі іншая арганізацыя вядзе адвакацыйную дзейнасць «для» або «разам» з групаю, тады яна мусіць працаваць з супольнасцю, каб сумесна вызначыць прыярытэтныя патрэбы.

– Запішыце ўсе патрэбы і згрупіруйце іх на паперы (гл. прыклад ніжэй).

– Папрасіце ўдзельнікаў ацаніць іх баламі ад 1 да 5 паводле прыярытэтнасці.

– Раздзяліце ўдзельнікаў на малыя групы, каб яны абмеркавалі адказы кожнага ўдзельніка і склалі агульны для кожнай групы рэйтынг.

– Пасля збярыце ўсю групу разам і запішыце адказы малых групаў; падыскутуйце, калі ў рэйтынгах ёсць адрозненні, і пастарайцеся вызначыць галоўныя праблемы.

– Альтэрнатыўны спосаб — запісаць усе праблемы на асобных картках і раскласці іх па парадку, ад самай важнай да найменш важнай. Працэс перакладвання картак у патрэбным парадку стымулюе лепшую дыскусію і перамовы.

## 2. ДАСЛЕДАВАННІ І АНАЛІЗ

Гэтая секцыя працы займаецца разгляданнем інфармацыі, патрэбнай для глыбейшага зразумення вызначаных падчас працы папярэдняй секцыі праблемаў да таго, як пачнецца сама адвакацыйная дзейнасць. Шмат інфармацыі патрэбна да таго, як распачнецца любая праца па развіцці, але пэўная інфармацыя больш падыходзіць для адвакацыйнай дзейнасці, напрыклад, разуменне палітычнай сітуацыі.

Уся адвакацыйная праца павінна абапірацца на дакладную, вартую даверу і дастатковую інфармацыю. Як і ў іншых відах працы па развіцці, правільная і добрая інфармацыя патрэбная ў адвакацыі для таго, каб:

– Зразумець кантэкст, у якім вы працуеце, у тым ліку прычыны і наступствы канкрэтнай праблемы, якою вы збіраецеся займацца, каб упэўніцца, што ўлічваюцца ўсе фактары, што ўплываюць на сітуацыю.

– Зразумець, як змяняецца кантэкст, каб звярнуцца да вырашэння патэнцыяльных праблемаў у будучыні або не дапусціць іх узнікнення.

– Абгрунтаваць любое дзеянне для вашай арганізацыі, бэнэфіцыярыяў і ўсіх людзей, з якімі вы супрацоўнічаеце.

– Вучыцца на папярэднім поспеху і памылках.

– Мець добрае пацвярджэнне сваім аргументам.

– Зразумець, чым займаюцца іншыя, каб пазбегнуць паўтарэння дзейнасці, і арганізаваць супрацоўніцтва, калі гэта вам трэба.

*Глядзі практыкаванне 2 (с. 242).*

### 3. ПЛАНАВАННЕ

*Вызначце мэту і задачы вашай адвакацыйнай дзейнасці*

Мэта адвакацыйнай дзейнасці — доўгатэрміновая для дасягнення агульная мэта, якая заключаецца ў вырашэнні вялікай праблемы. Для дасягнення кожнай мэты неабходна вызначыць некалькі задачаў. Задача ў адвакацыйнай дзейнасці азначае пэўнае дзеянне, магчымае для інстытуцыі. Гэтае дзеянне — канкрэтны вымяральны крок для дасягнення мэты.

Каб вызначыць задачы адвакацыйнай дзейнасці, задайце сабе наступныя пытанні:

– Што мы жадаем змяніць?

– Хто можа гэта змяніць?

– Наколькі шмат мы павінны дзейнічаць, каб змены адбыліся?

– Да якога тэрміну?

Інфармацыю, патрэбную для вызначэння мэты і задачы адвакацыйнай дзейнасці, звычайна можна знайсці ў дзяржаўных і грамадскіх дакументах, дакладах аб даследаваннях, у якіх падымаюцца і абмяркоўваюцца праблемы здароўя. Добрым пачаткам могуць быць 5-гадовыя планы працы міністэрстваў, працоўныя планы, гадавыя справаздачы і даклады з пасяджэнняў. Дадатковую інфармацыю можна знайсці ў дакументах недзяржаўных арганізацый і ахвярадаўцаў, зацікаўленых праблемаю.

Да таго, як заняцца адвакацыйнымі праграмамі, трэба сфармаваць маленькую каманду найбольш зацікаўленых у ініцыятыве, каб папярэдне ацаніць аб'ём вашай адвакацыйнай ініцыятывы і рэальную магчымасць яе ажыццявіць. Вывучыце адпаведныя дакументы і арганізуйце «магзавы штурм», каб распрацаваць адну або дзве папярэднія адвакацыйныя мэты і задачы. Аднак пазбягайце залішняга прывязвання да выбранай мэты. Для паспяховай адвакацыйнай дзейнасці неабходна, каб вялікая група або некалькі групаў вызначылася з мэтамі і задачамі. У працэсе працы вашыя мэты і задачы могуць змяніцца.

Прыклады мэтаў:

– Палепшыць стан дзіцячага здароўя ў дадзенай мясцовасці.

– Забяспечыць шырэйшы ўдзел жанчынаў у прыманні важных рашэнняў.

– Змагацца з карупцыяй у грамадстве.

*SMART-задача*

Задача — гэта меркаванае ўздзеянне і эфект ад працы, якою вы займаецеся, канкрэтныя змены, якіх вы чакаеце. Гэта найважнейшая частка вашай стратэгіі і наступны крок пасля вызначэння мэты. Варта выдзеліць час, каб распісаць дакладныя задачы, бо гэтак вы зможаце хутчэй распісаць астатнюю частку адвакацыйнай стратэгіі і эфектыўней працаваць над дасягненнем зменаў.

Прыклад SMART-задачы:

На 20% павялічыць колькасць жанчынаў у вясковых ра́дах у пэўнай мясцовасці на працягу двух гадоў.

– Гэта канкрэтная задача, бо мы імкнемся да павелічэння на 20%.

– Гэта вымяральная задача, бо колькасць жанчынаў у вясковых ра́дах можна лёгка палічыць.

– Гэта дасягальная задача, бо павелічэнне на 20% азначае, што замест 10-ці жанчынаў у ра́дах павінна з’явіцца 12 жанчынаў.

– Гэта важная задача, таму што яна паменшыць нераўнапраўе жанчынаў, за якіх на дадзены момант прымаюць рашэнні іншыя.

– Гэта задача з канкрэтным тэрмінам выканання, бо мы імкнемся выканаць яе на працягу двух гадоў.

*Вызначце аўдыторыю вашай адвакацыі*

Для дасягнення вашай мэты патрэбны пэўныя змены. Вызначце, якія людзі могуць паспрыяць або перашкодзіць гэтым зменам. Гэта людзі, да якіх вы жадаеце «дастукацца» і пераканаць у тым, што змены патрэбныя. Гэта ваша першасная аўдыторыя. Пасля вызначце, якія людзі могуць паўплываць на асобаў з першаснай аўдыторыі. Гэта ваша другасная аўдыторыя.

Вывучайце аўдыторыю на падрыхтоўчай стадыі адвакацыйнай працы, каб вызначыць сваю аўдыторыю і стварыць інфармацыйную базу для маніторынгу і ацэнкі ў будучыні. Вывучэнне аўдыторыі пачынаецца са стварэння «мапы аўдыторыі». У вашых ведах будзе шмат прабелаў. Рабіце назіранні і выкарыстоўвайце грамадскую інфармацыю, каб хутка і танна запоўніць гэтыя прабелы. Каб пераканаць патэнцыяльных партнёраў і супрацьстаяць апанентам, высветліце, як яны ставяцца да вашай праблемы. Таксама неабходна знайсці асабістую інфармацыю і даведацца пра зацікаўленасці вашых апанентаў, каб лепш зразумець іх пазіцыю.

Калі ў вашай інфармацыйнай базе ёсць вялікія прабелы, шукайце фінансаванне для інтэрв'ю, апытанняў і працы з фокус-групамі. Можна паменшыць кошты, калі папрасіць уласных супрацоўнікаў правесці свае даследаванні. Аднак вам спатрэбяцца фінансавыя ўнёскі і парады спецыялістаў, каб вашыя даследаванні адпавядалі мінімальным неабходным стандартам якасці. Даследаванне, не вартае даверу, — толькі растрата абмежаванага фінансавання.

*Стварэнне «мапы аўдыторыі»*

Метад «мазгавога штурму», які выкарыстоўваецца для таго, каб нанесці на мапы вашай адвакацыйнай дзейнасці інфармацыю пра вашую аўдыторыю, — гэта самы эфектыўны спосаб сабраць інфармацыю пра аўдыторыю і запоўніць прабелы ў ведах.

## 4. ДЗЕЙНАСЦЬ

*Мемарандум*

Мемарандум — гэта кароткі дакумент, які вызначае пазіцыю вашай арганізацыі па канкрэтнай праблеме. Мемарандум часта выкарыстоўваецца як аснова для апісання вашай дзейнасці для грамадства і СМІ. Кожны супрацоўнік вашай арганізацыі і членец вашай адвакацыйнай кааліцыі павінен амаль напамяць ведаць пазіцыю групы адносна мэты і задачаў адвакацынай дзейнасці і адказваць на розныя пытанні без аніякіх ваганняў.

*Асноўныя часткі мемарандума або стратэгіі*

Мемарандумы пішуцца ў рознай форме і служаць розным мэтам, але найчасцей яны складаюцца з наступных частак.

**Уводзіны:** назва арганізацыі, вашая асноўная дзейнасць; база, на якой існуе арганізацыя; каго вы прадстаўляеце.

**Рэзюмэ** (калі мемарандум вялікі): кароткае апісанне гісторыі вашай дзейнасці, справаў, якімі вы займаецеся і да якіх маеце дачыненне.

**Абгрунтаванне і ўплыў праблемаў:** які рэальны і патэнцыяльны ўплыў праблемаў, якімі вы займаецеся? Далучыце сваю інфармацыю першапачатковых даследаванняў. Калі вы маеце падрабязную інфармацыю, дадайце яе асобным дакументам да мемарандума, а ў самім тэксце мемарандума дайце спасылку.

**Прычыны праблемаў і адказнасць за іх:** якія групы або асобы адказныя за надзённую сітуацыю і спрычыніліся да яе ўзнікнення? Якія падзеі на яе паўплывалі? Чаму асобныя дзеянні былі няправільнымі, не адпавядалі законам, маралі і г.д.?

**Рашэнні і рэкамендацыі:** што трэба зрабіць, каб вырашыць праблему? Хто нясе за гэта адказнасць? Што ўжо робіцца для вырашэння праблемы і хто гэтым займаецца? Што добрае і дрэннае ў прапановах і дзеяннях, якія існуюць цяпер, і як іх трэба змяніць? Якія асаблівыя рэкамендацыі вы маеце? Упэўніцеся, што апісваеце SMART-задачы. Якія аргументы можна выказаць супраць вашых прапановаў, і як вы будзеце адказваць на гэтыя аргументы?

**Дадаткі:** гэта любая дэтальная інфармацыя, якую вы далучаеце да асноўнага дакумента.

Мемарандумы можна дасылаць або перадаваць уплывовым асобам у адной з трох асноўных формаў:

– Кароткі мемарандум (2–4 старонкі, якія перадаюцца падчас сустрэчы або дасылаюцца разам з суправаджальным лістом, дзе асвятляюцца 1–2 ключавыя пункты або рэкамендацыі).

– Больш разгорнуты брыфінг-дакумент (перадаецца падчас сустрэчы або дасылаецца разам з суправаджальным лістом, у якім асвятляюцца ключавыя пункты).

– Напісаны спецыяльна для ўплывовай асобы ліст, у якім асвятляюцца асноўныя пункты мемарандума.

Гэта аўтаномны дакумент, але, калі трэба, вы павінны прапанаваць больш дэтальную інфармацыю. Від дакумента, які вы абіраеце, залежыць ад таго, колькі інфармацыі вы жадаеце ўключыць, наколькі добра ведаеце ўплывовую асобу, колькі часу вы маеце для падрыхтоўкі карэспандэнцыі і гэтак далей.

*Некалькі дадатковых парадаў:*

– Коратка і сцісла апішыце сваю пазіцыю (не больш за адну старонку). Прадстаўце пакрокавае абгрунтаванне сваёй пазіцыі.

– Вашыя сцвярджэнні павінны грунтавацца на сур'ёзным даследаванні. Толькі аўтарытэтныя дадзеныя могуць пераканаць асобаў, якія сумняваюцца.

– Пішыце і перапісвайце ваш мемарандум або ліст вельмі ўважліва перад тым, як распаўсюджваць яго публічна. Звярніце ўвагу, каб не дапусціць:

- памылак;
- супярэчнасцяў у апісанні вашай пазіцыі;
- двухсэнсоўнасцяў;
- сцвярджэнняў або выразаў, незразумелых асобам, якія не належаць да вашай групы;
- жаргону;
- перабольшванняў.

– Няхай нехта іншы прачытае ваш дакумент, каб упэўніцца, што ён добра і зразумела напісаны. Папрасіце некага заняць супрацьлеглую вашай пазіцыю і паказаць на памылкі і супярэчнасці ў вашых думках.

*Справаздачныя нататкі*

У справаздачных нататках пералічваюцца факты вашай дзейнасці або нейкай канкрэтнай тэмы. У гэтых нататках коратка падсумоўваюцца справаздачы. Часта там змяшчаецца інфармацыя, цікавая для публікі. Справаздачныя нататкі —

вельмі карысны спосаб данесці інфармацыю да публікі, СМІ або ўплывовых асобаў. Пішучы справаздачныя нататкі, упэўніцеся, што маеце самую свежую інфармацыю, зрабіце спасылку, пазначыўшы, адкуль вы ўзялі інфармацыю. Гэта вельмі павялічыць ваш крэдыт даверу ў вачах асобаў, якія скарыстаюцца справаздачнымі нататкамі.

## ПРАЦА СА СМІ

СМІ — гэта радыё, тэлебачанне, газеты, часопісы і электронныя выданні. Гэта вялікая сіла, якая можа дапамагчы распаўсюдзіць інфармацыю і сфармаваць грамадскае меркаванне, паўплываць на важнае рашэнне. Эфектыўна выкарыстоўваючы СМІ, вы зможаце палепшыць сваю адвакацыйную працу і павялічыць шанцы на змены, якіх вы чакаеце. Самы просты і эфектыўны спосаб данесці свае ідэі — з’явіцца на радыё і ў тэлешоў. Выберыце прамоўцаў, якія будуць добра гучаць падчас радыё і тэлепраграмы. Няхай гэта будуць людзі, якія шмат ведаюць і ўмеюць красамоўна гаварыць. Некаторыя людзі, нават вельмі дасведчаныя, заўсёды будуць выглядаць заціснута і ненатуральна, а іншыя могуць дэманстраваць залішнюю самаўпэўненасць і гучаць навязліва.

### Рэкамендацыі для працы са СМІ

*Дакладна ведайце сваю мэту.*

Для чаго вам інфармацыя ў СМІ? Ці патрэбна гэта, каб ахапіць шырэйшую аўдыторыю або паўплываць на тых, хто прымае рашэнні? Ці патрэбна гэта, каб распаўсюдзіць інфармацыю або паскорыць змены?

*Трымайцеся сваіх ідэяў.*

Якой канкрэтна ідэяй вы хочаце падзяліцца? Упэўніцеся, што яна гучыць ясна, можа мабілізаваць людзей і паспрыяць вашаму лобі.

*Памятайце, што маеце стасункі з людзьмі.*

СМІ складаюцца з асобных людзей і аддзелаў, у якіх ёсць свая праца і якім патрэбна добрая гісторыя.

*Імкніцеся паўплываць на важных для вас асобаў.*

Каб добра выкарыстоўваць СМІ, трэба мець добрыя адносіны з важнымі людзьмі, якія сімпатызуюць вашай дзейнасці.

*Пастаўце сябе на месца СМІ.*

Спытайце сябе: а гэта цікава? Што зможа прыцягнуць увагу людзей? Як яны могуць адрэагаваць?

*Памятайце, што навіны не бываюць свабоднымі ад ідэалогіі.*

Большасць СМІ маюць свае каштоўнасці: гэта можа быць палітыка, рэлігія, засяроджанасць на праблемах беднасці або нешта іншае. Перад тым, як звяртацца да канкрэтнага СМІ, высветліце яго каштоўнасці, тады вы зразумееце, як яны могуць паставіцца да вашай дзейнасці.

**Прэс-рэліз**

Гэта адзін з найбольш распаўсюджаных спосабаў звярнуцца да СМІ і выкарыстаць іх, каб прыцягнуць увагу да сваёй дзейнасці. Упэўніцеся, што можаце даць адказ на гэтыя пяць пытанняў:

– Што адбываецца/адбылося?
– Хто гэта робіць/зрабіў або гаворыць пра гэта/гаварыў?
– Дзе гэта адбываецца/адбылося?
– Калі гэта адбываецца/адбылося?
– Чаму гэта адбываецца/адбылося?

Рыхтуючы прэс-рэліз, вы павінны думаць: «І што з гэтага?». Такім чынам вы зможаце стаць на месца сваіх чытачоў, зможаце ўпэўніцца, што растлумачылі ім сваю дзейнасць. Добрыя фотаздымкі павялічваюць шанцы на тое, што пра вашую дзейнасць напіша газета. Абавязкова ўпэўніцеся, што вашая інфармацыя правільная, і, выслаўшы прэс-рэліз, звяжыцеся з чалавекам, якому вы яго даслалі, каб даведацца, ці будзе асвятляцца вашая гісторыя і ці патрэбна дадатковая інфармацыя.

*Глядзіце матэрыял 1: Прыклад прэс-рэліза (с. 242).*

**Інтэрв'ю на радыё**

Інтэрв'ю на радыё — гэта эфектыўны спосаб хутка і ясна данесці свае ідэі да аўдыторыі, але калі яно зробленае дрэнна,

то можа пашкодзіць вашай адвакацыйнай дзейнасці. Стыль інтэрв'ю можа адрознівацца: ад простага апытання да агрэсіўнага допыту. Памятайце, што інфармацыяй валодаеце вы. Вы — эксперт і прыйшлі на інтэрв'ю, каб зацікавіць, інфармаваць і адукаваць. Добрыя інтэрв'ю патрабуюць добрай падрыхтоўкі і дасведчанасці. Досвед прыходзіць з практыкай, але можна навучыцца падрыхтоўцы да інтэрв'ю.

– Даведайцеся, будзе прамы эфір або запіс; ці будзеце вы адзіным госцем або арганізуюцца дэбаты.

– Праверце апошнюю інфармацыю, запішыце неабходныя факты і пакладзіце запісы перад сабою.

– Паразважайце над тым, якія складаныя пытанні вам могуць задаць, і прадумайце адказы.

– Стварыце спіс з трох галоўных ідэяў, якія вы хочаце асвятліць, і трымайцеся гэтага спісу!

– Падрыхтуйце некалькі гісторый або прыкладаў, каб праілюстраваць свае ідэі.

– Даведайцеся, якім будзе першае пытанне.

– Калі ў вас мала досведу або не хапае ўпэўненасці, папрактыкуйцеся: распавядзіце сябру або калегу, пра што вы збіраецеся гаварыць.

– Падтрымлівайце жывую размову: не гаварыце занадта складана і не выкарыстоўвайце шмат спецыяльнай лексікі.

**Тэхніка публічнай прэзентацыі**

Каб завалодаць увагаю аўдыторыі і ўтрымаць яе, патрэбна візуальная камунікацыя. Калі вы непрывабны для аўдыторыі, людзям не падабаецца, як вы выглядаеце, ім будзе цяжка сфармаваць да вас добрае стаўленне і паверыць, што вы дасведчаная і вартая даверу асоба.

*Знешні выгляд*: упэўнены.

*Поза*: роўная, галава ўзнятая.

*Выраз твару*: усмешка, экспрэсіўнасць.

*Зрокавы кантакт*: падтрымлівайце зрокавы кантакт з 2–3 людзьмі з аўдыторыі, не глядзіце паверх галоваў.

*Рухі*: не хістайцеся, не хадзіце туды-сюды і г.д.

*Жэсты*: натуральныя, рукі па баках цела або сашчэпленыя далоні.

**Папрактыкуйце моўную тэхніку:**

*Тон голаса*: нізкі, багаты на абертоны.

*Вобразнасць:* выдзяляйце важныя словы.

*Працягласць*: 2 хвіліны = крыху больш за адзін двайны аркуш тэксту; 10 хвілінаў = амаль 3 старонкі тэксту, набранага з адзінарным інтэрвалам; атрымліваецца 135–140 словаў у хвіліну.

*Паўзы*: 2 секунды для акцэнтавання; 8 секундаў пасля таго, як вам задалі пытанне.

*Інтанацыя*: паніжэнне напрыканцы сказаў.

*Дыкцыя*: яснае, выразнае вымаўленне словаў з усімі канчаткамі.

*Экспрэсіўнасць*: не гаварыце манатонна, пакажыце вашае стаўленне да таго, што вы гаворыце!

*Гучнасць*: гаварыце так, каб можна было пачуць усе вашыя словы.

Даследаванні паказалі, што чалавек мае 2–4 хвіліны, каб прыцягнуць увагу аўдыторыі (гэта не больш за 1 старонку тэксту, набранага з адзіночным інтэрвалам). Калі ў вас не атрымалася стварыць станоўчае ўражанне за гэты час, вы, хутчэй за ўсё, не зможаце ўтрымаць увагу аўдыторыі і матываваць яе.

*Для дадатковай трэніроўкі ўмення весці перамовы глядзіце матэрыял 2 (с. 244).*

**Арганізацыя прэс-канферэнцыі**

*Не пазней за тыдзень да прэс-канферэнцыі*

– Вызначыце месца яе правядзення.

– Пастаўце подыум, крэслы, магчыма, замоўце ежу і напоі для журналістаў.

– Зрабіце расклад мерапрыемства (расклад залежыць ад крайняга тэрміну здачы матэрыялаў у СМІ, якія будуць асвятляць падзею).

– Падрыхтуйце аб'яву аб прэс-канферэнцыі. Коратка пазначце тэмы і імёны спікераў, удакладніце іх дасведчанасць па вызначаных тэмах.

– Дашліце аб'яву факсам, поштаю (электр. поштаю) або з кур'ерам рэдактарам, журналістам, дзяржаўным службам навінаў і інфармацыйным агенцтвам, штотыднёвікам, вашым партнёрам.

– Падрыхтуйце для раздачы друкаваныя матэрыялы для прэс-канферэнцыі, у тым ліку прэс-папкі з раскладам, біяграфіямі спікераў і іншымі патрэбнымі дакументамі.

– Падрыхтуйце тэзісы прамоваў і раздайце спікерам. Упэўніцеся, што спікеры разумеюць, пра што павінны гаварыць, каб не адбылося «накладкі» падчас прэзентацыі.

*Не пазней за дзень да прэс-канферэнцыі*

– Звяжыцеся са спікерамі, каб праверыць і ўдакладніць парадак іх прамоваў і асноўныя пункты прамоваў.

– Звяжыцеся з прадстаўнікамі СМІ і нагадайце аб прэс-канферэнцыі.

– Падрыхтуйце ўсе матэрыялы, у тым ліку і дадатковыя копіі, каб даслаць іх журналістам, якія не змогуць прысутнічаць.

– Праверце, каб усё было падрыхтавана ў месцы правядзення прэс-канферэнцыі.

*У дзень прэс-канферэнцыі*

– Выдайце прэс-рэліз, у якім будуць змешчаны асноўныя ідэі прэс-канферэнцыі.

– Зрабіце апошнія званкі ў рэдакцыі і рэдактарам.

– За некалькі гадзінаў да пачатку прэс-канферэнцыі праверце ўсё ў месцы яе правядзення.

– Упэўніцеся, што дзверы для журналістаў не замкнёныя і памяшканне лёгка знайсці.

– Паўтарыце парадак і асноўныя пункты прамоваў са спікерамі, калі яны збяруцца ўсе разам.

*Падчас прэс-канферэнцыі*

– Падрыхтуйце спіс з імёнамі і адрасамі прысутных журналістаў.

– Раздайце прэс-папкі і вашы працоўныя візітоўкі.

– Раздайце журналістам спіс удзельнікаў.

– Рабіце ўступныя заўвагі, прадстаўце спікераў.

– Арганізуйце патрэбныя персанальныя інтэрв'ю і дадатковыя інтэрв'ю.

– Зрабіце запіс канферэнцыі, каб пазней можна было прагледзець або праслухаць яе.

– Рабіце фотаздымкі для ўнутранага карыстання.

*Пасля прэс-канферэнцыі*

– Дашліце прэс-папкі журналістам, якія не прыйшлі.

– Пазваніце журналістам, якія не прыйшлі, хоць здаліся зацікаўленымі.

– Сачыце за навінамі ў СМІ, каб ведаць, як асвятлялася прэс-канферэнцыя.

– Збярыце ўсе артыкулы і іншыя матэрыялы, якія асвятлялі падзею ў СМІ.

**5. АЦЭНКА**

Гэты пункт патрэбны для перыядычнага аналізу ініцыятываў адвакацыі, каб убачыць, ці былі дасягнутыя пастаўленыя мэты, і якія змены патрэбныя ў адвакацыйнай стратэгіі. Ён сведчыць пра важнасць маніторынгавай дзейнасці, якая кантралюе выкананне справаў паводле плана. Маніторынг і ацэнка часта адбываюцца адначасова.

*Пры ацэнцы даюцца адказы на пытанні:*

– Ці дасягнулі мы таго, што планавалі дасягнуць?

– Калі не, то чаму, і што трэба было змяніць, каб дасягнуць?

*Пры маніторынгу даюцца адказы на пытанні:*

– Ці зрабілі мы тое, што збіраліся зрабіць?

– Калі не, то чаму, і што трэба змяніць?

## *Практычная частка (прыклады)*

*Практыкаванне 1*

**Дзяліцца досведам з групаю**

Як пералічаныя вышэй парады могуць дапамагчы вам у працы? Ці лічыце вы, што нейкі з гэтых парадаў складана выкарыстоўваць у вашай канкрэтнай сітуацыі? Якія з іх і чаму?

*Практыкаванне 2*

Раздзяліце ўдзельнікаў на дзве групы. Адна група метадам «мазгавога штурму» вызначае інфармацыю, якая можа быць карыснаю ў адвакацыйнай працы. Іншая тым жа метадам вызначае крыніцы інфармацыі, даступныя для ўсёй групы. Пасля групы на пленарным пасяджэнні параўноўваюць вынікі. Іх можна запісаць і выкарыстоўваць як крыніцу для адвакацыйнай працы.

*Практыкаванне 3*

Удзельнікі падрыхтоўваюць радыё-інтэрв'ю на любую тэму на выбар. Фасілітатар выступае ў ролі інтэрв'юера, а іншыя ўдзельнікі даюць водгукі і вучацца на практыцы.

*Матэрыял 1*

**Прыклад прэс-рэліза**

### Загаловак акрэслівае сутнасць падзеі, пажадана да 80-ці сімвалаў, шрыфт большы

***Першы абзац — гэта кароткі выклад, крыху даўжэйшы пераказ навіны, які пашырае інфармацыю, пададзеную ў загалоўку, ад аднаго да чатырох сказаў. Гэты абзац пішацца стандартным шрыфтам.***

Горад, краіна, дата — у лідзе павінна падавацца галоўная інфармацыя, але не больш чым на 25 словаў. Прыцягніце ўвагу вашых чытачоў, проста паўтараючы інфармацыю пра навіну, якую вы збіраецеся абвясціць. Не перажывайце, што чытач ужо

прачытаў гэта ў загалоўку або ў першым абзацы; лід павінен заставацца сам па сабе.

Прэс-рэліз падобны да паведамлення навінаў. Сказы і абзацы кароткія, 3–4 радкі на абзац. **У першых абзацах павінны быць адказы на пытанні: «хто, што, калі, дзе, чаму і як».** СМІ могуць узяць інфармацыю аб падзеі з прэс-рэліза, каб стварыць кароткую навіну або напісаць артыкул аб падзеі, а могуць узяць інфармацыю з прэс-рэліза цалкам, слова ў слова, але сам прэс-рэліз не з’яўляецца артыкулам або перадрукам.

Стандартны прэс-рэліз складаецца з 300–800 словаў і пішацца ў праграме, якая правярае граматычныя і пунктуацыйныя памылкі.

Рэкамендуецца пісаць загаловак і першы абзац у апошнюю чаргу, каб быць упэўненымі, што яны змяшчаюць самую важную інфармацыю, якая ёсць у тэксце рэліза. Выкарыстоўвайце большы шрыфт толькі ў загалоўку.

У астатнім тэксце прэс-рэліза раскрываецца інфармацыя, пададзеная ў першым абзацы. У тэкст уключаны цытаты кіраўніцтва, карыстальнікаў і экспертаў па пытанні, а таксама больш дэталёва гаворыцца пра вашую навіну. У тэксце можа быць нешта ўнікальнае або спрэчнае, важная інфармацыя аб знакамітай асобе, месцы або рэчы.

Звычайныя тэмы для прэс-рэліза — гэта аб’явы аб новых праектах або стратэгічным партнёрстве, атрыманні ўзнагароды, публікацыі кнігі або падручніка, выхаду новай праграмы або адкрыцці новага вэбсайта. Прэс-рэліз пішацца ў нейтральным, аб’ектыўным тоне, без рэкламнай шуміхі і экзальтаванасці ў выказваннях, што робіць яго падобным да рэкламнага тэксту. Не звяртайцеся напрамую да вашых карыстальнікаў і мэтавай аўдыторыі. Выкарыстанне словаў «я», «мы» і «вы» па-за прамой цытатаю сведчыць пра тое, што ваш тэкст — хутчэй рэклама, чым прэс-рэліз.

Не далучайце адрас электроннай пошты да тэксту прэс-рэліза — праграма абароны ад спаму можа перапісаць сам адрас у тэксце.

У апошні абзац звычайнага прэс-рэліза ўключны найменш важны для навіны матэрыял, але ў анлайн-рэлізе ў апошнім абзацы звычайна пералічваюцца ключавыя пункты і падсумоўваюцца навіны, як у пададзеным ніжэй прыкладзе.

Для атрымання дадатковай інфармацыі аб навіне, якая з’яўляецца тэмаю гэтага рэліза (або для атрымання ўзору, копіі ці дэма) звязвайцеся з ___________ або наведайце ______________.

Пра вашую арганізацыю: далучыце кароткую інфармацыю пра вашую арганізацыю або важных людзей, звязаных з падзеяй, а пасля падайце імя і нумар тэлефона асобы для кантакту.

Кантакты: ________________________

*Матэрыял 2*

**Уменне весці перамовы**

Уменне весці перамовы дае вам магчымасць упэўніцца, што іншыя людзі разумеюць вашую пазіцыю, і дапамагае пераканаць іншых людзей прыняць меркаваны кірунак вашых дзеянняў. Няўменне дамаўляцца можа хутка настроіць людзей, з якімі вы размаўляеце, на негатыў, што перашкодзіць вам данесці сваю ідэю.

**Карысныя парады**

***Перамога-перамога***

Шукайце рашэнні, якія будуць выйгрышнымі для абодвух бакоў. Калі вы гатовыя да кампрамісу ў некаторых пытаннях, дакладна паведаміце, у якіх пытаннях вы не будзеце ісці на кампраміс. Падумайце, што вы можаце прапанаваць іншаму боку, каб апаненты засталіся задаволенымі.

***Задавайце пытанні***

Гэта неабходна, каб высветліць моманты, у якіх вы разам можаце застацца ў выйгрышы. Гэта дапаможа перамовам не рухацца па спіралі «напад — абарона».

***Прасіце дазволу***

Гэта дапаможа кантраляваць сітуацыю, не б’ючыся за права сказаць слова. Пачынайце са словаў: «Дазвольце мне выказаць меркаванне, што…» або «Дазвольце я задам пытанне…».

***Правярайце і падсумоўвайце***

Упэўніцеся, што кожны зразумеў і інтэрпрэтаваў пададзеную інфармацыю аднолькава і згаджаецца з планам дзеянняў. Гэта дапамагае выклікаць давер і не дапусціць памылак і разладу адносінаў у будучыні.

***Растлумачце вашыя матывы***

Няхай іншыя зразумеюць, чаму вы прапаноўваеце той ці іншы план дзеянняў. Не прымушайце іх угадваць або шукаць схаваныя матывы.

***Будзьце чулымі***

Сачыце, як змяняецца агульны настрой аўдыторыі, будзьце гатовыя да нечаканых выказванняў або рэакцый, абарончых адказаў, да таго, што аўдыторыя можа страціць зацікаўленасць, і адпаведна змяняйце стыль сваёй прамовы і падыход.

***Ведайце, калі трэба спыніцца***

Усведамляйце, як далёка можна заходзіць у тым ці іншым пытанні, будзьце гатовыя да далейшых сустрэчаў, калі гэта патрэбна.

***Слухайце і ўключайцеся***

Слухайце апанентаў і іх праблемы, будзьце гатовыя адказаць ім. Калі трэба, дазвольце ім прамаўляць першымі.

**Шкодныя звычкі**

***Эмацыйны падыход***

Пераход на асобы і ўжыванне эмацыйна афарбаванай лексікі пакрыўдзіць вашых апанентаў, гэта будзе несправядліва і неразумна.

***Спіраль «напад — абарона»***

Калі вы не слухаеце іншую кропку гледжання, а проста абараняеце сваю пазіцыю, можа ўзнікнуць спрэчка і вам будзе цяжэй пераканаць у нечым іншых людзей.

***Спіс***

Калі вы падаеце інфармацыю і аргументы спісам, каб умацаваць свой уплыў, гэта можа раздражніць слухачоў і прымусіць іх забыцца пра галоўныя пункты.

***Контрпрапановы***

Калі вы выказваеце сваю контрпрапанову ў адказ на кожную прапанову іншага боку, будзе цяжка пераканаць у нечым апанентаў.

***Злосць***

Калі вы павышаеце на некага голас, гэта дыскрэдытуе вашы ідэі і сведчыць пра слабасць вашай аргументацыі.

***Выйсмейванне і прыніжэнне***

Гэта прымусіць іншага чалавека закрыцца і нават перарваць сустрэчу.

***Імкненне перабіваць***

Гэта раздражняе чалавека, які гаворыць; ён палічыць, што вы яго не слухаеце, і будзе рабіць гэтак жа ў адносінах да вас.

***Успрымаць і падаваць усё асабіста***

Гэта выклікае крыўду і раніць, і неабавязкова датычыць праблемы.

## *Заключэнне*

У папярэднім раздзеле мы прапанавалі некаторыя (але не ўсе) парады, якія дапамагаюць паспяховай адвакацыйнай дзейнасці, калі вы толькі **распачынаеце** гэтую дзейнасць.

# ІНСТРУКЦЫЯ
# ПА ПРАВЯДЗЕННІ ТРЭНІНГАЎ

## **Асобныя сустрэчы ў парафіі** (прыклад)

| *Тэма* | *Працягласць* | *Метады* |
|---|---|---|
| Біблійныя і тэалагічныя асновы «Карытаса» | 2 г. | |
| Важныя дакументы | 2 г. | |
| Сутнасць парафіяльнага «Карытаса» | 3 г. | Уводзіны, малітва, тлумачэнне тэорыі, пытанні, практыка |
| Асноўная задача — педагагічная задача | 2 г. | |
| Асноўная задача — веданне мясцовасці | 2 г. | |
| Асноўная задача — сацыяльнае служэнне | 2 г. | |
| Асноўная задача — каардынацыя і каапераіцыя | 2 г. | |
| Валанцёрства — сутнасць | 3 г. | |
| Валанцёрская праца — вывучэнне прыкладу | 2 г. | |
| Рапрацоўка праекта | 3 г. | |
| Камандная праца | 3 г. | |
| Арганізацыя сустрэчаў | 3 г. | Уводзіны, малітва, праца ў групах, тлумачэнне тэорыі |

## **Поўны трэнінг на парафіяльным або дыяцэзіяльным узроўні** (прыклад)

| Тэма | Працягласць | Метады |
|---|---|---|
| ПЕРШЫ ДЗЕНЬ:<br>Асновы «Карытаса»<br>Сутнасць «Карытаса» | | |
| ДРУГІ ДЗЕНЬ:<br>Асноўныя задачы ПК | | |
| ТРЭЦІ ДЗЕНЬ:<br>Валанцёрства<br>Праца ў камандзе | | |
| ЧАЦВЁРТЫ ДЗЕНЬ:<br>Распрацоўка праектаў<br>Фасілітацыя ў правядзенні сустрэчаў | | |

## **Аднадзённы базавы трэнінг** (прыклад 1)

| Тэма | Працягласць | Метады |
|---|---|---|
| Уводзіны | 30 хв. | |
| Асновы «Карытаса» | 60 хв. | |
| Сутнасць ПК | 90 хв. | |
| Асноўныя задачы ПК | 90 хв. | |
| Валанцёрства | 90 хв. | |

## **Аднадзённы базавы трэнінг** (прыклад 2)

| Тэма | Працягласць | Метады |
|---|---|---|
| Уводзіны | 30 хв. | |
| Сутнасць ПК | 60 хв. | |
| Педагагічная задача | 90 хв. | |
| Веданне мясцовасці | 90 хв. | |
| Сацыяльнае служэнне | 45 хв. | |
| Каардынацыя і калектыўная праца | 45 хв. | |

## **Двухдзённы трэнінг** (прыклад)

Першы дзень:

| Тэма | Працягласць | Метады |
|---|---|---|
| Уводзіны | 30 хв. | |
| Асновы «Карытаса» | 60 хв. | |
| Сутнасць ПК | 90 хв. | |
| Асноўныя задачы ПК | 180 хв. | |

Другі дзень:

| Тэма | Працягласць | Метады |
|---|---|---|
| Валанцёрства | 180 хв. | |
| Камандная праца | 90 хв. | |
| Распрацоўка праекта | 90 хв. | |

# ВЫ — ТРЭНЕР

Распрацоўваць і праводзіць трэнінгі няпроста. Вам неабходна будзе клапаціцца пра мноства рэчаў, калі вы жадаеце, каб вашыя слухачы прымалі актыўны ўдзел у працы і вучыліся. У гэтым кароткім уводным курсе мы раскажам пра базавыя прынцыпы падрыхтоўкі і працы трэнера.

**Стварыце добрую атмасферу**

Добрая атмасфера падчас навучання часам важнейшая за іншыя ўменні і веды трэнера. Калі вы не зможаце дасягнуць мінімальнага ўзроўню камфорту, усё, што вы зробіце або скажаце як трэнер, не будзе адпавядаць чаканням вашых слухачоў. Таму трэба зрабіць усё магчымае для стварэння добрай атмасферы. Вось некаторыя важныя элементы падрыхтоўкі:

*Падрыхтуйце памяшканне*

Забяспечце для кожнага ўдзельніка месца за сталом (калі вы працуеце ў аўдыторыі), каб можна было запісваць. Упэўніцеся, што кожны студэнт бачыць вас і візуальныя матэрыялы. Імкніцеся пазбягаць таго, каб нейкія месцы былі зручнейшыя за іншыя, бо гэта парушае неабходную роўнасць усіх удзельнікаў. Важна праверыць святло і гукаізаляцыю ў памяшканні, а таксама праверыць, як працуе электрычнасць.

*Прывітайце усіх удзельнікаў*

Вы павінны прыйсці ў памяшканне для трэнінгу першым, людзі не павінны вас чакаць. Асабіста прывітайце кожнага чалавека, калі гэта магчыма, імкніцеся стварыць прыемную атмасферу і наладзіць адносіны.

*Пазнаёмцеся з удзельнікамі*

Перад пачаткам працы, паспрабуйце атрымаць некаторую інфармацыю пра вашых слухачоў: хто яны, колькі ім гадоў, чым яны займаюцца, чаму яны прыйшлі на трэнінг, які досвед маюць па тэме трэнінгу. Упэўніцеся, што ведаеце, у якіх адносінах знаходзяцца ўдзельнікі трэнінгу.

*Карыстайцеся гумарам*

Перад трэнінгам і падчас яго, гэтак жа, як і падчас перапынкаў і абеду, не забывайцеся пра пачуццё гумару. Гэта дапаможа вам стварыць добрую атмасферу і зняць напружанасць у слухачоў. Гэта не значыць, што ў вас перастануць бачыць сур’ёзнага прафесіянала.

**Уменне рабіць уводзіны**

Гэтае ўменне вельмі важнае для паспяховага правядзення трэнінгу. Прычына вельмі простая. На пачатку ўдзельнікі больш сканцэнтраваныя і зацікаўленыя. Вам трэба з самага пачатку прыцягнуць іх увагу, каб яны заставаліся з вамі ўвесь час. Вы павінны матываваць іх, растлумачыць, што і як вы будзеце рабіць, паказаць ім сувязь паміж іх чаканнямі і ўжо знаёмымі тэмамі. Не забывайцеся, што гэта толькі ўводзіны, не траціце на гэтую частку трэнінгу больш за 20% часу.

Вось прынцыпы пабудовы ўводзінаў да трэнінгу ў выглядзе мнеманічнага правіла:

**СТ** — СТыль (як будзе выглядаць трэнінг — прэзентацыя, дыскусія, лекцыя, праца ў групах і г.д.).

**ВА** — ВАжнасць (растлумачце, чаму тэма важная).

**РА** — РАсклад (часавыя рамкі і парадак працы).

**Й**

**ІМП** — ІМкненне Працаваць (распавядзіце, чаму ўдзельнікі навучацца і што будуць ведаць напрыканцы трэнінгу).

**Э** — Эфект (зрабіце напачатку нешта творчае, каб прыцягнуць увагу).

**Т** — Тэма (не забудзьце акрэсліць тэму трэнінгу, запішыце яе).

**Гнуткасць**

Гэтае ўменне важнае, бо дапамагае прыцягваць і ўтрымліваць увагу слухачоў, наладжваць станоўчыя працоўныя адносіны, заахвочваць слухачоў, уключаючы іх у працу, і пазбягаць нуднасці ў трэнінгу.

Ключавыя пункты гэтага ўмення:

– *Зрокавы кантакт* неабходна размяркоўваць пароўну сярод усіх удзельнікаў, каб кожны адчуваў, што цікавы трэнеру.

– *Рухі* павінны быць мэтанакіраваныя і змястоўныя, каб захоўваць зацікаўленасць і ўтрымліваць увагу «студэнтаў».

– *Удзел слухачоў* — трэнер павінен задаваць пытанні, распачынаць дыскусіі і практыку, каб заахвоціць да актыўнасці. Прыдумайце некалькі групавых, парных або індывідуальных заданняў.

– *Розная манера маўлення* — трэнер змяняе інтанацыю, гучнасць, хуткасць, экспрэсіўнасць маўлення. Гаворачы пра важныя рэчы, ён павінен гаварыць павольней і гучней.

**Уменне задаваць пытанні**

Гэта, відаць, самае складанае і недаацэненае ўменне трэнера. Трэнеры, якія ўдасканальваюць навык выкарыстоўваць пытанні, спрыяюць лепшым вынікам сваіх «студэнтаў» і ствараюць больш эфектыўную атмасферу навучання. Замест таго, каб гаварыць самому, дазвольце вучням сказаць.

Асновы ўмення задаваць пытанні:

– *Фокус* — трэнер задае агульныя пытанні, каб далучыць да працы як мага больш прысутных, а пасля задае канкрэтныя пытанні (каб сфакусавацца на канкрэтнай задачы).

– *Скіраванасць* — трэнер задае пытанне, звяртаючыся да ўсёй групы, а пасля выклікае прысутных па імёнах, запрашаючы да адказу.

– *Паўза* — трэнер задае пытанне і робіць кароткую паўзу, каб «студэнты» маглі падумаць над адказам. Гэта вельмі важна, калі вы хочаце пачуць адказы ўдзельнікаў.

– *Просьба прывесці прыклады* — прасіце ўдзельнікаў даваць прыклады па тэме.

– *Узгадка* — задайце пытанне, якое дапаможа ўдзельнікам узгадаць нейкую ідэю.

– *Падтрымка* — задайце пытанне, каб зразумець, чаму быў дадзены менавіта той ці іншы адказ.

Варта сказаць, што ключавыя пытанні трэба рыхтаваць загадзя, перад трэнінгам. Задаючы пытанне, звяртайцеся да ўсёй групы, каб кожны мог паразважаць над пытаннем. Дайце слухачам крыху часу падумаць над адказам, будзьце далікатныя і чулыя, задаючы пытанні і атрымліваючы адказы.

**Метад «ранішніх навінаў»**

*Repetita mater studiorum* («Паўтарэнне — маці вучэння»), або метад «ранішніх навінаў». Гэтае ўменне дапамагае трэнерам менш гаварыць пра агульнае, а засяроджвацца на канкрэтных рэчах. Заўжды ёсць магчымасць выбіраць: даць удзельнікам тоны новай інфармацыі, якую яны могуць не запомніць, або паўтараць шмат разоў тую самую інфармацыю, каб яны запомнілі і зразумелі яе. Вось як працуе гэты метад:

– *Распавядзіце слухачам, пра што вы збіраецеся ім сказаць,* — зрабіце напачатку кароткія ўводзіны ў тэму, растлумачце, што збіраецеся рабіць, як і з якою мэтаю.

– *Пасля распавядайце ім* — гэта асноўная частка трэнінгу; тут вы даеце інфармацыю ўдзельнікам.

– *Далей распавядзіце ім, пра што вы ім распавялі,* — напрыканцы трэнінгу зрабіце кароткае падсумаванне, паўтарыце ключавыя словы і ідэі.

**Метад візуалізацыі**

Візуальныя матэрыялы дапамагаюць трэнерам перадаць сваю ідэю ўдзельнікам трэнінгу. Гэта толькі дапаможныя матэрыялы, а не асноўны спосаб дзяліцца ведамі. Рэкамендавана карыстацца імі як мага больш, калі гэта патрэбна. Дарослыя лепш вучацца з дапамогаю аўдыя-візуальных матэрыялаў, і даследаванні паказваюць, што 83% новай інфармацыі мы атрымліваем праз зрок. Залатое правіла выкарыстання метаду візуалізацыі: каб усё было коратка і проста.

Такім чынам, візуальныя матэрыялы павінны быць:

– прыемныя для вачэй;

– лёгкія для чытання;

– выразныя;

– лаканічныя;

– каляровыя.

Гэта не азначае, што візуальныя матэрыялы павінен ствараць прафесійны мастак або графік у спецыяльных праграмах. Часам звычайныя самаробныя візуальныя дапаможныя матэрыялы працуюць лепш і ствараюць большы эфект.

Вось некалькі парадаў для працы з візуальнымі матэрыяламі:

– Не чытайце з іх, прамаўляючы; вы заўжды мусіце глядзець на сваіх слухачоў.

– Не пішыце больш за 5–7 радкоў на адной старонцы (слайдзе, дошцы).

– Упэўніцеся, што кожны ўдзельнік бачыць матэрыялы (не засланяйце іх), інакш у выкарыстанні візуальных матэрыялаў няма сэнсу.

– Рабіце іх як мага большымі.

– Будзьце крэатыўнымі, выкарыстоўвайце розныя колеры, цікавы дызайн.

– Не пішыце фразы цалкам, толькі ключавыя словы.

– Не гаварыце і не пішыце адначасова (гэта датычыць дошак або канспектаў): скажыце, павярніцеся, напішыце, зноў павярніцеся.

**Кароткі тэст для праверкі сваёй падрыхтоўкі да трэнінгу**

☐ Я ведаю, хто будзе прымаць удзел у трэнінгу і колькі будзе ўдзельнікаў.
☐ Я падрыхтаваў памяшканне для правядзення трэнінгу.
☐ Я падрыхтаваў адпаведны набор навучальных заданняў.
☐ Я напісаў кароткія ўводзіны (што я буду гаварыць і рабіць, калі і якім чынам).
☐ Я падрыхтаваў асноўныя пытанні і прыклады.
☐ Я прадугледзеў выкарыстанне розных метадаў, каб данесці свае ідэі.
☐ Я падрыхтаваў візуальныя матэрыялы.
☐ Я падрыхтаваў матэрыялы для ўдзельнікаў.
☐ Я вырашыў, як напрыканцы падсумую свае ідэі.

# ЗМЕСТ


На служэнні людзям
*Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча* ........ 5
Уводзіны ........ 7
Структура дапаможніка ........ 8

**Тэма I. Тэалагічныя асновы «Карытаса»**

Паняцце *caritas* у Святым Пісанні ........ 13
Сацыяльнае вучэнне Касцёла ........ 21
Caritas in veritate ........ 31
Каталік і грамадскае жыццё ........ 39

**Тэма II. Парафіяльныя структуры «Карытаса»**

Сутнасць працы парафіяльнага «Карытаса» ........ 49
Асноўная задача парафіяльнага «Карытаса» —
клопат пра бедных ........ 65
Асноўная задача парафіяльнага «Карытаса» —
педагагічная задача ........ 79
Асноўная задача парафіяльнага «Карытаса» —
сацыяльнае служэнне ........ 89
Асноўная задача парафіяльнага «Карытаса» —
кааперацыя, каардынацыя і калектыўная праца ........ 101

**Тэма III. Валанцёрства**

Хрысціянскае валанцёрства ........ 115
Практычнае даследаванне сацыяльнай сітуацыі ў парафіі ........ 155

**Тэма IV. Асноўныя навыкі валанцёраў**

Арганізацыя і фасілітацыя сустрэчаў ........ 171
Арганізацыя каманды і працы ў камандзе ........ 185
Распрацоўка і напісанне праектаў ........ 201
Дзейнасць па абароне грамадскіх інтарэсаў (адвакацыя) ........ 221
Інструкцыя па правядзенні трэнінгаў ........ 247
Вы — трэнер ........ 251

Духоўна-асветніцкае выданне

# ЛЮБІ СВАЙГО БЛІЖНЯГА
Дапаможнік па развіцці парафіяльных структураў
дабрачыннага таварыства «Карытас»

Пераклад з англійскай

Адказная за выданне А. Лукашэвіч
Карэктары Л. Уладзімірава, Э. Ваўчок
Тэхнічны рэдактар А. Глекаў
Камп’ютарная вёрстка А. Глекава, Э. Палінеўскай

Падпісана да друку 04.09.2018 г.
Фармат 60х90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 16,25. Ул.-выд. арк. 11,03.
Наклад 510 асобнікаў. Заказ № 718.

УП «Выдавецтва „ПРО ХРЫСТО“».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/145 ад 21.01.2014
Пл. Свабоды, 9, п. 2, 220030, г. Мінск
**http://pro-christo.catholic.by;**
**e-mail: pro-christo@catholic.by**

Надрукавана ў ПУП «Джи энд Ди».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/36 ад 13.01.2014.
Вул. Бурдзейнага, 37-191, 220136 г. Мінск.

Л93 **Любі** свайго бліжняга : Дапаможнік па развіцці парафіяльных структураў дабрачыннага таварыства «Карытас» ; пер. з англ. Юліі Шэдзько. — Мінск : ПРО ХРЫСТО. — 2018 г. — 260 с.

ISBN 978-985-7074-94-5.

Дапаможнік па развіцці парафіяльных структураў дабрачыннага таварыства «Карытас» «Любі свайго бліжняга» з'явіўся ў выніку шматгадовага супрацоўніцтва арганізацый «Карытаса» Паўднёвай Еўропы.

Дапаможнік стаў адказам на патрэбы людзей, якія працуюць у гэтай сферы (парафіяльных і дыяцэзіяльных структурах дабрачыннага таварыства «Карытас») і імкнуцца арганізаваць або рэарганізаваць парафіяльны «Карытас». Гэты дапаможнік распрацаваны так, каб дапамагчы ў парафіях аніматарам, якія займаюцца заснаваннем парафіяльных структураў «Карытас» і (або) арганізуюць розныя трэнінгі і сустрэчы ў структурах, што ўжо існуюць.

**УДК 272**
**ББК 86.375**

**Нацыянальны «Карытас»**
Рэлігійная місія «Дабрачыннае каталіцкае таварыства Карытас»
Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі
220004 г. Мінск, пл. Свабоды, 9
тэл.: +375 (44) 791 78 87
e-mail: caritasby@gmail.com
сайт: www.caritas.by

Рэлігійная місія «Дабрачыннае каталіцкае таварыства Карытас»
**Мінска-Магілёўскай архідыяцэзі**і
220058 Мінскі р-н,
в. Ляскоўка, вул. Карытас, 1
тэл./факс: + 375 (17) 265 18 78
e-mail: caritas@caritas-minsk.by
сайт: caritas-minsk.by

Рэлігійная місія «Дабрачыннае каталіцкае таварыства Карытас»
**Віцебскай дыяцэзіі**
210041 г. Віцебск, вул. Чкалава, 52-1
тэл./факс: +375 (21) 225 29 31
e-mail: caritas.vitebsk.diocese@yandex.by
сайт: caritas-vitebsk.by

Рэлігійная місія «Дабрачыннае каталіцкае таварыства Карытас»
**Гродзенскай дыяцэзіі**
230025 г. Гродна, вул. К. Маркса, 4
тэл.: +375 (15) 275 34 12
факс: +375 (15) 275 34 11
e-mail: caritasgrodno@yandex.ru
сайт: www.grodnensis.by

Рэлігійная місія «Дабрачыннае каталіцкае таварыства Карытас»
**Пінскай дыяцэзіі**
225030 Брэсцкая вобл., Брэсцкі р-н,
в. Чарнаўчыцы, вул. Брэсцкая, 33
тэл.: +375 (16) 294 57 64
e-mail: caritaspinscensis@gmail.com